БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

# СЛАВЯНСКІЯ ЛІТАРАТУРЫ Ў КАНТЭКСЦЕ СУСВЕТНАЙ

**Матэрыялы**
**XIV Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі,**
**прысвечанай 85-годдзю філалагічнага факультэта**
**Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта**

**Рэспубліка Беларусь**
**Мінск, 26 верасня 2024 г.**

МІНСК
БДУ
2024

УДК 821.16.09(06)+821(100)09(06)
ББК 83.3(4)я431+83.3(0)я431
С47

Р э д а к ц ы й н а я  к а л е г і я:
кандыдат філалагічных навук дацэнт *С. А. Важнік* (гал. рэд.);
доктар філалагічных навук прафесар *І. А. Чарота*;
доктар філалагічных навук прафесар *А. М. Андрэеў*;
доктар філалагічных навук прафесар *М. М. Хмяльніцкі*;
кандыдат філалагічных навук дацэнт *Т. А. Марозава*;
кандыдат філалагічных навук дацэнт *В. В. Прыемка*

Р э ц э н з е н т ы:
доктар філалагічных навук *Т. Я. Камароўская*;
кандыдат філалагічных навук *І. М. Афанасьеў*

**Славянскія** літаратуры ў кантэксце сусветнай : матэрыялы XIV Міжнар.
С47 навук.-практ. канф., прысвеч. 85-годдзю філал. фак. Беларус. дзярж. ун-та, Рэсп. Беларусь, Мінск, 26 верас. 2024 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: С. А. Важнік (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2024. – 341 с.
ISBN 978-985-881-693-3.

Разгледжаны актуальныя пытанні літаратуразнаўчай славістыкі і тэорыі літаратуры, праблемы сучаснай жанралогіі, славянскага фальклору і яго асэнсавання на сучасным этапе. Прааналізаваны міжнацыянальны дыялог культур і яго адлюстраванне ў літаратуры, мастацкі пераклад як форма міжнацыянальных літаратурных сувязей. Паказана фарміраванне літаратуразнаўчай і мовазнаўчай кампетэнтнасці ў XXI ст.

**УДК 821.16.09(06)+821(100)09(06)**
**ББК 83.3(4)я431+83.3(0)я431**

**ISBN 978-985-881-693-3**

© БДУ, 2024

## АРГАНІЗАЦЫЙНЫ КАМІТЭТ КАНФЕРЭНЦЫІ

**Старшыня:** *Важнік Сяргей Аляксандравіч*, дэкан філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, к.ф.н., дацэнт.

**Намеснік старшыні**: *Марозава Таццяна Анатольеўна,* загадчык кафедры тэарэтычнага і беларускага літаратуразнаўства філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, к.ф.н., дацэнт.

**Члены аргкамітэта**:

*Чарота Іван Аляксеевіч*, прафесар кафедры тэарэтычнага і беларускага літаратуразнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар філалагічных навук, прафесар

*Хмяльніцкі Мікалай Мікалаевіч*, прафесар кафедры тэарэтычнага і беларускага літаратуразнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар філалагічных навук, прафесар

*Шэшкен Ала Генадзьеўна*, прафесар кафедры славянскай філалогіі Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. В. Ламаносава, доктар філалагічных навук, прафесар

*Андрэеў Анатоль Мікалаевіч*, прафесар кафедры педагогікі і псіхалогіі прафесійнай адукацыі ФДБАУ ВА «Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт тэхналогій і кіравання імя К. Р. Разумоўскага», доктар філалагічных навук, прафесар

*Дзянісенка Вера Сяргееўна*, загадчык вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору кафедры тэарэтычнага і беларускага літаратуразнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

*Вострыкава Алена Уладзіміраўна*, дацэнт кафедры тэарэтычнага і беларускага літаратуразнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

*Прыемка Вольга Віктараўна*, дацэнт кафедры тэарэтычнага і беларускага літаратуразнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

*Лук'янава Таццяна Валер'еўна*, дацэнт кафедры тэарэтычнага і беларускага літаратуразнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

*Шамякіна Славяна Вячаславаўна*, дацэнт кафедры тэарэтычнага і беларускага літаратуразнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

*Уласевіч Валерыя Мікалаеўна*, спецыяліст кафедры тэарэтычнага і беларускага літаратуразнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

# ПРАДМОВА

Дадзены зборнік матэрыялаў падрыхтаваны па выніках працы XIV Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай», прысвечанай 85-годдзю філалагічнага факультэта БДУ. І гэта невыпадкова: названая канферэнцыя з'яўляецца візітнай карткай філалагічнага факультэта БДУ (у 2024 годзе яна адбылася ў 14 раз!). Гэта паказчык традыцый і нязменнай цікавасці арганізатараў і ўдзельнікаў да падтрымкі дадзенага навуковага мерапрыемства. І філалагічны факультэт у складзе дэканата і літаратуразнаўчых кафедраў імкнецца працягваць гэтую традыцыю.

Сярод аўтараў зборніка – выкладчыкі Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. В. Ламаносава, Філіяла Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта ў Севастопалі, Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта тэхналогій і кіравання імя К. Р. Разумоўскага, Нацыянальнага даследчага ўніверсітэта «Вышэйшая школа эканомікі» (Масква), Казахскага нацыянальнага ўніверсітэта імя Аль-Фарабі, Данецкага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя В. Шаталава, Адзінцоўскага філіяла Маскоўскага дзяржаўнага інстытута міжнародных адносінаў Міністэрства замежных спраў Расійскай Федэрацыі, Навасібірскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта, Мультыкультурнага даследчага цэнтра Універсітэта Хучжоу, Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта; навуковыя супрацоўнікі і маладыя даследчыкі ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі», літаратурныя рэдактары РУП РВУ «Звязда» і Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, настаўнікі школ.

Зборнік мае традыцыйную кампазіцыю. На пачатку прадстаўлены даклады, агучаныя на пленарным пасяджэнні. Гэта выступленні прафесара Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта тэхналогій і кіравання імя К. Р. Разумоўскага А. М. Андрэева, прафесараў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта А. І. Бельскага і С. Я. Ганчаровай-Грабоўскай, вядучага навуковага супрацоўніка і кіраўніка Школы філалагічных навук НДУ«Вышэйшая школа эканомікі», прафесара Я. В. Казарцава (Масква), вядучага навуковага супрацоўніка Навасібірскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта і прафесара Сібірскага дзяржаўнага ўніверсітэта геасістэм і тэхналогій С. С. Жданава.

Далей прадстаўленыя даклады, размешчаныя ў пяці раздзелах.

У раздзеле 1 «Актуальныя пытанні тэорыі літаратуры і сучаснай жанралогіі» разглядаюцца творы пісьменнікаў у кантэксце жанравай традыцыі, мадэрнісцкія тэндэнцыі ў беларускай і польскай паэзіі пачатку XX ст., аповедныя стратэгіі і катэгорыя аўтара, асаблівасці хранатопу ў жанры фэнтэзі, тэорыя дыялогу культур на сучасным этапе.

У раздзеле 2 «Беларуская літаратура: сучасныя даследаванні» закранаюцца пытанні сацыяльнага станаўлення дзіцяці ў творах беларускага пісьменніка І. Васілевіча

і нацыянальнага менталітэту ў творах Л. Калюгі, біблейскай парадыгмы К. Тураўскага, дзіцячай антыўтопіі Я. Маўра, драматургічнай спадчыны А. Пшчолкі і інш.

Кола пытанняў раздзела 3 «Сусветная літаратура і аспекты кампаратывістыкі» – параўнанне твораў Ф. Ніцшэ і А. Пушкіна, гратэск у мастацкай сістэме Б. Лесьмяна, спецыфіка рэпрэзентацыі катэгорыі «свой – чужы», светапоглядна-метадалагічны зрух у беларуска-польскай літаратуры XIX стагоддзя, асоба І. Шаблоўскай як даследчыцы польскай і чэшскай літаратуры, вобраз горада і яго «цёмныя» бакі, матыў вар'яцтва ў прозе У. Гаршына і інш.

У раздзеле 4 «Славянскі фальклор, міфалогія і іх асэнсаванне на сучасным этапе» ў цэнтры ўвагі – тапанімічная народная проза, восеньскія абрады беларускага і кітайскага календара, парадаксальна-інтэграцыяная гумарыстыка ў сучасным гарадскім фальклоры, стварэнне тэхналогіі зазавання твораў фальклорнай творчасці на сучасным этапе і інш.

Раздзел 5 змяшчае артыкулы па пытаннях літаратурных сувязей і дыдактыкі, тэматыка якіх наступная: вобразы паэмы «Неўтаймаваны Раланд» Л. Арыёста ва «Успамінах» І. Клюкоўскага, мандэльштамаўскі шыфр у паэзіі П. Цэлана, інтэграцыйныя прыёмы ў выкладанні ліатуразнаўчых дысцыплін, выкарыстанне тэхналогіі развіцця крытычнага мыслення на ўроках рускай мовы і літаратуры і інш.

Над падрыхтоўкай зборніка да друку працавалі загадчык кафедры тэарэтычнага і беларускага літаратуразнаўства, кандыдат філалагічных навук, дацэнт Т. А. Марозава (складальнік); дацэнт кафедры тэарэтычнага і беларускага літаратуразнаўства, кандыдат філалагічных навук, дацэнт В. В. Прыемка (карэктура); спецыяліст па арганізацыі вучэбнага працэсу вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору кафедры тэарэтычнага і беларускага літаратуразнаўства К. А. Батура (стварэнне арыгінал-макета).

*Т. А. Марозава,*
*загадчык кафедры тэарэтычнага і*
*беларускага літаратуразнаўства БДУ,*
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

# ПЛЕНАРНЫЯ ДАКЛАДЫ

## ЛИТЕРАТУРА КАК ФЕНОМЕН ИДЕОЛОГИИ

**А. Н. Андреев**

*Доктор филологических наук, профессор,*
*Федеральное государственное бюджетное научное учреждение высшего образования*
*«Московский государственный университет технологий и управления*
*им. К. Г. Разумовского» (ПКУ), ул. Земляной вал, 73, 108802, г. Москва, Россия*

Литература не имеет прямого отношения к производству ценностного качества идей (к содержанию); литература специализируется на способах передачи смысла, на стиле, хотя при этом кажется, что именно литература является «фабрикой идей». Но литература не «фабрика идей», а «фабрика превращения идей в образы». Литература специализируется не на производстве идей, а на конвертации идей в образы, на переводе языка понимания на язык веры (язык чувств).

В таком своем качестве литература является феноменом идеологии, под которым понимается учение о вере в идеи (истинные или ложные), которые, обращаясь к каждому персонально, способны объединить общество, становясь при этом силой, предназначенной для изменения реального мира.

Художественная литература – это форма идеологии, которая является наиболее эффективным способом духовного производства человека, способом превращения индивида в личность.

***Ключевые слова:*** литература; идеология; язык; картина мира; матрица; культурный код; культура; образование.

## ЛІТАРАТУРА ЯК ФЕНОМЕН ІДЭАЛОГІІ

**А. М. Андрэеў**

*Доктар філалагічных навук, прафесар,*
*Федэральная дзяржаўная бюджэтнае навуковая ўстанова вышэйшай адукацыі*
*«Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт тэхналогій і кіравання імя К. Р. Разумоўскага» (ПКУ),*
*вул. Земляны вал, 73, 108802, г. Масква, Расія*

Літаратура не мае прамога дачынення да вытворчасці каштоўнаснай якасці ідэй (да зместу); літаратура спецыялізуецца на спосабах перадачы сэнсу, на стылі, хоць пры гэтым здаецца, што менавіта літаратура з’яўляецца «фабрыкай ідэй». Але літаратура не «фабрыка ідэй», а «фабрыка ператварэння ідэй у вобразы». Літаратура спецыялізуецца не на вытворчасці ідэй, а на канвертацыі ідэй у вобразы, на перакладзе мовы разумення на мову веры (мова пачуццяў).

У такой сваёй якасці літаратура з'яўляецца феноменам ідэалогіі, пад якім разумеецца вучэнне пра веру ў ідэі (праўдзівыя або ілжывыя), якія, звяртаючыся да кожнага персанальна, здольныя аб'яднаць грамадства, становячыся пры гэтым сілай, прызначанай для змены рэальнага свету.

Мастацкая літаратура – гэта форма ідэалогіі, якая з'яўляецца найбольш эфектыўным спосабам духоўнай вытворчасці чалавека, спосабам ператварэння індывіда ў асобу.

***Ключавыя словы:*** літаратура; ідэалогія; мова; карціна свету; матрыца; культурны код; культура; адукацыя.

## LITERATURE AS A PHENOMENON OF IDEOLOGY

**A. N. Andreev**

*Hab. PhD, Professor,*
*Federal State Budgetary Scientific Institution of Higher Education*
*«Moscow State University of Technology and Management named after K. G. Razumovsky» (PKU),*
*Zemlyanoy Val St., 73, 108802, Moscow, Russia*

Literature has nothing to do with the production of the value quality of ideas (content); literature specializes in ways of conveying meaning, in style, although it seems that literature is the «factory of ideas». But literature is not a «factory of ideas», but a «factory of turning ideas into images». Literature does not specialize in the production of ideas, but in the conversion of ideas into images, in the translation of the language of understanding into the language of faith (the language of feelings). In this capacity, literature is a phenomenon of ideology, which means the doctrine of faith in ideas (true or false), which, addressing everyone personally, are able to unite society, while becoming a force designed to change the real world. Fiction is a form of ideology, which is the most effective way of spiritual production of a person, a way of turning an individual into a personality.

***Keywords:*** literature; ideology; language; worldview; matrix; cultural code; culture; education.

### Введение, постановка проблемы

Я всю жизнь занимался литературой, чтобы понять, что никакой литературы, отлученной от идеологии, не существует. Если ты говоришь о литературе, то рано или поздно ты придешь к идеологии; а если не придешь, то ты говорил не о литературе.

Это может показаться шуткой. Так или иначе ее смысл направлен вовсе не в шуточную сторону. Хочешь понять литературу – разберись с идеологией и культурой.

Предмет литературы складывается из двух составляющих: идей (смысла) и стиля (способа выражения смыслов, «красоты»). В классической традиции, восходящей еще к Аристотелю [1], – из содержания и формы.

Очевидно, что из двух составляющих чем-то специфически литературным – тем, что, кроме как в литературе, более нигде не присутствует, – является словесно-художественный стиль, способ подачи и организации ценностно-смыслового дискурса.

Что касается содержания как такового (семантики, так или иначе связанной с природой человека, и философской антропологией, с ценностным ядром культуры), то литература не контролирует эту сферу жизни человека. Литература не производит ценности и смыслы и не управляет ими; ровно наоборот: ценности (содержание) управляют литературой (стилем). Если литература исчезнет, смысловые ценности не исчезнут вместе с ней; если исчезнут ценности, то почти вся литература, имеющая значение для мировой культуры, исчезнет вместе с ними. Утверждать, что литература является «служанкой идеологии», – значит принизить культурный статус и потенциал литературы; отрицать «прислуживание», то есть зависимость, – глупо. «Служанка идеологии» – это идеологическая маркировка идеологии.

Литература не имеет прямого отношения к производству ценностного качества идей (к содержанию); литература является не «фабрикой идей», а «фабрикой превращения идей в образы»; литература специализируется на способах передачи смысла, хотя при этом кажется, что именно литература является «фабрикой идей».

**ПЕРВЫЙ ТЕЗИС. Литература – феномен идеологии, имеющий отношение не к производству идей, а к технологии их передачи. Литература – это, если продолжать пользоваться метафорой, не фабрика идей, а фабрика превращения идей в образы. Литература специализируется не на производстве идей, а на переводе идей в образы, на переводе языка понимания на язык веры (язык чувств).**

Уже одно это обстоятельство заставляет задуматься над тем, что же такое литература и каковы ее функции в культуре.

Что такое идеология?

Идеологию мы трактуем как *тип управления информацией, который позволяет превращать идеи в материальную силу*. Идеология – это *учение о вере в идеи* (истинные или ложные), которые, обращаясь к каждому персонально, способны объединить общество, становясь при этом силой, предназначенной для изменения реального мира [2].

Термин «идеология» в научный оборот ввёл французский философ Антуан Дестют де Траси в конце XVIII века. С тех пор количество трактовок этого термина стало запредельным, а качество не поддается внятной систематизации.

Понятие «идеология» образовано от двух греческих слов (греч. ἰδεολογία; от ἰδέα «прообраз, идея» + λόγος «логос, слово, разум, учение»). Следовательно, этимологически идеология является учением об идеях, о системах идей. Однако, с нашей точки зрения, такое определение в корне искажает сущность идеологии и ее предмет в сегодняшнем их понимании.

Мы будем придерживаться иной трактовки термина идеология. Идеология в нашем понимании – это не учение об идеях или о системах идей, несущих мировоззренческую нагрузку; это отчасти верно, но в целом дает искаженное представление о предмете. Идеология – это нарратив, с одной стороны, про связь личного и общественного, а с другой стороны – про связь двух языков культуры: веры и идей (познания).

Идеология – это научный контент, изложенный ненаучным (образным) языком. Если говорить о структуре, то идеологию как целостный, многоплановый и сложно устроенный антропологический нарратив можно с известной долей условности представить как взаимодействие трех уровней:

- Картина мира,
- Матрица,
- Технология.

Под «Картиной мира» мы подразумеваем систему ценностей человека, сознательно сформированные мировоззренческие установки, которые служат основой для формирования мотиваций и моделей поведения.

«Матрица» – система ценностей, данная в образной, чувственно воспринимаемой форме (в мироощущении).

«Технология» – инструмент перевода с языка «Картины мира» (мировоззрения) на язык «Матрицы» (мироощущения).

Вводим эти понятия как термины, поэтому пишем с большой буквы – с целью отделить термины от метафоры.

Идеология – это нарратив про создание «Картины мира» (идеи, понимание, доказательство), переходящий в нарратив про веру в Картину мира («Матрицу») и информационную Технологию перевода понимания в веру. Картина мира доказывает, Матрица – убеждает.

Таким образом, *литература в контексте идеологии и культуры, – это Технология.* Но это особого рода Технология. Литература в плане информационном гораздо ближе к идеям, к Картине мира, по сравнению с иными видами искусств. Поэтому идеологический потенциал литературы неизмеримо выше.

## Идеи, мысли и образы как языки культуры

Поскольку литература является «самым умным» (смыслонасыщенным, семантикоемким) из искусств, имеет смысл разобраться с этим самым «умом литературы». С помощью слова в литературе создаются образы, то есть передаются и воспринимаются чувства; но слово, основной рабочий литературный инструмент, одновременно является инструментом мышления, которому образы противопоказаны (мышление осуществляется с помощью понятий). Иначе говоря, художественное слово, с одной стороны, заточено на образность, а с другой – блокирует эмоциональность своим «понятийным» потенциалом. Слово в литературе амбивалентно: оно умудряется создавать образы, задействовав при этом потенциал понятий.

Как это происходит?

Между *идеями* и *образами* существует некое связующее звено, – информационная единица, которую точнее всего обозначить термином *мысль* [3]. Чем отличаются мысли-смыслы от идей?

Идеи – это структурированные (систематизированные) смыслы в контексте четко обозначенного принципа познания мира (Картины мира). Идеи – это собранный

из мыслей иерархически организованный паззл (объект познания), где каждая отдельно взятая мысль занимает свое, строго отведенное ей место.

Мысли, в отличие от идей, – это не привязанные к принципу познания смыслы, которые, словно кошка, гуляют сами по себе и никак не хотят складываться в паззл, в систему, в Картину мира. Мысли можно применить к любому принципу познания, потому что они живут вне контекста.

За идеи, за которыми стоит претензия на объективное отражение мира, то есть наука, приходится нести культурную ответственность; за взлет мысли, за томления и прозрения «духа», за субъективный взгляд на вещи никто не несет культурной ответственности (мыслить – значит, «не ведать, что творишь»).

Идеи ценятся за объективность, вольные мысли – за оригинальность.

За оригинальные мысли и смыслы легко спрятаться (мыслители, малые сии, не ведают, что творят); идеи же разоблачают мыслителя донага, до фигового листочка.

Мысли – рабочий инструмент интеллекта; идеи – рабочий инструмент ума.

От произвольно собранных в кучу смыслов веет «свободой мысли»; от выстроенных идей за версту «несет законом», то есть ограничением свободы. Поэтому мысли и мыслителей люди любят, ибо «малые сии» дарят иллюзии (они «добрые»); идеи и тех, кто их вынашивает, ненавидят, ибо они безжалостно отбирают иллюзии (они «злые»).

Получается, что едва ли не само вещество гуманизма связано именно с мыслями, а идеи – смерть культуре. Это миф, созданный «мыслителями» в отместку за то, что они не умеют думать.

Главным здесь для нас является следующее. Мысли гораздо ближе к образам как языку информации, нежели идеи. Собственно, мысли есть не что иное, как «разбавленные» образами идеи. Мысли – это аморфные идеи, «идеи в тумане», неотформатированные (отлученные от концепта) идеи. Мысли оказывают более сильное воздействие на чувства по сравнению с идеями. В «туманные» мысли легче поверить, нежели в идеи: в них каждый увидит то, что захочет.

Одно дело – приглашение к размышлению (обо всем и ни о чем), приглашение присоединиться к процессу, и совсем другое – извлечение смыслов до такой степени ясности, которая превращает смыслы в идеи, а идеи – в руководство к действию, к принятию решений.

Литература в лучшем случае приглашает к размышлению, в худшем – призывает вообще не думать.

Мастеров «идейного отражения» мира (постижения мира через идеи) у человечества было немало, все они так или иначе были философами, которых для пущей важности иногда именуют мыслителями. Понятие мыслитель, увы, имеет культурный статус едва ли не выше, чем просто философ.

Это, конечно, самый забавный, запутанный и печальный культурный миф. Мыслитель (в узких рамках нарратива нашей работы) – тот, кто умеет мыслить, кто производит смыслы; философ – тот, кто с помощью мышления умеет производить идеи, управлять смыслами. Мыслитель – интеллектуально развит, философ – умен. Границы подвижны.

А есть еще те, кто с помощью идей меняет реальность. Афоризм «нет ничего практичнее хорошей теории» как раз о «сцепке» идей, продукции ума, с практикой. Хорошая теория доводит мысли «до ума», до степени идей, а идеи являются уже инструментом, с помощью которого можно изменять реальность – если их перевести на язык веры, конечно, сделать инструментом идеологии.

Идеология, качественная идеология, всегда опирается на идеи, а не на мысли. На ум, а не на интеллект.

Качественная, универсальная идеология видит только одну цель: превращение индивида в личность. Личность – это человек, ориентированный в своей жизнедеятельности на высшие культурные ценности, такие, как истина, добро, красота, справедливость, свобода, любовь, семья, патриотизм. Для этого личности необходим ум.

Когда литература думает, что она думает, «мыслит», она чаще всего совершает ошибку. Но ошибка в плане философском почти всегда оборачивается идеологической убедительностью. «Мыслители» с честью выходят из идейных тупиков, «посрамляя» научный способ познания мира.

Ф. М. Достоевский и Л. Н. Толстой были великими мыслителями, именно поэтому они писали романы, а не трактаты. Их учения невозможно взять и прямо вот так «безыдейно» претворить в жизнь: хорошие мысли, примененные в качестве инструмента к плохой реальности, – гарантия социальной катастрофы. Представим себе, что было бы, если бы толстовство стало идеей, овладевшей массами. Представим себе, что было бы, если бы «достоевщина» стала идеей, определяющей наше отношение к миру.

Было бы ровно то же самое, что и с учением Маркса и Ленина. Социалистические и коммунистические мысли тоже были чудо как хороши, это были идеальные идеалы, но они не дозрели до степени идей, поэтому практика отвергла эти «вредные мысли» и слышать ничего не хочет про идеи, которые могут вырасти из таких мыслей. Обожглись на молоке, а дуют на воду. Мыслящий писатель В. Т. Шаламов считал: «Русские писатели-гуманисты второй половины XIX века (и прежде всего Л. Толстой. – *А. А.*) несут на душе великий грех человеческой крови, пролитой под их знаменем в XX веке» [4].

И страх перед «молоком», перед «вредными» мыслями – это надолго, к сожалению.

Кстати, мыслителей, в том числе великих, в великой русской культуре было много, а философов – мало. Вот и стали называть мыслителей философами: из-за дефицита последних. Так, В. В. Розанов, собиратель «опавших мыслей» «в ворохи-короба», попал в философы. Мыслитель – всегда большой путаник, великий мыслитель – великий путаник; философ – перспектива и спасение для мыслителя.

Между прочим, те, кто упорно записывают Розанова в философы, оказывают русской философской мысли плохую услугу: они дезориентируют общественное сознание, понижают (хотя кажется, что повышают) уровень философской культуры, уводят ее в «бесконечные тупики». «Бесконечный тупик» – так называется роман Д. Е. Галковского, посвященный как раз текстам Розанова и представляющий собой

безмерно разросшийся «гипертекст»: это хорошая модель мышления как бесконечного процесса, бессмысленного и безрезультатного, не несущего никакой ответственности за свою криптофилософию: за гипермасштабы и мизеридеи. «Бесконечный тупик» – это, возможно, хорошая школа эквилибристики мысли, но определенно плохая философия.

Нечего сказать – говори гипертекстово.

Бесконечный тупик и гипертекст: кому выгодно?

Тем, кто не умеет производить идеи или по каким-то причинам не хочет этого делать. Гипертекст – это идеальный гроб для гуманитарной науки, который – вот чудо! – может стать живительной находкой для литературы.

**ВТОРОЙ ТЕЗИС. Ценности – идеи – мысли – образ – стиль: таков идеологический дискурс литературы. В феномен литературы как таковой ее превращает стиль.**

### Литература – инструмент идеологии

Как функционирует литература в качестве инструмента идеологии?

Чтобы разобраться в этом непростом вопросе, разберем «идеологическое» стихотворение Ю. Друниной «Комбат» (1943 г.) [5].

Когда, забыв присягу, повернули
В бою два автоматчика назад,
Догнали их две маленькие пули –
Всегда стрелял без промаха комбат.
Упали парни, ткнувшись в землю грудью,
А он, шатаясь, побежал вперед.
За этих двух его лишь тот осудит,
Кто никогда не шел на пулемет.
Потом в землянке полкового штаба,
Бумаги молча взяв у старшины,
Писал комбат двум бедным русским бабам,
Что… смертью храбрых пали их сыны.
И сотни раз письмо читала людям
В глухой деревне плачущая мать.
За эту ложь комбата кто осудит?
Никто его не смеет осуждать!

Мысль (продукт интеллекта) поэтессы ясна: на войне как на войне, всякое бывает; на войне хорошо то, что работает на нашу победу. Сам человек – средство для достижения победы. Комбат сделал то, что однозначно работает на победу. Следовательно, «никто его не смеет осуждать». Вины комбата нет. Таков поэтический приговор.

За мыслью сквозит идея (продукт разума), которая для автора не актуальна, но которая заставляет посмотреть на мысль в контексте высших культурных ценностей (то есть с точки зрения разума). Приведем популярную аранжировку категорического императива Канта: «Человек всегда должен быть целью и никогда – средством». Это высший принцип нравственности. Кант, а не комбат, выступает подлинным субъектом культуры.

По Друниной получается иначе: если ты *задался целью победить фашизм,* то человек неизбежно превратится в средство. Не по вине комбата, а по логике вещей, по логике жизни. Хочешь победить врага? Надо скорректировать цель, сердцевину культуры. Вечную и, чего греха таить, несколько абстрактную цель-императив «Человек» придется заменить (временно, временно!) на сиюминутную и конкретную «Победа». При этом цель как таковая, на первый взгляд, никуда не исчезла, и она не противоречит императиву. Победим врага – вернемся к человеку.

Дьявол сокрыт в деталях, или, иначе, все на свете состоит из роковых нюансов: только комбатовская цель – победа над фашизмом! – развязывает руки тем, кто хочет добиться цели «по Канту». В таком случае комбат, готовый отдать жизнь за свои убеждения, становится субъектом культуры. Хотите мира по Канту – зовите на помощь комбата.

Но тут также сокрыт роковой нюанс. Комбатовская цель достигается *любыми средствами*, что означает: средства в принципе могут подменить цель. По Канту – не могут; по комбату – могут и должны.

Комбатовская цель (Победа над фашизмом) – это средство для кантовской цели (Человек); кантовская цель для комбата – пустая фикция, фантом, происки слюнтяев и врагов, проявление слабости. Никто не смеет осуждать комбата, даже Кант. А вот комбат Канта – смеет.

Ставим вопрос ребром. Кто является подлинным субъектом культуры? Кто прав: Друнина-комбат или Кант? В силе Бог или в правде? (Вопрос правоты и веры в нее – это уже чисто идеологический вопрос.)

Если прав Кант, то и у комбата появляется шанс. Если прав комбат, то «Победа» над фашизмом станет способом уничтожения «Человека». Если Кант прав, то комбат, хоть без вины, но «все же, все же, все же» виноват (чего нет в стихотворении Ю. Друниной). Тот, кто воюет за истину (Человека), а не только за Победу над фашизмом (в этом лишь толика истины), должен чувствовать свою вину за то, что пусть невольно, согласно бесчеловечной логике вещей, но все же предал императив Канта – суть гуманизма. Суть гуманизма не в Победе над фашизмом, а в том, что Человек – цель. Если в комбатовской цели не присутствует цель Канта, то комбат превращается в носителя зла; если присутствует, то в носителя добра. Таков культурный приговор комбату.

Кант, высший субъект культуры, прав как культурфилософ; Друнина права как поэт и бескомпромиссный антифашист. Кант прав с позиций разума, Друнина – эмоционально и интеллектуально. Перед читателем возникает проблема выбора. «Кант VS победоносный комбат».

**ТРЕТИЙ ТЕЗИС. Подлинный субъект культуры всегда ориентируется на категорический императив Канта как высшую культурную ценность; следовательно, любого комбата следует изображать и оценивать с позиций Канта.**

Писатель почти всегда занимает позицию условного комбата, превращая литературу в служанку политики, патриотизма, красоты, религии, семьи, чего там еще. Литературоведение и критика должны оценивать писателя с позиций Канта.

Здесь мы остановимся и спросим себя: что мы сейчас обсуждали? Где в нашем обсуждении литература?

Когда читатель воспринимает стихотворение, то обсуждение его содержания, как правило, сосредотачивается в семантическом зазоре между идеей и мыслью (общим и частным, целью и средством). Обсуждать качество этической идеи – значит, обсуждать не стихотворение Друниной, а ценности культуры. В подобном обсуждении подлинный предмет литературы (стиль) отсутствует, потому что как бы растворяется в содержании. Это с одной стороны. С другой стороны, стиль работает на продвигаемый автором смысл, следовательно, обсуждать стиль вне смыслового контекста – некорректно. Принять стиль Друниной можно только вместе со смыслом.

Обсуждать можно и нужно веру поэтессы в свои мысли (или идеи). Ее *пафос* (идеи (мысли) + вера в них), как говорили когда-то теоретики советской школы [6]. А также стиль, который и реализует то, что мы назвали пафосом.

А это уже чистой воды идеология (за вычетом стиля). Друнина выступает как политрук. Тот, кто принимает ее мысли, также разделяет убеждения политрука; тот, кто не принимает, выступает с иных идеологических позиций. Если вы (с помощью Канта) обнаруживаете более высокий культурный смысл, стихотворение резко утрачивает художественную ценность.

Так или иначе обсуждается не стиль; обсуждается идеология с определенных идеологических позиций. Спорить можно бесконечно. Но где здесь литература?

Необходимо зафиксировать тот момент, который неизбежно делает литературу идеологией. Поэтесса не отвечает, не несет ответственности за качество Картины мира; я художник – я так вижу, как говорится. С поэта взятки гладки: какой с него спрос? Не читают поэты Канта, но почему-то считают себя вправе вступать с ним в спор. Малые сии не ведают, что творят. В реальности смыслы не бывают бесхозными, они всегда приведены в определенный идеологический порядок.

Друнина заражает своей верой в идеи-мысли (истинные или ложные). Вера в идеи (или праидеи – мысли), которые, обращаясь к каждому персонально, способны сплотить общество, становясь при этом реальной силой, делает литературу идеологией.

Литература становится проводником идеологии. Качество идеологии – это уже философско-культурологический, а не литературоведческий вопрос. Стихотворение «Комбат» впечатляет как образец советской идеологии «человек ничто, родина все», «сначала думай о родине, потом о себе», «кто не с нами, тот против нас». Но если соотнести идеологию с культурной ценностью (человек есть цель, но не средство), то ложный смысл делает и пафос ложным. Здесь уже никакой стиль не спасет.

В таких случаях говорят: стихотворение осталось в своем времени. Наступило иное время, пришла более универсальная идеология – прежняя стала неактуальной.

Существует иная идеологическая возможность. Некоторым особо чутким к поэтическому слову творцам удается «отделить» форму (стиль) от содержания, наделить форму функциями содержания (сделать стиль важнее смысла). В качестве примера укажем на стихотворение Б. Пастернака «Сумерки… Оруженосцы роз», 1913. Но бессодержательное «чистое искусство» (корифеи которого В. Набоков, С. Соколов) не является исключением из правила «литература есть форма идеологии». Если стиль важнее содержания, следовательно, средство важнее цели. Человек уже не цель, а материал для Его Величества Искусства (стиля). Vita brevis est, ars longa. В результате мы имеем «Кант VS «эстетический» комбат». «Чистое искусство» – это также идеология, также весьма неоднозначная, дискуссионная и агрессивная.

А бывает ли так, что идеологическая картина мира, которой придерживается художник, не противоречит научным (условно –кантианским) представлениям о ней? Бывает ли так, что картина мира определенного художника ближе к истине, чем остальные? Бывает ли так, что художник и доказывает, и убеждает одновременно, делая это на пределе человеческих возможностей? Бывает ли так, что идеология, а вместе с ней и произведение, переживают свое время?

Конечно, бывает. Когда мы говорим о классике, мы имеем в виду именно это. В случае совпадения позиций *ценности – идеи – мысли – образ – стиль* мы получаем шедевр, подлинную гармонию смысла и стиля. Таких шедевров в литературе мало. Они возникают тогда, когда поэту удается за счет личного ресурса усвоить сложнейшую гуманистическую картину мира и поделиться своей верой в нее с читателем. Универсальность идеологической картины мира становится художественным качеством произведения. Никто не называет А. Пушкина, М. Лермонтова, Л. Толстого или А. Чехова идеологами, а зря. Их творения в высшей степени идеологичны; но их идеологическая направленность незаметна именно потому, что универсальна: они включают в себя и библейский, и кантовский, и друнинский дискурсы. Все это мы видим, например, в стихотворении А. С. Пушкина «Я вас любил».

Ведь что такое «лишние люди», величайший феномен, открытый русской литературой, с точки зрения информационной технологии? Это личности, которые относились к себе, то есть к ресурсу человека в принципе, в кантианском ключе – как к цели; по этой причине для всех остальных, рассматривающих человека как средство, они были лишними, слишком умными. Тот, кто относится к себе и другим как к цели, обречен испытывать комплекс «горе от ума». Тип или модель «лишних людей» – колоссальный идеологический ресурс, дарованный нам великой литературой.

Наши классики дали потрясающие образцы умной литературы, которая пробуждает умные (противоречивые) чувства. Не игра интеллекта, а поиски Картины мира, которая стала культурным кодом русской цивилизации, – вот чем ценно творчество великих классиков.

Именно такая литература является элитарной. Именно такая литература необходима для изучения в школе и университете. Именно такая литература развивает мышление, и у учащегося, под чутким руководством учителя, появляется шанс обнаружить в себе личность.

Предлагаемые нами концептуальные определения и характеристики корректны в контексте определенной философской антропологии, в контексте идеологии, которую мы называем *персоноцентризм* [7].

В заключение предложим свое – персоноцентрическое – определение литературы. *Художественная литература* – это форма идеологии, которая представляет собой информационную технологию превращения идей в мыслеобразы (смысла – в чувство) с помощью стиля; в таком своем качестве литература является наиболее эффективным способом духовного производства человека, способом превращения индивида в личность, способом утверждения категорического нравственного императива.

## Библиографические ссылки


1. *Аристотель*. Поэтика // Соч.: В 4 т. / АН СССР. Ин-т философии. М., 1983. Т. 4. С. 645–680.

2. Идеология как феномен культуры и цивилизационный ресурс России: Монография. М.: «Снежный ком», 2023. [Электронный ресурс]. URL: https://mgutm.ru/2023/12/11/professor-kafedry-fsgt-vypustil-monografiyu-ob-ideologii/ (дата обращения: 1-31.10.2024).

3. *Андреев Анатолий.* Зачем нужны умные люди? Антропология счастья в эпоху перемен. Москва: Издательство АСТ, 2022. [Электронный ресурс]. URL: https://www.litres.ru/anatoliy-andreev/zachem-nuzhny-umnye-ludi-antropologiya-schastya-v-epohu-p/chitat-onlayn/ (дата обращения: 12.10.2024).

4. *Шаламов В.Т.* Собрание сочинений: в 4-х т. М., 1998. Т. 4. С. 375.

5. *Друнина Ю. В.* Стихи о войне. М., ЭКСМО, 2010.

6. *Тимофеев Л. И.* Основы теории литературы. М.: Просвещение, 1976.

7. *Андреев А. Н.* Персоноцентризм в классической русской литературе XIX в.: монография. М.: НИЦ ИНФРА-М, 2021.

## СУЧАСНАЯ ПЕСЕННАЯ ЛІРЫКА: ЖАНРАВАЯ ДЫНАМІКА, КАНТЭКСТ, АСАБЛІВАСЦІ ПАЭТЫКІ

**А. І. Бельскі**

*Доктар філалагічных навук, прафесар, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр-т Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, alesbelsky@yandex.by*

Разглядаецца песня як адметны тып верша і мегажанр, адзначаецца, што яна мае свой гісторыка-культурны і літаратурны кантэксты. Аўтар вызначае ў беларускай паэзіі лірычна-песенную плынь, акрэслівае некаторыя тэндэнцыі ў развіцці сучаснай песеннай лірыкі. Асноўная ўвага засяроджана на творчасці паэтаў-песеннікаў У. Мазго, Л. Пранчака, К. Цыбульскага, А. Бадака.

***Ключавыя словы:*** літаратурная песня; песенна-паэтычныя творы; мадэрнізацыя жанру; паэты-песеннікі; літаратурна-песенная традыцыя; музычнасць; спеўнасць; рытмічны малюнак верша.

## СОВРЕМЕННАЯ ПЕСЕННАЯ ЛИРИКА: ЖАНРОВАЯ ДИНАМИКА, КОНТЕКСТ, ОСОБЕННОСТИ ПОЭТИКИ

**А. И. Бельский**

*Доктор филологических наук, профессор, Белорусский государственный университет, пр-т Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, alesbelsky@yandex.by*

Рассматривается песня как отличительный тип стихотворения и мегажанр, отмечается, что она имеет свой историко-культурный и литературный контексты. Автор определяет в белорусской поэзии лирико-песенное течение, подчеркивает некоторые тенденции в развитии современной песенной лирики. Основное внимание сосредоточено на творчестве поэтов-песенников В. Мазго, Л. Прончака, К. Цыбульского, А. Бадака.

***Ключевые слова:*** литературная песня; песенно-поэтические произведения; модернизация жанра; поэты-песенники; литературно-песенная традиция; музыкальность; песенность; ритмический рисунок стихотворения.

## CONTEMPORARY SONG LYRICS: GENRE DYNAMICS, CONTEXT, FEATURES OF POETRY

**A. I. Belski**

*Hab. PhD, Professor, Belarusian State University, 4 Independence Avenue, 220030, Minsk, Belarus, alesbelsky@yandex.by*

The article considers the song as a distinctive type of poem and mega-genre, noting that it has its own historical, cultural and literary contexts. The author defines a lyrical and song trend in Belarusian poetry, outlines some trends in the development of modern song lyrics. The main attention is focused on the works of songwriters V. Mazgo, L. Pranchak, K. Tsybulsky, A. Badak.

***Keywords:*** literary song; song and poetic works; modernization of the genre; songwriters; literary and song tradition; musicality; songfulness; rhythmic pattern of the poem.

Беларуская лірыка канца XX – пачатку XXI ст. у стылёвым плане разнастайная, поліфанічная. У. Гніламёдаў у адпаведнасці з выяўленчым і выразнымі пачаткамі вызначае ў сучаснай беларускай паэзіі асноўныя мастацка-стылёвыя плыні, ён піша: «…мы выдзелілі б не менш шасці: лірыка-апавядальную, рамантычную, публіцыстычную, філасофска-аналітычную, мастацка-сінкрэтычную і ўніверсальна-інтэлектуальную» [1, с. 151]. У гэтай сувязі даследчык слушна гаворыць пра «прынцып дапаўняльнасці: агульны для ўсёй беларускай паэзіі мінулага лірыка-апавядальны стыль (з пэўнымі асабовымі варыянтамі) становіцца ўсяго толькі адной з яе стылявых плыняў, хаця і вельмі пашыранай» [1, с. 151]. У цэлым можна пагадзіцца з такім класіфікацыйным падыходам, узяць яго за аснову. Аднак, на наш погляд, паводле песеннага тыпу верша і жанрава-відавой адметнасці варта вылучыць адпаведна асобную стылёвую плынь – лірыка-песенную. На тое ёсць усе падставы. У беларускай паэзіі існуе надзвычай вялікі корпус песенных тэкстаў, многія з якіх ствараліся адмыслова ў жанры песні. Уласна кажучы, усё ў паэзіі і пачыналася з песні-малітвы, з народнай песні (песенна-інтымная лірыка, калядкі і інш.), якая сваёй гучальнасцю, вобразнасцю, той ці іншай стылёвай інтэнцыяй уплывала на літаратурна-мастацкую творчасць паэтаў: Ф. Багушэвіча, В. Дуніна-Марцінкевіча, Я. Купалу, Я. Коласа, М. Багдановіча, А. Гаруна і інш.

Пра спеўнасць, музычнасць, песеннасць беларускага паэтычнага слова напісана нямала. Так, В. Бечык даў свайму артыкулу пра П. Броўку красамоўную назву «Што сэрца праспявала…» [2, с. 4], ён заўважае ў лірыцы паэта «самыя тонкія душэўныя струны» [2, с. 10, 20]. Пра М. Танка і яго паэзію гэты ж крытык назваў артыкул «Песня аб Радзіме» [2, с. 22], дзе, у прыватнасці, захапляецца: «Вось як творацца гэтыя вершы-песні. З такой апантанасцю і з такім напалам…» [2, с. 23]. В. Бечык падкрэслівае ўменне Р. Барадуліна выказвацца «на самай пяшчотнай і шчымлівай ноце», адзначае яго паэтычнае майстэрства інтанавання, рытмастварэння, гукапісу («Захоча – … сугуччы ўвойдуць углыб радкоў; захоча – надасць імклівы рытм…»), звяртае ўвагу ў барадулінскай лірыцы на вельмі істотную мастацка-выяўленчую асаблівасць – «плыткі, музычны метафарызм» [2, с. 86, 87]. В. Бечык вылучае ў лірыцы Н. Гілевіча «песенна-меладычны пачатак» [2, с. 190], заўважае характэрную, тыповую ўнутраную інтэнцыю «ў паэтаў новага пакалення… нейкую ўнутраную музыку святла, радасці, прыгажосці…» [2, с. 208].

Можна таксама спаслацца на А. Лойку як даследчыка, тонкага знаўцу паэзіі, які неаднойчы робіць акцэнт на спеўнасці і музычнасці беларускага лірычнага слова, яго блізкасці да народна-песеннай мелодыкі. Вобразы і інтанацыі беларускага народнага меласу ён маркіруе ў паэзіі Е. Лось, А. Вялюгіна, Р. Барадуліна і іншых паэтаў.

А. Лойка ўмеў заўсёды разгледзець эстэтычна сутнаснае, ідэнтыфікаваць ключавыя моманты і фактары паэтычнага самавыяўлення аўтара, паказаць асаблівасці паэтыкі, творчага майстэрства. Ён мае рацыю, пішучы наступнае: «Песня Рыгору Барадуліну… дыктуе рэгулярна-песенную строфіку, рыфміку, інтанацыю» [3, с. 239]. Ды і сам Лойка-паэт у лірычнай творчасці дэманстраваў спеўнасць, меладычнасць гучання паэтычных радкоў. Невыпадкова яго вершы загучалі песнямі, ён стварыў «Гімн БДУ», паэтычна-музычную нізку твораў «Беларускае танга» і інш. Т. Мацюхіна ў артыкуле «Імпрэсіяністычнасць лірыкі Алега Лойкі», раскрываючы адметнасць творчай індывідуальнасці аўтара, вызначае такія рысы яго лірычнай паэзіі, як «музычнасць, гукавыяўленчасць… рытмічнасць малюнка» [4, с. 73]. Музыка і песня былі, можна сказаць, існасцю, страсцю, стыхіяй Алега Лойкі: ён любіў спяваць, іграў на акардэоне, а ўнутраны водгук яго – шчыры спеў сэрца, прачулыя лірычныя інтанацыі і мелодыі. Стан, вызначальную інтэнцыю яго самавыяўлення яскрава перадаюць наступныя радкі: «Бо сэрца на песню бярэцца – // На цэлы свет спяваць» [5, с. 100]. К. Цыбульскі, слухаючы Алега Антонавіча, як і многія іншыя студэнты, заўважыў у гаворцы-маўленні прафесара і паэта «абертоны яго меладычнага голасу» [4, с. 274]. А. Лойка называе старэйшага паэта і сябра М. Аўрамчыка паэт-сустрэча [3, с. 254], пра яго ж самога можна сказаць так: паэт-песня. Як, зрэшты, і пра яго вучняў: паэтаў-песеннікаў У. Мазго, К. Цыбульскага, А. Бадака.

Літаратурная (прафесійная) песня – традыцыйны і ўстойлівы жанр творчасці, яна пастаянна, нязменна прысутнічае ў беларускай і сусветнай культурнай прасторы. Трэба сказаць, што не заўсёды ёй аддавалі належнае сярод іншых жанраў, як і заставаліся недаацэненымі самі стваральнікі нацыянальнай песні. Аднак з цягам часу паэтычна-песенны жанр творчасці пачаў набываць культурна-каштоўнаснае значэнне і навуковае асэнсаванне, а сама беларуская песня набыла папулярнасць, шырокую вядомасць. Сярод аўтараў слоў былі П. Броўка, А. Куляшоў, М. Танк, А. Бачыла, А. Астрэйка, Н. Гілевіч, Р. Барадулін, Г. Бураўкін, А. Ставер, У. Карызна і іншыя таленавітыя паэты, і найперш дзякуючы таму, што выканаўцы песенных твораў – выдатныя спевакі, ансамблі, у першую чаргу тут трэба назваць «Песняры», «Сябры», «Верасы». Беларуская песня загучала, і яе падхапілі па ўсім Савецкім Саюзе. Сярод паэтаў-песеннікаў вылучаецца імя Адама Русака (1904–1987), аўтара знакамітых шлягераў «Бывайце здаровы», «Лясная песня» («Ой, бярозы ды сосны...»), «Не шукай», «Не за вочы чорныя» і інш. Ён – класік беларускай песні, па сутнасці з'яўляецца адным з заснавальнікаў літаратурна-песеннай традыцыі ў літаратуры і культуры Беларусі. Менавіта ў жанрава-эстэтычным кантэксце гэтай традыцыі трэба разглядаць творчасць сучасных паэтаў-песеннікаў. Пішучы пра А. Русака, харавы дырыжор і музыказнавец Г. Цітовіч выдатна патлумачыў феномен лірычна-песеннай творчасці гэтага паэта: «…у яго вершах-песнях адчуваецца ўнутраная музыка: між песенных радкоў тут нябачна прысутнічаюць лініі нотнага стану, на якім уяўляецца лад, рытм і інтанацыйныя контуры напеву» [6, с. 5].

Дзеля справядлівасці трэба сказаць, што масавая і эстрадная песня ў савецкі час былі шырока запатрабаванымі, тады цаніліся меладызм і сэнсавая нагрузка ў паэтычным тэксце, пакладзеным на музыку. На слыху былі імёны савецкіх і рускіх паэтаў-

песеннікаў М. Ісакоўскага, А. Фацьянава, Р. Раждественскага, А. Дзяменцьева, Я. Далматоўскага, М. Матусоўскага, М. Дабранравава і інш. Экстраардынарным фактам постсавецкага часу, які засведчыў надзвычайны фенаменальна-феерычны поспех і міжнароднае прызнанне песні як жанру, з'яўляецца прысуджэнне Нобелеўскай прэміі па літаратуры ў 2016 годзе паэту і спеваку Бобу Дылану «за стварэнне новых паэтычных выразаў у вялікай амерыканскай песеннай традыцыі» [7]. Гэта ўзнагарода ў культурных і літаратурных колах выклікала неадназначную ацэнку і крытыку.

Калі задацца пытаннем: а якіх больш за ўсё вершаваных тэкстаў створана паэтамі ў свеце – у жанравым плане, у тэматычным рэчышчы. І хоць не існуе такой статыстыкі, можна меркаваць, што песня – ці не самым распаўсюджаны, самы масавы жанр. І, напэўна, больш за ўсё напісана песень пра каханне. Паэтамі на розных мовах створана і пішацца вялікая колькасць песенных твораў, прытым у розных жанравых катэгорыях, мадыфікацыях: пачынаючы ад рамансаў і да сучаснага шансону ды, скажам, рок-песні. Па сутнасці вялікі комплекс ці сістэма песенна-паэтычных твораў – гэта мегажанр, які ўяўляе сабой шматаспектны аб'ект даследавання. Да таго ж адбываюцца інтэграваныя працэсы ўзаемадзеяння і жанравага сінтэзу пры стварэнні песенных тэкстаў, што абумоўлена развіццём найноўшай музыкальнай культуры, лічбавых тэхналогій, відэаіндустрыі, шоу-бізнесу, існаваннем пэўных падыходаў і стратэгій на радыё, трансфармацыяй моладзевай камунікацыі і інш.

Гісторыя беларускай песні ведае творчыя ўзлёты, свае дасягненні і набыткі. Новы этап актывізацыі літаратурна-песеннай творчасці адбыўся ў канцы XX ст., на хвалі духоўна-культурнага адраджэння, калі пачалі ладзіцца нацыянальныя музычныя фестывалі, конкурсы, канцэрты. Склалася творчая кагорта, цэлая плынь паэтаў-песеннікаў маладзейшага пакалення (Л. Прончак, Л. Дранько-Майсюк, А. Бадак, У. Мазго, К. Цыбульскі, М. Шабовіч і інш.).

Беларуская песня на сёння – з'ява неаднароднай, ахапіць усе яе жанравыя разнавіднасці і найноўшыя музычныя кірункі (скажам, рэп, пот-панк, хард-рок, фолк-метал і інш.), у межах якіх створаны тэксты, не ўяўляецца магчымым. Мы звернемся да традыцыйнага жанру літаратурнай песні і паспрабуем высветліць, якія новыя працэсы і тэндэнцыі адбываюцца ў сучаснай песеннай лірыцы. Зрэшты, адну з такіх першых спроб зрабіла больш як дзесяць гадоў таму І. Бароўская, якая з'яўляецца актыўнай даследчыцай беларускага песеннага матэрыялу [8].

У класічных традыцыях песеннага жанру працуюць паэты-песеннікі У. Мазго, К. Цыбульскі, Л. Прончак, А. Бадак. Дарэчы, усе названыя паэты ў свой час сталі аўтарамі зборнікаў літаб'яднання філфака БДУ «Узлёт», якім кіраваў прафесар і паэт А. Лойка. Імёны У. Мазго, К. Цыбульскага, Л. Прончака фігуруюць у «Вёснах» (1977), А. Бадак выступае з вершамі ў «Вуснах» (1985). Тэматыка вершаў-песень паэтаў у асноўным традыцыйная, пераважаюць у іх творчасці тэмы Радзімы і кахання. Лірычнасць, пранікнёнасць і экспрэсіўнасць паэтычнага слова выяўляецца ў песенных тэкстах К. Цыбульскага «Дымок Радзімы», Л. Прончака «Беларусь, ты – мая!», У. Мазго «Малая радзіма». К. Цыбульскі так выказвае сваё пачуццё духоўнай еднасці з радзімай: «Дымок Радзімы такі салодкі, // Дымок Радзімы, жылі тут продкі. // Дымок радзімы, ён родны самы, // Бо тут калыска і рукі мамы» [9, с. 18]. Феномен сінтаніі

фикации на европейском континенте шло, очевидно, с севера, охватывая сначала протестантские страны Германию, Данию, Швецию – затем оно приходит в Россию [12, с. 9]. Этот процесс можно представить на следующей схеме:

Русская силлабо-тоника в свою очередь оказывает влияние на соседние славянские литературы, прежде всего на ближайшие – украинскую и белорусскую, которые также взаимодействуют между собой:

Надо сказать, что ямбы у украинских поэтов появляются несколько раньше, чем в Белоруссии, уже в шестидесятые годы XVIII века обнаруживаются первые опыты создания украинского ямбического 4-стопника (Я4). Они представляли собой ученические стихи, выполненные явно под русским влиянием в стенах Киево-Могилянской академии, например, И. Максимовичем. Первым большим «нешкольным» сочинением можно считать перевод пародийной ироикомической поэмы Н. П. Осипова «Вергилиева Енеида, вывороченная наизнанку», выполненный И. П. Котляревским в 1798 г. Белорусский ямб появляется лишь в XIX веке также благодаря переложению «Энеиды наизнанку», которое осуществил, вероятно, В. Ровинский предположительно до 1837 г. [4; 5]. Таким образом, как в украинской, так и в белорусской поэтической традиции ямб возникает как размер, обслуживающий низкий жанр, комедию. Такой генезис отличает его от русского стиха, где 4-стопник сразу же использовался в высокой поэзии, торжественных и духовных одах.

Думается, эта особенность происхождения Я4, вернее, его вхождения в украинскую и белорусскую традицию, связана с тем, что короткий стих, каким является 4-стопник, воспринимался здесь – в силу действия достаточно мощной латинско-польской силлабической традиции – как размер, пригодный лишь для низких жанров. Сознание белорусских и украинских поэтов тогда еще не могло принять в качестве эпи-

ческого стиха ямбизированный 8-сложник. Высокая поэзия, как известно, должна обслуживаться долгими размерами, для нее подходит гендекасиллаб, александрийский стих и/или 13-сложник. Переворот, сделанный французскими поэтами, в результате которого короткий 8-сложник стал восприниматься как «серьезный» размер, здесь еще не мог быть осмыслен.

Вслед за французами фламандские и брабантские поэты, превратив 8-сложник в 4-стопный ямб, сохранили за ним широкий поэтический функционал и, главное, его «новую» роль – служить высокой поэзии. В таком виде этот размер приобрели голландские стихотворцы, а далее немецкие и за ними через Ломоносова – русские. При этом в Украине и в Белоруссии такая практика употребления короткого стиха еще не была освоена, ей сопротивлялась предшествующая традиция.[3] Здесь 4-стопный ямб, видимо, воспринимался еще в достаточной степени через оптику классической силлабики, как короткий стих, непригодный для высокого слога. Поэтому он и использовался в бурлескной поэме. Связь короткого ямбического стиха с «несерьезной» лирикой – родимое пятно украинского и белорусского 4-стопника.

Важной отличительной особенностью ранних русских ямбов можно считать не только их связь с высокой поэзией, но и весьма высокую степень «чистоты» реализации метра (эти вещи, безусловно, взаимосвязаны): запрет на частое использование пиррихиев (у раннего Ломоносова), на переакцентуацию и на безударную рифму (пропуск ударения на финальном сильном месте (СМ)). При этом два последних запрета сохранялись относительно долго. А вот первый запрет, на частые пиррихии, был снят полностью уже к 1750-м гг. Однако в начале своего пути русский Я4 по уровню реализации метра напоминал немецкие образцы, см. график:




*Рис. 1.* Полноударность русских и немецких ямбов

[3] Вдобавок надо сказать, что в отличие от русского стиха, где с приходом силлаботоники силлабическая традиция быстро закончилась, украинская и белорусская поэзия еще долго сохраняли приверженность силлабике.

Рисунок 1 показывает тесную связь русского стиха с немецким, которая проявляется в вопросах «чистоты» метрической реализации ямба, что видно при сравнении данных по немецкому Я4 и ранним сочинениям Ломоносова – количество полноударных строк практически одинаково 75,0% и 75,7%, этому соответствует сходство в показателях строк с пиррихиями. Однако картина существенно меняется, когда мы переходим к сопоставлению зрелых сочинений Ломоносова с немецким стихом. Такое изменение выглядит как зеркальная противоположность как немецкому Я4, так и ранним русским ямбам.

Причины такой стремительной эволюции обсуждались не одним поколением стиховедов [3; 9; 11]. Наиболее новая версия процесса «раскрепощения» русского 4-сопника была описана автором данной статьи [7, с. 398–399].

Если сравнить частоты распределения образцов нидерландских, немецких и русских полноударных ямбов, которые в среднем встречаются в крупных классических произведениях, картина будет следующая:

| | «чистые» ямбы | с пиррихиями |
|---|---|---|
| Doorlúchte Ríjn, mijn zóete dróom | **53,8 %** | **46,2%** |
| In déine Hánd und gróße Mácht | **74,5%** | **25,5%** |
| Я ца́рь – я ра́б – я че́рвь – я бо́г! | **27,7%** | **72,3%** |

Наименее полноударным в этой тройке выглядит нидерландский стих (первый пример), всего 53,8% полноударных срок, обычно от 51% до 55%. То есть голландскому уху для сохранения метра требуется паритет чистых ямбов в тексте, когда строки типа «Doorlúchte Ríjn, mijn zóete dróom» набирают более 50%. Немцу (второй пример) для этого требуется больше метрических усилий, дающих до 74,5% и даже до 75% «чистых» строк. Русскому слуху (последний пример) этот паритет уже не требуется, порог полноударности опускается ниже 30%; как видим, вполне хватает и 27,7%.

Н. Г. Чернышевский, сравнивая языки (русский и немецкий), писал, что русскому языку двусложные размеры, ямб и хорей, несвойственны, а свойственны трехсложники, дактили, амфибрахии и анапесты, так как русские слова длинные, их средняя длинна превышает три слога, немецкие – короче, поэтому немцам подходят ямбы и потому-то они у них более ударны [10]. То есть немецкий ямб «чище» русского потому, что в их языке довольно мало пиррихиеобразующих слов. Так ли это на самом деле, в этом ли кроется причина ритмической свободы стиха? Давайте сравним средний слоговой объем русских, белорусских и украинских слов с немецкими, нидерландскими и английскими,[4] см. рис. 2.

[4] 4-стопный ямб был мало распространен в английской поэзии. Английская традиция предпочитала нерифмованный или рифмованный 10-сложник, преобразованный в 5-стопный ямб, который употреблялся в драме и жанрах высокой поэзии.




*Рис 2.* Средний слоговой объем ритмических слов в разных языках

По нашим данным, русское ритмическое (фонетическое) слово[5] по объему слогов практически равно белорусскому – 2,9 слога; украинское чуть меньше – 2,8. При этом немецкое слово еще короче – 2,6 слога, а нидерландское короче немецкого – 2,5 слога. В этом ряду самое короткое английское слово с объемом 2,4 слога. Если следовать логике Чернышевского, то именно английский ямб должен быть самым полноударным, ведь английские слова наиболее короткие. При этом нидерландские ямбы должны быть более «свободными», чем английские, а немецкие еще более раскрепощенными, чем нидерландские. Но это совершенно не так, а совсем наоборот. Рассмотрим следующую диаграмму (рис. 3).




*Рис. 3.* Уровень полноударности 4-стопного ямба в разных поэтических традициях[6]

[5] Ритмическим или фонетическим словом мы называем комплекс слогов, объединенных одним главным ударением.

[6] На графике приведены данные по английскому стиху Дж. Бейли [1].

Анализ данных, представленных на рис. 3, в сравнении с рис. 2 позволяет усомниться в гипотезе Чернышевского. Можно сказать, что длина слов не имеет прямого влияния на степень ритмической свободы стиха.

Английский ямб выглядит куда свободнее, чем немецкий, и нидерландский тоже свободнее немецкого: там и там уровень полноударности ниже немецких показателей. Хотя английские и нидерландские слова короче и, казалось бы, пиррихиев у англичан и голландцев должно быть меньше, чем у немецких поэтов. Но это не так, немецкий ямб оказывается более строгим, чем английский и нидерландский. И это несмотря на бóльшую длину немецких слов. Строже только ранние ямбы Ломоносова (1741 г.), и это опять-таки несмотря на то, что в русском языке слова заметно длиннее, чем в немецком, нидерландском и английском.[7]

Любопытно, что украинские слова немного короче русских, при этом пиррихиев в украинском ямбе заметно больше, и уровень полноударности ниже. В белорусском ямбе он оказывается еще ниже, хотя белорусское слово равно русскому по слоговому объему. Очевидно, тут дело не столько в языке, сколько в традиции и, вероятно, в каких-то более глубоких причинах, связанных с процессом версификации [13; 14].

Всех причин, приведших к такому распределению полноударных строк в разных традициях, использующих метрический стих, мы пока не знаем, их поиск требует более детального сравнительного изучения.[8] Тем не менее, представленные результаты позволяют наблюдать тенденцию к развитию «чистоты» метрического стихосложения от английского стиха до немецкого и крайне высокой степени реализации метра в ранних русских ямбах 1741 г. Далее в творчестве Ломоносова наступает спад метрической напряженности, в 1743 г. степень реализации метра сближается с показателями немецкого стиха, затем после 1750 г. в этом отношении наступает раскрепощение русского стиха: уровень чистых ямбов становится ниже 30%. Следует заметить, что украинский и белорусский стих продолжают процесс, наметившийся в русском Я4, а именно, тенденцию к освобождению от чистоты реализации метра – уровень полноударности стиха украинские и белорусские поэты продолжают понижать.

Таким образом, континентальная силлабо-тоника,[9] сформировавшаяся прежде всего в Нидерландах, укрепляется в немецкой поэзии, достигая вершин «чистоты» метрической реализации. Далее, попадая в восточнославянские литературы, континентальная модель реализации метра (более строгая, чем английская) начинает разрушатся. Хотя сначала, у раннего Ломоносова, она достигает своего апогея (что, вероятно, связано с определенными установками экспериментального характера), но очень скоро происходит деформация континентальной модели, сначала в русском стихе, далее в других восточнославянских традициях. Этот процесс касается, очевидно, не только соотношения чистых и пиррихиесодержащих строк, но также пропорции чистых ямбов и строк с переакцентуацией:

[7] См. также наши работы [6, с. 68; 12, с. 13–14].

[8] Отчасти оно было начато в работе М. А. Красноперовой и Е. В. Казарцева [15].

[9] Термин введен автором данной статьи ранее [12, с. 4].

Пространній пилью путь димится,
Лежит сих гор что чрез хребет,
Воздух как в ***<u>тумане</u>*** всем зрится,
От ног земля вся там ревет.

*И. Максимович*

В этом примере из ранних украинских ямбов заметны два случая переакцентуации в третьей строке, которые «ломают» метр, почти превращая ямб в хорей: первый в слове «возду́х», второй в слове «ту́ман». Если первое слово еще можно произнести с ударением на втором слоге, сохраняя ямб, то слово «туман» никогда не имело ударения на первом слоге (ни в русском, ни в украинском языках), это явное нарушение метра, очень сильный перебой. Подобные обструктивные нарушения не практиковались ни немецкими, ни русскими поэтами. Однако были присущи английской лирике [14]. В украинском и белорусском метрическом стихе, как видно, переакцентуация также получила развитие, впрочем, как и безударная рифма.

Итак, в процессе распространения силлабо-тоники на восток европейского континента усиливаются не только конфирмативные формы отступления от метра (повышается частота пиррихиев), но появляются и метрически обструктивные явления, такие как переакцентуация. В целом, идет последовательное разрушение континентальной модели реализации метра, установившейся в Германии. Ямб расшатывается, в результате метрический стих восточных славян по ряду параметров (высокий процент пиррихиев, наличие переакцентуации) сближается с английским стихом.

## Библиографические ссылки


1. *Bailey J.* Toward a Statistical Analysis of English Verse. The Iambic Tetrameter of Ten Poets. Grüner, 1975.

2. *Гаспаров М. Л.* Очерк истории европейского стиха. М.: Наука, 2003.

3. *Жирмунский В. М.* О национальных формах ямбического стиха // Теория стиха. Л.: Наука, 1968. С. 7–23.

4. *Земскова Т. А., Казарцев Е. В.* Становление и эволюция белорусского 4-стопного ямба // Russian Literature, 2022. № 134. С. 51–71.

5. *Казарцев Е. В., Давыдова А. Ю.* О происхождении и природе украинских ямбов в сравнении с русским стихом // Russian Literature, 2022. Т. 134. С. 23–49.

6. *Казарцев Е. В.* Сравнительное стиховедение: метрика и ритмика // СПб.: Изд-во РГПУ им. А. И. Герцена, 2017.

7. *Казарцев Е. В.* К истории появления пиррихиев в русском ямбе // Russian Literature, 73. 2013. P. 379–409.

8. *Казарцев Е. В.* Ритмическое представление текста в сравнительных стиховедческих исследованиях // Russian Linguistics. 2018. № 42 (2). С. 271–287.

9. *Тарановский К. Ф.* Ранние русские ямбы и их немецкие образцы // Русская литература XVIII века и её международные связи. Сб. 10. Л.: Наука, 1975.

10. *Чернышевский Н. Г.* Полное собрание сочинений. Т. II. Статьи и рецензии 1853–1855 гг. М.: Наука, 1949.

11. *Шапир М. И.* У истоков русского четырехстопного ямба: генезис и эволюция ритма (К социолингвистической характеристике стиха раннего Ломоносова). Philologica, 1996, № 5–7, 69–101.

12. *Kazartsev E.* Iambic Verse in Different Literary Traditions // Glottotheory. 2021. 13.1. P. 1–17.

13. *Kazartsev E.* Quantitative und vergleichende Versforschung – Ausweg aus der Krise? // Jahrbuch für Internationale Germanistik. 2016. No. 1. P. 53–72.

14. *Kazartsev E.* Overaccentuering en de ontwikkeling van de alternerende versificatie // IVG-Akten – 29 Oudere Nederlandse Letterkunde (Ältere Niederländische Literatur). Warsz., Berlin, NY, Wien, Brux., Oxford, Bern, Frankfurt am Main : Peter Lang, 2012. P. 251–257.

15. *Krasnoperova M., Kazartsev E.* Reconstructive simulation of versification in comparative studies of texts in different languages (theoretical aspects and practice of application) // Frontiers in Comparative Metrics. Peter Lang, 2011. P. 97–120.

# РАЗДЗЕЛ 1

# АКТУАЛЬНЫЯ ПЫТАННІ ТЭОРЫІ ЛІТАРАТУРЫ І СУЧАСНАЙ ЖАНРАЛОГІІ

## НАВЕЛА УЛ. СЦЯПАНА Ў КАНТЭКСЦЕ ЖАНРАВАЙ ТРАДЫЦЫІ

**Т. А. Аляшкевіч**

*Кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы,*
*вул. Ажэшка, 22, 4, 230023, г. Гродна, Беларусь,*
*arsdeta@gmail.com*

Артыкул прысвечаны жанру навелы ў творчасці У. Сцяпана. Прадметам вывучэння выступаюць элементы паэтыкі навелы пісьменніка. Увага актуалізуецца на асаблівасцях сюжэтабудовы, падзее аповеду, геройным плане. Адзначаецца, што ў цэлым навела У. Сцяпана развіваецца ў рэчышчы жанравай традыцыі, аднак паглыбленне псіхалагізму, выкарыстанне прыёму рэтраспекцыі, увядзенне своеасаблівага героя-рэчы абнаўляе навелу, што і пацвярджае закон аб памяці жанра, сфармуляваны М. Бахціным.

***Ключавыя словы:*** навела; пуант; жанравая традыцыя; герой-рэч; псіхалагізм.

## НОВЕЛЛА В. СТЕПАНА В КОНТЕКСТЕ ЖАНРОВОЙ ТРАДИЦИИ

**Т. А. Олешкевич**

*Кандидат филологических наук, доцент,*
*Гродненский государственный университет им. Янки Купалы,*
*ул. Ожешко, 22, 4, 230023, г. Гродно, Беларусь,*
*arsdeta@gmail.com*

Статья посвящена жанру новеллы в творчестве В. Степана. Предметом изучения выступают элементы поэтики новеллы писателя. Внимание актуализируется на особенностях сюжетостроения, событии рассказа, геройном плане. Отмечается, что в целом новелла В. Степана развивается в русле жанровой традиции, однако углубление психологизма, использование приема ретроспекции, введение своеобразного героя-вещи обновляет новеллу, что и подтверждает закон о памяти жанра, сформулированный М. Бахтиным.

***Ключевые слова:*** новелла; пуант; жанровая традиция; герой-вещь; психологизм.

# VL. STEPAN'S SHORT STORY IN THE CONTEXT OF GENRE TRADITION

**T. A. Aleshkevich**

*PhD, Ass. Professor,*
*Yanka Kupala State University of Grodno,*
*22 Azheshka Street, 230023, Grodno, Belarus,*
*arsdeta@gmail.com*

The article is devoted to the novella genre in the works of Vl. Stepan. The subject of study is the poetic elements of the writer's novella. Attention is actualized on the features of the plot structure, the event of the story, the hero's plan. It is noted that, in general, U. Stepan's novella develops in line with the genre tradition, however, the deepening of psychologism and the introduction of the hero-thing renews the novella, which confirms the law of genre memory formulated by M. Bakhtin.

***Keywords:*** short story; puant; genre tradition; hero-thing; psychology.

Літаратуразнаўчая навука не раз задавалася пытаннем пра размежаванне жанраў навелы і апавядання. Аднак у навуковай рэфлексіі да сённяшняга дня адсутнічае дакладная ідэнтыфікацыя не толькі названых жанраў, але і іншых форм малой эпікі. Тым не менш, праведзены айчыннымі і замежнымі навукоўцамі тэарэтычны аналіз навелістычнага дыскурса ёсць спроба зацвердзіць самастойны статус навелы як жанра малой прозы, які, супадаючы па многіх аспектах з апавяданнем, усё ж у сваім комплексе структурных прыкмет мае кананічную кампазіцыйную сюжэтабудову, адрозную падзею аповеду і адпаведную структуру геройнага плана, своеасабліва адмежаваную ад аўтара і чытача.

Жанр навелы ў галіне паэтыкі і ў сферы мастацкага зместу ўзыходзіць найперш да сярэдневяковага анекдота. Аднак, узнікнуўшы на этапе рытарычнай славеснасці, яна якраз на самым пачатковым этапе станаўлення і адрозніавалася нестабільнасцю свайго мастацкага цэлага, варыятыўнасцю структураўтвараючых элементаў і камунікатыўных стратэгій. Іншымі словамі, гісторыя станаўлення жанру навелы, у адрозненне ад гісторыі такіх жанраў як, напрыклад, ода, жыціе, трагедыя, зваротная: адбываецца паступовае станаўленне канона жанру навелы, які канчаткова афармляецца толькі на самых позніх этапах свайго бытавання прыкладна ў канцы XVIII стагоддзя.

Кароткая формула навелы неаднаразова прыводзілася ў працах тэарэтыкаў з апорай на ідэі Гётэ. «Что ж иное представляет собой новелла, как не случившееся неслыханное происшествие?» [1, с. 388], разам пералічваюцца і асноўныя прыкметы жанру – «"новизна случая", "остроумный поворот", схожесть с анекдотом", "роль случая в разрешении противоречий как внутри персонажей, так и между их намерениями и обстоятельствами жизни"» [1, с. 388] і іншыя.

Беларуская навелістыка, калі не атаясамліваць навелу з апавяданнем, і не лічыць дадзеныя паняцці сінонімамі, а разумець пад навелай аповед, асноўнай асаблівасцю якога з'яўляецца пуант, выглядае адносна сціплай ў параўнанні з іншымі жанрамі. Яна прадстаўлена ў творчасці Ф. Багушэвіча, Я. Коласа, М. Гарэцкага, Я. Скрыгана, Я. Брыля, А. Мрыя, К. Крапівы, В. Карамазава і іншых. Распачаўшыся ў канцы XIX ст. і асабліва актуалізуючыся на пераломе стагоддзяў, айчынная навела, у цэлым

следуючы жанравай традыцыі, часам адступае ад жанравага канона: назіраецца размыванне яе традыцыйных жанравых рамак. Аднак такі працэс скіраваны хутчэй не на разбурэнне канона, а на патрэбу своечасова адгукнуцца на супярэчлівую і няпростую атмасферу часу. Сучасная беларуская навела адыходзіць ад камізму і гумару, як, здаецца, і ў цэлым навела сусветная. Перавага трагічнага пафасу, парадаксальнасць сітуацыі пашыраюць навелістычныя межы, што бачыцца абсалютна натуральным і заканамерным у эпоху творчай мадальнасці. У сувязі з гэтым можна згадаць выказванне М. М. Бахціна, які адзначаў, што «жанр возрождается и обновляется на каждом новом этапе развития литературы и в каждом индивидуальном произведении данного жанра», «жанр живет настоящим, но всегда помнит свое прошлое, свое начало» [2]. Калі зрухі ў змястоўным кампаненце сюжэтабудовы відавочныя, то зрухі ў знешняй кампазіцыі сюжэта (выкарыстанне прыёма рэтраспекцыі, незавершанасць фінала і інш.) дыктуюцца якраз вышэй названымі зрухамі.

Звернемся да навелы Уладзіміра Сцяпана, аднаго з сучасных беларускіх аўтараў, чые творы, што ўкладаюцца ў навелістычныя рамкі, сведчаць пра сапраўднае майстэрства пісьменніка, следаванне жанравай традыцыі і натуральнае яе абнаўленне новым зместам. У цэлым У. Сцяпана называюць майстрам кароткага жанру. Аднак калі гаварыць пра створаныя ім навелы, то сваім зместам яны часам выходзяць за межы адлюстраванай падзеі, пашыраючы прастору і «создавая новое видение жизненной ситуации, убеждая в то же время читателя в неполноте и в относительности всяких готовых норм и моральных критериев» [1, с. 392].

У навеле «Я сёння ў школу не прыйду» [3], якая бачыцца нам вельмі ўзорнай у адлюстраванні сюжэтнага разгортвання яе асіметрычнай структуры, мінімальны аб'ём сюжэта кампенсуецца паглыбленнем псіхалагічнага зместу [4]. У творы выяўляецца пэўны збег падзей, які якраз і паслужыў нагодай для аповеду гэтай гісторыі. Адпаведна вылучылася і асоба апавядальніка, якая займае ў адрозненне ад аўтара жыццёва актыўную пазіцыю. Пра падзеі, якія мелі адбыцца ў лёсе герояў-вяскоўцаў, апавядальнік і чытач ведаюць часткова. Падзея, што разгортваецца на пярэднім плане, – рыбакі-браканьеры прыйшлі на возера знайсці ў ім свае загадзя растаўленыя сеткі – здаецца будзенай і аднастайнай. Напружвае толькі атмасфера абранага часу – моцны туман, які замінае пошукам рыбакоў. Іншая падзея, радыкальная, якая якраз і паслужыла прычынай адлюстраванай на першым плане падзеі, высвятляецца ў самым канцы твора. Гэтая падзея-пуант. Яна спараджае яшчэ адну падзею – падзею пераасэнсавання, аднак не столькі самой сюжэтнай падзеі пошукаў рыбацкіх сетак, колькі прымушае па-іншаму прыслухацца да галасоў героя-апавядальніка і рыбакоў, іх паводзін, узеамаадносін паміж героямі і суаднесці іх з абсалютна нечаканай падзеяй – са смерцю маці падлетка – больш за тое, паспрабаваць ураўнаважыць пуантычную падзею з усім сюжэтным дзеяннем. Героі твора – з аднаго боку апавядальнік, з другога – бацька з сынам – не здагадваюцца аб прысутнасці адзін другога. І не з прычыны туману (туман, лічым, выступае дадатковай, вельмі важкай акцэнтуацыяй дыстанцыі паміж героем-апавядальнікам і астатнімі героямі навелы), а з прычыны ўмовы для ўзнікнкння пуанта. Здаўна туман лічыцца сімвалам нявызначанасці, эмблемай моцы, якая блытае і прыхоўвае ісціну ад назіральніка. Гэта не проста дыстанцыя, якая вымяраецца метрамі, гэта дыстанцыя свядомасная, дыстанцыя, якая якраз і дае магчымасць стварыць другасны пункт погляду на адлюстраваную на першым плане падзею. Фраза, якую выкажа хлопчык у фінале – «*Вольга Пятроўна, я сёння ў школу не*

*прыйду… Мамка памерла…*» [3] – абсалютна нечаканая, а таму прымушае звярнуцца да ўсяго папярэдне сказанага, пераасэнсаваць яго.

У фінале твора становіцца зразумелым, чаму ў такую непагадзь героі ўсё ж рушылі на возера, а таксама па-іншаму ўспрымаюцца выказаныя апавядальнікам словы: «*Было ў гэтых гуках, тумане, возеры, мокрым трыснягу, рыбе, сетках і галасах бацькі з сынам-падлеткам такое адвечнае і знаёмае, што думалася – адбываецца гэта ўсё сто, ці нават тысячу гадоў назад. Было ж гэта возера і тады… І плылі па ім ў хісткім чаўне рыбакі – бацька з сынам, і выбіралі свае сеткі… І радаваліся злоўленай рыбе, і неслі яе дамоў, каб накарміць сям'ю…*» [3]. Такая заўвага дае зразумець, што, сапраўды, знешне ў жыцці вяскоўцаў-рыбакоў нічога не змянілася, нават такая падзея, як смерць маці, не ўнесла перамен ў звычайны ход іх жыцця. Але ў той жа час выкарыстаныя мастацкія дэталі пачынаюць «працаваць» на ўзмацненне драматычнага пафасу ўсяго твора: «*Спачатку пачуў ціхае і* ***аднастайнае плёханне*** *вёслаў*», затым «…*было чутно, як* ***сыпаліся кроплі*** *з вясла, як* ***уздыхаў*** *падлетак*» (кроплі ёсць метафара слёз), «…***туман адно вакол***».

Кампазіцыя сюжэта пачынаецца з экспазіцыі, у якой чытач знаёміцца з героямі і з асноўнымі абставінамі падзеі. Завязка дзеяння працягвае развіццё сюжэта («*Нябачная лодка набліжалася да майго берага. Падумаў (узрадавана), што дурняў на белым свеце хапае, што вось яшчэ адзін рыбак плыве, і гэткі кастрычніцкі туман яго не спыніў*» [3]), які, аднак, крыху замаруджаны: нейкі аднастайны дыялог бацькі і сына, з якога ўсё ж цяжка зразумець, з якой нагоды менавіта зараз спатрэбілася перагледзіць сеці – «*Гэта ж столькі людзей збярэцца, і ўсіх трэба накарміць…*» [3]. Аднак такога развіцця падзеі дастаткова для "разгону" перад фінальным пуантам. І нарэшце сам пуантычны фінал твора, той эмацыянальны выбух, тая кропка біфуркацыі, якая робіць дадзены аповед менавіта навелістычным.

Калі навела «Я сёння ў школу не прыйду» вытрымана ў жанравай традыцыі, то наступная – «Дом» – ілюструе абнаўленне жанру з прычыны пераасэнсавання пісьменнікам яго магчымасцей і надання жанру новага сэнсу.

Першае, што звяртае на сябе ўвагу ў творы, – гэта не зусім прывычны протаганістычны полюс навелы. Галоўным персанажам выступае дом, увядзенне якога ў тканіну твора сталася цікавым мастацкім рашэннем у навеле. Праз антрапамарфізацыю, нават адухаўленне дома пісьменнік вяртае цікавасць да рэчаў, падкрэслівае тым самым, што акрамя чалавека ёсць і іншыя важныя формы існавання, што важным аказваецца не толькі дух, але і матэрыя. у пэўнай ступені тут прасочваецца крытыка гуманізму. Спроба У. Сцяпана ўбачыць у рэчы нешта большае сугучна ідэям М. Хайдэгера, якога цікавілі рэчы вакол нас, іх маніфестацыя, роля ў жыцці чалавека. У беларускай літаратуры прадаўжальнікам ідэі рэчыўнасці быў Алесь Разанаў, які неаднаразова даводзіў, што рэчы ёсць апошняе цела людзей, якое жыве найдаўжэй.

Тым самым атрымліваеецца, што, насуперак канону навелы, у цэнтры ўвагі становіцца не падзея, а хутчэй сам герой-дом, які аказаўся ўцягнутым у сюжэт твора. І аўтар, хутчэй, акцэнтуе ўвагу менавіта на псіхалагічным складніку яго ўчынкаў. У навэле даволі падрабязна апісваецца працэс рабавання дома, з якога з'ехалі гаспадар і астатнія жыхары. Пры гэтым выяўленчы модус супраціўлення рабаўнікам з боку дома ствараецца пры дапамозе трапных мастацкіх дэталей, падрабязнага іх апісання. Здаецца, апавядач вядзе нас і пакрокава завастрае ўвагу на «гвалце», які чыніцца над

домам: «*падлога ўздыхнула і зарыпела*», «*дом прачнуўся, спахапіўся, зніякавеў, спалохаўся…заціхаўся і сціснуўся, ды так, што зніклі нават вузенькія шчыліны ў падлозе паміж масніцамі*» [5, с. 46].

Аднак ўся падзея глядзіцца парадаксальнай на фоне іншай падзеі, пра якую чытач і ўсе героі твора даведваюцца на прыканцы навелы. Дом змагаўся ўсей сваёй сутнасцю да канца, каб застацца некранутым, каб застацца «жывым», каб яму было чым пахваліцца перад сваім гаспадаром, каб можна было даказаць, што ён служыць яму ўвесь час верай і праўдай. У фінале твора для усіх герояў і чытача становіцца зразумелым, што намаганні дома былі марнымі: усе яго «*жыхары з'ехалі на ПМЖ*» [5, с. 49], і расказаць пра сваю барацьбу, пра сваё супраціўленне, нават, калі б дом здолеў, ужо няма каму: «*З усяго пачутага сёння вялікі дом, як не намагаўся, а зразумець, што такое ПМЖ, – не мог*» [5, с. 49]. Усё, дзеля чаго было прыкладзена столькі намаганняў, дарэмна, у чым увесь парадокс навелы і сканцэнтраваны.

Дом без гаспадара – гэта не ёсць дом, гэта проста будынак, такі нічыйны. Вялікі дом у канцы твора памірае, пра што трапна даведзена ў наступным выказванні: «*У **выстылым** доме на верандзе было насыпана **мёртвага** дубовага лісця*» [5, с. 49].

Навелы У. Сцяпана ахутаны змрочным пафасам, касмічнай самотай. Праблемы, якія закранаюцца ў творах, вечныя, субстанцыянальныя. У цэлым сваёй сюжэтабудовай навелы У. Сцяпана адпавядаюць жанраваму канону. У іх аснове ляжыць адзін пэўны эпізод з жыцця герояў, які імкнецца да нечаканай развязкі. Хоць ёсць і аўтарскія адступленнні ад яго, напрыклад, у плане геройнай кампазіцыі, завастрэнні псіхалагічнай абмалёўцы ўчынкаў і паводзін героя, ужывання прыёму рэтраспекцыі, што мае месца найперш ў навеле «Дом», але не толькі. Спектр названых сродкаў выкарыстоўвае ў сваім арсенале апавяданне. Аднак пуант, які прысутнічае ў навелах У. Сцяпана, пераважае над усімі іншымі элементамі паэтыкі твора, што і дае права сцвярджаць пра іх навелістычную прыроду.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Теория литературы: Учеб. пособие для студ. филол.фак. высш. учеб. заведений: В 2 т. / Под ред. Н. Д. Тамарченко. Т. 1: Н. Д. Тамарченко, В. И. Тюпа, С. Н. Бройтман. Теория художественного дискурса. Теоретическая поэтика. М. : «Академия». 2004.

2. *Бахтин М. М.* Проблемы поэтики Достоевского. М. : 1979. С.122.

3. *Сцяпан У. А*. Я заўтра ў школу не прыйду [Электронный ресурс] // Дзеяслоў. № 125. 2023. С. 89 – 90. URL: https://dziejaslou.by/sciapan125/ (дата обращения : 01. 10. 2024).

4. *Кожинов В. В*. Новелла // Словарь литературоведческих терминов. Просвещение : 1974. С. 239–240.

5. *Сцяпан У. А*. Дом // Хвалі. Мінск : Мастацкая літаратура. 2019. С. 45–49.

# МАДЭРНІСЦКІЯ ТЭНДЭНЦЫІ Ў БЕЛАРУСКАЙ І ПОЛЬСКАЙ ПАЭЗІІ ПАЧАТКУ ХХ СТ.

**А. А. Брусевіч**

*Кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы,*
*вул. Ажэшка, 22, 230023, г. Гродна, Беларусь, brusevich@tut.by*

Разгледзець некаторыя кропкі судакранання паміж беларускай і польскай паэтычнымі парадыгмамі, якія на пачатку ХХ ст. узялі курс на збліжэнне з літаратурай еўрапейскага мадэрнізму. Мадэрнісцкая хваля абнаўлення і развіцця беларускай і польскай паэзіі на дадзеным этапе была выклікана інтэнсіўнымі эстэтычнымі пошукамі, спробамі і эксперыментамі найбольш перадавых і крэатыўных аўтараў, нетрывіяльнымі творчымі ідэямі і поглядамі, што прывяло да паглыбленага разумення складанасці і тонкасці паэтычнага мастацтва, пашырэння яго межаў і даляглядаў. Звяртаецца таксама ўвага на культурна-гістарычныя асаблівасці эпохі, якая, актыўна ўплываючы на мастацкія прынцыпы творчасці беларускіх і польскіх пісьменнікаў, заахвочвала іх слова да рэзаніравання не толькі з новымі тэндэнцыямі літаратурнай Еўропы, але і з традыцыямі айчыннага рамантызму. Матэрыял артыкула можа быць выкарыстаны пры распрацоўцы лекцыйных курсаў і практычных заняткаў, прысвечаных беларуска-польскім літаратурным і культурным узаемасувязям.

***Ключавыя словы:*** еўрапейскі мадэрнізм; славянскі рамантызм; беларуская паэзія; польская паэзія.

# МОДЕРНИСТСКИЕ ТЕНДЕНЦИИ В БЕЛОРУССКОЙ И ПОЛЬСКОЙ ПОЭЗИИ НАЧАЛА XX В.

**А. А. Брусевич**

*Кандидат филологических наук, доцент,*
*Гродненский государственный университет им. Янки Купалы,*
*ул. Ожешко, 22, 4, 230023, г. Гродно, Беларусь, brusevich@tut.by*

Рассмотреть некоторые точки соприкосновения между белорусской и польской поэтическими парадигмами, которые в начале XX в. взяли курс на сближение с литературой европейского модернизма. Модернистская волна обновления и развития белорусской и польской поэзии на данном этапе была вызвана интенсивными эстетическими поисками, попытками и экспериментами наиболее передовых и креативных авторов, нетривиальными творческими идеями и взглядами, что привело к углубленному пониманию сложности и тонкости поэтического искусства, расширению его границ и перспектив. Обращается также внимание на культурно-исторические особенности эпохи, которая, активно влияя на художественные принципы творчества белорусских и польских писателей, поощряла их слово к резонированию не только с новыми тенденциями литературной Европы, но и с традициями отечественного романтизма. Материал статьи может быть использован при разработке лекционных курсов и практических занятий, посвященных белорусско-польским литературным и культурным взаимосвязям.

***Ключевые слова:*** европейский модернизм; славянский романтизм; русская поэзия; польская поэзия.

## MODERNIST TENDENCIES IN BELARUSIAN AND POLISH POETRY AT THE BEGINNING OF THE 20TH CENTURY

**A. A. Brusevich**

*PhD, Ass. Professor,*
*Yanka Kupala State University of Grodno,*
*22 Ozheshko Str., 230023, Grodno, Belarus, brusevich@tut.by*

The purpose of the article is to consider some points of contact between the Belarusian and Polish poetic paradigms, which at the beginning of the 20th century. took a course for rapprochement with the literature of European modernism. The modernist wave of renewal and development of Belarusian and Polish poetry at this stage was caused by intensive aesthetic searches, attempts and experiments of the most advanced and creative authors, non-trivial creative ideas and views, which led to a deeper understanding of the complexity and subtlety of poetic art, expanding its boundaries and horizons. Attention is also drawn to the cultural and historical features of the era, which, actively influencing the artistic principles of Belarusian and Polish writers, encouraged their words to resonate not only with the new literary trends of Europe, but also with the traditions of domestic romanticism. The material of the article can be used in the development of lecture courses and practical classes devoted to Belarusian-Polish literary and cultural relations.

***Keywords:*** European modernism; Slavic romanticism; Belarusian poetry; Polish poetry.

Пачатак XX стагоддзя і для польскай, і для беларускай паэзіі становіцца этапам мадэрнісцкіх ідэйна-эстэтычных пошукаў, новай канцэптуалізацыі мастацтва, што было выклікана як уплывамі звонку (ідэямі еўрапейскіх сімвалістаў, імпрэсіяністаў, экспрэсіяністаў і іншых апалагетаў мадэрнізму), так і ўнутранымі супярэчнасцямі і праблемамі ў розных жыццёвых сферах – ад сацыяльна-грамадскай да культурна-асветніцкай. Прыхільнікі новых тэндэнцый у польскай літаратуры, сярод якіх былі А. Лянгэ, Т. Міціньскі, З. Налкоўская і шэраг іншых паэтаў, чыя творчая свядомасць сфарміравалася не без уплыву і беларускага фактару (непасрэднага, альбо праз паэзію А. Міцкевіча), стварылі рух «Маладая Польшча». Заўважым, упершыню пад такой назвай пісьменнік і літаратурны крытык А. Гурскі (выступаў пад псеўданімам Квазімода) апублікаваў у 1898 г. на старонках кракаўскага часопіса «Życie» («Жыццё») цыкл артыкулаў з мэтай абараніць маладое пакаленне творцаў ад нападкаў кансерватыўна настроеных літаратараў і чытачоў, якія вінавацілі мадэрністаў у самых розных грахах, асабліва ў адсутнасці патрыятызму. Адказваючы на беспадстаўныя закіды апанентаў, А. Гурскі тлумачыць, чаму важна пакідаць сваю і наведвацца ў чужую мастацкую прастору: «Мы бяром з іх літаратуры тое, што можа быць для нас карысным, а ўсё неадпаведнае і шкоднае выкідваем, як выціснуты лімон» [1, с. 299]. Такі падыход быў цалкам апраўданы, паколькі ў выніку падобнай «экспансіі» адбывалася насычэнне прыгожага пісьменства новымі эстэтычнымі ідэямі, формамі, нечаканымі вобразамі і матывамі, запазычанымі звонку.

У сваю чаргу прагрэсіўныя беларускія аўтары (Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч, З. Бядуля, М. Арол, К. Буйло, Г. Леўчык і інш.) дзеля ўзбагачэння ўласнага творчага досведу і пашырэння паэтычных магчымасцей беларускага вербальнага мастацтва, як і іх польскія калегі, таксама сягалі па-за кананічныя межы айчыннай літаратуры і культуры, выходзілі на шлях эстэтычнай рэцэпцыі, камунікацыі і ўзаемадзеяння з іншамоўнымі, іншанацыянальнымі літаратурамі, і гэты працэс рабіўся асноватворным, сістэмаўтвальным. Як адзначае З. Мельнікава, «пад непасрэдным уплывам ідэй "маладой Польшчы" выспела ідэя маладой Беларусі» [2, с. 5]. І сапраўды, следам за «Маладой Польшчай», а таксама за «Маладой Бельгіяй», «Маладой Германіяй» і іншымі аналагічнымі ўтварэннямі, з'явілася і «Маладая Беларусь»: менавіта пад такой назвай у 1912–1913 гг. у Пецярбурзе выйшла тры нумары першага беларускага літаратурна-мастацкага і грамадска-палітычнага часопіса, старонкі якога аздобілі творы К. Буйло, Ц. Гартнага, А. Гурло, Цёткі, Я. Купалы і Я. Коласа. Не выпадкова аналагічную назву («Молодая Белоруссия») для свайго нарыса тагачаснай беларускай літаратуры ўзяў і Л. Клейнбарт – адзін з найлепшых знаўцаў актуальных творчых працэсаў, што адбываліся ў нашай краіне на пачатку XX ст. Праўда, «Маладая Беларусь», пра якую пісаў даследчык, згуртавалася пераважна не вакол аднайменнага пецярбурскага альманаха, а вакол віленскай газеты «Наша ніва». Паводле Л. Клейнбарта, «лёс новай літаратуры галоўным чынам звязаны з гэтым выданнем» [3, с. 106]. І, безумоўна, нельга не адзначыць, што аўтары, якія знаходзілі шлях да чытача дзякуючы газеце «Наша ніва» (гэтаксама як і пісьменнікі з «Маладой Польшчы»), былі не проста абуджальнікамі народнага духу, але носьбітамі «духу» А. Міцкевіча – увасаблення ідэалаў свабоды, годнасці, вернасці свайму народу і айчыне: міцкевічаўскія вобразы і матывы даволі яскрава і паслядоўна пераклікаюцца з ідэйна-вобразным зместам, пафаснасцю цэлага шэрагу іх лепшых вершаў.

Вядома, не адным «духам» А. Міцкевіча сілкаваліся як нашаніўцы, так і прадстаўнікі «Маладой Польшчы». Меліся ў іх і другія кропкі судакранання, звязаныя з цікавасцю да агульнаеўрапейскіх літаратурна-мастацкіх тэндэнцый, звязаных з ідэйна-эстэтычнай парадыгмы мадэрнізму. На гэту акалічнасць, напрыклад, звяртае ўвагу І. Штэйнер, калі аналізуе мастацкі свет і асаблівасці герояў Я. Купалы. Даследчык прыходзіць да высновы, што «яны не менш загадкавыя, чым героі С. Пшыбышэўскага, Б. Лесьмяна, Ф. Кафкі, якія, як дэміюргі, ствараюць свой сусвет» [4, с. 6]. Гэтак жа і паэзію М. Багдановіча, як слушна адзначае М. Хмяльніцкі, «тыпалагічна можна суаднесці з мастацкімі традыцыямі імпрэсіянізму і сімвалізму (К. Тэтмаер, Я. Каспровіч, С. Бжазоўскі, Е. Жулаўскі), неарамантызму (С. Выспянскі, Б. Лесьмян), неакласіцызму (К. Тэтмаер, Л. Стаф, Я. Івашкевіч), а таксама з адраджэнскай плынню (Л. Стаф, М. Вольска) перыяду "маладой Польшчы"» [5, с. 425]. Аднак усё ж традыцыя, закладзеная А. Міцкевічам, калі не дамінавала над іншымі традыцыямі, то і не згасала канчаткова, не знікала з літаратурнага кантэксту, наадварот, праяўляла сябе на ўсіх мастацка-стваральных узроўнях у паэзіі як польскіх, так і беларускіх аўтараў пачатку XX ст. А яшчэ паміж рамантызмам і новымі нерэалістычнымі мастацкімі кірункамі (сімвалізмам, імпрэсіянізмам, экспрэсіянізмам і некаторымі іншымі) існавалі роднасна-генетычныя сувязі, якія аб'ядноўвалі іх эстэтыку з яшчэ больш даўняй традыцыяй хрысціянскай культуры, заглыбленай у еўрапейскае Сярэднявечча, што знайшло адбітак у творчасці і рамантыкаў і мадэрністаў. Гэта,

напрыклад, выяўляецца праз падкрэсленую дыстанцыю, альбо нават поўную адмову ад матэрыяльнага свету з яго ілюзорнымі, нетрывалымі каштоўнасцямі на карысць пачуццёва-духоўнай сферы, якая належыць свету ідэальнаму (нябеснаму, вечнаму, нязменнаму). І польская паэзія пачатку XX ст., і беларуская вызначаюцца далучанасцю да хрысціянскай аксіялогіі, яскрава выяўленым біблеізмам, наяўнасцю рэлігійных канцэптаў, вобразаў-сімвалаў. Хрысціянства як сістэма фундаментальных, ідэяўтваральных маральна-этычных каштоўнасцей адыграла выключную ролю ў фарміраванні творчай свядомасці выдатных мастакоў слова. У сімвалісцкіх, экспрэсіяністычных і сюррэалістычных пошуках «Маладой Польшчы», як і ў творчасці паэтаў-нашаніўцаў адчуваецца хрысціянскасць светапазнання і светаразумення: аўтары глыбокага анталагічна-быційнага, экзістэнцыйна-філасофскага досведу – ад А. Лянгэ і Т. Міціньскага да Я. Купалы і М. Багдановіча былі выхаваны ў тагачасных рэлігійна-хрысціянскіх традыцыях і былі ўключаны ў парадыгму хрысціянскіх этычных і маральных каштоўнасцей. У іх паэзіі, як і ў творчасці папярэднікаў-рамантыкаў, генетычная, унутраная пародненасць з хрысціянска-гуманістычнай культурай праявілася ў выкарыстанні адпаведных ідэйна-сэнсавых універсалій і ў разнастайных вобразна-матыўных кантэкстах, што дазваляе найбольш поўна зразумець як мастацкі свет асобнага аўтара, так і літаратурна-эстэтычныя тэндэнцыі, сістэмаўтваральныя працэсы. Напрыклад, паэзія З. Налкоўскай, прадстаўніцы літаратуры «Маладой Польшчы», здавалася б, наскрозь прасякнута дэкадэнцкай эстэтыкай. Аднак, як можна пераканацца з вершаў пісьменніцы, дэкаданс у польскім (славянскім) варыянце ўсё ж не такі змрочны і непраглядны, як яго заходнееўрапейскі адпаведнік. Найбольш паказальным, красамоўным у гэтым плане з'яўляецца твор «Anemone nemorosa», які стаў апошнім з усіх апублікаваных вершаваных тэкстаў паэтэсы. Яго назва – лацінскае найменне кураслепу дуброўнага (у народзе – пралеска), адной з першых вясновых кветак. Заўважым, што большасць радкоў у вершы «Anemone nemorosa» напаўняе пачуццё самоты і глыбокага расчаравання, а навакольная рэчаіснасць здаецца лірычнай гераіні падманнай, ілюзорнай:

Żyję między zagasłemi gwiazdami...
Chodzę, jak gwiazdy, po mroźnych orbitach,
Ślepemi oczami wpatrzona kamiennie
W ostatni nieskończoności skraj –
Ze zdziwieniem wiedząca, że blask mój miniony
Przyświeca jeszcze ludziom, choć źródło już zgasło [6, c. 452].

Аднак у вершы знаходзім і радкі, у якіх лірычная гераіня не баіцца прызнацца сабе і ўсяму свету, што рэчаіснасць не саткана толькі з чорных фарбаў, што жыццё – бясцэнны Божы дар, што ў душы, нягледзячы ні на што, павінны нараджацца і нараджаюцца светлыя, высокія пачуцці:

Zabrałam z sobą parę tamtych kwiatów,
I one mówią mi cicho,
Że to jest prawda – (ten maj...)
(Jakże dziękuję panu za te białe kwiaty,

Rwane w majowy świt
Między pocałunkami)...[6, с. 452].

Гэты ўзнёслы пафас – сведчанне сувязі са славянскай рамантычнай традыцыяй, рэтраспектыўна ў эстэтычным плане скіроўвае да творчасці А. Міцкевіча. У міцкевічаўскім вершы «Першацвет», нагадаем, таксама паэтызуецца вобраз той самай першай вясновай кветкі – пралескі, якой пазней прысвеціць верш і З. Налкоўская.

Дэкадэнцкая эстэтыка, угрунтаваная на ідэйна-мастацкіх канстантах не заходнееўрапейскага, а славянскага, найперш «міцкевічаўскага» рамантызму, імпанавала і беларускім паэтам, сярод якіх, напрыклад, З. Бядуля. Гэты паэт, як ніхто іншы, ўмеў ствараць яскравыя шматузроўневыя полісемантычныя вобразы, што сведчыла пра арыгінальны, самабытны талент паэта-мадэрніста. У яго мастацкай свядомасці нараджаліся незвычайныя фантазійна-асацыятыўныя карціны і яркія каларытныя выявы, многія вершаваныя радкі інструментаваны ў лірычна-імпрэсіяністычнай манеры. На сінтэтычны характар паэтычнага спосабу мыслення З. Бядулі звяртае ўвагу З. Мельнікава: «Лірызм яго твораў спалучаўся з рамантызмам, элементамі імпрэсіянізму, экспрэсіянізму, утвараючы якасна новы стылявы сінтэз» [7, с. 28]. Прыкладам такога мастацка-выяўленчага сінтэзу можа паслужыць верш «Зімовая казка», у якім назіраецца спалучэнне вобразна-сэнсавых супрацьлегласцей, праяўляецца аўтарская ўсхваляванасць і эфект фрагментарнасці, а рамантычна-казачны пафас пераплятаецца са змрочнай сімволікай пры дапамозе перадачы непасрэдных уражанняў і эмоцый:

У здзічэлым бары, непрабудным бары
Жывуць людзі маўклівыя, злосныя.
У хароме шкляным, на пасцелі шкляной
Дрэмле дзеўчына сонцавалосая [8, с. 21].

Дарэчы, вобраз дзяўчыны, што дрэмле «на пасцелі шкляной», супадае з вобразам царэўны з вядомай рамантычнай казкі А. Пушкіна:

Перед ним, во мгле печальной,
Гроб качается хрустальный,
И в хрустальном гробе том
Спит царевна вечным сном [9, с. 240].

А яшчэ падобны вобраз дзяўчыны, што спіць у труне (праўда, не шкляной, а звычайнай), прысутнічае і ў польскай паэзіі – у вершы Т. Міціньскага «Witeź Włast» («Віцязь Уласт»):

I przeciw smoku dumnie
zagrał w dzwon –
a młoda pani w trumnie
krwawi szron [10, с. 141].

Адзначым, што ў паэзіі З. Бядулі, як, зрэшты, і ў многіх творах Т. Міцінъскага, іншых прыхільнікаў польскага, беларускага – і шырэй – славянскага рамантызму і мадэрнізму (дэкадансу, сімвалізму, экспрэсіянізму) маюцца іншыя сугестыўныя, містычныя матывы, казачныя і міфалагічныя вобразы, што сведчыць пра ўключанасць аўтарскай мастацкай думкі таго часу ў агульнаеўрапейскую вербальна-эстэтычную парадыгму, працэс літаратурнага ўзаемадзеяння і міжкультурнай камунікацыі. Аднак яшчэ раз падкрэслім, што беларускія і польскія паэты пачатку XX ст. не імкнуліся да крайняга творчага радыкалізму. Мадэрнісцкая паэзія, народжаная на беларуска-польскім культурным памежжы – а гэта вершаваныя творы Т. Міцінъскага, З. Налкоўскай, Я. Купалы, М. Багдановіча, З. Бядулі і іншых аўтараў, – хоць і судакранаецца (часам даволі інтэнсіўна і глыбока) з мастацка-эстэтычнай парадыгмай заходнееўрапейскага мадэрнізму, усё роўна застаецца па-славянску адметнай, што выяўляецца ў лірычна-эмацыянальнай шчырасці, непасрэднасці, чуласці, светлых настроях, аптымістычных інтанацыях.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Quasimodo.* Młoda Polska // Życie: tygodnik illustrowany, literacki, artystyczny i społeczny. 1898. R. II. № 25. S. 299.

2. *Мельнікава З. П.* Літаратура і эстэтыка нацыянальнага самапазнання ў філасофска-публіцыстычнай спадчыне Змітрака Бядулі // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. 3: Філалогія. Педагогіка. Псіхалогія. 2016. № 1. С. 5–13.

3. *Клейнборт Л. М.* Молодая Белоруссия: очерк современной белорусской литературы, 1905–1928 гг. Минск : Белорус. гос. изд-во, 1928.

4. *Штэйнер І.* Déjà vu, або Успамін пра будучыню. Мінск : ЛМФ «Нёман», 2003.

5. *Хмяльніцкі М. М.* Польская літаратура і М. Багдановіч // Максім Багдановіч : энцыклапедыя. Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2011. С. 425–426.

6. *Rygier-Nałkowska Z.* Anemone nemorosa // Tygodnik Illustrowany. 1908. № 23. S. 452.

7. *Мельнікава З. П.* «На горне душы…» : творчасць З. Бядулі ў беларускай літаратуры першай трэці XX стагоддзя : манаграфія. Брэст : БрДУ імя А. С. Пушкіна, 2001.

8. *Бядуля З.* Збор твораў : у 4 т. Мінск : Дзярж. выд-ва. БССР, 1952. Т. 2 : Вершы і паэмы.

9. *Пушкин А. С.* Полное собрание сочинений : в 6 т. М. : Гос. изд. худож. лит., 1950. Т. 3 : Евгений Онегин. Сказки. Драматургия.

10. *Miciński T.* W mroku gwiazd. Kraków : Drukarnia Uniwersytetu Jagiellońskiego, 1902.

# ЛАКАЛІЗАЦЫЯ ГАТЫЧНАГА ЖАНРУ Ў ВЕРШАВАНАЙ АПОВЕСЦІ АДАМА МІЦКЕВІЧА «ГРАЖЫНА»

**М. А. Мартысевіч**

*Нацыянальная акадэмія навук Беларусі,*
*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры,*
*вул. Сурганава 1, к. 2, 220072, г. Мінск, Беларусь, maryjka.m@gmail.com;*
*Навуковы кіраўнік – доктар філалагічных навук, прафесар І. В. Саверчанка*

Удакладняецца жанравая прыналежнасць вершаванай аповесці А. Міцкевіча «Гражына» (1823) – твора, які аўтар артыкула адносіць да канона шматмоўнай літаратуры Беларусі XIX ст. З дапамогай параўнальна-гістарычнага метаду аналізуецца падабенства твора з англійскімі гатычнымі раманамі Х. Ўолпала «Замак Отранта» (1764) і Э. Рэдкліф «Таямніцы замка Удольфа» (1794), жанравызначальнай рысай якіх выступае хранатоп замка. Наваградскі замак – цэнтральнае месца дзеяння «Гражыны» – прадстаўлены ў артыкуле ў двух вымярэннях: змрочна-рамантычным, як плён фантазіі А. Міцкевіча пра мінуўшчыну старадаўняй Літвы, і археалагічна-гістарычным, як вынік архіўнага пошуку і цікавасці аўтара да тапаграфіі малой радзімы. Вызначаюцца функцыі элементаў гатычнага рамана ў мультыжанравай структуры «Гражыны» і іх уплыў на літаратурны працэс свайго часу.

***Ключавыя словы:*** гатычны раман; Адам Міцкевіч; хранатоп замка; мультыжанр; Наваградак; шматмоўная літаратура Беларусі.

# ЛОКАЛИЗАЦИЯ ГОТИЧЕСКОГО ЖАНРА В СТИХОТВОРНОЙ ПОВЕСТИ АДАМА МИЦКЕВИЧА «ГРАЖЫНА»

**М. А. Мартысевич**

*Национальная академия наук Беларуси,*
*Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы,*
*ул. Сурганова 1, к. 2, 220072, г. Минск, Беларусь, maryjka.m@gmail.com;*
*Научный руководитель – доктор филологических наук, профессор И. В. Саверченко*

Уточняется жанровая принадлежность стихотворной повести А. Мицкевича «Гражына» (1823) – произведения, которое автор статьи относит к канону многоязычной литературы Беларуси XIX в. С помощью сравнительно-исторического метода анализируется сходство произведения с английскими готическими романами Х. Уолпола «Замок Отранто» (1764) и Э. Рэдклифф «Тайны замка Удольфо» (1794), жанроопределяющей чертой которых выступает хронотоп замка. Новогрудский замок – центральное место действия «Гражыны» – представлен в статье в двух измерениях: мрачно-романтичным, как плод фантазии А. Мицкевича о прошлом старинной Литвы, и археологически-историческом, как результат архивного поиска и интереса автора к топографии малой родины. Определяются функции элементов готического романа в мультижанровой структуре «Гражыны» и их влияние на литературный процесс своего времени.

***Ключевые слова:*** готический роман; Адам Мицкевич; хронотоп замка; мультижанр; Новогрудок; многоязычная литература Беларуси.

## LOCALIZATION OF THE GOTHIC GENRE IN THE NARRATIVE POEM BY ADAM MICKIEVICZ «GRAŻYNA»

**M. M. Martysevich**

*Research Center of Belarusian Culture,*
*Language and Literature of the National Academy of Sciences of Belarus,*
*vul. Surhanava 1/2, 220072 Minsk, Belarus, maryjka.m@gmail.com;*
*Supervisor – Hab. PhD, Professor I. V. Saverchanka*

The article clarifies the genre affiliation of the narrative poem «Grażyna» (1823) by A. Mickiewicz, which the author of the article attributes to the canon of multilingual Belarusian literature of the 19th century. With the aid of the comparative-historical method, the similarity of the work with the classic English Gothic novels by H. Walpole «The Castle of Otranto» (1764) and by A. Radcliffe «The Mysteries of Udolpho» (1794), whose genre-defining feature is the castle chronotope, is analyzed. Navahrudak Castle, which is the main setting of «Grażyna», is presented in the article in two dimensions: darkly romantic, as the fruit of A. Mickiewicz's fantasy about the past of ancient Litva (Lithuania), and archeological and historical, as a result of archival research and the author's interest in the topography of his homeland. The functions of the elements of a Gothic novel in the multi-genre structure of «Grażyna» and their impact on the literary process of its time are defined.

***Keywords:*** Gothic novel; Adam Mickiewicz; the castle chronotope; multi-genre; Navahrudak; multilingual literature of Belarus.

Кампазіцыі аповесцяў, якія складаюць тэтралогію “Пачакай, затрымайся”, маюць ідэнтычную структуру: у сюжэтах адлюстраваны штодзённыя клопаты гераіні, яе праблемы і поспехі ў школе, стасункі ў сямейным атачэнні, назіранні за людзьмі і асэнсаванні іх адносінаў. Але ў заключных раздзелах кожнай часткі абавязкова па-мастацку рэзюмуецца, якім чынам гэтыя ўражанні паўплывалі на дзяўчынку, якія факты абумовілі яе пэўныя рашэнні або нават зрабіліся вызначальнымі ў выбары далейшага жыццёвага шляху. У аповесці «Новы свет» гаворка ідзе пераважна пра вучобу Ганькі ў дзесяцігодцы і жыццё ў мястэчку: спачатку на кватэры, пазней – у інтэрнаце. Аднак галоўныя падзеі, якія ў канчатковым выніку матывавалі дзеянні юнай гераіні, адбыліся ў яе сям’і.

Сярод усіх сваякоў Ганькай найбольш апякуецца стрыечная сястра Саша – старэйшая дачка цёткі Іваніхі. Менавіта Саша аплочвае Ганьцы жыллё на кватэры ва Урэччы, кожны тыдзень «пакуе з сабой торбу» – харчаванне да наступных выхадных. Ганька выдатна разумее, што Сашы гэтае апякунства даецца вельмі няпроста, бо ў сястры свая сям’я: муж, двое дзяцей, старая маці, гаспадарка. Дзяўчынка імкнецца дапамагчы сястры, чым можа: як толькі вяртаецца з вучобы, кідаецца прыбіраць у хаце, шчыраваць па гаспадарцы, хапаецца за любую працу. Чарговы раз, вярнуўшыся дамоў на выхадныя, Ганька даведваецца пра няшчасце, якое абрынулася на сям’ю: Валодзю, мужа Сашы, арыштавалі. Маладога гаспадара абвінавацілі ў тым, што забілася калгасная кабыл: памчала, спалохаўшыся «араплана», і наляцела ў калгасным двары на плугі ды бароны. Ганька моцна перажывае за родных: «Валодзю далі дзесяць год. Падумаць толькі, за кабылу, што сама забілася, чалавека пасадзілі на дзесяць год у турму... І няхай сабе і не сядзіць ён, а капае нейкі канал, але ж дзесяць год! Без сям’і, без дзяцей, без жонкі... А як ім тут <…> жыць гэтыя дзесяць год...» [3., с. 256].

Драма ў сям’і сваякоў кардынальна змяніла жыццёвыя планы галоўнай гераіні твора, якая першапачаткова мела намер скончыць дзесяцігодку, паступіць у інстытут і атрымаць «сур’ёзную адукацыю». Сумленне не дазваляе дзяўчынцы абцяжарваць

сястру дадатковым клопатам: Саша «не можа болей цягнуць яшчэ і яе вучэнне – яе кватэру і яе торбы штотыдня» [3, с. 341]. Ганька прымае рашэнне пасля сёмага класа паступаць у педвучылішча, бо «разумее, што сама ўласнымі сіламі павінна неяк выбівацца на ўласны хлеб. І выбівацца як мага хутчэй. А ў педвучылішчы давалі стыпендыю, давалі інтэрнат» [3, с. 341–342]. Гэтае ўзважанае і асэнсаванае рашэнне дзяўчынкі з'яўляецца не толькі сведчаннем яе сумленнасці, але перадусім – прыкметай сацыяльнай сталасці, здольнасці да рацыянальных і адказных учынкаў. Паводле меркаванняў сучасных псіхолагаў, «сацыяльны і асабісты вопыт – гэта заўсёды вынік дзеянняў дзіцяці, яго актыўнага ўзаемадзеяння з навакольным светам, аднак авалодаць вопытам – значыць не проста засвоіць сукупнасць звестак, ведаў, навыкаў, узораў, але інтэрналізаваць той спосаб дзейнасці і зносінаў, вынікам якіх ён з'яўляецца» [4, с. 122]. Заключныя падзеі аповесці «Новы свет» пераканаўча сведчаць, што пятнаццацігадовая Ганька Гурновіч насамрэч зрабілася дарослай: самастойнай, здольнай аб'ектыўна ацэньваць рэальнасць і прымаць сур'ёзныя рашэнні.

Тэтралогія А. Васілевіч «Пачакай, затрымайся» вельмі паслядоўна і псіхалагічна дакладна адлюстроўвае этапы сацыяльнага станаўлення галоўнай гераіні. Аднак менавіта дзве цэнтральныя аповесці выяўляюць найважнейшы перыяд у жыцці Ганькі, калі дзяўчынка пачынае самастойна ўзаемадзейнічаць не толькі з аднагодкамі, але і з дарослымі людзьмі, калі засвойвае тыповыя формы сацыяльных паводзінаў і пачынае вызначаць каштоўнасныя прыярытэты. Для юных чытачоў, якім адрасаваны мастацкі твор, досвед галоўнай гераіні мае несумненную карысць. Мастацкая літаратура – гэта апасродкаваны, але прадуктыўны спосаб пазнання рэчаіснасці і ўзаемадзеяння асобы з соцыумам, гэта магчымасць мадэлявання і выпрабоўвання разнастайных стратэгій дзеянняў разам з літаратурнымі героямі, гэта прастора засваення этычных абсалютаў, без якіх немагчыма функцыянаванне індывіда як сацыяльнага суб'екта.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Николаева Е. М.* Ценность традиций в социальном становлении личности // Вестник экономики, права и социологии. 2007. № 2. С. 115–119.

2. *Васілевіч А.* Доля знойдзе цябе // Выбраныя творы. Мінск: Беларуская навука, 2010. С. 133–235.

3. *Васілевіч А.* Новы свет // Выбраныя творы. У 3 т. Т.2. Мінск: Маст. літ., 1982. С. 229–344.

4. *Кожевникова Д. А.* Особенности формирования социального и личностного опыта на различных этапах детства // Известия Саратовского университета. 2012. № 4. С. 115–122.

# ДУХОЎНА-АКСІЯЛАГІЧНАЯ ПРАСТОРА НАЦЫЯНАЛЬНАГА МЕНТАЛІТЭТУ Ў ПРОЗЕ ЛУКАША КАЛЮГІ

**Н. М. Зуева**

*РУП «Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова “Звязда”»,*
*вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а, 220013, г. Мінск, Беларусь,*
*nz_777@mail.ru*

Даследуецца духоўна-аксіялагічная прастора нацыянальнага менталітэту і мастацкае ўвасабленне беларускага характару ў творах Лукаша Калюгі. Асаблівая ўвага надаецца сістэме персанажаў, а таксама асаблівасцям гаворкі літаратурных герояў і мастацкай рэпрэзентацыі тых рыс, якія характэрны для жыхароў беларускай вёскі. Праведзены аналіз дазваляе вызначыць мастацкія асаблівасці твораў празаіка, а таксама зазірнуць ва ўнутраны свет носьбітаў аўтарскага ідэалу і антыідэалу, вылучыць дамінантныя рысы ментальнасці народа, яго духоўныя каштоўнасці і аўтэнтычную культуру, сфармаваць уяўленне пра нацыянальную ідэнтычнасць беларусаў, іх канцэпцыі быцця. Аўтар артыкула падкрэслівае, што Лукаш Калюга ў сваіх творах акцэнтаваў увагу на традыцыйных каштоўнасцях мясцовага насельніцтва, супрацьпастаўляючы іх ідэалам новага пакалення, якія фарміруюцца, што дазваляе прасачыць сацыяльную трансфармацыю беларускага грамадства, мадэрнізацыю беларускай вёскі пачатку XX стагоддзя.

***Ключавыя словы:*** нацыянальны характар; менталітэт; нацыянальныя рысы; духоўна-аксіялагічная прастора; літаратурны партрэт; літаратурны герой; самабытнасць; духоўная культура.

# ДУХОВНО-АКСИОЛОГИЧЕСКОЕ ПРОСТРАНСТВО НАЦИОНАЛЬНОГО МЕНТАЛИТЕТА В ПРОЗЕ ЛУКАША КАЛЮГИ

**Н. Н. Зуева**

*РУП «Редакционно-издательское учреждение “Звязда”»,*
*ул. Б. Хмельницкого, 10 а, 220013, г. Минск, Беларусь,*
*nz_777@mail.ru*

Исследуется духовно-аксиологическое пространство национального менталитета и художественное воплощение белорусского характера в произведениях Лукаша Калюги. Особое внимание уделяется системе персонажей, а также особенностям речи литературных героев и художественной репрезентации тех черт, которые характерны для жителей белорусской деревни. Проведенный анализ позволяет определить художественные особенности произведений прозаика, а также заглянуть во внутренний мир носителей авторского идеала и антиидеала, выделить доминантные черты ментальности народа, его духовные ценности и аутентичную культуру, сформировать представление о национальной идентичности белорусов, их концепции бытия. Автор статьи подчеркивает, что Лукаш Калюга в своих произведениях акцентировал внимание на традиционных ценностях местного населения, противопоставляя их

формирующимся идеалам нового поколения, что позволяет проследить социальную трансформацию белорусского общества, модернизацию белорусской деревни начала XX века.

***Ключевые слова:*** национальный характер; менталитет; национальные черты; духовно-аксиологическое пространство; литературный портрет; литературный герой; самобытность; духовная культура.

## SPIRITUAL AND AXIOLOGICAL SPACE OF NATIONAL MENTALITY IN THE PROSE OF LUKASH KALYUGA

**N. N. Zuyeva**

*RUE «Editorial and Publishing Institution "Zvyazda"»,*
*B. Khmelnitsky str., 10 a, 220013, Minsk, Belarus,*
*nz_777@mail.ru*

The article explores the spiritual and axiological space of the national mentality and the artistic embodiment of the Belarusian character in the works of Lukash Kalyuga. Special attention is paid to the system of characters, as well as to the peculiarities of the speech of literary heroes and the artistic representation of those features that are characteristic of residents of the Belarusian village. The analysis allows us to determine the artistic features of the prose writer's works, as well as to look into the inner world of the bearers of the author's ideal and anti-ideal, to highlight the dominant features of the mentality of the people, their spiritual values and authentic culture, to form an idea of the national identity of Belarusians, their concept of being. The author of the article emphasizes that Lukash Kalyuga in his works focused on the traditional values of the local population, contrasting them with the emerging ideals of a new generation, which allows us to trace the social transformation of Belarusian society, the modernization of the Belarusian village at the beginning of the XX century.

***Kewwords:*** national character; mentality; national traits; spiritual and axiological space; literary portrait; literary hero; identity; spiritual culture.

Ва ўмовах сусветнай глабалізацыі і інтэграцыі, у сувязі з кардынальнымі зменамі сістэмы традыцыйных культурных каштоўнасцей, механізмаў пераемнасці пакаленняў творчасць Лукаша Калюгі набывае асаблівую актуальнасць. Яго творы ўнікальныя ў плане адлюстравання нацыянальнага. Як пісала даследчыца З. Драздова, пісьменнік «перш за ўсё звяртае ўвагу на тое, як жывецца ў ім [новым грамадстве] асобнаму, нічым не выдатнаму і разам з тым адзінаму такому непаўторнаму чалавеку» [1, с. 120]. Лукаш Калюга звяртаецца да простага чалавека як носьбіта народнай культуры, дзякуючы чаму як мага лепш выяўляецца беларускі менталітэт. Таму невыпадкова, што яго проза неаднаразова з'яўлялася прадметам даследавання.

Аналіз літаратуразнаўчых прац паказаў, што пытанне аксіялагічнай прасторы нацыянальнага менталітэту даследавана не ў дастатковай ступені. Тэарэтычны аспект пытання выявіў, што калі прытрымлівацца класічнага разумення «менталітэту» (ад лац. mens, mentis «розум, інтэлект»), то гэта найперш так званае мадэляванне

канкрэтыкі мыслення, выяўленне ў пэўнай нацыянальнай супольнасці прыярытэтаў псіхалагічных і інтэлектуальных. Менавіта такі падыход існуе дзеля абстрагавання і адэкватнасці пры вывучэнні дадзенага пытання. Існуюць і іншыя падыходы, якія ўключаюць рознапланавыя аспекты выяўлення ментальнага: этнічны, геаграфічны, сацыяльны, духоўны, прафесійны і г. д.

У дадзенай працы бачыцца неабходным выкарыстоўваць паняцце «менталітэт» замест блізкага па значэнні, аднак нятоеснага, «нацыянальны характар», бо ў першым утрымліваецца найбольш поўная характарыстыка ўласцівасцей, якія датычыцца нацыянальных рысаў чалавека пэўнай нацыянальнасці. Аднак з прычыны недастатковай вызначанасці паняцця даследчыкі часам разыходзяцца ў поглядах. Гэта зусім натуральна, паколькі ўяўленні пра нацыянальную самабытнасць народа і яго культуру, пра нацыянальны характар і гістарычны лёс адлюстраваны ў міфалогіі, фальклоры, звычаях, абрадах, літаратуры і мастацтве, грамадска-палітычным, дзяржаўна-прававым і маральна-этычным самавыяўленні нацыі.

Тэрмін «менталітэт» у літаратуразнаўстве не мае пакуль адзінага азначэння. Аднак варта заўважыць, што ў некаторых навуковых крыніцах нават адмыслова падкрэсліваецца «цяжкавытлумачальнасць» паняцця. Так, напрыклад, у энцыклапедычным даведніку «Культуралогія» [4] адзначана, што менталітэт – гэта своеасаблівы спосаб мыслення, склад розуму асобнага чалавека або якой-небудзь супольнасці людзей. Аднак пры гэтым заўважаецца, што «па сваёй сутнасці і зместу менталітэт з'яўляецца цяжкавытлумачальнай крыніцай мыслення, ідэалогіі і веры, эмоцый і пачуццяў чалавека» [4]. Пры аналізе твораў Лукаша Калюгі будзем прытрымлівацца культуралагічнага падыходу.

Нягледзячы на тое, што творчасць Лукаша Калюгі развівалася ў неспрыяльных умовах, фактычна ў кожным творы пісьменнік сцвярджаў каштоўнасці традыцыйнай народнай этыкі і маралі.

Традыцыйна дамінантнымі рысамі беларускага менталітэту прынята лічыць гасціннасць, працавітасць, цярплівасць, талерантнасць, уменне суперажываць, гаспадарлівасць. Гэтымі рысамі беларускага менталітэту надзеленыя героі твораў Лукаша Калюгі, носьбіты самабытных характараў: Трахім з апавядання «Трахім – штучны чалавек», Іллюк з сатырычнага апавядання «Іллюк-даследчык», Юстап, Тахвіля, Прузына, Савоста, Андрук з «Тахвілінага швагера» і інш. Апавяданні «Тахвілін швагер», «Краўцы і чаляднікі», «Вам знаёмае» і аповесці «Ні госць ні гаспадар», «Нядоля Заблоцкіх», якія пазначаны вялікай увагай да народных паданняў, звычаяў, абрадаў.

У творы «Тахвілін швагер» бачым запазычанасць з мастацкага вопыту Мікалая Гогаля. Апавяданне расказвае пра Юстапа, калі ён яшчэ «не прадаў чорту душу» і быў бедняком-гаротнікам. Юстап тады хадзіў з торбачкай у карчомку і слёзна скардзіўся ўсім баркаўчанам на беднасць, на благія вочы швагеркі Тахвілі і вядзьмацкія чары, ад якіх пакутуе. У яго ёсць патаемная мара: выбіцца ў «багатыры». Нават з дапамогай чорта. Сацыяльны змест гэтага апавядання відавочны. Апавяданні «Краўцы і чаляднікі», «Лук'ян – капераціўскі сабака», «Трахім з пагулянкі», «Іллюк-даследчык» не ўтрымліваюць разважлівай глыбіні. У творах апавядаюцца звычайныя

гісторыі пра гультаёў, звяглівых жанчын і раўнівых мужыкоў. Аднак менавіта самабытныя вобразы – аб'ект аналізу нацыянальнага, у прыватнасці беларускага менталітэту.

Абраная пісьменнікам своеасаблівая манера і форма апавядання валодае вялікім гнасеалагічным патэнцыялам. Яркія, да адчувальнасці канкрэтныя дэталі, рухі, дзеянні – аснова рознабаковай характарыстыкі герояў, якія маюць нетрадыцыйныя погляды, што непасрэдна праяўляецца ў неардынарных паводзінах, утрымліваюць асаблівасці светапогляду апавядальніка, канцэпцыю сацыяльна-палітычных пераўтварэнняў 1920-х – 1930-х гг. Ідэйны змест перададзеных няўласна-простай мовай крытычных думак Трахіма наконт новых парадкаў у размеркаванні дроў падзяляе і аўтар-апавядальнік. «*Ведаеце – многа халадней у нашым краі стала, як сельсавет стаў дровы назначаць людзям. З розумам даюцца дровы. Сельсавет глядзіць, каб людзі не спрацаваліся надта. Тыя гады шчэ малацьба ёсць у людзей, а ўжо кінуць усё ды ў лес едуць. Цяпер лепей: дадуць дроў пад вялікдзень, як ужо ў самага хітрага багатыра, што усяе работы ня можа парабіць і наймітоў наняць баіцца, каб у кулакі не запісалі, на падатак процантаў не накінулі, і ў таго малацьбы й початку няма…*» [2, с. 351]. Прыведзены ўрывак з апавядання «Трахім – штучны чалавек» ілюструе гумарыстычную танальнасць твора і з'яўляецца ўвасабленнем сатырычнага погляду на некаторыя бакі тагачаснага жыцця. Рэчаіснасць падаецца ў творы праз унутранае ўспрыняцце чалавека з народа. Аксіялагічнай асновай такой ацэнкі паслужыў пункт гледжання народа, меркаванні неадукаванага селяніна сталі кропкай адліку, што даказвае канцэптуальную блізкасць зместу апавядання да вуснай народнай творчасці.

Для пісьменніка і людзі, і вёска, пра якую ён піша, – свае, родныя. Характэрная ў гэтым сэнсе апавяданне «Баркаўцы – добрая вёска, і баркаўчане вясёлыя людзі», а менавіта канцоўка «*Але хто што ні гаворыць, а я адно кажу: за нашы Баркаўцы ў свеце лепшай вёскі няма. Нізашто б я з яе не выбраўся, хоць бы мне й прыплочвалі*» [2, с. 328]. У гэтым творы новым з'явіўся погляд у глыбіню стагоддзяў, дзе мінулае пераходзіць у сучаснае. Тут пісьменнік не толькі сцвярджаў каштоўнасці традыцыйнай маралі, але і паспрабаваў разабрацца ў сутнасці новага грамадства.

Прыглядаючыся да людзей, якія ў нечым вылучаюцца сярод аднавяскоўцаў, пісьменнік стварае самабытныя характары. І Лук'ян і Трахім – дзівакі, у нечым блізкія героям апавяданняў В. Шукшына. Тыпы герояў у гэтых індывідуальна і нацыянальна вельмі своеасаблівых, самабытных пісьменнікаў розныя. Але пафас аўтарскіх пазіцый зводзіцца да аднаго і таго ж: да сцвярджання права кожнага чалавека быць самім сабой, паважаць іншага. Шукшынскі жа герой, чалавек зусім іншай грамадскай фармацыі, нацыянальнага і гістарычнага вопыту, усвядомлена хоча быць такім, як ёсць, а не іншым.

Праз адзінкавы вобраз чалавека-ўнікума празаікі абмалёўваюць рысы нацыянальнага менталітэту і праз нечаканыя здарэнні паказваюць змяненні не толькі ў грамадскім жыцці, але і змяненні ў чалавечай душы. Родная зямля, аднавяскоўцы, сям'я для гэтых аўтараў заўжды з'яўлялася адной з галоўных тэм. Лукаш Калюга і Васіль Шукшын паўстаюць перад чытачамі як прадстаўнікі вёскі. Беларускі аўтар выступае

як мастацкі летапісец дарэвалюцыйнага сялянскага жыцця, што адлюстравана ў аповесцях «Нядоля Заблоцкіх», «Ні госць – ні гаспадар», гумарыстычных апавяданнях-сказах «Трахім – штучны чалавек», «Іллюк-даследчык», «Тахвілін швагер».

У аповесці Л. Калюгі «Ні госць, ні гаспадар» «дзіваком» выступае юнак-камсамолец Хвядос Чвардоўскі, які едзе працаваць на родную зямлю хлебаробам. Між тым аднакласнікі яго нават і думаць не хочуць, каб застацца ў роднай вёсцы, лічаць, што вёска цёмная, таму і ідуць «*Хто – у настаўнікі, хто – у каморнікі, меліяратары… Адзін ён – гаспадар (*«*мужык*» *бы даўней сказалі). Троха крыўдна (ці ён горшы за ўсіх?)*» [3, с. 36]. *Хвядос задаецца пытаннем* «*А хто зямлю капаць будзе? Хто вам астанецца хлеб рабіць?*» [3, с. 36]. Асноўны лейтматыў аповесці – любіць зямлю і адносіцца да яе па-гаспадарску. Тэматыкай, пафасам часу да гэтай аповесці цесна прымыкае апавяданне «Цеснаватая куртачка», дзе ролю дзівака выконвае Адась Банькоўчык, вязавіцкі каваль. Яго таксама лічаць не такім, як усе. Галоўныя героі – Адась Банькоўчык і Волька Лысаковічаўна разыходзяцца ў сваіх памкненнях да новага сучаснага жыцця. Волька выбрала горад, навуку, яна адарвалася ад зямлі, родных каранёў, а Банькоўчык – не. Разам з Адасёвым смуткам улоўліваецца тут і аўтарскі смутак аб тым, што перацягвае горад у свае абдымкі пісьменных і разумных вясковых жыхароў. Апавядальны тон гэтага твора хаваецца ў катэгарычным адмаўленні і непрыманні перад новай явай усяго старога ў жыцці. Свядомасць «дзівака» сінтэтычная, на мяжы гарадскога і вясковага светаў, што прадстаўляе сабой ідэйна-вобразную апазіцыю «горад–вёска». Герой вылучыўся сярод сваіх, але ніколі не стане сваім сярод чужых, гарадскіх. З невялікай тэмы «маленькага» героя і характару нараджаецца і духоўная праблема.

Калюга адлюстраваў праблемнае становішча вёскі, дзе не хапала мужчынскіх рук: «*Адзін Банькоўчык з усяго свайго таварыства астаўся ў Вязавічах. Кавальства прытрымала яго тут. А так усе хлопцы – хто куды відна: каторыя ў войска пайшлі, каторыя канавы капаць пад Смалявічы паехалі, каторыя каменне білі, недзе далёка адгэтуль клалі шашу. Вязавічы за падлеткамі (за “падшывальцамі*» *<…>) асталіся*» [2, с. 334]. У творы паказваецца сялянская праца, якую, з-за недахопу ў вёсцы моцнай паловы, прыходзілася рабіць жанчынам: «*<…> і ўсюды людзі. Чатыры жняркі адна за адною ішлі наўкола палетка. Віда-віда сціскаўся бліжэй да сярэдзіны спелы жытні круг. І жанцы і жнеі адным гурткам ішлі ззаду. Круцілі перавяслы, вязалі цяжкія, на кулі падобныя снапы*» [2, с. 334]. Менавіта гэтыя апісанні рэпрэзентуюць дамінантныя рысы беларуса: працавітасць, цярплівасць, веру ў лепшае будучае.

Лукаш Калюга «надзяляў» сваіх герояў спрадвечнымі рысамі беларусаў: працавітасцю, руплівасцю, адказнасцю. Пісьменнік стварыў праўдзівы псіхалагічны воблік беларуса з яго яскравымі праявамі нацыянальнага менталітэту. Духоўна-аксіялагічная прастора нацыянальнага менталітэту беларусаў у творчасці Лукаша Калюгі адлюстравана ў імкненні персанажаў да працы, любові да аднавяскоўцаў, роднай гаворкі, звычаяў, ў праяўленні павагі да старэйшага пакалення.

Вонкава персанажы напісаны даволі ярка. Калі маладнякоўцы малявалі ў сваіх творах, як новае перамагае старое, Лукаш Калюга, які сваіх камсамольцаў часта пісаў з натуры, паказваў іх людзьмі новай фармацыі, але не адарванымі ад спрадвечнага

сялянскага ладу жыцця, не ізаляванымі штучна ад таго гаспадарчага, ідэйнага, псіхалагічнага і маральнага досціпу, які назапашваўся стагоддзямі. Героям Калюгі уласцівы цвярозы, практычны сялянскі розум, іх хвалююць надзённыя справы. Зразумела, маладому пісьменніку не хапала майстэрства тыпізацыі, мастацкага абагульнення, але у яго была галоўная вартасць: жыццёвасць вобразаў, дакладнасць, натуральнасць і багацце жывой народнай мовы. Для адлюстравання грамадскага руху, пераўтварэнняў на вёсцы і трансфармацыі беларускага грамадства пісьменнік абраў манеру, якая некалькі адрознівалася ад апрабаванай у ранніх творах.

Лукаш Калюга стварыў яскравы партрэт беларуса з характэрнымі нацыянальнымі рысамі: сумленным стаўленнем да абавязкаў, праяўленнем патрыятызму, павагі да бацькоў і продкаў, гаспадарлівасцю, пільнасцю да сямейных каштоўнасцей. Празаік ведаў душу свайго аднавяскоўца, сачыў за жыццём вёскі, паказаў яе мадэрнізацыю на пачатку XX ст. Праз сваіх герояў ён прадэманстраваў характэрныя рысы беларускага менталітэту і ўвасобіў духоўна-аксіялагічную прастору нацыянальнага ў сваёй прозе.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. *Драздова З.* Творчасць А. Мрыя і Калюгі: Стылявыя асаблівасці. Мінск: Беларуская навука, 1997.

2. *Калюга Л.* Творы: раман, аповесці, апавяданні, лісты. Мінск: Маст. літ., 1992.

3. *Калюга, Л.* Творы: раман, аповесці, апавяданні, лісты. Мінск: Маст. літ., 2011.

4. Культуралогія: Энцыкл. давед. / Э. С. Дубянецкі; Маст. А. А. Глекаў. Мінск, БелЭн, 2003.

# БІБЛЕЙСКАЯ ПАРАДЫГМА Ў «СЛОВЕ НА АНТЫПАСХУ» КІРЫЛА ТУРАЎСКАГА

**А. І. Бельскі[1)], Я. Д. Касіловіч[2)]**

*[1)]Доктар філалагічных навук, прафесар,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр-т Незалежнасці, 4, г. Мінск, Беларусь,*
*alesbelsky@yandex.by;*
*[2)]Настаўніца беларускай мовы і літаратуры*
*ДУА «Сеніцкая сярэдняя школа № 2»,*
*Мінскі р-н, аг. Сеніца, вул. Васільковая, 15,*
*jauhienijakasil@gmail.com*

Разглядаецца аўтарская рэцэпцыя і трактоўка біблейскага тэксту ў параўнальным аспекце; пры гэтым прыводзіцца цэлы шэраг прыкладаў, цытацыі. Робіцца выснова, што Свяшчэннае Пісанне з'яўляецца ўтваральным канцэптуальным ядром у тэксце Кірыла Тураўскага, своеасаблівым вербальным інструментам для вопытнага прамоўцы-багаслова і рэлігійнага філосафа-герменеўта.

***Ключавыя словы:*** Кірыл Тураўскі; «Слова на Антыпасху»; Свяшчэннае Пісанне; біблейская парадыгма; біблейскі тэкст; прарок/прарокі; цытаванне.

# БИБЛЕЙСКАЯ ПАРАДИГМА В «СЛОВЕ НА АНТЫПАСХУ» КИРИЛЛА ТУРОВСКОГО

**А. И. Бельский[1)], Е. Д. Косилович[2)]**

*[1)] доктор филологических наук, профессор,*
*Белорусский государственный университет,*
*пр-т Независимости, 4, г. Минск, Беларусь,*
*alesbelsky@yandex.by;*
*[2)] учитель белорусского языка и литературы*
*ГУО «Сенницкая средняя школа № 2»,*
*Минский р-н, аг. Сеница, ул. Васильковая, 15,*
*jauhienijakasil@gmail.com*

Рассматривается авторская рецепция и трактовки библейского текста в сравнительном аспекте; при этом приводится целый ряд примеров, цитаций. Делается вывод, что Священное Писание является образующим концептуальным ядром в тексте Кирилла Туровского, своеобразным вербальным инструментом для опытного оратора-богослова и религиозного философа-герменевта.

***Ключевые слова:*** Кирилл Туровский; «Слова на Антыпасху»; Священное Писание; библейская парадигма; библейский текст; пророк/пророки; цитирование.

# THE BIBLICAL PARADIGM IN KIRILL TUROVSKY'S «THE WORD FOR ANTI-EASTER»

**A. I. Belski[1)], Ya. D. Kasilovich[2)]**

*1) Hab. PhD, Professor,*
*Belarusian State University,*
*4 Independence Avenue, Minsk, Belarus,*
*alesbelsky@yandex.by;*
*[2)]Teacher of Belarusian language and literature*
*of the state educational institution «Senitska Secondary School No. 2»,*
*Minsk district, Senitsa, 15, Vasilkovaya st., Minsk, Belarus,*
*jauhienijakasil@gmail.com*

The article «The Word for Anti-Easter» by Kirill Turovsky is considered of the author's reception and interpretation of the biblical text in a comparative aspect, while a number of examples of citation are given. It is concluded that the Holy Scriptures are the forming conceptual core in the text of Kirill Turovsky, a kind of verbal tool for an experienced theologian and religious philosopher-hermeneutist.

***Keywords:*** Kirill Turovsky; «The Word for Antipascha»; Holy Scripture; biblical paradigm; biblical text, prophet/prophets; citation.

Кірыл Тураўскі – знакаміты старажытнабеларускі пісьменнік, прапаведнік, красамоўца, багаслоў. Ён аўтар цэлага шэрагу царкоўна-літаратурных твораў, сярод якіх прыкметнае месца займаюць яго словы-казанні. Даследчыкі найчасцей вылучаюць мастацкі бок пропаведзяў, а іх біблейская аснова звычайна застаецца па-за ўвагай, па-за кантэкстам. Верагодна, гэта звязана з тым, што многія аўтарытэтныя навукоўцы асэнсоўвалі літаратурна-творчую спадчыну Кірылы Тураўскага яшчэ ў савецкі атэістычны час, калі рэлігія адмаўлялася і пропаведзь у рэлігійна-хрысціянскім аспекце разглядаць было складана. Аднак усё ж некаторыя даследчыкі зрабілі паасобныя сціслыя ацэнкі і слушныя назіранні. І. П. Яромін у працы «Ораторское искусство Кирилла Туровского» запыняецца на біблейскіх вобразах некаторых пропаведзяў, хаця наўмысна імкнецца адмежаваць Кірыла Тураўскага ад багаслоўя: «Он никогда не подчинял текст писания какой-либо определенной, строго продуманной богословской концепции. Свои аллегорезы Кирилл, скорее поэт, чем богослов, изобретал, руководствуясь не столько логическим анализом текста, сколько чувством, радостно взволнованным в обстановке праздничного богослужения» [1, с. 55]. Але будова і змест пропаведзі, зразумела, вымагалі адпаведнага тлумачэння, звароту да пэўных біблейскіх рэмінісцэнцый, прыкладаў і інш.

Паэтычны складнік у выглядзе біблейскай вобразнасці ў тэкстах пісьменніка-прапаведніка разглядае А. Я. Наумаў, які ў артыкуле «Св. Кирилл Туровский и Священное Писание», апрача іншага, адзначае выключную культуратворчую ролю

Свяшчэннага Пісання: «Таким образом, культура Древней Руси, как и всего византийского мира, отличается исключительно большим уважением к слову – самого Бога и Его апостолов, пророков, угодников…» [2, с. 116].

У Беларусі найбольш грунтоўна творчасць Кірылы Тураўскага даследаваў А. А. Мельнікаў, у манаграфіі якога «Кірыл, епіскап Тураўскі: жыццё, спадчына, светапогляд» (1997; 2-е выд. – 2000) [3] зроблена спроба рэканструкцыі біяграфіі святіцеля, прааналізаваны творы і размешчаны тэксты святога. Але мы абапіраемся на тэкст «Слова на Антыпасху» ў кнізе «Рукописи графа А. С. Уварова», выдадзеную ў 1858 г. (і цытуем тэкст па гэтым выданні). Тут прадстаўлены і два артыкулы: «Библейское влияние» і «Византийское влияние» [4, с. 10–32], у якіх прасочваецца сувязь слоў Кірыла Тураўскага з Бібліяй і творамі Айцоў Царквы.

З навуковага досведу, які ўяўляе цікавасць і каштоўнасць пры асэнсаванні біблейскай парадыгмы ў творчасці Кірыла Тураўскага, мы ўлічваем даследаванне Л. В. Ляўшун «История восточнославянского книжного слова XI–XVII вв.» [2] і некаторыя іншыя працы.

Засяродзімся на параўнальна-супастаўляльным аналізе тэксту «Слова на Антыпасху» і Свяшчэннага Пісання. Пры гэтым мы не будзем разглядаць характар аўтарскага цытавання (гэта добра зрабіў Ф. М. Двіняцін у артыкуле «Традиционный текст в торжественных словах св. Кирилла Туровского»). На гэты раз мы бяром пад увагу толькі канец «Слова…», калі аўтар-святіцель пераказвае гісторыю сустрэчы Хрыста і яго вучня Фамы, які не паверыў уваскрэсенню Ісуса. Гэта падзея згадваецца толькі ў адным Евангеллі: Евангеллі ад Іаана. У Евангеллі ад Лукі гэтыя падзеі таксама згаданы, але не падрабязна, без апісання размовы з Фамой (Лукі 24:33). Пасля ўкрыжавання Хрыста Яго вучні зачыніліся ў доме, баючыся іўдзеяў, якія кепска ставіліся да Ісуса і яго паслядоўнікаў (Іаана 20:19). Але Хрыстос з’явіўся сярод вучняў. Ён паказаў рукі, ногі і рэбры, бо гэтыя часткі цела былі пашкоджаны пры пакаранні на крыжы (рукі і ногі былі прабіты, бо Ён вісеў на крыжы на цвіках, а рэбры былі прабіты дзідай, бо воіны, што ладзілі ўкрыжаванне, хацелі пераканацца, што Хрыстос сапраўды памёр). Вучні ўзрадаваліся Настаўніку. Але ў той дзень сярод іх не было Фамы. І калі вучні расказалі Фаму пра сустрэчу з Хрыстом, Фама адказаў: «**а҆ще не ви́жду на ру́ку є҆гѡ̀ и҆́зъвы гвоздѝнныѧ, и҆ вложу́ пе́рста моего́ въ и҆́зъвы гвоздѝнныѧ, и҆ вложу́ ру́ку мою́ въ ре́бра є҆гѡ̀, не и҆му́ вѣ́ры**» (Іаана 20:25).

Праз восем дзён гісторыя паўтарылася: Хрыстос прыйшоў пры зачыненых дзвярах. У гэты раз Фама прысутнічаў. Ісус сказаў яму: «**принеси́ пе́рсты твои́ сю́мо и҆ ви́ждь ру́цѣ мои́: и҆ принеси́ ру́ку твою́ и҆ вложи́ въ ре́бра моѧ̀: и҆ не бу́ди невѣ́ренъ, но вѣ́ренъ**» (Іаана 20:27).

На гэтым апостал Іаан скончыў аповед пра Фаму. Але Кірыл Тураўскі, дакладна пераказваючы вышэйзгаданую гісторыю, працягвае як бы ад імя Хрыста: «**Мнѣ бо**

преже тебе патриарси и прр҃ци разумѣвше, вѣровaша моемȣ вчл҃вчнию» [4, с. 23]. Евангельскія кнігі пісаліся з мэтай распавесці пра Боскую сутнасць Хрыста, таму ў іх такое багацце цытат са Старога Запавету, якія пацвярджаюць, што Ісус – Божы сын. Кірыл Тураўскі згадвае, што Хрыстос пасля ўваскрэсення «с Лукою Клеопою пȣть шествовaхѫ» [4, с. 24]. Падарожнікі не спазналі Настаўніка: «Ѻчи же є҆ю держа́стѣсѧ, да є҆гѡ҆ не позна́ета» (Лукі 24:16). Расчараваныя вучні расказалі Ісусу пра ўкрыжаванне. Яны, як многія яўрэі, спадзяваліся, што Ісус і ёсць Месія, абяцаны прарокамі: «мы́ же надѣѧхомсѧ, ꙗ҆кш сей є҆сть хотѧ҆ и҆зба́вити і҆и҃лѧ» (Лукі 24:21). І Хрыстос растлумачыў ім Пісанне, бо ў вучняў не хапіла веры, каб паверыць у напісаныя прароцтвы: «Ѡ҆, несмы́сленнаѧ и҆ кѡ́снаѧ се́рдцемѫ, є҆́же вѣ́ровати ѡ҆ всѣ́хъ, ꙗ҆́же глаго́лаша прр҃о́цы: не сїѧ҆ ли подоба́ше пострада́ти хр҃т҃ȣ҆ и҆ вни́ти вѫ сла́вȣ҆ свою҆; И҆ нача́вѫ ѿ҆ мѡѷ҆се́а и҆ ѿ҆ всѣ́хъ прр҃ѡ́къ, сказа́ше и҆́ма ѿ҆ всѣ́хъ писа́нїй ꙗ҆́же ѡ҆ не́мъ» (Лукі 24:25-27). Верагодна, матыў дарогі ў Эмаус і стаў асновай для далейшага тлумачэння Кірыла Тураўскага. Хрыстос, ідучы з вучнямі ў Эмаус, гаварыў пра свой прыход, ушчуваў Кляопу і Луку за нявер'е Божаму слову.

Свяціцель на прыкладзе многіх праведнікаў супрацьпастаўляе веру нявер'ю. Аўтар выкарыстоўвае рытарычную ампліфікацыю. Прапаведнік пачынае з новазапаветных падзей: «...осѧзан мѧ, ꙗко азъ самъ и҆смь, и҆гоже преже wсѧзавъ Семеѡнъ, и вѣрою прашаше ѿ҆тпȣщенїа с҃ миромъ» [4, с. 23]. У Евангеллі чытаем, што Сімяон быў чалавек дабрачынны, «чѧ́ѧ ѻ҆у҆тѣ́хи і҆и҃левы» (Лукі 2:25). Яўрэі чакалі Месію, бо старазапаветныя прарокі сведчылі пра Збаўцу Ізраіля. Таму Сімяон «прїи́де доу́хомъ» у храм (Лукі 2:27), што значыць па веры, бо «вѣ҆ є҆моу҆ ѡ҆вѣ́щано дх҃омъ с҃ты́мъ, не ви́дѣти сме́рти, пре́жде да́же не ви́дитъ хр҃та҆ г҃дн҃ѧ» (Лукі 2:26). І Бог выканаў Сваё абяцанне – праведнік трымаў Хрыста на руках (Лукі 2:28).

Але не ўсе яўрэі былі рады нараджэнню Ісуса. Сярод іх – цар Ірад, пра якога згадвае Кірыл Тураўскі як антытэзу веры Сімяона: «И не бȣди невѣренъ, ꙗко же Иродъ, иже, слы́шавъ мое рж҃тво, гл҃ше вохвомъ: кдѣ҆ Хс҃ раждаетьсѧ, да шедъ поклонюсѧ емȣ҆, а҆ въ ср҃дци ѡ҆ оубииствѣ моемь мы́слѧше» [4, с. 23]. Цар, пачуўшы пытанне ад мудрацоў «гдѣ҆ є҆сть рожде́йсѧ цр҃ь і҆оуде́йскїй» (Мацвея 2:2), «смоути́сѧ» (Мацвея 2:3). Паклікаўшы іх да сябе, сказаў: «ше́дше и҆спыта́йте и҆звѣ́стно ѡ҆ ѻ҆трочѧ́ти: є҆гда́ же ѡ҆бра́щете, возвѣсти́те мнѣ, ꙗ҆кш да и҆ а҆́зъ ше́дъ поклонюсѧ є҆моу҆» (Мацвея 2:8). Ды намер Ірада быў зусім невысакародны: цар збіраўся не пакланіцца Хрысту, а «погоубити҆ є҆҃» (Мацвея

2:13). Таму мудрацы «вѣ́сть прїе́мше во снѣ́ не возврати́тисѧ ко и҃рѡдоу» (Мацвея 2:12) не сталі гаварыць цару пра месцазнаходжанне Ісуса і вярталіся ў сваю краіну іншым шляхам.

Далей Кірыл Тураўскі распавядае пра Аўраама: «вѣ́ру ими ми, Фомо, и познаи мѧ, ꙗкоже и Аврамѣ, к нему же подь сѣ́нь сѫ́ двѣ́ма а҆нг҃лома придохѫ, и тѣ́ позна мѧ, и Г҃а҆ мѧ нарече, и ѡ Содомѣ́ молѧшемисѧ, да его не погублю аще и до десѧти вѫ́ї в немѫ́ праведникѫ́» [4, с. 23]. Верай Аўраам дагадзіў Госпаду, было ў жыцці гэтага чалавека многа абставін, якія выпрабоўвалі праведніка. Аднаго разу «трїѝ моу́жїе» (Быццё 18:2) прыйшлі да Аўраама. Ён спазнаў Госпада (Быццё 18:3) і быў гасцінным. Бог адкрыў Свайму рабу намер наконт Садома і Гаморы. Тады Аўраам сказаў: «погоубѝши ли прⷣнаго сѫ́ нечестѝвымѫ́, и҆ боу́детѣ прⷣникѫ́ ꙗ҆́кѡ нечестѝвый» (Быццё 18:23). Аўраам працягваў разважаць, ці не знішчыць Бог горад, калі там будзе 50 праведнікаў (Быццё 18:24-25). Гасподзь паабяцаў не знішчаць горад, калі там будзе столькі праведнікаў (Быццё 18:26). Тады Аўраам спытаў наконт сарака пяці праведнікаў – Госпад паабяцаў не руйнаваць і дзеля гэтай колькасці. Роспыт спыніўся, калі лік праведнікаў дасягнуў дзесяці. Улічваючы далейшую гісторыю, можна канстатаваць: у Садоме не знайшлося нават дзесяці праведнікаў.

У апазіцыю Аўрааму Кірыл Тураўскі прыводзіць нявер'е Валаама: «А҆ не буди невѣ́ренѣ, ꙗкѣ Валаамѣ, иже Дх҃мь Сѷ́тмь пророкѣ мое за мирѣ оумр҃твие, и ꙗкѣ мьздѣ ради прельстивъсѧ, погꙋбе» [4, с. 23]. Аднойчы Валак, цар Маава, які хацеў знішчыць варожы яму Ізраіль, пачаў упрошваць прарока Валаама праклясці яўрэяў, бо думаў, што гэта дапаможа ў вайне з імі. Каб улагодзіць Валаама, цар Маава даслаў яму падарункі. І прарок, бачачы вялікія дары, хацеў падпарадкаваць Божую волю Валааму. Валаам некалькі разоў упрошваў Госпада праклясці Ізраіль. Ды Богу было няўгодна клясці Ізраіль, і Ён вуснамі Валаама паслаў дабраславенне Свайму народу (Лікі 24:9). Таму веру Аўраама, ад якога паходзіць Ізраіль, Кірыл Тураўскі супастаўляе з нявер'ем Валаама: Аўраам паверыў Богу, калі Ён паабяцаў нарадзіць ад яго народ. Аўраам маліў Бога захаваць Садом дзеля праведнікаў, якія жывуць там. А Валаам быў гатовы праклясці Божы народ Ізраіля, што нарадзіўся ад Аўраама, каб атрымаць царскія падарункі.

Потым у тэксце гаворыцца пра ўнука Аўраама, Якава: «вѣ́ру ими ми, Фомо, ꙗко самѣ азъ есмь, его же видѣ́ Ꙗковѣ нощи на лѣ́ствицѣ оутвержающасѧ; тоже и ꙗкѣ позна мѧ Дх҃мь, егда боряхусѧ с нимь вѣ Месопотамии: тогда бо шбѣщахусѧ ему вѣчѣ́чтисѧ вѣ племени его» [4, с. 23]. Жыццё Якава не было простым: Кірыл Тураўскі згадвае некалькі цяжкіх момантаў жыцця гэтага чалавека. У Якава быў старэйшы брат Ісаў. У тыя часы старэйшым сынам надавалася больш пашаны, чым малодшым.

Таму Якаў, скарыстаўшыся слабасцю Ісава, калі той вярнуўся стомлены з палявання, «купіў» у брата першароднасць за страву з сачыўкі (Быццё 25:29-24). Калі Ісаў уцяміў, што ён страціў, задумаў забіць малодшага брата. Ды Якаў, даведаўшыся пра гэта, уцёк з дому (Быццё 27:41-45). Ноччу ў дарозе «взѧ ѿ ка́менїѧ мѣ́ста (того́) и̑ положѝ вх возгла́вїе себѣ́» (Быццё 28:11). Лёг на тым месцы «и̑ со́нх ви́дѣ: и̑ сѣ, лѣ́ствица оу҃тверждена́ на землѝ, е́́же глава́ досѧза́ше до небесѐ, и̑ а҆г҃ли бж҃їи восхожда́хоу и̑ низхожда́хоу по не́й: гдь же оу҃твержда́шесѧ на не́й и̑ речѐ: а҆́зх е́́смь бг҃х авраа́ма о҆́тца̀ твоего́ и̑ бг҃х і҃сла́ка, не бо́йсѧ: землѧ̀, и̑дѣ́же ты̀ спи́ши на не́й, тебѣ́ да́мх ю҆̀ и̑ сѣ́мени твоемоу҃...» (Быццё 28:12-13). Гэта была не адзіная сустрэча Якава з Богам. Прайшлі гады, пакуль Якаў вярнуўся дадому. У час вяртання ён хваляваўся, што Ісаў заб'е яго. Сустрэча Якава адбылася таксама ў дарозе: «и̑ боре́шесѧ сх ни́мх чл҃вѣ́кх да́же до оу҃тра» (Быццё 32:24). Бог паабяцаў «поне́же оу҃крѣпи́лсѧ е́сѝ сх бг҃омх и̑ сх человѣ́кы си́ленх боу҃деши» (Быццё 32:28), таксама «и̑ блг҃вѝ е́го̀ та́мѡ» (Быццё 32:29). Праз Якава потым пайшоў народ Ізраіля, гэта азначае, што Хрыстос яго нашчадак.

Веру Якава ў Божае прароцтва святіцель супрацьпастаўляе нявер'ю цара Вавілона Навухаданосара: «И не буди не вѣренх, ꙗко и Навходоносорх, иже видѣвъ мѧ в пещи шторкхі ѿ огнѧ сп҃ша, истиною Сн҃а Бж҃ія нарече мѧ, и пакві кх своимх прельстемх оуклонивсѧ, погхибе» [4, с. 23]. Як яўрэйскія маладыя людзі трапілі на пакаранне смерцю? Пасля перамогі над Ізраілем многіх яўрэйскіх юнакоў з царскага роду даслалі на службу Вавілонскаму цару. Але трое з іх адмовіліся пакланяцца ідалу Навухаданосара, і цар загадаў спаліць іх у печы. Тады юнакі яму адказалі: «е́сть бо бг҃х на́шх на нб҃сѣ́хх, е́мѹ́же мы̀ слѹ́жимх, си́ленх и҆зба́вити на́сх ѿ пе́щи о҆гне́мх горя́щїѧ и̑ ѿ рѹкѹ́ твое́ю и҆зба́вити на́сх, царю̀» (Данііла 3:17). Яны не згарэлі ў печы, бо побач з трыма юнакамі стаяў Чацвёрты. Навухаданосар здзівіўся: «сѣ, а҆́зх ви́ждоу моу҃жы четы́ри разрѣше́ны и̑ ходя́щѧ средѣ́ о҆гнѧ̀, и̑ и҆стлѣ́нїѧ нѣ́сть вх ни́хх, и̑ зра́кх четве́ртагш подо́бенх сн҃оу бж҃ію» (Данііла 3:92) (Данііла 3:25) (Дакладнае месца залежыць ад варыянту перакладу.). Нягледзячы на тое, што Навухаданосар быў язычнік, ён пазнаў у Чацвёртым Бога. Але пасля гэтага цар не пачаў пакланяцца Госпаду.

Кірыл Тураўскі згадвае вялікіх прарокаў: Ісаю, Езэкііля і Данііла, якія мелі адкрыццё ад Госпада: «вѣру ими ми, Фомо, ꙗко азх есмь, его же видѣвх шбразх Исаиа на престолѣ превхісоцѣ, шбыстонша множьствомь а҆́нглх» [4, с. 23]. Гэту аналогію

ці паралель мы знойдзем у Свяшчэнным Пісанні: «ви́дѣхъ гд҃а сѣдя́ща на пр҃то́лѣ высо́цѣ и҆ превознесе́ннѣ, и҆ и҆спо́лнь до́мъ сла́вы є҆гѡ̀» (Ісая 6:1).

У «Слове на Антыпасху» згаданы прарок Езэкііль: «а҆́ зѣмь кавнвзі́йся Нєзнкѣю посредѣ живо́тнзіхъ wбразомь члвч҃кмь, нмѹ же и вас҃ прошбразнхъ колєсхі, живо́тнзімъ придержащесѧ, взздвнзающимсѧ со мною» [4, с. 23–24]. Свяціцель прыводзіць відзеж з кнігі гэтага прарока: «...и҆ внегда҆ ше́ствовати живо́тнымъ, ше́ствовахѹ и҆ коле́са держа́щеся и҃хъ: и҆ внегда҆ воздвнза́тнся живо́тнымъ ѿ земл҃и, воздвнза́хѹся и҆ коле́са» (Езэкііль 1:19).

І прарок Данііл бачыў Бога: «а҆́зъ нємь, нго же видѣ Данилъ на wблацѣхъ нб҃нхъ, подобнємь с҃на чл҃вча, сѣшедшаго до вет҃хаго дн҃мн». Гэта чытаем у прарока Данііла: «и҆̑ сѣ, а҆́ки подо́бїе сы́на человѣ́ча прикоснѹся оу҃стна́мъ мои́мъ...» (Данііл 10:16).

Вышэйразгледжаныя цытаты з'яўляюцца яскравым сведчаннем біблейскай парадыгмы як асноваўтваральнай у «Слове на Антыпасху». Гэтыя невялікія фрагменты ў тэксце пропаведзі Кірыла Тураўскага адлюстроўваюць сувязь аўтарскай думкі з Бібліяй як першакрыніцай богапазнання, рэлігійнага веравучэння, разумення і адчування сакральнага слова. Свяшчэннае Пісанне з'яўляецца не ілюстрацыяй і дадаткам да пропаведзі, а яе канцэптуальным ядром, своеасаблівым вербальным інструментам для вопытнага прамоўцы-багаслова і рэлігійнага філосафа-герменеўта. «Слова на Антыпасху» сведчыць пра літаратурны талент Кірыла Тураўскага як стваральніка аратарскай прозы: багаслоўска-тэалагічная думка агорнута аўтарам у прыгожую мастацка-паэтычную форму.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Еремин И. П.* Ораторское искусство Кирилла Туровского // Труды Отдела древнерусской литературы / АН СССР, Ин-т рус. лит. (Пушкинский Дом). М.; Л.: Изд-во АН СССР, 1962. Т. 18. С. 50–58.

2. *Наумов А. Е.* Св. Кирилл Туровский и Священное Писание // Philologia slavica: к 70-летию акад. Н. И. Толстого. М.: Наука, 1993. С. 114–124.

3. *Мельнікаў А. А.* Кірыл, епіскап Тураўскі: Жыццё. Спадчына. Светапогляд. 2-е выд. Мінск: Беларус. навука, 2000.

4. Рукописи графа А. С. Уварова. М.: Книга по требованию, 2023. Т. 2. 232 с.

5. *Левшун Л. В.* История восточнославянского книжного слова XI–XVII вв. / Л. В. Левшун. Минск: Экономпресс, 2001.

## ВОБРАЗ ЛЮСТЭРКА Ў ЛІТАРАТУРЫ БЕЛАРУСІ XIX СТАГОДДЗЯ

**Л. П. Леська**

*Кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка,*
*вул. Савецкая, 18, 220030, г. Мінск, Беларусь, leska.l.5@yandex.by*

Даследуецца спецыфіка выяўлення вобраза люстэрка на матэрыяле мастацкіх тэкстаў літаратуры Беларусі XIX ст. Адзначана, што карані светапогляднага зместу вобраза люстэрка ўзыходзяць да міфалагічнай свядомасці, для якой люстэркавасць была прынцыпам пазнання свету і адной з форм яго духоўнага засваення.

Асветлена рознааспектнае даследаванне вобраза люстэрка, матыву люстэркавасці, ў працах сучасных літаратуразнаўцаў: У. Эко, А. Вуліса, М. Бахціна, і вучоных Тартускай школы.

У працы адзначаецца, што ў апавяданнях Я. Баршчэўскага, баладах Я. Чачота вобраз люстэрка служыць сімвалічным сродкам раскрыцця ўнутранага свету герояў, спосабам іх самапазнання, асэнсавання свайго месца ў свеце.

У баладах Я. Чачота, А. Міцкевіча і апавяданнях Я. Баршчэўскага вобраз люстэрка асвятляе ўзаемаадносіны чалавека і свету, выступае спосабам перастварэння рэчаіснасці.

***Ключавыя словы:*** люстэрка; люстэркавасць; рамантызм; Я. Баршчэўскі; Я. Чачот; А. Міцкевіч.

## ОБРАЗ ЗЕРКАЛА В ЛИТЕРАТУРЕ БЕЛАРУСИ XIX ВЕКА

**Л. П. Лесько**

*Кандидат филологических наук, доцент,*
*Белорусский государственный педагогический университет им. Максима Танка,*
*ул. Советская, 18, 220030, г. Минск, Беларусь, leska.l.5@yandex.by*

Исследуется специфика выявления образа зеркала на материале художественных текстов литературы Беларуси XIX в. Отмечено, что корни мировоззренческого содержания образа зеркала восходят к мифологическому сознанию, для которого зеркальность была принципом познания мира и одной из форм его духовного освоения.

Освещено разноаспектное исследование образа зеркала, мотива зеркальности в работах современных литературоведов: У. Эко, А. Вулиса, М. Бахтина и ученых Тартуской школы.

В работе отмечается, что в рассказах Я. Барщевского, балладах Я. Чечота образ зеркала служит символическим средством раскрытия внутреннего мира героев, способом их самопознания, осмысления своего места в мире.

В балладах Я. Чечота, А. Мицкевича и рассказах Я. Борщевского образ зеркала освещает взаимоотношения человека и мира, выступает способом пересотворения действительности.

***Ключевые слова:*** зеркало; зеркальность; романтизм; Я. Борщевский; Я. Чечот; А. Мицкевич.

# THE IMAGE OF A MIRROR IN THE LITERATURE OF BELARUS OF THE NINETEENTH CENTURY

**L. P. Lesko**

*PhD, Ass. Professor,*
*Belarusian State Pedagogical University named after Maksim Tank,*
*Sovetskaya str., 18, 220030, Minsk, Belarus, leska.l.5@yandex.by*

The article examines the specifics of identifying the image of a mirror based on the material of literary texts of the literature of Belarus in the 19th century. It is noted that the roots of the ideological content of the image of the mirror go back to the mythological consciousness, for which mirroring was the principle of cognition of the world and one of the forms of its spiritual assimilation. The article highlights the multidimensional study of the image of a mirror, the matter of mirroring, looking glass in the works of modern literary critics: V. Eco, A. Ulis, M. Bakhtin, and scientists of the Tartu school. The work notes that in the stories of Y. Borshchevsky, the ballads of Y. Chechot, the mirror serves as a symbolic means of revealing the inner world of the characters, a way of their self-knowledge, understanding their place in the world. The image of a mirror in the ballads of Ya. Checheta, A. Mickiewicz and the stories of Ya. Borshchevsky acts as a method of reflecting man and the world and a way of re-creating reality.

***Keywords:*** mirror; mirroring; romanticism; Ya. Borshchevsky; Ya. Chechot; A. Mickiewicz.

Карані светапогляднага зместу вобраза люстэрка адыходзяць у міфалагічную свядомасць, для якой люстэркавасць была прынцыпам пазнання свету, адной з форм яго духоўнага засваення. У старажытныя часы люстэрка, выконваючы функцыі адлюстравання, адбітку і трансфарматара, выступала адначасова сродкам пакарання, пагібелі, выратавання, абароны. У міфе пра блізнят люстэрка выконвала космасаўпарадкавальную функцыю, што становіцца відавочным пры разглядзе «сваяцкіх» сувязяў паміж боствамі, напрыклад, Феба-багіня месяца, сястра бога сонца). У міфе пра Персея люстэрка несла герою гібель, таму ён, баючыся быць ператвораным у камень, сочыць за медузай Гаргонай па адбітку на медным шчыце. У міфе пра Нарцыса люстэрка ахоўвае чалавека ад страты асабістай цэласнасці. Нарцыс парушыў мяжу паміж сабой і адбіткам, парушыў дыхатамію «я» – «не я». Старажытныя міфы разглядалі чалавечыя недахопы памяркоўна, матывуючы і абумоўліваючы іх (напрыклад, імкненне Нарцыса да вады асэнсоўвалася як натуральная з'ява: ён жа сын патоку і Наяды). Негатыўная роля адбітку, адлюстравання была абумоўлена смяротнасцю вады, якая несла забыццё.

Фальклорныя ўяўленні таксама зафіксавалі разнастайныя ўяўленні пра люстэрка. У народных павер'ях разбітае люстэрка прадвяшчала няшчасце, пустое, без адбітку сведчыла пра ўваход нячыстай сілы ў жыццё чалавека.

Вобраз люстэрка з'яўляўся не толькі прадметам міфалагічных і фальклорных твораў, але і з'явай літаратуры, што прыцягвала да сябе ўвагу шматлікіх літаратуразнаўцаў. Адной з першых прац, у якой вывучалася функцыянаванне люстэрка ў мастацкай літаратуры стала манаграфія А. Вуліса «Літаратурныя люстэркі», у якой матыў,

вобраз, сімвал люстэрка разглядаецца на вялікім матэрыяле фальклору, сусветнай літаратуры.

Функцыі, семантыка вобразаў люстэрка і залюстроўя даследавалася ў працах М. Бахціна, вучоных Тартускай школы. Для М. Бахціна люстэрка з'яўляецца спосабам самапазнання героя праз яго адбітак.

Першым спецыяльным даследаваннем семіётыкі люстэркавасці стала эсэ «Люстэркі» У. Эка. Італьянскі вучоны, разглядаючы магчымасці аптычнага аб'екта, што выступае ў якасці знаку, разглядае яго месца ў індывідуальнай практыцы чалавека.

Глыбокі семіятычны падыход у вывучэнні люстэрка прадстаўлены ў працах вучоных Тартускага ўніверсітэта (С. Залян, Ю. Левіна, Л. Сталовіча). Аўтары зборніка «Люстэркі. Семіётыка люстэркавасці» [3] даследуюць функцыю вобраза, разглядаюць яго як мяжу паміж «сваім» – «чужым», «гэтым» і «тым», «жывым» і «нежывым» светамі, паміж знешнім і ўнутраным. Люстэрка для тартускіх вучоных з'яўляецца механізмам арганізацыі карціны свету, што будуецца на супрацьпастаўленні розных светаў. Здольнасць люстэрка выступіць у якасці мяжы вызначае яго дадатковыя магчымасці, звязаныя з арганізацыяй структуры мастацкага свету.

Люстэрка – поліфункцыянальны прадмет, які мае мноства сэнсаў і сімвалічных значэнняў. Прадметна-рэчыўны аналіз вобраза прапаноўваюць сучасныя даследчыкі постмадэрну (Ж. Бадрыйяр, М. Фуко [4]). Псіхалагічны аспект раскрыты ў працах Ж. Лакана, Ж-П Сартра, дзе таямнічы вобраз люстэрка – інструмент фарміравання Я-канцэпцыі і самасвядомасці.

Сімвалічны аспект люстэрка праяўляецца ў тым, што гэты прадмет уведзены ў літаратуру, дзе ён фіксуе часавыя і прасторавыя характарыстыкі ў мастацкім тэксце, раскрывае двайніковае жыццё герояў.

Сэнсаваўтваральныя магчымасці вобраза люстэрка ў мастацкіх тэкстах пісьменнікаў-рамантыкаў літаратуры Беларусі XIX стагоддзя (А. Міцкевіча, Я. Чачота, Я. Баршчэўскага) раскрываюцца пры характарыстыцы вобразаў і сіметрычнасць кампазіцыі.

У мастацкай канцэпцыі твораў Я. Баршчэўскага вобраз люстэрка звязаны з вобразамі двайнікоў (апавяданне «Плачка», «Стогадовы стары і чорны госць»), з трагічным матывам непазнавання сябе (апавяданне «Белая сарока»), з матывам шматмернасці і рознаўзроўневасці міфапаэтычнай прасторы і часу (апавяданні «Пра чарнакніжніка і цмока…», «Ваўкалак»), таму што з пункту погляду (зроку), у мастацкіх тэкстах пісьменніка можа быць любая рэч, любая з'ява, любы феномен, які ў той ці іншай ступені, падпарадкаваны законам оптыкі. Вобразамі-эквівалентамі люстэрка з'яўляюцца двайніковасць: сон і снабачанні, водная паверхня вады (апавяданне «Жабер-трава»), партрэтнае палотна (апавяданне «Вогненныя духі»), фотаздымак у альбоме, цень на сцяне (апавяданне «Стогадовы стары і чорны госць»).

Так, у апавяданнях «Белая Сарока», «Вогненныя духі» Я. Баршчэўскага люстэрка служыць своеасаблівым адбіткам духоўнага свету галоўнай гераіні. Мальвіна (апавяданне «Вогненныя духі») не ацаніла добрых намераў Альберта, не прыняла яго шчырае пачуццё, а толькі думала пра багацце, таму і стала ў адзін шэраг з голымі німфамі, што сышлі з палотнаў. «Голасць» німфаў сімвалічна паркрэслівае душэўную пустату Мальвіны, якая, апроч грошай, нічога і не любіць.

Люстэрка асвятляе і ўнутраны свет пана Скамарохі (апавяданне «Белая Сарока») Я. Баршчэўскага, паводле зместу твора, «надвячоркам, у прыцемках у пакоі сядзіць пан Скамароха (твар якога такі круглы, што нагадвае поўню), падкручваючы свой вус, пільна ўглядаецца ў люстэрка. Нечакана над яго жытлом павіслі хмары, зашумеў за сцяною вецер і лінуў дождж. У пакоі цёмна, толькі цьмяна свяціліся шыбы» [5, с. 205]. І прыходзіць да Скамарохі пасланнік Белай Сарокі, які мае вельмі непрывабнае аблічча. Герой Я. Баршчэўскага палохаецца нечаканага госця, але той супакойвае яго, заўважыўшы: «Не крычы, я падобны да цябе і магу табе шмат добрага зрабіць» [5, с. 206]. Скамароха глядзіць ў люстэрка, але не бачыць свайго сапраўднага твару, агіднасць яго аблічча становіцца відавочнай у час параўнання са страшным нячысцікам.

У мастацкай філасофіі Я. Баршчэўскага вобраз люстэрка асвятляе ўнутраны свет герояў, прынцып люстэркавасці ў кампазіцыі твораў пісьменніка падпарадкаваны раскрыццю адзінства свету.

У баладах Я. Чачота, А. Міцкевіча, Т. Зана люстэрка не толькі сродак самапазнання героя, але і спосаб яго выпраўлення, ператварэння чалавека.

У баладзе «Бекеш» Я. Чачота функцыю люстэрка выконвае крыштальная гара, па якой рухаецца галоўны герой твора, удзельнічаючы ў спаборніцтве за руку Малгосі, зусім забыўшыся, што кляўся ў каханні іншай. Нечакана ўсхаджаецца бура, і Бекеш ляціць з гары ўніз і разбіваецца, толькі напамінам аб ім засталася Бекешава гара; своеасаблівым адгалоскам жыцця папа і пападзі ў Пазяневічах стаў «звон на горцы ў Пазяневічах» (балада Я. Чачота «Падземны звон на горцы ў Пазяневічах»), які даносіцца з зямных глыбіняў.

Вобраз люстэрка ў баладзе «Бекеш» Я. Чачота служыць своеасаблівай меркай вартасці чалавека, сродак яго адлюстравання і перасатварэння. Такую сімвалічную функцыю люстэрка выконвае і ў баладах «Свіцязь», прадстаўленых у творчай спадчыне А. Міцкевіча, Я. Чачота і Т. Зана. Вобраз воднага люстэрка застаецца на месцы былога горада як знак яго праведнасці або грахоўнасці.

Такім чынам, у рамантычных творах літаратуры Беларусі XIX ст. шматфункцыянальны вобраз люстэрка выконвае ролю мастацкага адлюстравання свету, чалавека і перасатварэння рэчаіснасці.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Вулис А.* Литературные зеркала. Москва : Сов. писатель, 1991.

2. *Эко Умберто*. О зеркалах и другие истории / Умберто Эко; перевод с итальянского. Москва : Слово/Slovo, 2020 .

3. Зеркало. Семиотика зеркальности. [Ред. З. Г. Минц]. Тарту: ТГУ, 1988.

4. *Фуко Мишель*. Слова и вещи [Текст]: Археология гуманит. наук : пер. с фр. / Мишель Фуко ; вступ. статья канд. филос. наук Н. С. Автономовой. Москва: Прогресс, 1977.

5. *Баршчэўскі Я.* Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях / пер. з пол. мовы, паслясл. і камент. М. В. Хаустовіча. Мінск : Юнацтва, 1996.

## «АПОВЕСЦЬ БУДУЧЫХ ДЗЁН» ЯНКІ МАЎРА ЯК ДЗІЦЯЧАЯ ЎТОПІЯ

**М. В. Шамякіна**

*Кандыдат філалагічных навук,*
*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі,*
*вул. Сурганава, 1, корп 2, 220072, г. Мінск, Беларусь, centre@belcentre.by*

Разглядаецца амаль не даследаваны твор Янкі Маўра «Аповесць будучых дзён» на фоне дзіцячай фантастычнай літаратуры савецкага часу. Асаблівая ўвага засяроджана на станоўчым вобразе будучыні, прадэманстраваным у «Аповесці…», што дае падставу называць яе дзіцячай утопіяй.

***Ключавыя словы:*** беларуская савецкая фантастыка; утопія; дзіцячая літаратура; дзіцячая ўтопія; вобраз будучыні; Янка Маўр.

## «АПОВЕСЦЬ БУДУЧЫХ ДЗЁН» ЯНКИ МАВРА КАК ДЕТСКАЯ УТОПИЯ

**М. В. Шамякина**

*Кандидат филологических наук,*
*Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы НАН Беларуси,*
*ул. Сурганова, 1, корп 2, 220072, г. Минск, Беларусь, centre@belcentre.by*

Рассматривается почти не исследованное произведение Янки Мавра «Аповесць будучых дзён» на фоне детской фантастической литературы советского времени. Особое внимание сосредаточено на положительном образе будущего, продемонстрированном в «Аповесці…», что дает повод называть ее детской утопией.

***Ключевые слова:*** белорусская советская фантастика; утопия; детская литература; детская утопия; образ будущего; Янка Мавр.

## «THE TALE OF FUTURE DAYS» BY YANKEE MOOR AS A CHILD'S UTOPIA

**M. V. Shamyakina**

*PhD,*
*Center for Research of Belarusian Culture, Language and Literature*
*of the National Academy of Sciences of Belarus,*
*1 Surganova Street, building 2, 220072, Minsk, Belarus, centre@belcentre.by*

The article examines the practically unexplored work of Yankee Moor «The Tale of Future Days» against the background of children's fantasy literature of the Soviet era. Special attention is focused on the positive image of the future shown in the «Tale of Future Days», which gives reason to call it a childish utopia.

***Keywords:*** Belarusian Soviet fiction; utopia; children's literature; children's utopia; image of the future; Yanka Mavr.

Расійскі даследчык літаратуры Арцём Краўчанка адзначае, што «у савецкага грамадства і ўлады ад пачатку прысутнічаў моцны запыт на фарміраванне ўтапічнай карціны будучыні; сама ідэя існавання савецкай дзяржавы была моцна звязана з імкненнем рэалізаваць глабальны праект такога роду. Узнікла спецыфічная сітуацыя, калі пісьменнік, які стварае ўтопію, мог выступаць не толькі і не столькі як выражальнік уласнай канцэпцыі бачання будучыні, а як фактычны інтэрпрэтатар дзяржаўнай дактрыны развіцця» [1].

Пры гэтым і пісьменнікі і грамадства ўсведамлялі, што менавіта дзецям належыць будаваць камуністычную будучыню і жыць у ёй, таму іх неабходна рыхтаваць да вырашэння адпаведных задач. І вельмі важнай часткай падрыхтоўкі мыслілася стварэнне зразумелага дзецям пажаданага і прывабнага вобраза заўтрашняга дня.

Найбольш прыдатнай для стварэння вобраза будучыні ў дзяцей і падлеткаў стала фантастычная літаратура. З аднаго боку, навуковая фантастыка па сутнасці сваёй так ці інакш скіравана ў будучыню. Нават калі дзеянне адбываецца ў час напісання твора, у цэнтры аповеду знаходзіцца вынаходніцтва, якога ў рэальнасці пакуль няма. З другога боку, традыцыйна фантастычная літаратура з яе рамантычным пафасам найбольш прываблівае падлеткаў і моладзь.

У беларускай літаратуры першым, хто разгледзеў і выкарыстаў, у тым ліку і педагагічны патэнцыял фантастыкі, быў Янка Маўр. Ён напісаў некалькі фантастычных твораў: авапяданне «Піянерскія казкі» (1927), аповесці «Чалавек ідзе» (1926), «Фантамабіль прафесара Цылякоўскага» (1954–1955) і інш. Але асаблівую цікавасць у плане вывучэння вобраза будучыні ўяўляе «Аповесць будучых дзён» [2]. Пісалася яна ў 1930 г., асобнай кнігай выйшла ў 1932 г., а дзеянне ў ёй адбываецца недзе ў 1940–1941 гг., такім чынам, гэта так званая «фантастыка бліжэйшага прыцэлу».

У цэнтры твора 14-гадовы хлопчык Юзік, які з Заходняй Беларусі, што знаходзіцца пад уладай панскай Польшчы, трапляе ў Савецкую Беларусь і знаёміцца з яе жыццём. Ёсць некалькі персанажаў, праз якіх тое знаёмства адбываецца. Спачатку яго ўводзіць у курс спраў таварыш Шторм – майстар на харчовым камбінаце, дзе Юзік некалькі тыдняў працуе (яго змясцілі пры вытворчасці, бо там давалася жытло і харчаванне). А пасля герой едзе да дзеда ў калгас, і тут пра жыццё Савецкай Беларусі яму апавядае ўласна дзядуля, а таксама стрыечныя сёстры і браты.

Як бачна, «Аповесць будучых дзён» будуецца ў адпаведнасці з класічнай формай утопій, калі госць са «знешняга свету» трапляе ў цудоўную краіну, падрабязнасці ладу і звычак якой, як правіла, тлумачыць яму праважаты – мясцовы жыхар.

Такая форма ідзе непасрэдна ад «Утопіі» (1516) Томаса Мора і паўтараецца ў цэлым шэрагу пазнейшых твораў. Часта гэтае клішэ – мясцовы жыхар водзіць госця па ўтапічнай краіне – фактычна замяняе сабой сюжэт у традыцыйным разуменні. Так будуюцца і «Падарожжы Гулівера» (1726) Джанатана Свіфта, і «Новая Атлантыда» (1627) Фрэнсіса Бэкана – класічныя ў гэтым жанры творы. У XIX ст. аналагічна пабудавана ўтопія выдатнага мастака мадэрна Уільяма Морыса «Навіны з Ніадкуль» (1890).

Пазней, у XX ст., падобная структура захоўваецца і сустракаецца нярэдка – цалкам ці часткова. Цалкам замяняе сюжэт у «Сучаснай ўтопіі» (1905) Герберта Уэлса, «Падарожжа брата майго Аляксея ў краіну сялянскай утопіі» (1920) А. Чаянава, «Чырвонай зорцы» (1908) А. Багданава, «Востраве» (1962) Олдаса Хакслі. Прысутнічае таксама ў выглядзе экскурсіі ў Олдаса Хакслі ў «Чароўным новым свеце» (1932).

Утопія зусім не абавязкова знаходзіцца ў будучыні, бо першыя ўтопіі (скажам, Т. Мора) паказваюць Утопію як прасторава аддаленае месца. Менавіта такому разуменню адпавядае «Аповесць будучых дзён». Галоўны герой не пераносіцца ў будучыню. Я. Маўр знаходзіць іншы ход для стварэння кантрасту: не паміж сучаснасцю і будучыняй, а паміж рознымі сацыяльнымі ўкладамі ў суседніх краінах.

Даследчык жанра ўтопіі Ф. Аінса вызначаў некалькі адметных рыс утопіі. Сярод іх урбанізм, прасторавая ізаляванасць, аўтаркія, пазачасавасць, рэгламентацыя жыцця [3].

На фоне ўтопіі разгортваецца дзеянне шмат якіх савецкіх дзіцячых твораў. Аднак не ўсе з іх маюць структуру класічнай утопіі: калі ў галоўнага героя ёсць праважаты, які знаёміць яго з мясцовымі дзівосамі. Нярэдка бывае так, што дзеянне ўсяго твора разгортваецца ў будучыні. Напрыклад, «Я іду сустракаць брата» (1962) Уладзіслава Крапівіна і «Апошняя арбіта» нашага беларуса Уладзіміра Шыціка (1962), пачатак цыклу Кіра Булычова пра Алісу Селязнёву («Дзяўчынка, з якой нічога не здарыцца» – 1965), «Пяцёра ў звяздалёце» (1975) Анатоля Машкоўскага, «Мільён і адзін дзень канікул» (1979) Яўгена Вялціства.

Каля 1960-х гадоў складваецца нават спецыфічны канон будучыні: камунізм як пануючы сацыяльны лад, дабрабыт, надзвычай развітая навука, касмічныя падарожжы.

Сустракаюцца і творы, напрыклад, у таго ж Яўгена Вялціства, якія ад канону трохі адхіляюцца: у іх касмічных падарожжаў няма. Ёсць сацыялізм, урбанізм, навука і тэхналогіі. Кнігі яго вядомыя: «Электронік – хлопчык з валізы» (1964), «Рэссі – няўлоўны сябра» (1970) і «Новыя прыгоды Электроніка» (1984).

Але ствараліся дзіцячыя творы, амаль цалкам пабудаваныя па фармальнай мадэлі класічных утопій, дзе адзін ці некалькі падарожнікаў трапляюць у дзівосную краіну, сустракаюць нейкага праважатага (таксама аднаго ці некалькіх), які і знаёміць іх з мясцовым ладам жыцця.

У 1924 г. выходзіць адзін з першых падобных твораў: аповесць Інакенція Жукава «Падарожжа звяна «Чырвонай зоркі» ў краіну цудаў». Другое Лысагорскае звяно піянераў-ленінцаў, якое называецца як папулярны ў той час утапічны раман Аляксандра Багданава, і іх сабака Шарык пераносяцца ў 1957 год, стаўшы на пляму святла, якую нечакана знайшлі ў лесе падчас паходу. Па дарозе сустракаюць піянерскае звяно з будучыні – «Вечны касцёр». Імёны іх – люстраны адбітак імёнаў галоўных герояў. А ў рэшце рэшт, аказваецца, што падарожжа адбылося ў сне камандзіра звяна Сярожы. Тут праважатымі чакана робяцца піянеры з будучыні.

Варта адзначыць, што ў аповесці Жукава аповед засярожданы на сацыяльна-палітычным баку будучыі: на перамозе ва ўсім свеце камунізму, а тэхналагічныя дасягненні застаюцца па-за ўвагай аўтара.

У сваю чаргу, у 1957 г. (у годзе, куды падарожнічалі піянеры з папярэдняга твора) выходзіць аповесць Віталія Міленцьева «33 сакавіка». 13-гадовы школьнік

Вася зімой ідзе шукаць мамантавы зуб, праз яміну ў снезе трапляе ў будучыню – у 2005 год. А праважатым робіцца яго пастарэлы сябра. Аднак і гэтае падарожжа апынулася сном.

У творы Міленцьева на першы план выходзяць тэхнічныя вынаходніцтва будучыні, у першую чаргу – аўтамабілі.

1963 г. Аляксандр Светаў выпускае аповесць «Ветачкіны падарожнічаюць у будучыню». У аповесці дзеці пераносяцца ў будучыню з дапамогай чараўніка, які дае ім чароўны эліксір. Такім чынам, тут навуковая фантастыка змешваецца з казкай.

Аналагічная сітуацыя ў творы Віталя Губарава «Падарожжа на Ранішнюю Зорку» (1961), дзе чараўнік пераносіць герояў на іншыя планеты. Але там, акрамя таго, прысутнічаюць тры багатыры, нейкія персанажы рускіх народных казак; у цэлым вельмі эклектычны, нават хаатычны сюжэтна твор. А гэта той самы аўтар, па іншай аповесці якога знялі нядрэнны фільм «Каралеўства крывых люстэркаў» (кніга выйшла ў 1951 г.).

Дарэчы, Янка Маўр у невялікім апавяданні «Піянерскія казкі», якое выйшла ў часопісе «Беларускі піянер» у 1927 г., прадэманстраваў мяжу паміж казкай і навуковай фантастыкай.

У навукова-фантастычным ключы, без чараўніцтва, адбываюцца падарожжы ў цэлым шэрагу твораў (праз ужыванне тэхнічных прыладаў ці з прычыны невядомых фізічных законаў і парадоксаў).

У 1978 г. выходзіць «100 гадоў таму наперад» Кіра Булычова. У 1982 г. на старонках «Уральского следопыта» з'яўляецца аповесць Сямёна Сляпыніна «Хлопчык з саваны». Тут хлопчык з каменнага веку трапляе ў будучыню. У абодвух выпадках – з дапамогай машыны часу.

Нарэшце, у тым жа 1982 г. на старонках таго ж «Уральского следопыта» пачынае выходзіць трылогія Уладзіслава Крапівіна «Свята лета ў Старагорску» (аповесць першая «Галубятня на жоўтай паляне»). Тут касманаўт пераносіцца ў паралельную рэальнасць, у горад, які нагадвае горад яго дзяцінства, але ўтапічны, ідэалізаваны. У дадзеным выпадку перанос адбываецца праз нейкі фізічны парадокс. Наогул у многіх аповесцях У. Крапівіна героі пераносяцца ў паралельныя сусветы.

Усе названыя творы дэманструюць рысы, уласцівыя ўтопіям: урбанізм, наяўнасць фантастычных тэхналогій, сваеасаблівую сацыяльную будову. Хоць чым пазней напісаны твор, тым менш у ім такога ідэалагічнага падмурку і больш – дзеяння, арыгінальнай светабудовы і каларытных характараў.

Аднак і матыў госця ў невядомым свеце, дзе яму патрэбны праважаты, часам захоўваецца. У ролі такіх гасцей аказваюцца дарослыя героі У. Крапівіна (Яраслаў і Глеб). А ў Булычова падарожнічае Аліса і Коля.

Варта адзначыць, што ў «Аповесці будучых дзён» вельмі ўдала абыграны гэты ўласцівы ўтопіям падыход да пабудовы сюжэту з госцем і праважатымі. Ён сюжэт не замяняе, а ўпісваецца ў яго, прычым прысутнічае толькі ў другой частцы твора.

Першая частка прысвечана апісанню жыцця Юзіка, яго сям'і і сяброў у Заходняй Беларусі і нагадвае шматлікія тагачасныя творы пра прыгнёт сялян у дакастрычніцкі перыяд. Але ўзгадваюцца і тэхналогіі (на ўзроўні пачатку XX ст.), і малаадукаванасць простых людзей, і іншыя акалічнасці, якія пазней спрацуюць на кантраст. Пры-

сутнічае тэма падпольнай барацьбы і нават шпіёнская гісторыя. Дзеянне разгортваецца імкліва, героі жывыя, індывідуалізаваныя, кожны са сваім характарам і светапоглядам.

Па-іншаму выглядае другая частка, дзе апісваецца знаёмства Юзіка з жыццём Савецкай Беларусі. Герой падарожнічае ў прасторы, але ўзнікае адчуванне, што ён перанёсся ў будучыню гадоў на 30.

Тут шмат апісанняў тэхнічных навінак: ад амаль цалкам аўтаматызаванай фабрыкі-кухні і незвычайных сельскагаспадарчых прылад да педагагічных тэхналогій, якія і сёння выглядаюць абсалютна адэкватна: магчымасць атрымліваць і падвышаць адукацыю для дарослых і пажылых, сістэма завочнага, дыстанцыйнага навучання, нават он-лайн лекцыя.

Адзіны мінус: вобразы савецкіх людзей выглядаюць больш схематычнымі, чым польскія сябры Юзіка. Адчуваецца, што яны – найперш функцыя, тыя самыя ўтапічныя праважатыя, якія знаёмяць галоўнага героя са светам будучыні.

Гэта зразумела, бо само пытанне аб тым, якім павінен быць чалавек будучыні, у творах навуковай фантастыкі было пастаўлена пазней. Скажам, у кнігах карыфея жанра Івана Яфрэмава («Туманнасць Андрамеды» – 1957), прычым вырашана ў яго не вельмі паспяхова, бо яфрэмаўскія людзі будучыні, мягка кажучы, не прывабныя як асобы. Ці ў творах Сяргея Снегава («Людзі як багі» 1966), які стварыў сапраўдных супергерояў не горш за персанажаў Марвел.

Такім чынам, Янка Маўр у «Аповесці будучых дзён» дэманструе характэрную для савецкай утопіі карціну будучыні і ў многім выкарыстоўвае тыповую для ўтопій пабудову сюжэта. Аднак робіць гэта няяўна, разбавіўшы ўтапічны дыдактызм і аднастайныя карціны знаёмства з дзівосамі даволі захапляльнымі сюжэтнымі хадамі.

Вобраз будучыні, які вымалёўваецца ў яго творы, таксама мае рысы ўтопіі. Вялікая частка дзеяння разгортваецца ў горадзе. Шмат тэхнічных падрабязнасцей, сацыяльна-эканамічных ідэй. Але галоўнае: Маўр падступаецца да ідэі *выхавання* чалавека будучыні. Хаця жывыя вобразы ў яго пакуль не атрымаліся, але ён паказаў, якім чынам выхоўваецца новы чалавек для новага грамадства: праз адукацыю і пастаяннае самаўдасканаленне.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Кравченко Артем*. Гости в будущее: «пионерская утопия» и советская действительность [Электронный ресурс] // Философско-литературный журнал «Логос». 2017. №5 (120). URL: https://cyberleninka.ru/article/n/gosti-v-buduschee-pionerskaya-utopiya-i-sovetskaya-deystvitelnost (дата обращения: 14.10.2024).

2. *Маўр Я.* Аповесць будучых дзён // Юндзетсэктар. Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, 1932.

3. *Аинса Ф.* Реконструкция утопии. Москва : Наследие – Editions UNESCO, 1999.

## АЛЯКСАНДР ПШЧОЛКА ЯК ДРАМАТУРГ

**Г. А. Леонцьеў**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр-т Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь,*
*glebleo3@gmail.com;*
*Навуковы кіраўнік – кандыдат філалагічных навук, дацэнт Л. А. Гедзімін*

Разглядаецца драматургічная спадчына Аляксандра Пшчолкі. У даследаванні вызначаюцца жанравыя дамінанты, праблематыка і матывы, якія родняць пісьменніка з сучаснымі яму прадстаўнікамі беларускай літаратуры. Такім чынам, былі адзначаныя паралелі з творчасцю Францішка Багушэвіча і Аляксандра Ельскага, а таксама выяўленае месца Аляксандра Пшчолкі ў гісторыі беларускай драматургіі.

***Ключавыя словы:*** Аляксандр Пшчолка; беларуская драматургія; беларуская літаратура пачатку XX ст.; сатыра; драма.

## АЛЕКСАНДР ПЩЁЛКО КАК ДРАМАТУРГ

**Г. А. Леонтьев**

*Белорусский государственный университет,*
*пр-т Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь,*
*glebleo3@gmail.com;*
*Научный руководитель – кандидат филологических наук, доцент Л. А. Гедимин*

Рассматривается драматургическое наследие Александра Пщёлко. В исследовании определяются жанровые доминанты, проблематика и мотивы, которые роднят писателя с современными ему представителями белорусской литературы. Таким образом, были отмечены параллели с творчеством Франтишка Богушевича и Александра Ельского, а также обнаружено место Александра Пщёлко в истории белорусской драматургии.

***Ключевые слова:*** Александр Пщёлко; белорусская драматургия; русская литература начала XX в.; сатира; драма.

## ALEXANDER PSHCHOLKA AS A DRAMATURG

**G. A. Leontyev**

*Belarusian State University,*
*4 Independence Avenue, 220030, Minsk, Belarus,*
*glebleo3@gmail.com;*
*Supervisor – PhD, Ass. Professor L. A. Gedimin*

The article examines the dramaturgical legacy of Alexander Pscholka. The research identifies genre dominants, issues and motives that connect the writer with his contemporary representatives

of Belarusian literature. Thus, the parallels with the work of Frantsishak Bogushevich and Alexander Yelski were noted, as well as the place of Alexander Pscholka in the history of Belarusian drama.

***Keywords:*** Alexander Pshcholka; Belarusian dramaturgy; Belarusian literature of the beginning of the 20th century; satire; drama.

Аляксандр Пшчолка разглядаецца даследчыкамі збольшага як празаік і этнограф. Мы ж звернемся да яго п'ес. Пяру пісьменніка належаць драматычныя абразкі «Бабылкіна гора», «Янкава скарга», «Прамова старшыны да валаснога сходу», «З жыцця лепельскіх сялян».

П'есы А. Пшчолкі – кароткія, але многія, верагодна, маюць рэальную аснову, на што ўказваюць падзагалоўкі «Изъ жизни лепельскихъ крестьянъ», «Сценка съ натуры», «Картинка съ натуры».

Яшчэ адной асаблівасцю згаданых твораў з'яўляецца адсутнасць пераліку дзейных асоб і аўтарскай характарыстыкі іх у пачатку. Гэта можа тлумачыцца не толькі малой колькасцю герояў, але і тым, што персанажы драматурга – гэта тыпы, а не індывідуальнасці са сваімі характарамі.

Некаторыя драматычныя абразкі можна назваць сцэнічнымі маналогамі: «Бабылкіна гора» – манадрама, у «З жыцця лепельскіх сялян» прамаўляе толькі адзін персанаж, астатнія моўчкі з ім узаемадзейнічаюць, у «Прамове старшыны да валаснога сходу» пісар і старшына звяртаюцца да сялян, працягваючы думкі адзін аднаго.

Творца выкрываў надзённыя заганы грамадства: п'янства, подкупы ў судах, і да таго ж выстаўляў у сатырычным асвятленні дзейнасць царскіх ураднікаў.

Найбольш пісьменнік распрацаваў у драматургіі матыў пошуку праўды («Бабылкіна гора», «Янкава скарга»), што родніць творчасць А. Пшчолкі з паэзіяй Ф. Багушэвіча («Праўда», «Як праўды шукаюць», «Кепска будзе!» і інш.).

У абразку «Бабылкіна гора» жабрачка наракае на несправядлівасць старшыны, але перакананая: «*А все-жъ правды на свѣти найду… Хоть тутъ правды мало, да на свѣти она не сгинула! Начальство разбереть! Начальство на свѣти есь!*» [1, с. 11]. Такім чынам, А. Пшчолка адлюстраваў веру простага народа ў справядлівасць асоб, якія стаяць над ім, і ў тое, што яны павінны бараніць праўду на свеце. Гэтая думка нявольна ўступае ў палеміку з Багушэвічам, які пісаў:

Даўней, кажуць, праўда па свеце хадзіла,
Жабруючы ж, змёрла, а людцы схавалі
(«Праўда» [2, с. 30])
Як простая праўда згінула у свеце…
(«Як праўды шукаюць» [2, с. 22])

Фінал п'есы адкрыты: мы не ведаем, ці здабыла перамогу ў судзе бабылка. М. Гарэцкі даў гэтаму твору вельмі высокую ацэнку: «*Наагул, бабылка Пшчолкі – самы дасканальны беларускі тып і адзін з лепшых мастацкіх тыпаў беларускае*

*літэратуры*» [3, с. 122]. У пазнейшай рэдакцыі сваёй «Гісторыі», М. Гарэцкі выказаўся больш стрымана, адзначыўшы толькі, што бабылка з'яўляецца тыпам [4, с. 272].

У «Янкавай скарзе» паказаны ўжо сам суд і «начальства», на якое ўскладаў надзеі беларускі селянін. Янка Цімафееў падаў скаргу, што брат адабраў у яго хату, нанёсшы цялесную шкоду. На працягу працэсу падкуплены пісар усяляк спрабуе апраўдаць абвінавачанага Пахома. Так, ураднік з дзясятак разоў загадвае Янку і яго-ным сведкам маўчаць.

У выніку вінаватым выстаўляецца сам Янка. Старшына разважае: «*Якъ мнѣ, Яночка, здается, ты самъ больше усюдахъ виноват… Замѣсто того, штобъ табѣ жить, якъ людцы… мирно, тихо, по-божьему, ты идешь насупротивъ, на брата цѣлый день вантажешься. И самъ не живешь, и людямъ житья отъ тебѣ нѣтъ… Штобъ отдать брату треттинку, подѣлицца, якъ людцы дѣлюцца, а ты его енчишь… И усѣхъ за носъ тягаешь… Зъ волоской домой, зъ дому у волоскую… Якъ разъ у батьку уродіуся… Тожъ первый бунтавщикъ быу…*» [5, с. 14]. Такім чынам, пісьменнік выкрывае ўраднікаў і іхнюю абыякавасць да праблем простага люду і незацікаўленасць у падобных расследаваннях.

У канцы Янку караюць арыштам, на што ён разгублена прамаўляе: «*Я не знаю… развѣ… што ты цѣлыя ночи… пьешь кровь хрестьянскую…*» [5, с. 17]. На нашу думку, у гэтай (адной з заключных) рэпліцы аўтар выказаў уласную думку датычна такіх ураднікаў. Варта таксама зазначыць, што пазней А. Пшчолка атрымаў юрыдычную адукацыю. Магчыма, падобныя выпадкі і паспрыялі выбару творцы.

На думку М. Гарэцкага, «Янкава скарга» «*вельмі добрая сатыра*» [4, с. 273]. Мы ж дапоўнім гэтае сцверджанне, што пісьменнік змог спалучыць у адным творы сатырычнае ў вобразе ўраднікаў і драматычнае ў вобразе Янкі Цімафеева, даўшы першы ўзор трагікамедыі па-беларуску.

Абразок «Прамова старшыны да валаснога сходу» дэманструе, як нягегла ўраднікі спрабуюць прыцягнуць сялян да грамадскай дзейнасці, а канкрэтна ахвяраваць грошы пацярпелым ад голаду ў Расеі.

Камізм у дадзеным творы будуецца на кантрасце каснаязычнага старшыны і адукаванага пісара. Так, маўленне старшыны перасыпанае паўторамі і ўстаўнымі канструкцыямі: «*Во, братцы, мы афяруемся, знацца, на голодныхъ, бо на Росе́и голодовка… знацца начинаицца… Во и якъ панъ писарь кажить… што… кажить… што́…*» [6, с. 37]. Тым часам, пісар красамоўна заклікае: «*Этимъ мы осушимъ слезы…*» [6, с. 38].

Аўтарская іронія прасочваецца і ў заўвагах у дужках, напрыклад: «*придвигаясь къ толпѣ и выразительно помахивая руками*» [6, с. 37–38], «*окончательно разошовшійся въ краснорѣчіи*» [6, с. 38].

У канцы вуснамі старшыны аўтар наракае: «*Нихай же, браццы, другій потушить слезы… бо кхъ… кхъ… ня Богъ вѣдаить, што тамъ тая копейка, ти то гарницъ хлѣба, бо… другій разъ и рубъ пропадаить у пусто ти у Шмерки, ти у Янкеля, ти такъ за винополію пойдеть… Барыши чіе?..*» [6, с. 38]

У п'есе «З жыцця лепельскіх сялян» пісьменнік яшчэ больш рэзка выкрывае праблему празмернага спажывання алкаголю сярод сялянства. Вуснамі наведніка

карчмы творца крытыкуе яўрэйскі народ: «*Мы, напримѣра, крестьянской вѣры, живемъ, знацца, на своемъ хлѣбѣ, а ты только и живешь крутней… Такъ тольки што обманешь…*» [6, с. 101], «*Кровь крестьянскую пьешь, быдла ты!..*» [6, с. 102]. Варта згадаць, што ў той жа час выйшла брашура А. Ельскага «Слова аб праклятай гарэлцы і аб жыцці і смерці п'яніцы» (1900), дзе, аднак, яўрэі ні ў чым не вінавацяцца. Антысемітызм драматурга для мяжы XIX і XX стст. нельга назваць выключнай з'явай, тым не менш як адзнаку светапогляду і ідэйнай накіраванасці вылучаць, на нашу думку, варта.

У сваіх творах А. Пшчолка па-майстэрску адлюстраваў жыццё, нягоды і ўнутраны свет беларускага селяніна, у тым ліку і ў п'есах. Пісьменнік выявіў не толькі талент сатырыка, але і выдатна паказаў драматызм, які праследаваў долю простага люду. Творца крытыкаваў рэчаіснасць, якую бачыў, спадзеючыся, такім чынам, данесці несправядлівасць дадзенага парадку рэчаў.

Немалаважна таксама, што калі не ўлічваць згубленую п'есу Ядвігіна Ш. «Злодзей», то А. Пшчолка – першы беларускамоўны драматург пасля В. Дуніна-Марцінкевіча. Сваімі сцэнічнымі замалёўкамі А. Пшчолка адрадзіў беларускамоўную драму і даў ёй штуршок да далейшага развіцця.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Пщелко А. Р.* Бѣлорусскіе разсказы. Витебскъ: Губернская Типо-Литографія, 1901.
2. *Багушэвіч Ф.* Творы: Вершы, паэма, апавяданні, артыкулы, лісты / уклад., прадм. Я. Янушкевіча; Камент. У. Содаля, Я. Янушкевіча; Маст. Г. Хінка-Янушкевіч. Мінск: Мастацкая літаратура, 1991.
3. *Гарэцкі М.* Гісторыя беларускай літэратуры. Вільня: Віленскае выдавецтва Б. А. Клецкіна, 1924.
4. *Гарэцкі М.* Гісторыя беларускай літаратуры / уклад. і падрыхт. тэксту Т. С. Голуб. Мінск: Мастацкая літаратура, 1992.
5. *Пщелко А. Р.* Янкина жалоба. Витебскъ: Губернская Типо-Литографія, 1900.
6. *Пщелко А. Р.* Очерки изъ жизни бѣлорусской деревни. Витебскъ: Губернская Типо-Литографія, 1899.

# МУЗЫКА ЯК КУЛЬТУРНЫ ГЕРОЙ У БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ XX СТ.

**Ю. А. Афанасьева**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр-т Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь,*
*5902053@mail.ru;*
*Навуковы кіраўнік – кандыдат філалагічных навук, дацэнт Г. М. Бутырчык*

Разгледжаны асаблівасці выкарыстання героя-музыкі ў беларускай літаратуры XX ст. Вызначана, што ён набывае рысы культурнага героя праз адлюстраванне абагульненных культурных характарыстык, краевугольных пытанняў экзістэнцыі беларускага народу. Для героя характэрна наступнае: 1) наяўнасць боскага дару і яго выкарыстанне дзеля трансляцыі ўніверсальных чалавечых каштоўнасцей (любоў да блізкага чалавека, радзімы, чалавецтва і жыцця ўвогуле); 2) праходжанне працэсу ініцыяцыі, пераадоленне розных перашкодаў праз выказванне праўды, праходжанне шляху-квэсту, каб дасягнуць сваёй мэты; 3) пакутніцтва і/альбо смерць за ісціну, што звязана з паганскімі альбо біблейскімі матывамі, падабенствам да Ісуса Хрыста. Беларускі Арфей – гэта часцей Прарок, які з дапамогай таленту спрабуе вырашыць канфлікты ў грамадстве, атрымлівае імя і гісторыю, застаецца ў народнай памяці.

***Ключавыя словы:*** Арфей; архетып; беларускае адраджэнне; матыў; музыка; універсалія.

# МУЗЫКАНТ КАК КУЛЬТУРНЫЙ ГЕРОЙ В БЕЛОРУССКОЙ ЛИТЕРАТУРЕ XX В.

**Ю. А. Афанасьева**

*Белорусский государственный университет,*
*пр-т Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь,*
*5902053@mail.ru;*
*Научный руководитель – кандидат филологических наук, доцент А. М. Бутырчик*

Рассмотрены особенности использования героя-музыканта в белорусской литературе XX в. Определено, что он приобретает черты культурного героя через отражение обобщенных культурных характеристик, краеугольных вопросов экзистенции белорусского народа. Для героя характерно следующее: 1) наличие божественного дара и его использование для трансляции универсальных человеческих ценностей (любовь к близкому человеку, Родине, человечеству и жизни вообще); 2) прохождение процесса инициации, преодоление различных препятствий через высказывание истины, прохождение пути-квеста, чтобы достичь своей цели; 3) мученичество и/или смерть за истину, которая связана с языческими или библейскими мотивами, подобием до Иисуса Христа. Белорусский Орфей – это чаще Пророк, который с помощью таланта пытается разрешить конфликты в обществе, получает имя и историю, остается в народной памяти.

***Ключевые слова:*** Орфей; архетип; белорусское возрождение; мотив; музыка; универсалия.

# THE MUSICIAN AS THE CULTURAL HERO IN THE BELARUSSIAN LITERATURE OF THE 20TH CENTURY

**Y. A. Afanasyeva**

*Belarusian State University,*
*4 Independence Avenue, 220030, Minsk, Belarus,*
*5902053@mail.ru;*
*Supervisor – PhD, Ass. Professor G. M. Butyrchyk*

The article considers the peculiarities of using the hero-musician in the Belarusian literature of the twentieth century. It is determined that he acquires the features of a cultural hero through the reflection of generalized cultural characteristics, the cornerstones of the existence of the Belarusian people. It is typical for a hero: 1) the presence of a divine gift and its use to translate universal human values (love for a loved one, Homeland, humanity and life in general); 2) going through the initiation process, overcoming various obstacles through the expression of truth, passing the quest path to achieve your goal; 3) martyrdom and/or death for the truth, which is related to pagan or biblical motifs, similarity to Jesus Christ. The Belarusian Orpheus is more often a prophet who, with the help of his talent, tries to resolve conflicts in society, gets a name and a story in order to remain in people's memory.

***Keywords:*** Orpheus; archetype; the Belarusian revival, motive; music; universal.

Архетыпічныя персанажы як інструменты, з дапамогай якіх сімвалічныя вобразы мажліва ўключыць у калектыўнае несвядомае і такім чынам надаць ім універсальнае значэнне, выкарыстоўваюцца рознымі супольнасцямі ў якасці міфалагічнага базісу існавання народу. Культурны герой, на думку С. С. Беразоўскай, з'яўляецца рацыянальна-тэарэтычным канструктам-універсаліяй, залежным ад пануючага тыпу філасофіі ў канкрэтны гістарычны перыяд [1]. Класічны яго варыянт – міфічны персанаж, творца новых міфаў, які 1) упершыню знаходзіць альбо стварае розныя прадметы культуры альбо ўдзельнічае ў светапабудове; 2) вучыць людзей жыццёва неабходным рэчам (паляванне, рамёствы, мастацтва); 3) уводзіць новыя правілы для сацыяльных стасункаў, рытуалаў, святаў і інш. [2] Цэласнасць культурнага архетыпу, які носіць памяць розных пакаленняў, суадносіцца з працэсамі фарміравання асобы, яе самаідэнтычнасці і менталітэту.

Арфей як герой-музыка, летуценнік, асоба, здольная тонка і глыбока адчуваць і разумець прыроду, першапачаткова з'яўляецца героем старажытнагрэцкага міфа, дзе яго галоўнае выпрабаванне – вярнуць жонку Эўрыдыку, якая памерла праз укус ядавітай змяі, з падземнага царства Аіда. Цудадзейны талент героя дае яму мажлівасць забраць з сабою душу дзяўчыны ў свет жывых пры ўмове не глядзець на яе падчас вандроўкі дадому, але перад выхадам да сонечнага святла Арфей не вытрымлівае і парушае дамову. Цень каханай знікае, а няўцешны творца блукае па зямлі і пяе сумныя рэчы, пакуль яго жыццё не абрываюць раз'юшаныя вакханкі. Матывы геніяльнасці і боскага дару аб'ядноўваюцца з матывамі страты чагосьці каштоўнага

(блізкага чалавека, сям'і і інш.), пераадолення шляху-квэсту дзеля вяртання страчанага, паўторнай страты і адчування ўласнай творчасці як праклёну. З цягам часу спецыфічны міф атрымлівае ўніверсальнае значэнне, а яго герой апынаецца сімвалам, носьбітам душы нацыі.

Кажучы пра беларускую літаратуру, літаратуразнаўца Я. А. Лойка піша наступнае: «…музычны элемент вельмі багата ўплецены ў агульны літаратурны пояс, пачынаючы з "Песні пра зубра" М. Гусоўскага і заканчваючы творамі Ф. Багушэвіча, Цёткі, Я. Купалы, Я. Коласа – гэты спіс бясконцы. Увогуле беларуская паэзія, асабліва перыяду Беларускага Нацыянальнага Адраджэння ў пачатку XX ст., вылучаецца выразнай музыкальнасцю. Гэта тычыцца і мовы і рытму» [3, с. 158]. Сапраўды, беларускае адраджэнне як перыяд актыўнай міфатворчасці вызначаецца асаблівай ўвагай да родных спеваў і іх творцы, песняра, які можа сваім голасам паўплываць на асяроддзе. Архетыпічны вобраз адоранага музычным талентам чалавека становіцца ўвасабленнем Паэта, які спявае сумныя песні пра нядолю свайго народа, без магчымасці нешта змяніць з дапамогай дзеяння. З іншага боку, такі герой можа стаць (і часцей становіцца) Прарокам, палымянае слова якога ўздзейнічае на сэрцы слухачоў і натхняе іх на актыўныя дзеянні супраць прыгнёту. Такі культурны герой звязаны з матывам шляху, ініцыяцыяй, якая дазваляе герою данесці ісціну да людзей, нават страціўшы ўласнае жыццё. Музыка апынаецца нацыянальным героем, які транслюе сапраўдныя чалавечыя каштоўнасці, аб'ядноўвае фрагментаваную супольнасць.

Пачынаючы са зборнікаў Ф. Багушэвіча «Дудка беларуская» (1891) і «Смык беларускі» (1894), надрукаваных пад псеўданімам Мацей Бурачок і Сымон-Рэўка з-пад Барысава, тэма творцы з народу пашыраецца сярод інтэлігенцыі. Наступныя радкі сведчаць пра пераемнасць традыцыі такой містыфікацыі (выдаваць сябе за простага селяніна, адоранага талентам вершаскладання і адчування рытмаў родных спеваў), надзею на працяг працы на ніве беларускай паэзіі: «Граю трошкі на скрыпачцы, ну дык няхай і мая ксёнжачка завецца струмантам якім; вот я і назваў яе "Смык". Смык ёсць, а хтось скрыпку, можа, даробе, а там была "Дудка" – вот і мы зробім музыку, як тыя жыдкі, што на цымбалах іграюць» [4, с. 65]. Зборнік Цёткі «Скрыпка беларуская» (1906) пад псеўданімам Гаўрыла з-пад Полацка адгукаецца на гэты вокліч: «Выйшла з-пад рук "Скрыпка". Цяпер кручу "Струны". А ты, Мацей Бурачок, ідзі, ідзі ўздоўж і папярок нашага беднага краю, братоў родных вітай, да курных хат заглядай, мо знайдзеш там артыста, каторы збярэ ўсе нашы беларускія інструманты і наладзіць гранне як мае быць» [5, с. 138]. Ідэя аркестру, створанага з беларускіх творцаў, атаясамліваецца з жаданнем еднасці, гармоніі, трансляцыі нацыянальных каштоўнасцей без аніякіх перашкод. Часцей за ўсё менавіта такія героі несправядліва пакутуюць, спрабуючы выказаць уласнае меркаванне. Безназоўны пясняр у лірычным апавяданні «Музыка» (1907) М. Багдановіча страчвае жыццё ў турме «сільных людзей», але памяць аб ім захоўваецца, каб далей «будзіць людзей к свету, праўдзе, брацтву і свабодзе» [6, с. 187]. Герой выступае ў якасці сумнага сведкі людскіх пакутаў, змагара за праўду, за што трапляе за краты і страчвае жыццё. Суадносяцца матывы шчырасці выканаўцы і адухаўлення ягонага інструмента (у дадзеным выпадку – скрыпкі): «Душа яго знала ўсё тое гора, што бачыў ён па людзях; гэта гора грала на скрыпцы,

гэта яно вадзіла смыкам па струнах; і ніводзін сыты не мог так граць, як грала народнае гора» [6, с. 187].

Я. Купала выкарыстоўвае арфічныя матывы ў паэтычнай творчасці для фарміравання выявы песняра-змагара за свабоду, чалавека-прыкладу, які будзе сеяць у чалавечых душах зерне разваг наконт уласнага жыцця [7]. У паэме «Курган» (1910) гусляр, ужо сівы старца, выказвае праўду князю: «Люба чуці табе скочнай музыкі звон: // Ты, дружына п'яцё асалоду, – // А ці ўслухаўся ты, як плыве з яе стогн, // Стогн пракляцця табе, твайму роду?!» [8, с. 14]. Ягоныя словы абуджаюць сумленне князя, але шчыры папрок несправядлівасці ўлады каштуе песняру жыцця. Прывід музыкі, які пяе толькі яму зразумелыя песні, уздымае тэму неўміручасці мастацтва і вечнага жыцця слова. Іншы падобны да міфалагічнага Арфея герой, Данілка Зяблік з драмы «Раскіданае гняздо» (1913), майструе сабе скрыпку, каб потым з маці пайсці жабраваць. Шукаць жывой вады разам са скрыпкай. «Дык не бядуйце, мамка! Я незадоўга ўжо скрыпку сваю скончу і так тады зайграю, так зайграю, што ўжо нікому з нас так галасіць не захочацца!» [9, с. 219]. Хлопец страчвае першы інструмент, бо скрыпку ламае бацька, другую пагражае знішчыць старэйшы брат Сымон. Такім чынам закранаецца суаднясенне жабрацкага, цяжкага жыцця і мастацтва, для якога патрэбна збаўленне ад цяжкай, фізічнай працы. Такім чынам, у незалежнасці ад узросту, пясняр Я. Купалы намагаецца змяніць цяперашні лад жыцця.

Сымон-музыка ў аднайменнай ліра-эпічнай паэме Я. Коласа, выдадзенай у 1925 г., праходзіць цяжкія выпрабаванні, але не абірае шлях прыніжэння перад панамі і, згодна з рамантычнай канцэпцыяй твора, толькі ўскосна паўплывае на парушэнне панскага бяспраўя. Сымон – герой-вандроўнік, які рэалізуе матывы боскага дару, таленту, які можа быць скарыстаны шчырым і наіўным юнаком толькі дзеля людзей. Яго мэта – несці свае спевы, поўныя глыбокімі разважаннямі пра сутнасць жыцця і сацыяльныя праблемы, у народ, што адлюстроўвае глыбінныя думкі аўтара твора пра свае наканаванне ў жыцці: «Пайшоў Сымон сваёй пуцінай, // Бо ён прыроджаны пясняр. // Панёс ён людзям песень дар – // Агонь душы і сэрца жар, // Панёс пяснярскай каляінай» [10, с. 276]. Яго Эўрыдыка, Ганна, у трох рэдакцыях паэмы мае розны лёс: альбо смерць, як гэта і належыць па міфалагічным сюжэце, альбо шчаслівае ўваскрошанне і блуканне з Сымонам па зямлі. Даследчыца Т. І. Шамякіна звяртае ўвагу на тое, што сэнс жыцця Сымона, які прайшоў ініцыяцыю рознымі выпрабаваннямі на сваім шляху, не ў служэнні народу, а ў каханні, якое ўздымае чалавечую душу да недасяжнай вышыні сапраўды чыстага, боскага пачуцця [11]. Цікава, што ў прытчы напрыканцы твора героі параўноўваюцца з кветкай (Ганна як лілея) і з птушкай (Сымон як пташына-пясняр) – апошняе параўнанне цалкам відавочна, калі пад ім разумець сімвал свабоднага палёту думкі і слова. Таксама Арфей, адаптаваны да беларускай рэчаіснасці пачатку XX ст., надае асаблівую ролю мове. Як разважае Т. М. Федарцова, аналізуючы паэтычную традыцыю гэтага часу: «Арфізм стаў вызначальнай асаблівасцю і беларускай санетыстыкі, якая сама сабой закліканая служыць ідэям хараства і ўзвышанасці. Але недаверлівы і абачлівы беларус у той жа час задумаўся: ці не ўяўная музыка Арфея ў ціхаплынным рэчышчы нашага слоўнага

мастацтва? Не выпадкова ж Якуб Колас у паэме “Сымон-музыка” падкрэсліў непадабенства тыповых рысаў “беларускага Арфея” з тыповымі, прынятымі за эталон, рысамі сусветна вядомага вобраза мастака-вандроўніка, бо наш Арфей толькі носьбіт рысаў арфізму, а па сутнасці застаецца Прарокам. Найвышэйшую асалоду ён атрымлівае не толькі ад суладнасці гукаў у павевах роднага вятрыскі ці шуме лесу, бо навучыўся разумець настрой Прыроды і перадаваць яго людзям, але, галоўнае, для яго важна тое, што гукамі роднай мовы, яе хараством можна згарманізаваць унутраную музыку роднага слова і аповед пра харство роднага краю» [12, с. 15].

Галоўны герой празаічнага апавядання «Салавей» (1928) З. Бядулі, таксама Сымон, выступае ўвасабленнем творцы-мастака, які скарыстоўвае ўласны талент дзеля барацьбы з класавай несправядлівасцю. Юнак мае мімікрычныя здольнасці: падрабляць галасы жывёлаў, птушак і людзей. Яго мастацтва апелюе да пачуццяў, што неаднаразова дапамагае адплаціць панам за здзекі з сялян (герой падрабляе выццё ваўка, каб адпомсціць за маці Зоські) і нават выбаўляе яго ад смерці, падрабляючы гукі салаўя і гэтым абуджаючы ў памяці паноў салодкія моманты іхняга мінулага. Аднак гэтыя змены аблічча сцвярджаюць ваганні маладога хлопца ў самавызначэнні – як спалучыць чуласць душы з жорсткасцю змагара за справядлівасць? Іншы музыка, капельмайстар з прыгонных, Антон Мурашка, не ўмее падрабляць галасы альбо гукі жывёл, але ў яго руках спявае людское гора. Менавіта яго скрыпка адлюстроўвае пачуцці і памкненні сялян, якія збеглі з панскай службы і вырашаюць, як адпомсціць за свой боль: «У адзін і той самы час чуваць былі розныя галасы: адна струна заходзілася ад плачу, другая дзіка рагатала, а трэцяя струна кудысьці клікала-звала грозным крыкам» [13, с. 182–183]. Як кажа даследчыца В. І. Локун, «Тып бядулеўскага героя – тып героя ўніверсальнага, крэатыўнага. Гэта – Мастак, Музыка, носьбіт хараства. Герой марыў ператварыць свет з дапамогай Мастацтва. Але новае жыццё патрабавала і новага іншага героя. З літаратуры знікаў вобраз Песняра як сына Прыроды, сына Сусвету. У гэтым унутраная драма бядулеўскага героя, ды і самога аўтара» [14, с. 126]. Музыкі З. Бядулі натхняюць нацыянальна-вызваленчы рух, надаюць хаосу негатыўных эмоцый, назапашаных падчас траўматычнага досведу, структуру зладжанага сялянскага бунту.

Рамантычным варыянтам Арфея, аб’ядноўваючага культурнага героя і трыкстара ў адным персанажы, можна назваць Гервасія Выліваху з «Ладдзі роспачы» (1964) У. Караткевіча, які праз уласную зухаватасць абыгрывае ў шахматы саму Смерць і набывае правы на далейшае існаванне на беларускай зямлі. Гервасій грае на лютні, і сваімі спевамі натхняе тых, хто знаходзіцца на шляху ў небыццё. Менавіта яго прага жыцця, любоў да роднай зямлі і людзей на ёй дае магчымасць выцягнуць сваю Эўрыдыку-Бярозку з апраметнай і пражыць з ёй доўгае жыццё. Выкарыстанне антычных, паганскіх і хрысціянскіх матываў, на думку даследчыц Г. М. Бутырчык і М. М. Казлоўскай, дазваляюць разглядаць героя адначасова як Ісуса Хрыста, Арфея і ўладальніка магічнай кветкі шыпшыны [15]. Кожная песня, якую спявае Гервасій Выліваха, поўная аптымізму і веры ў чалавека, што адрознівае гэтага персанажа ад шэрага іншых герояў з арфеічнымі рысамі: «Любяць нас неба, віно і кабеты. // Сонцам чырвоным, сонцам прарочым, // Люд наш упарта ўстае над светам // Нават пасля

найцямнейшай ночы. // Гэта наш гонар, шчасце і сіла: // Жыць насупор уварванням і ранам // Там, дзе даўно бы другім пакасілі // Радасць і сонца, песню й каханне» [16, с. 38]. І зноў, як Сымон-музыка, Гервасій абірае ў якасці вышэйшай ісціны менавіта любоў, якую нельга абмежаваць.

Такім чынам, музыка ў беларускай літаратуры XX ст. набывае рысы культурнага героя праз адлюстраванне абагульненых культурных характарыстык, краевугольных пытанняў экзістэнцыі беларускага народу. Для героя характэрна 1) наяўнасць боскага дару і яго выкарыстанне дзеля трансляцыі ўніверсальных чалавечых каштоўнасцей (любоў да блізкага чалавека, радзімы, чалавецтва і жыцця ўвогуле); 2) ініцыяцыя, пераадоленне розных перашкодаў праз выказванне праўды, праходжанне шляху-квэсту, каб дасягнуць сваёй мэты; 3) пакутніцтва і/альбо смерць за ісціну, што звязана з паганскімі альбо біблейскімі матывамі, падабенствам да Ісуса Хрыста. Беларускі Арфей – гэта часцей Прарок, які з дапамогай таленту спрабуе вырашыць канфлікты ў грамадстве, атрымлівае імя і гісторыю, застаючыся ў народнай памяці.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Березовская С. С.* Культурный герой как универсалия культуры: опыт типизации : автореф. дисс. ... канд. филос. наук : 24.00.01; Нац. иссл. Томск. гос. ун-т. Томск, 2016.

2. *Мелетинский Е. М.* О литературных архетипах. М., 1994.

3. *Лойка Я. А.* Музычная культура як фактар развіцця беларускай ідэнтычнасці // Актуальные проблемы гуманитарного образования : материалы VIII Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 22–23 окт. 2021 г. Минск : БГУ, 2021. С. 156 – 162.

4. *Багушэвіч Ф. К.* Творы. Уклад. і прадм. Я. Янушкевіча. Мінск : Маст. літ., 1991.

5. *Цётка*. Прадмова да «Скрыпкі беларускай» // Беларуская літаратура: Хрэстаматыя. Ч. 3. (1901–1920). Дапаможнік для польскіх студэнтаў па спецыяльнасці «Беларуская філалогія». Склад. М. Хаўстовіч. Мінск, 2006. С. 138.

6. *Багдановіч М. А.* Музыка // Пярсцёнак : выбраныя творы. Уклад. У. М. Сіўчыкава. Мінск : Папуры, 2023. С. 186– 187.

7. *Конан У. М.* Прарок у вобразе музыкі : Арфічныя матывы ў творчасці Янкі Купалы // Роднае слова. 2005. № 7. С. 24–27.

8. *Купала Я.* Курган // Беларуская літаратура: Хрэстаматыя. Ч. 3. (1901–1920). Дапаможнік для польскіх студэнтаў па спецыяльнасці «Беларуская філалогія». Склад. М. Хаўстовіч. Мінск, 2006. С. 10–15.

9. *Купала Я.* Раскіданае гняздо // Поўны Зб. тв. : у 9 т. Мінск, 2001. Т. 7. С. 204–262.

10. *Колас Я.* Сымон-музыка. Менск: Дзяржвыд. Беларусі, 1925.

11. *Шамякіна Т. І.* Вобраз музыкі ў беларускай літаратуры: паводле паэмаў Янкі Купалы «Курган» і Якуба Коласа «Сымон-музыка» //Роднае слова. 1992. № 12. С. 18–25.

12. *Федарцова Т. М.* Замежная літаратура. Антычны перыяд: Вучэбна-метадычны дапаможнік для студэнтаў спецыяльнасці «Выдавецкая справа» завочнага факультэта. Мінск : БДТУ, 2005.

13. *Бядуля З.* Салавей. // Выбраныя творы. Уклад., прадм., камент. У. Казберука. Мінск : Белкнігазбор, 2006. С. 57–198.

14. *Локун В. І.* Птахі з падрэзанымі крыламі. Фрэдэрык Стэндаль і Змітрок Бядуля: да праблемы свабоды і чалавека // Полымя. 2013. № 12. С. 120–127.

15. *Караткевіч У. С.* Ладдзя роспачы. Мінск : Папуры, 2024.

16. *Бутырчык Г. М., Казлоўская М. М.* «І я не пакіну пасля сябе другой Візантыі, акрамя любові» : нацыянальнае і ўніверсальнае ў аповесці У. Караткевіча «Ладдзя Роспачы» // Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай: да 900-годдзя Кірыла Тураўскага і 200-годдзя Тараса Шаўчэнкі : матэрыялы XI Міжнар. навук. канф., Мінск, 24–26 кастр. 2013 г. У 2 ч. Ч. 1. Пад рэд. Т. П. Казаковай. Мінск : РІВШ, 2013. С. 253–261.

## ЖАНОЧЫЯ ВОБРАЗЫ Ў ПАЭЗІІ У. ДУБОЎКІ

**І. І. Шматкова[1)], А. Р. Кухальская[2)]**

*[1)] Кандыдат філалагічных навук, дацэнт, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр-т Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, i.shmatkova@gmail.com;*
*[2)] Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр-т Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, nastakukhalskaa@gmail.com;*
*Навуковы кіраўнік – кандыдат філалагічных навук, дацэнт І. І. Шматкова*

Акрэсліваецца месца жаночых вобразаў у шматграннай вобразнай сістэме паэзіі У. Дубоўкі, выяўляюцца фальклорныя асновы фарміравання дадзенага тыпу вобразаў, прасочваецца іх функцыянаванне ў розныя перыяды творчасці паэта, выяўляецца іх роля ў раскрыцці ідэйна-тэматычнага зместу лірычных твораў, у пашырэнні іх жанрава-стылёвай разнастайнасці.

***Ключавыя словы:*** жаночыя вобразы; паэзія; У. Дубоўка; ідэйна-тэматычны змест; жанрава-стылёвая разнастайнасць.

## ЖЕНСКИЕ ОБРАЗЫ В ПОЭЗИИ В. ДУБОВКИ

**И. И. Шматкова[1)], А. Р. Кухальская[2)]**

*[1)] кандидат филологических наук, доцент, Белорусский государственный университет, пр-т Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, i.shmatkova@gmail.com;*
*[2)] Белорусский государственный университет, пр-т Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, nastakukhalskaa@gmail.com;*
*Научный руководитель – кандидат филологических наук, доцент И. И. Шматкова*

Подчеркивается место женских образов в многогранной образной системе поэзии В. Дубовки, выявляются фольклорные основы формирования данного типа образов, прослеживается их функционирование в разные периоды творчества поэта, проявляется их роль в раскрытии идейно-тематического содержания лирических произведений, в расширении их жанрово-стилевого разнообразия.

***Ключевые слова:*** женские образы; поэзия; В. Дубовка; идейно-тематическое содержание; жанрово-стилевое разнообразие.

## WOMEN'S IMAGES IN THE POETRY OF U. DUBOVKA

**I. I. Shmatkova[1)], A. R. Kuhalskaya[2)]**

*[1)] PhD, Ass. Professor, Belarusian State University, 4 Independence Ave., 220030, Minsk, Belarus, i.shmatkova@gmail.com;*
*[2)] Belarusian State University, 4 Independence Ave., 220030, Minsk, Belarus, nastakukhalskaa@gmail.com;*
*Supervisor – PhD, Ass. Professor I. I. Shmatkova*

The article outlines the place of female images in the multifaceted figurative system of U. Dubovka's poetry, reveals the folklore foundations of the formation of this type of images, traces their functioning in different periods of the poet's work, reveals their role in revealing the ideological and thematic content of lyrical works, in expanding their genre and style diversity.

***Keywords:*** female images; poetry; U. Dubovka; ideological and thematic content; genre and style diversity.

У. Дубоўка сцвердзіў сябе ў беларускай культуры як выдатны паэт, пісьменнік, перакладчык, мовазнаўца, адзін з лідараў літаратурна-мастацкага аб'яднання «Узвышша». Найбольш актыўны і плённы перыяд творчасці У. Дубоўкі прыпадае менавіта на маладыя гады, перыяд перад высылкай (1921–1930). У гэты час з-пад яго пяра выходзяць паэтычныя зборнікі «Строма» (1923), «Наля» (1927), паэмы «Кругі» (1927), «І пурпуровых ветразей узвівы» (1929) і інш. Вобразная сістэма творчасці паэта надзвычай шматгранная, але адны з самых захапляльных – жаночыя вобразы.

Упершыню мы сустракаем мілы вобраз дзяўчыны ў дэбютным зборніку У. Дубоўкі «Строма», а канкрэтна толькі **ў адным вершы** – «Не жальбую...». Тут не згадваецца імя музы паэта, аўтар называе яе **тая**, **яна** – быццам штосьці далёкае: *«Пачакаю, пашукаю пільна* ***тую****, // Ад якой я буду зноўку маладым...»* [1, с. 17]. Юны аўтар глядзіць у будучыню з надзеяй, марыць знайсці спадарожніцу жыцця, якая зможа дайсці з ім да глыбокай старасці, быць вернай. Для Дубоўкі яна асаблівая. Нездарма паэт так прыгожа піша пра яе з'яўленнне: *«Яна прыйдзе вольным гоманам сасонкі, // Яна прыйдзе, бы вяночак дзіўных мар...»* [1, с. 17]. Цікава, што ў пазнейшай рэдакцыі (хутчэй за ўсё зменены ў 60-я гг. XX ст. – у гэты час паэт актыўна перапісваў свае раннія творы) верш зусім не пра чаканне прыходу каханай – ён пра «акрасу» – радасць жыцця: *«Пашукаю і знайду акрасу, // што да новых прывядзе ўзлётаў...»* [2, с. 17]. Мара пра верную і каханую жанчыну ажыццявілася: ёй стала прыгажуня Марыя Кляус, якая, як жонкі дзекабрыстаў, паехала за мужам у высылку і разам з ім перажыла ўсе жахі лагернага жыцця.Чаму Дубоўка піша менавіта пра «акрасу»? Амаль 27 гадоў у высылцы, цяжкая фізічная праца ўдалечыні ад радзімы, трагічная смерць сына і інш. – усё гэта моцна адбілася на лёсе і поглядах паэта. Пасля перажытага, вядома, захацелася адчуць подых лёгкасці, спакою, гармоніі.

У другім паэтычным зборніку «Трысцё» жаночыя вобразы сустракаюцца **ў сямі творах**. Адбываюцца пэўныя змены ў адлюстраванні дзяўчыны. Тут яна ўжо не мара, уяўленне, а рэальнасць. Вобраз мяняецца нават у тым, як Дубоўка называе яе. Напрыклад, у вершы «Ты руку сваю забінтавала» дзяўчына – **ты**, **маладая**: *«****Ты*** *руку сваю забінтавала, //* ***маладая****... як цябе і клікаць?..»* [3, с. 14]. Асноўныя матывы твора – перажыванні аб злых людскіх плётках: *«прытуліся… Хай гавораць людзі: // словы іх, як палыновы воцат, // зьвінавацяць і мяне у блудзе…»* [3, с. 14]. Аўтар паказвае гераіню чуллівай, шчырай і нават наіўнай. Яшчэ адзін верш зборніка – «Змрок імклівіў» – расказвае пра сумнае, страшнае здарэнне ў жыцці адной дзяўчыны і пра тое, як яна гэта перажывае: *«Спахмурнелі сінія вочы дзяўчыны, // бы туману сьцюдзёныя столкі…»* [3, с. 21]. У творы для перадачы настрою гераіні аўтар выкарыстоўвае сімвалы: *«Засьпявай хоць вярбу над вадою…»; «ты сьпявала каліну калісьці…»* [3, с. 21]. Вярба – гэта сімвал плачу, смутку, а каліна – прыгажосці і кахання. Дубоўка

паказвае дзяўчыну вельмі жывой, са сваімі перажываннямі і праблемамі. У гэтых двух вершах сам паэт паўстае надзейным і добрым хлопцам, які заўсёды падставіць сваё моцнае плячо.

У вершы «Нафарбавала навошта вусны» таго ж зборніка паэт натхняецца незвычайнай прыгажосцю дзяўчыны: *«Шэнціла ж косы табе рассыпаць // чорна-сіняй, ня наскай кудзелі…»* [3, с. 25]. Але Дубоўка адчувае яе недасягальнасць: *«Можа, мне* ***сьнішся і ты****, і горад, //* ***сьніцца адзін раз – прыгожа сьніцца****!..»*; *«Гэта дзяўчына зусім* ***чужая****, // а* ***я*** *– таксама* ***ня свой дзяўчыне****...»; «дык прытулі* ***мужыцкага сына****...»* [3, с. 24–25]. Тут жаночы вобраз набывае адценне хітрасці, гарэзлівасці, какетлівасці; для перадачы сілы жаночых чараў паэт выкарыстоўвае традыцыйныя фальклорныя вобразы: *«Рукі заломіць, паўзе вужакай, // быццам з марскога дна багавіньне...»* [3, с. 24].

У зборніку «Трысцё» ёсць невялікая паэма ў стылі народнай легенды, каторая так і называецца «Дзяўчына». У. Дубоўка такім чынам паказвае яе вобраз: *«Красуня-Дзяўчына! у вочах блакіт, // а твар бель-ірдзельнай, вазёрнай лялеі… // Красуня-Дзяўчына! – вянок, васількі; // з іх водарыць дзіўным алеем…»* [3, с. 33]. Тут у жаночым вобразе ўвасабляецца Беларусь, да якой заляцаліся «два хлопцы»: адзін з усходняга боку, другі – з заходняга. У паэме У. Дубоўкі, напісанай у 1922 г., абодвух каханых, якія загінулі, хаваюць на адной гары, дзе яны нарэшце прымірыліся.

Ёсць у зборніку яшчэ адна народная легенда, якая расказвае пра паходжанне назвы горада Брагін – «Бра…гінь…». У цэнтры сюжэта – заляцанне пана да вясковай дзяўчыны Алесі, браты якой былі катэгарычна супраць такога саюзу, таму ім прыйшлося ўцякаць ад панскіх коняў. Нечакана адзін брат трапіў у балота і загінуў, а другі змог уратавацца. Вобраз Алесі паказвае бяздольнасць, немагчымасць супрацьстаяць жыццёвым рэаліям, пакорлівасць, сціпласць.

У паэме «Студэнт» У. Дубоўка адкрывае перад намі ўжо іншы жаночы вобраз: вобраз маці, сын якой стаў камуністам. Хлопец апантана расказвае ёй пра новы лад жыцця, калектыўную працу на карысць краіны. Урэшце, ён адпраўляецца вучыцца ў Маскву. Але сэрца матулі заўсёды чуйнае, тужыць па дзецях: *«Дзе ты, матуля, дзе ты, старая, // пэўна, чакаеш, вернецца сын? // Гэта ты на шляхі паглядаеш… // Не, не палічыш ты дзён і гадзін…»* [3, с. 50]. Пакуль студэнт далёка асвойвае навукі, няшчасную старую пабіў да смерці панскі пастарунак за тое, што яе сын камуніст. Апошнім воклічам старой сталі наступныя словы: *«Сынку, сынку… Ня чуеш, далёкі… // Каласочак… канаю… даруй…»* [3, с. 51]. Вобраз маці – самаахвярны, выражае вялікую любоў да сына.

У паэме «Кляновыя лісты» сустракаюцца два жаночыя вобразы: маці і дачка Ганна. Апісваецца толькі дзяўчына: *«У Ганны, ой! сінія вочы, // у Ганны, ой! русыя косы…»* [3, с. 74]. Маладая паўстае перад намі сапраўднай прыгажуняй, але ёсць адзін момант: *«Палатаная скрозь спадніца, // нібы у нядольлівых кратах…»* [3, с. 75]. Жывуць яны з маці вельмі бедна. Старая просіць дачку прынесці кляновых лістоў, каб зімой было на чым пячы хлеб. Дарэчы, у Дубоўкі кляновыя лісты (альбо проста лісты) – сімвал даволі часты. Вось што пра яго У. Дубоўка пісаў у аўтабіяграфіі: *«Дарэчы, калі я ў адным вершы («Крыху восені і жменька кляновых лістоў») згадаў пра кляновыя лісты, дык адзін «крытык» усё пяўся вытлумчыць іх як нешта вельмі шкоднае. Ён, не ведаючы беларускага жыцця, зусім не разумеў, што кляновыя лісты*

*гэта не толькі сімвал разлукі, як у японскй паэзіі, але і сімвал беднасці»* [4]. Жыццё дзяўчыны крута мяняецца пасля ўступлення ў камсамол, новы лад жыцця – асноўная тэма твора.

Наступны паэтычны зборнік Дубоўкі «Credo» таксама ўключае ў сябе жаночыя вобразы – **у сямі творах**. Гэта вобразы маці, каханай дзяўчыны... Вобраз маці сустракаецца ў вершы «Нікне ўсё ў нейкай шэрай мгле», але вельмі ўскосна – толькі згадваецца. Асноўны матыў твора – змена сацыяльнага становішча сына: «*маці... маці... родная матуля... // Кажуць мне, што я інтэлігэнт, // бо на мне цяпер – // ня зрэбная кашуля...»* [5, с. 7]. Да маці паэт ставіцца вельмі паважна, ласкава называе яе «родная матуля», «любая матуля». У. Дубоўка, адлюстроўваючы сябе ў вобразе лірычнага героя, перажыве, як яна паставіцца да зменаў у ім. Аўтар баіцца страціць сувязь з зямлёй, адкуль пайшоў у свет, у канцы верша рытарычнае пытанне: *«І мяне твае палеткі // ласкава прытуляць?!»* [5, с. 8]. Тут важна згадаць саму маці паэта – Анастасію Іванаўну (у дзявоцтве Гайдуке(о)віч), пра якую паэт пісаў так: *«Маці мая была непісьменная, але мела ясны прыродны розум, вельмі добра ведала беларускую мову і, паўжыцця пражыўшы ў Маскве, гаварыла толькі па-беларуску. Я ніколі не вучыўся ні ў якіх беларускіх школах, усё маё веданне беларускай мовы – ад маці і з вёскі. Вось чаму я маю поўную падставу называць беларускую мову – матчынай мовай»* [4].

Чароўна вобраз дзяўчыны падаецца ў вершы «Вы мелодый не слухаеце»: *«Вочы... ну зірні дзяўчыне // ў вочы. Глыбіня – як жыцьцё прадоннае...»; «каб забыцца аб стройным стане. // Тыя цудоўна-русыя косы // завіваццa не перасталі...»* [5, с. 13]. У творы аўтар не проста выказвае захапленне маладой, а пераплятае, нітуе вобразы радзімы і сваёй каханай: *«Так, здаецца, абняў бы аберуч // і жыцьцё, і лясы, і дзяўчыну...»* [5, с. 13].

Ёсць у Дубоўкі і вершы пра расстанне з любай, як, напрыклад, «Дзіваваўся і так кахаў». Пры гэтым ён не злуецца на дзяўчыну, не выказвае негатыву, а вельмі цёпла апісвае ўспаміны былых сустрэч: *«Дзіваваўся і так кахаў, – // наглядзецца ня мог калісьці. // Зубцамі чорных валос – галава // васільком здавалася шалясьцістым...»* [5, с. 16].

Прыгожае, вобразнае апісанне дзяўчыны Дубоўка дае ў вершы «Я шкадую ўсё ж ткі сябе», у якім расказвае пра тое, як ён спазнаў светлае пачуццё кахання: *«Не чакаў, што вачэй блакіт // можа быць для мяне прадоньнем...»; «Не чакаў, што кужэльная каса // абвівае залатым павучыньнем...»; «Бо прыгожай такой, як ты – // яшчэ людзі не ведалі, мусіць...»* [5, с. 18–19]. Аўтар у творы падкрэслівае ўнікальнасць беларускіх дзяўчат: *«Бо гадуюць трысьцё балаты – // бязумоўна ў аднэй Беларусі... »* [5, с. 19].

Вобраз каханай вядучы і ў вершы «Кармазынам асмужаны", дзе ён пададзены з асаблівым хваляваннем м пяшчотай: *«Ведаеш добра: ты вельмі прыгожая, // вусны твае кармазынам асмужаны. // Вочы ненацкам жыцьцё устрывожылі // і агарнулі сукрыстасьцю кужалю...»* [5, с. 23].

Нечакана ў вершы «І гінулі яны» У. Дубоўкі з'яўляецца вобраз самой Клеапатры – егіпецкай царыцы: *«І гінулі яны за косы Клеапатры, // за вочы тыя, што ня сьняцца нават…»* [5, с. 22], вобраз заморскай царыцы адрозніваецца ад вобразаў беларускіх дзяўчат – тут мы бачым распусную і заганную прыгажосць жанчыны, перад якой мужчына становіцца безабаронным.

Адметна намаляваны жаночы вобраз у вершы «Сінявокая мая». Тут у паэта няма рамантычнага пачуцця – больш праяўляецца сястрынскае стаўленне да дзяўчыны. Аўтар так і называе гераіню – «сястрыца». У цэнтры твора маладая асоба, быццам гераіня «Слуцкіх ткачых» М. Багдановіча, паказана працавітай, стомленай ад ткацтва, адчувае фізічны боль, не бачыць белага свету за кроснамі і шпулькамі. Тут У. Дубоўка таксама не абышоў перанясенне вобраза дзяўчыны на вобраз радзімы. У Беларусі паэт правёў толькі дзіцячыя і юнацкія гады, далей асвойваў навукі ў Маскве. Адтуль, здалёк, ён назірае за лёсам Бацькаўшчыны, марыць наведаць родныя мясціны: *«Ты пра вёску скажаш, я пра гарады... // Дык калі ж прыеду я, дык калі прыеду?..»* [5, с. 31].

Чацвёрты зборнік паэзіі Дубоўка не проста прысвяціў дзяўчыне, але і назваў яе іменем – «Наля» (1927). Хто яна і чаму такое значэнне мае для паэта? *«Спачатку здавалася выпадковым сугуччам – назва кнігі Дубоўкі і літаратурнае імя цяпер малавядомай, а на той час шараговай паэтэсы з Магілёўскай філіі «Маладняка» Налі Маркавай, якое эпізадычна з'яўлялася на старонках беларускага друку 20-х гадоў»* [6, с. 62]. Кім была для Дубоўкі дзяўчына з незвычайным іменем Наля – даведваемся на старонках зборніка. Вобраз дзяўчыны адлюстраваны **ў васьмі творах**. Многія вершы не маюць згадванняў гераіні, усё роўна пэўным чынам звязаны з паэтавай музай.

Вобраз маладой сустракаем ужо ў першым творы зборніка – «Думкі лятуць». У ім паэт разважае наконт хуткаплыннасці часу, жыцця (хоць Дубоўка на момант напісання твора меў каля 26–27 гадоў, але матывы і вобразы набліжэння да восені жыцця ў яго частыя). Разважаючы на такія глыбокія тэмы, аўтар незнарок згадвае дзяўчыну: *«Часам дзяўчына прытуліцца ласкава, // часам ля воч мільгане маіх казкаю...»* [7, с. 5]. У творы гераіня выступае як лекі ад трывогі. Прытуліцца, здзіўлёна паглядзіць – і праходзяць усе перажыванні. У Дубоўкі яна шчырая, непрадказальная.

У вершы «Зубцамі чорных, стрыжаных валос» згадваецца знаёмы з верша «Дзіваваўся і так кахаў» (зборнік «Credo») вобраз – дзяўчына з кароткімі валасамі чорнага колеру, якія нагадваюць паэту «валошку ў жыце». Тут мы даведваемся імя таямнічай асобы і яе паходжанне – *«мая зямлячка ты, мая Маруся... »* [7, с. 29]. У творы паэт расказвае пра юнацкае каханне, якое цяпер «адкрасавала, адцьвіло». Нягледзячы на растанне, Дубоўка ўсё роўна называе яе «любай».

Упершыню ў творах чацвёртага зборніка імя дзяўчыны-загадкі Налі адлюстравана ў вершы «Цягнік спяшаўся». У ім распавядаецца пра растанне з любай. Для перадачы жаночага вобраза паэт выкарыстоўвае славянскі сімвал – каліну: *«І харство істоту агарнула, // каліна белая... нявеста маладая...»; «Калі водарыла белым цьветам, // каліну звалі тую: Наля... Наля...»* [7, с. 30]. Вобраз каліны-дзяўчыны выглядае пяшчотна, рамантычна: *«Наводля дзеўчына ў кужэльных шатах»; «нявеста маладая»* [7, с. 30].

Сястрынскае стаўленне да жаночага вобраза, як і ў вершы «Сінявокая мая» (зборнік «Credo»), перадаецца і ў творы «А напорна ідзеш, маладая», у якім распавядаецца пра жыццёвыя перашкоды. Аўтар паўстае тут самаахвярным, смелым: *«Я ўзьляту аж да месяца ў высі, // для цябе стуль сузор'е дастану...»* [7, с. 41]. Жанчыну лірычны герой называе «сястрыца», «дзяўчына», «ты». Аўтар перадае ў вершы баявы, натхнёны настрой, гатовы падтрымаць гераіню на жыццёвых пуцявінах.

У зборніку «Наля» ёсць і аднайменная паэма. Асноўныя матывы твора – падзел Беларусі на Заходнюю і Усходнюю, высылка мноства беларусаў у Сібір: *«ты кажаш,*

*беларусаў вельмі шмат // за край-Сібір, на самым Сонца-Усходзе?..»* [7, с. 64]. Мы быццам пранікаем у размову паміж маладымі. Аўтар просіць дзяўчыну расказаць тым, хто адправіўся ў высылку, пра Беларусь. Вобраз дзяўчыны перададзены з асаблівай пяшчотай, замілаваннем, пры дапамозе шматлікіх зваротаў: *«Наля, любая мая»* [7, с. 64].

Такім чынам, паэзія У. Дубоўкі насычана жаночымі вобразамі: каханая дзяўчына, сястрыца, маці, Клеапатра, цыганка. Самы часты вобраз – любая дзяўчына. Жаночыя вобразы ў Дубоўкі разнастайныя – кожная асоба са сваім характарам, адметнасцю, знешнасцю. Вытокі фарміравання сістэмы вобразаў паэзіі У. Дубоўкі, у тым ліку і жаночых, у беларускім традыцыйным фальклоры. Найбольш багатая палітра жаночых вобразаў у чацвёртым зборніку паэта «Наля» (1927), найменш іх – у першым – «Строма» (1923). Калі ў дэбютовай кнізе вобраз жанчыны абстрактны – мара, жаданне, то ў наступных – гэта рэальныя асобы – Маруся, Наля.

Жаночыя вобразы ў паэзіі У. Дубоўкі сведчаць пра душэўныя памкненні літаратара, змены ў светапоглядзе, раскрываюць некаторыя біяграфічныя звесткі мастака слова.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Дубоўка У. Строма: вершы. Вільня: выд. «Нашай Будучыні», 1923.
2. Дубоўка У. О Беларусь, мая шыпшына...: Выбранае. Мінск: Маст. літ., 2002.
3. Дубоўка У. Трысцё: вершы. Менск: Дзярж. выд-ва Беларусі, 1925.
4. Дубоўка У. М. Мой жыццяпіс [Электронны рэсурс] // Пяцьдзесят чатыры дарогі : аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў. Мінск: Маст. літ., 1963. С. 189–207. URL: http://libpost.of.by/biyagrafiya/ (дата звароту: 20.09.2024).
5. Дубоўка У. Credo: вершы. Менск: выд. ЦБ «Маладняка», 1926.
6. Да 100-годдзя Уладзіміра Дубоўкі, Уладзіміра Жылкі, Кузьмы Чорнага : зб. навук. арт. – Мінск: Бел. дзярж. ун-т, 2001.
7. Дубоўка У. Наля: вершы. Масква: Цэнтр. выд-ва народаў Саюза ССР, 1927.

# «СЫН ВАДЫ» І ІНШЫЯ МАЎРАЎСКІЯ «ПАДАРОЖЖЫ» Ў АМЕРЫКУ

**А. В. Сімакоў**

*Незалежны даследчык,*
*вул. 60 гадоў СССР, 19, 246036, г. Гомель, Беларусь, baicri@tut.by*

Як прыклады звароту Янкі Маўра да тэм, звязаных з амерыканскімі краінамі, у артыкуле пералічваюцца яго публікацыі – крыніцы індзеянісцкіх цытат: акрамя галоўнага твора з гэтай катэгорыі, аповесці «Сын вады», гэта аўтабіяграфічная аповесць «Шлях з цемры», прыгодніцкая аповесць «Палескія рабінзоны», фантастычная аповесць «Падарожжа ў пекла», артыкулы «Мёртвыя і жывыя», «БССР… і Уругвай». Называюцца таксама іншыя творы, у якіх апісваецца Амерыка, але не прысутнічаюць індзейцы. Ставіцца пытанне пра ўплыў дарэвалюцыйных традыцый і савецкага наватарства, у тым ліку на апісанне ўспрымання індзейцаў дзецьмі – героямі твораў. Ацэньваецца ступень жорсткасці і натуралізму ў паказе Маўрам жыцця «дзікуноў» – як карэнных жыхароў Вогненнай Зямлі, так і сучасных Маўру амерыканскіх расістаў.

***Ключавыя словы:*** Янка Маўр; дзіцячая літаратура; прыгодніцкая літаратура; публіцыстыка; Амерыка; індзейцы; расізм; незалежнасць.

# «СЫН ВАДЫ» И ДРУГИЕ МАВРОВСКИЕ «ПАДАРОЖЖЫ» В АМЕРИКУ

**А. В. Симаков**

*Независимый исследователь,*
*ул. 60 лет СССР, 19, 246036, г. Гомель, Беларусь, baicri@tut.by*

Как примеры обращения Янки Мавра к темам, связанным с американскими странами, в статье перечисляются его публикации – источники индеанистских цитат: помимо главного произведения из этой категории, повести «Сын вады», это автобиографическая повесть «Шлях з цемры», приключенческая повесть «Палескія рабінзоны», фантастическая повесть «Падарожжа ў пекла», статьи «Мёртвыя і жывыя», «БССР… і Уругвай». Называются также другие произведения, в которых описывается Америка, но не присутствуют индейцы. Ставится вопрос о влиянии дореволюционных традиций и советского новаторства, в том числе на описание восприятия индейцев детьми – героями произведений. Оценивается степень жестокости и натурализма в показе Мавром жизни «дикарей» – как коренных жителей Огненной Земли, так и современных Мавру американских расистов.

***Ключевые слова:*** Янка Мавр; детская литература; приключенческая литература; публицистика; Америка; индейцы; расизм; независимость.

# «SON OF THE WATER» AND OTHER MAURIAN «JOURNEYS»TO AMERICA

**A. V. Simakou**

*Independent researcher,*
*60 years of the USSR Stpeet, 19, 246036, Gomel, Belarus, baicri@tut.by*

As examples of Yanka Maur's address to American themes, the article lists his publications – sources of Indianist quotations: the stories «Son of the Water» (the main work from this category), «The Path from the Darkness», «Polesian Robinsons», «Journey to Hell», articles «The Dead and Alive», «BSSR... and Uruguay». Other works that describe America but do not feature Indians are also named. The question about the influence of pre-revolutionary traditions and Soviet innovation, including the description of the perception of Indians by children – the heroes of the works, is raised. The degree of brutality and naturalism in Maur's depiction of the life of «savages» – both the indigenous inhabitants of Tierra del Fuego and the contemporary American racists – is evaluated.

***Keywords:*** Yanka Maur; children's literature; adventure literature; journalism; America; Indians; racism; independence.

Аповесць Янкі Маўра «Сын вады» [6] была адным з першых савецкіх мастацкіх твораў пра індзейцаў, прычым па колькасці перавыданняў і перакладаў з'яўляецца адным з лідараў у гэтай катэгорыі на постсавецкай прасторы і цяпер. Пры гэтым асвятленне Маўрам не толькі індзейскай, але і больш шырокай «амерыканскай» тэмы наўрад ці станавілася тэмай асобнай публікацыі; мы, аднак, збіралі матэрыял для падобнага даследавання, ужо пачынаючы з сярэдзіны 1980-х гг.

Спрабуючы вызначыць больш вузкаспецыялізавана жанр і месца «Сына вады» ў сусветнай літаратуры, не толькі мастацкай, ацаніць творчы метад, стыль і выказаныя погляды Маўра на прыкладзе гэтага яго твора «пераходнага перыяду», мы заўважылі, што ў тым жа 1928 г., што і «Сын вады», былі апублікаваныя даследаванні С. К. Лотрапа «Індзейцы Вогненнай Зямлі» (Нью-Ёрк) і «Сем нарысаў інтэрпрэтацыі перуанскай рэчаіснасці» Х. К. Марыятэгі (Ліма). Першая кніга абагульняла звесткі пра вогнезямельцаў пасля таго, як іх грунтоўна апісалі патары В. Коперс і М. Гузіндэ, другая ўяўляла сабой зборнік работ аднаго з першых сацыялістычных індзеяністаў. Калі першынство Марыятэгі як класіка індзеянізму ў сацыялогіі не выклікае сумненняў, то наша ранняе меркаванне аб тым, што беларускі пісьменнік першым выкарыстаў метад сацыялістычнага рэалізму пры мастацкім апісанні індзейцаў, цяпер здаецца занадта смелым. Ён у асноўным працягваў добрым прыкладам стары, дарэвалюцыйны стыль у спачувальных адносінах да экзатычных народаў. Пры гэтым, аднак, нельга было чакаць хуткай мадыфікацыі сфарміраванай да рэвалюцыі негатывістычнай часткі стэрэатыпаў «нябелых» і племянных народаў.

Каб праверыць праўдзівасць хаця б часткі асабліва цікавых для нас ранніх супярэчлівых ацэнак такога «Сына вады», неабходны быў параўнаўчы матэрыял як з самога Маўра, так і падобных да яго беларускіх і замежных аўтараў. Што яшчэ

напісаў Маўр пра індзейцаў і Амерыку і якія нагоды былі для гэтага? Хаця гэтае пытанне намі распрацаванае недастаткова (наш прагляд маўраўскіх публікацый не поўны), пералічваем вядомыя нам мастацкія творы і папулярныя, публіцыстычныя артыкулы, дзе індзейцы ў нейкі момант з'явіліся.

Да і пасля «Сына вады» зварот Янкі Маўра да індзейскай тэмы меў эпізадычны характар. Падобныя згадкі ёсць у аповесці «Палескія рабінзоны», аповесці-«казцы» «Падарожжа ў пекла» і белетрызаванай аўтабіяграфіі «Шлях з цемры». Цалкам «немастацкія» творы прадстаўленыя артыкуламі «Мёртвыя і жывыя. Гарады мерцвякоў» (1927) і «БССР і… Уругвай» (1947). У гісторыю з першабытнай эпохі «Чалавек ідзе», аповесць «У краіне райскай птушкі» пра папуасаў і раман «Амок» пра вызваленчую барацьбу ў Інданезіі індзейцы не трапілі нават як «разавая паралель». Амерыка істотна прадстаўленая ў шэрагу яго твораў. Напрыклад, маладыя героі фантастычнай аповесці «Фантамабіль прафесара Цылякоўскага», якая друкавалася ў часопісе «Маладосць» у 1954–1955 гг., падарожнічаюць над Амерыкай (але не бачаць там індзейскіх паселішчаў ці індзейскіх атрадаў, якія хаваюцца ў гарах). У апавяданні пра Амерыку («заморская казка») «Сярод дзікуноў» («Іскры Ільіча», 1932) дзікунамі прадстаўленыя амерыканцы, якія павесілі негра (малюнак павешанага (мастак Ц. Кіпніс) здзіўляе сваёй натуралістычнасцю, недарэчнай у дзіцячым часопісе, нават з улікам агульнага жорсткага савецкага стылю таго часу).

**«Шлях з цемры».** «Індзейскія» ўспаміны дзяцінства ўвайшлі ў аўтабіяграфічную аповесць, канечнай датай стварэння якой звычайна называюць 1958 г. Маўр нібыта ад свайго «ego ў дзяцінстве» становіцца на бок белых ва ўзброеным супрацьстаянні з індзейцамі – думкі пра тое, наколькі эфектыўны штуцар у забойстве індзейцаў, у тым ліку ў парадку помсты за зняцце скальпа, і неграў, можна трактаваць як літаратурна-камічныя, павярхоўна-«інсітныя», але сур'ёзным з'яўляецца пытанне, як шмат дзяцей мысліла падобным чынам.

Пачаўшы з «Конніка без галавы» і «Палявання за скальпамі» Майн Рыда і раманаў Купера, Янка «падарожнічае» з іншымі класікамі прыгодніцкай літаратуры. І, вядома, нарадзілася «цікавейшая ідэя» і самому «абследаваць Амазонку, потым Конга, затым Місісіпі» і г. д. Тое, што маленькі Янка лепш за іншыя кантыненты і краіны ведаў Амерыку, пацвярджаецца Маўрам праз успаміны яго героя ў 1920 г., у першай частцы «Шляху з цемры»: «Апрача Расіі я добра ведаў Амерыку ды яшчэ Сібір». Дадатковай прычынай думак пра Амерыку было тое, што родны дзядзька паехаў у Амерыку. Версіі 1960 і 1975 гг. цікавых для нас фрагментаў не адрозніваюцца, акрамя аднаго месца: «Цяпер мы ўжо жылі разам з паляўнічымі, сква[т]эрамі, шукальнікамі золата і ўсялякіх прыгодаў. Мы радаваліся кожнаму стрэлу, якім наш герой забіваў беднага індзейца, і плакалі, калі індзеец помсціў свайму ворагу, здзіраючы з яго галавы скальп». (Мы дадалі літару «т» у адно са слоў таму, што "сквайры" з версіі 1975 г. (т. 3 «Збору твораў») кепска ўпісваюцца паміж паляўнічымі і шукальнікамі золата, затое лагічнае знаходжанне паміж імі «скватэраў», скватараў.)

Праз некалькі старонак, у раздзеле «Нашы камерцыйныя сувязі», разважанні становяцца ўжо нават практычнымі: «Асабліва важнымі для мяне былі вінчэстары і штуцары, і я не адзін год ламаў сабе галаву, якую з гэтых стрэльбаў выбраць для свайго

падарожжа. У Купера белыя паляўнічыя вельмі добра забівалі індзейцаў з вінчэстара, а ў Майна Рыда з няменшым поспехам забівалі неграў з штуцара».

**«Сын вады».** Калі Маўр пачынаў пісаць «Сына вады», «Чалавек ідзе» і «У краіне райскай птушкі» ўжо былі яго здабыткам. Як і іншыя творы «экзатычнага цыкла», «Сын вады» абавязаны сваім з'яўленнем школе: падказкай тэмы паслужыў урок, на якім Маўр павінен быў расказаць вучням пра Вогненную Зямлю.

Апублікаванай у 1926–1927 гг. аповесцю «Чалавек ідзе» зацікавіўся дырэктар дзяржаўнага выдавецтва Ц. Гартны. У час «быццам бы выпадковай іх гутаркі пра беларускую літаратуру ўвогуле і аб прыгодніцкім жанры ў ёй у прыватнасці» Гартны заўважыў, што не можа «ўгаварыць» ніводнага пісьменніка напісаць прыгодніцкую кнігу ў супрацьвагу таму, «старому», што прыходзіцца чытаць у школах, асабліва вясковых. І прапанаваў у наступных словах, як іх перадае А. Міронаў: «Паглядзі на карту, падумай, аб чым бы табе самому захацелася школьнікам расказаць. Не аб амерыканскіх індзейцах і траперах: пра іх у Рыда і Купера дастаткова... І не аб прыгодах дзеля прыгод, а з дабаўленнем істотнай дозы сацыяльнага сэнсу. Каб чытачы адразу адчулі: кніга напісаная савецкім аўтарам, яшчэ лепш – нашым, беларускім. Як гэта зрабіць – падказваць табе, знаўцу гісторыі і геаграфіі, не бяруся» [3, с. 100].

Гэтым і іншымі творамі Маўр паўплываў на дзяцінства, на фарміраванне карціны свету, уключаючы вобраз нееўрапейскіх народаў. У класічных работах маўразнаўцаў М. Яфімавай і Э. Гурэвіч ёсць падрабязныя агляды «Сына вады»; стэрэатыпаваныя і часам незвычайныя ўспрыманні, аспекты «Сына вады» дапамагаюць убачыць нашы зборкі згадак аповесці ў шматлікіх газетных, часопісных і кніжных публікацыях.

**«Палескія рабінзоны».** Пазначаная 1929 г. як скончаная, у 1930 г. выдаецца аповесць «Палескія рабінзоны» з характэрным для дарэвалюцыйных выданняў падзагалоўкам «Прыгоды двух хлопцаў у Палескіх балотах». Адзінае месца, дзе ў ёй «з'яўляюцца» «дзікуны, індзейцы», – даволі папулярнае пры цытаванні ў маўразнаўчых публікацыях: «Вучыліся абодва добра, чыталі шмат кніжак, асабліва прыгодніцкіх – Жуля Верна, Майн Рыда, Купера і г. д. Цікавілі іх розныя далёкія краіны, дзікуны, індзейцы, якіх цяпер бадай ужо зусім няма. Захапляліся рознымі прыгодамі з іх жыцця, што адбываліся гадоў 60–80 назад. Марылі пра пальмы, джунглі, а не бачылі добрай пушчы, якая была за некалькі дзясяткаў кіламетраў ад іх. Уяўлялі сабе розныя паляванні на тыграў, слановў, ільвоў, а вавёркі на волі не бачылі». Прыняты ў дарэвалюцыйныя часы выраз «дзікуны» яшчэ ўжываўся некаторы час савецкімі аўтарамі ў адносінах да племянных народаў не для дасягнення іранічнага эфекту, а як сінонім для выразу «першабытныя людзі».

**«Падарожжа ў пекла».** У антырэлігійнай «байцы», «казцы» («Пекла», вядомае спачатку як брашура 1929 г. [2], перапрацаванае для выдання ў «Зборы твораў» у 1960 г. як «Падарожжа ў пекла») ён высмейвае недарэчнасць легенд аб замагільным жыцці, прыгадаўшы і тое, «як, напрыклад, негры, папуасы і індзейцы, якім казалі, што пекла – нейкая яма з жабамі і змеямі, і тое, што яны цяпер убачылі, ім нават спадабалася. Так цікава, весела, столькі рознага народу са ўсяго свету – і аніводнай жабы».

Беларускія піянеры едуць у цягніку на той свет разам з іншымі прадстаўнікамі чалавецтва, якія выходзяць на станцыях «Азія», «Амерыка», «Афрыка», «Аўстралія» і «Еўропа». Падобныя рэвалюцыйныя эксперыменты ў літаратуры былі натуральнымі ў 1920-я гг.; пазней, тым не менш, аўтары вымушаныя былі рабіць самацэнзуру.

«**Мёртвыя і жывыя» [5].** У навукова-папулярным артыкуле Маўр выступіў практычна ў сваёй ролі настаўніка геаграфіі: «Сярод дзікуноў Аўстраліі і Паўночнае Амерыкі існаваў звычай змяшчаць нябожчыкаў на дрэвах, ці на асобных памостах, якія будаваліся на ўкопаных у зямлю слупах». «Разнастайнасць пахавальных звычаяў залежыць ад шмат якіх умоў, вялікае значэнне маюць рэлігійныя вераванні».

«**БССР і… Уругвай» [1].** Маўр напісаў дзясяткі фельетонаў на міжнародныя тэмы, шмат крытыкуючы Амерыку, прычым не толькі Паўночную. Лацінская ў Маўра-фельетаніста прадстаўленая ўжо ў загалоўках Сальвадорам, Уругваем. Магчыма, апошні і не з'явіўся б асобна ў яго публіцыстыцы, «каб не выступленне ўругвайскага [ў публікацыі ўсюды ўжываецца «у»] дэлегата на палітычным камітэце Генеральнай Асамблеі. Гэты паважаны дэлегат усумніўся, ці з'яўляецца БССР самастойнай дзяржавай, яму здаецца, што Беларусь толькі «правінцыя». Ён не ведае нават, што ў яе ёсць свае граніцы. І не ведае, што яна мае свой урад. Ён ведае толькі, што БССР уваходзіць у склад Савецкага Саюза, значыць, БССР – правінцыя». Паводле Маўра, членаў «Брытанскага Садружаства Нацый» уругваец не лічыць правінцыямі: «Такая ўжо ўругвайская логіка». У сваю чаргу, паводле Маўра, Уругвай «у параўнанні з БССР, – самая захудалая правінцыя». У якасці аргумента ён спасылаецца на 1828 г., калі «Уругвай нарадзіўся».

«Аргентына [Аргенціна] і Бразілія, змагаючыся за гэтую правінцыю, не маглі здужыць адзін аднаго і вымушаны былі зрабіць яе самастойнай, хоць не толькі ўругвайскай тэрыторыі, але і ніякага ўругвайскага народа не існавала». Далей ён указвае ў працэнтах колькасць васьмі народаў, агульным лікам 74 тыс. чалавек, ва Уругваі, прычым аказваецца, што іспанцы, італьянцы і партугальцы кожны паасобку ўжо перавышаюць па колькасці індзейскае насельніцтва.

У свой пафас Маўр уключае прыніжэнне значэння ўругвайскай незалежнасці, але зусім не акцэнтуе ўвагу на тым, што індзейцы аказаліся нязначнай меншасцю, якая ўжо не адыгрывала нейкай ролі. У той жа час ён не вылучае на беларускай тэрыторыі асобныя народы, гаворачы пра краіну з пахвалой:

«А Беларусь у гэты час мела ўжо многавекавую гісторыю, нацыянальную тэрыторыю (у два разы большую за ўругвайскую), адзіны беларускі народ (у трыццаць разоў большы за «ўругвайскі») са сваёй мовай, культурай, сваімі нацыянальнымі традыцыямі.

Такім чынам, гісторыя не дае ніякіх падстаў паважанаму ўругвайцу ганарыцца перад БССР сваёй "дзяржаўнасцю"».

Маўр, у якога індзейцы праходзяць як народ без гісторыі, калі толькі пад гісторыяй ён мае на ўвазе гісторыю дзяржаўнасці, а не этнагісторыю, і сам уругвайскі народ бярэ ў двукоссе. Далей ён робіць агаворку, што «гэта было даўно. Можа цяпер Уругвай "перагнаў" Беларусь?», але не знаходзіць пераваг у паўднёваамерыканскай краіны і пазней.

Беручы разам творы з матывамі, што нас цікавяць, нельга не ставіць праблему «жорсткасці», чорнага гумару, палемічнага перабольшвання, фактычных і ідэалагічных дэфектаў. Маўр пісаў і мастацкія, і папулярна-пазнавальныя (апошнія не ператварыліся ў вельмі патрэбныя вялікія этнаграфічныя нарысы для дзяцей, падобныя да кніг ураджэнкі Беларусі і затым амерыканкі С. Блікер [4]) творы, а таксама публіцыстыку на міжнародныя тэмы. Нашай мэтай цяпер не з'яўляецца пералік прыкладаў непаслядоўнасці і супярэчлівасці ў ацэнках Маўра аўтарамі кніг і артыкулаў пра яго, асабліва заўважных у канцы 1920-х – пачатку 1930-х і ў 1990-х – самым пачатку 2000-х, калі ставіліся пад сумненне адэкватнасць паказу «класавай» сутнасці і агульны гуманізм аўтара пры паказе жыцця першабытных народаў. Амерыка – толькі частка тэатра дзеяння ў Маўра, але ў выпадку з «Сынам вады» найбольш лірычная, нягледзячы на натуралізм і «прытупленасць», якую бачылі некаторыя крытыкі. Лічбавы збор «усіх» тэкстаў Маўра дапамог бы скласці больш поўную карціну ўспрымання ім Амерыкі. Гэта з'яўляецца задачай будучых пакаленняў беларускіх літаратуразнаўцаў-амерыканістаў.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. *Маўр Я.* БССР і... Уругвай // Літаратура і мастацтва. 1947. 22 лістап.
2. *Маўр Я.* Пекла: байка / маст. Б. Малкін. Менск: Белдзяржвыд., 1929.
3. *Миронов А.* Дед Мавр: повесть-воспоминания. Минск: Маст. літаратура, 1979.
4. *Сімакоў А.* Соня Блікер – класік дзіцячай пазнавальнай літаратуры // Краязнаўчая газета. 2022. № 30 (жн.). С. 6.
5. *Маўр Я.* Мёртвыя і жывыя: гарады мерцьвякоў // Беларускі піянэр. 1927. № 18. С. 12–14.
6. Mavr Ianka (pseudonym of Ivan Mikhailovich Fedorov) // Great Soviet Encyclopedia. New York: Macmillan, 1976. V. 15. P. 608.

## ДАСКАНАЛЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ЛАД ВА УЯЎЛЕННЯХ АЙЧЫННЫХ АЎТАРАЎ-ПАЛЕМІСТАЎ К. XVI – ПАЧ. XVII СТСТ.

**Р. С. Пашкевіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр-т Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, paszkiewiczjafiet@gmail.com;*
*Навуковы кіраўнік – кандыдат філалагічных наук, дацэнт Л. А. Гедзімін*

Грунтуючыся на аналізе твораў палемічнай літаратуры Барока, былі вызначаны палітычныя перакананні, светапоглядныя канстанты і ўяўленні пра ідэальную дзяржаву Пятра Скаргі і Мелеція Сматрыцкага як найбольш выразных прадстаўнікоў розных канцэпцый дзяржаўнага развіцця на землях ВКЛ.

***Ключавыя словы:*** палемічная літаратура Барока; Пётр Скарга; Мелецій Сматрыцкі; палітычная філасофія; польскамоўная літаратура Беларусі; рэлігійная літаратура.

## ИДЕАЛЬНЫЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ СТРОЙ В ПРЕДСТАВЛЕНИЯХ ОТЕЧЕСТВЕННЫХ АВТОРОВ-ПОЛЕМИСТОВ К. XVI – НАЧ. XVII ВВ.

**Р. С. Пашкевич**

*Белорусский государственный университет,*
*пр-т Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, paszkiewiczjafiet@gmail.com;*
*Научный руководитель – кандидат филологических наук, доцент Л. А. Гедимин*

Основываясь на анализе произведений полемической литературы Барокко, были определены политические убеждения, мировоззренческие константы и представления об идеальном государстве Петра Скарга и Мелетия Смотрицкого как наиболее выразительных представителей различных концепций государственного развития на землях ВКЛ.

***Ключевые слова:*** полемическая литература Барокко; Пётр Скарга; Мелетий Смотрицкий; политическая философия; польскоязычная литература Беларуси; религиозная литература.

## PERFECT STATE ORDER IN THE IDEAS OF NATIVE AUTHORS-POLEMISTS OF THE XVI CENTURY – BEGINNING. XVII STST.

**R. Paszkiewicz**

*Belarusian State University,*
*4, Independence Ave, 220030, Minsk, Belarus, paszkiewiczjafiet@gmail.com;*
*Supervisor – PhD, Ass. Professor L. A. Gedimin*

Based on the analysis of the works of polemical literature of the Baroque period, the political beliefs, worldview constants and ideas about the ideal state of Piotr Skarga and Meletiusz Smotrycki,

as the most expressive representatives of various concepts of state development in the lands of the Grand Duchy of Lithuania.

***Keywords:*** Baroque polemical literature; Piotr Skarga; Meletiusz Smotrycki; political philosophy; Polish-language literature of Belarus; religious literature.

Праблема ідэальнага дзяржаваўладкавання непарыўна звязана з развіццём філасофскай думкі з антычных часоў. Менавіта да гэтай спадчыны звярталіся філосафы і тэолагі ў пазнейшыя часы. У хрысціянскай Еўропе, шмат у чым намаганнямі св. Тамаша Аквінскага, асаблівым аўтарытэтам карысталася філасофія Арыстоцеля, якая была прынята за ўзор разважанняў. За стагоддзі філосафы стварылі мноства мадэляў дзяржавы, частка з якіх была выпрабавана на трываласць часам, а іншыя існавалі толькі ў якасці тэарытычных абстракцый.

Дзяржава – адзін з найважнейшых інстытутаў чалавечай арганізацыі, таму і пытанне пра яе лад закранала адразу некалькі сфер жыццёвай дзейнасці: філосафы разважалі пра прынцып улады, пра законы, іх выкананне і паходжанне, перавагі той ці іншай формы кіравання, лаялізм і паўстанне, суадносіны свецкай і рэлігійнай улады. Усебакова разглядалі гэтыя патынні сярэднявечныя тэолагі (свв. Аквінат, Аўгустын, Бернард Клеўроскі, Пётр Даміані, Грыгорый VII і інш.). Яны ўтварылі своеасаблівы кансэнсус, які грунтаваўся на філасофіі арыстоцелізму і біблійным падмурку, а таксама святаайцоўскім вучэнні. Нягледзячы на добрараспрацаваную тэорыю, кожная гістарычная эпоха ставіла перад чалавецтвам новыя выклікі.

У XVI стагоддзі з пачаткам Рэфармацыі Еўропу паглынуў працяглы рэлігійны канфлікт, які не абыйшоў і ВКЛ. Рух за рэлігійныя змены пачаў імкнуцца і да палітычнай трансфармацыі [2, с. 111]. Так, кальвініст Андрэй Валян нават не згадвае духоўнае саслоўе ў сваім трактаце «Аб грамадзянскай свабодзе…». Аднак пасля Трыдэнцкага сабору (1545–1563 гг.) у палітычнай тэорыі паўстаў кантррэфармацыйны дыскурс, у межах якога тэолагі адаптавалі сярэднявечныя канцэпцыі пад актуальныя рэаліі. Найбольшым аўтарытэтам у гэты перыяд карыстаўся Роберт Белармін, пазней кананізаваны; менавіта яго вучэнне распаўсюдзілася сярод каталіцкіх аўтараў, у тым ліку айчынных. Напрыклад, даследчыкі (Я. Тазбір, С. Віндакевіч) адзначаюць уплыў тэалогіі і палітычнай філасофіі Белармінa на апалагета каталіцтва Пятра Скаргу, які імкнуўся прымяніць гэтае вучэнне на практыцы ў культурнай прасторы Рэчы Паспалітай. Паводле Януша Тазбіра, палітычную праграму Скаргі можна апісаць як клерыкалізм з тэндэнцыямі да абсалютызму. У каталіцкай палітычнай думцы існаваў і іншы кірунак, да якога належалі прадстаўнікі біскупату, якія выступалі за пашырэнне паўнамоцтваў Сената, апелюючы да арыстоцелеўскай арыстакратыі [10, с. 51].

Заўважым, з самага пачатку свайго існавання Рэч Паспалітая не была аднароднай ні палітычна, чаму спрыялі яе канфедэрацыйны характар, абмежаваная каралеўская улада, шырокія прывелеі шляхецкага саслоўя; ні рэлігійна: нягледзячы на некалькі спроб рэалізацыі пастаноў Ферара-Фларэнтыйскага сабора аб уніі, у XVI стагоддзі Кіеўская мітраполія (у тагачаснай тэрміналогіі Руская Царква) дзейнічала незалежна

ад Папскай сталіцы, сярод шляхты і мяшчанства актыўна распаўсюджваўся пратэстантызм, а свабода веравызнання была замацавана заканадаўча. У такіх умовах на землях усёй Рэчы Паспалітай пачала з'яўляцца палемічная літаратура, у якой палітычнае часта падавалася непадзельна ад рэлігійнага. Прадстаўнікі ўсіх бакоў канфлікту сцвярджалі свой патрыятызм, адданасць рэлігійным і этнічным традыцыям ВКЛ, у духу сарматызму апелявалі да «слаўных продкаў» і шляхецкага этасу. На гэта ўплывала атмасфера своеасаблівай палітычнай культуры польскай арыстакратыі, для якой была характэрна ідэалізацыя «залатых вольнасцяў» і прынцыпаў шляхецкай дэмакратыі. Па-за рэлігійнай палемікай ідэолагамі сарматызму дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай прызнаваўся дасканалым. «Сарматысты» грунтавалі свае меркаванне на палітычнай тэорыі арыстоцелізму, якая абвяшчала тры вартыя формы дзяржаўнага ладу: манархію, арыстакратыю і палітэю; у сваю чаргу, Рэч Паспаліта нібыта сумяшчала найлепшыя рысы гэтых форм. Падобную ідэю можна параўнаць з уяўленнямі Цыцэрона пра Рымскую рэспубліку, творы якога друкавалі ў Рэчы Паспалітай польскай і лацінскай мовамі.

Першапачаткова падобныя ідэі падзялялі і антыўніяцкія палемісты, асабліва з атачэння «абаронцы праваслаўя» князя Канстанціна Астрожскага, аднак пасля смерці апошняга ў якасьці новага абаронца праваслаўя пачало ўспрымацца казацтва. У сувязі з гэтым паказальна гісторыясофская канцэпцыя праваслаўнага манаха Захарыі Капысценскага: ён будуе ідэнтычнасць казацкага праваслаўя на супрацьпастаўленні Рыма і Канстанцінопаля, адмаўляючы традыцыйную для ўсходняй Царквы эклезіялогію, паводле якой апостал Пётр і яго наступнікі былі першымі па гонары, але не па ўладзе. У трактаце «*Палінодыя…*» Капысценскім быў пераапрацаваны сармацкі міф: паводле яго, сарматы гэта «*продкі нашы Роскія*», якія рыцарскі ваявалі супраць рымлян, «*и завше той народ яфето-росскій славенскій был неусмиреній и вольній и незголдованій*» [1, с. 498]. Капысценскі за сармацкі ідэал успрымае быт казацкага войска, шануе казакоў за абарону праваслаўя. На прыкладзе аўтара «*Палінодыі…*» бачна, што частка інтэлектуалаў неўніяцкай Кіеўскай мітраполіі не лічыла неабходным заставацца вернымі Рэчы Паспалітай: нягледзячы на сваю індактрынаванасць сарматызмам, яны не жадалі звязваць свой лёс з Польшчай. Захарыя сцвярджае, што праваслаўным лепей у Порце: «*Хто был в Константинополю… обачил бы свободу… и безпеченство христіан таковоє, же рекл бы кождый, иж там христіане царствуют… толко цара не доставаєт*» [1, с. 641].

Аднак ў эпоху Барока на першы план выходзіць патрыятызм, кали такія заявы адмоўна ўспрымаліся нават праваслаўнымі. Абвінавачванне ў здрадзе становіцца элементам ідэйнай барацьбы. Прычынай недаверу станавілася тое, што ўсе праваслаўныя патрыярхі былі падданымі асманскага султана – суперніка Рэчы Паспалітай. Некаторыя палемісты імкнуліся падцвердзіць патрыятызм. Так, баронячы вернасць праваслаўных сваёй Айчыне, архіепіскап Мялецій Сматрыцкі ў «*Verificatii niewinności*» (1621) абураецца, што «*nas zdraycami oyczyzny y szpiegami Tureckimi szkaluią*» і адмаўляе, што «*Borecki y Smotrzisky… z cesarsem Tureckim zrozumiawszy się, pod praetextem relligiey y nabożeństwa, bunty y roztyrki szkodliwe czynili*» [4, с. 398].

Такім чынам, сярод як каталіцкіх, так і часткі праваслаўных палемістаў захаванне Рэчы Паспалітай прызнавалася за неабходнасць. Аднак адносна яе будучыні існавалі розныя меркаванні. Найбольш выразна розныя канцэпцыі грамадзянска-палітычнага ладу можна ўбачыць на прыкладзе твораў каталіцкага тэолага Пятра Скаргі і праваслаўнага (пазней уніяцкага) апалагета Мелеція Сматрыцкага.

У сваёй творчасці Пётр Скарга закранае розныя пытанні: у некаторых тэалагічных працах уздымаюцца палітычныя і сацыяльныя праблемы, Скарга вызначае шляхі іх вырашэння ў рэчаіснасці мяжы XVI–XVII стст. на землях Рэчы Паспалітай. Да такіх твораў можна аднесці: «*O jedności Kościoła Bożego*…», «*Upominanie do ewangelików*», «*Proces konfoederatiey*», «*Kazania sejmowe*», «*Dyskurs na konfederacyą*», «*Wzywanie do pokuty…*», «*Na threny y lament… przestroga*» і інш. Асобна адзначым «Сеймавыя казанні», бо менавіта ў іх айцец-езуіт падрабязна апісвае свае бачанне хрысціянскай дзяржавы, яе грамадзянскага ўладкавання, крытыкуе сацыяльныя рэаліі Рэчы Паспалітай, вызначае шэсць «хвароб» гэтай дзяржавы. Больш сцісла Пётр Скарга апісвае дасканалае дзяржаваўладкаванне ў трактаце «*Na threny y lament..* ». Гэты трактат, як і «*Wzywanie do pokuty…*», з'яўляюцца своеасаблівым падсумаваннем ідэй аўтара, напісаныя напрыканцы яго жыцця.

Заўважны манархічныя сімпатыі Пятра Скаргі «*Przyrodzony sposób jest w ciele, aby jedna głowa rządziła: tak też w rzpltej przyrodzona i nalepsza i nawłaśniejsza rozumowi ludzkiemu jest monarchia abo jedynowładztwo i rząd jednego, który gdy się mieni a na wiele się głów dzieli, ciężka jest i śmiertelna rzpltej choroba*» [7, с. 14], больш таго, паводле Скаргі, манархія з'яўляецца адлюстраваннем Боскага парадку: кароль кіруе дзяржавай падобным чынам, як сам Бог кіруе сусветам. Гісторыя, паводле Скаргі, наканавана Богам: ні каралеўства, ні рэспублікі *bez Boskiej pomocy fundować się i stać i obrony mieć nie mogą.*

Каб давесці сваю пазіцыю, Скарга апелюе да антычных філосафаў, святых айцоў і Бібліі; звяртаецца да гістарычных сведчанняў. Палеміст сцвярджае неабходнасць моцнай каралеўскай улады, якая не будзе абмежавана сеймам. Крытыкуючы сеймавую сістэму, ён піша: *Gdzie wszyscy równi, tam żaden rząd być nie może… Między pospólstwem więcej głupich, niźli mądrych, i na głupi, co jest przeciw przyrodzeniu, rząd przychodzi* [5, с. 98]. Скарга папракае шляхту за адыход ад веры, невыкананне рыцарскіх абавязкаў, чыненне «звады і нязгоды», перашкоду працы сейма. Разам з тым манархія супрацьпастаўлена тыраніі: *Nie taką monarchią chwalimy, jaka jest u Turków, Tatar i Moskwy, która ma bezprawne panowanie, ale taką, która prawy sprawiedliwemi i radą mądrą podparta jest i moc swoje ustawami pobożnemi umiarkowaną i okreszoną ma* [7, с. 51]. Скарга фактычна паўтарае тэзіс св. Аўгустына пра тое, што дзяржавы, якія не прытрымліваюцца сваіх законаў, з'яўляюцца разбойнымі бандамі. Акрамя таго, для Пятра Скаргі важна не толькі законнасць улады, але і справядлівасць яе законаў: *a iż królowie i rzplte mają moc stanowić sobie prawa, pismo samo świadczy…*«*Przez mię królowie królują i zakonodawce sprawiedliwie skazują*». *I to, co rzekł Izajasz:* «*Biada tym, którzy niesprawiedliwe prawa stawią*». ***A jeśliż takim biada, tedy tym, którzy dobre i sprawiedliwe prawa stawią, jest błogosławieństwo*** [7, с. 14].

Скарга падкрэслівае, што крыніцай дзяржаўнага права з'яўляецца воля караля, якая павінна быць узгоднена з Боскім, натуральным і звычаёвым правам. Дзяржава павінна абараняць хрысціянскія каштоўнасці і саму каталіцкую рэлігію. У сувязі з гэтым крытыкуецца прававая сітуацыя ў Рэчы Паспалітай: *Grzechy się też rozkwitnęły…: cudzołostwa, kazirodztwa, lichwy, czary i inne, które wedle praw starych i świętych duchowny sąd karał, które teraz szerzą się, a pomsty samego Boga rychłej i srogiej czekają* [7, с. 41]. Але яшчэ горшым нават ад грахоў, якія «выклікаюць помсту з неба», Скарга называе заканадаўча замацаваную свабоду веравызнання: *jeszcze gorsze, które konfederacyą zowiecie roku pańs. 1573… aby każdemu wolno było wiarę sobie, jaką chce mieć… odmiany w kościele czynić... Jeszcze większą ma niesprawiedliwość i większe za sobą przeklęctwo Boskie ciągnie to prawo… [ciągnie] swowolność i bluźnienia… i wykorzenianie wiary… i szczepienie ateizmu* [7, с. 42].

Але, паводле Пятра Скаргі, нельга гвалтам вымушаць змяніць веру, бо «хаця і дрэнная ерась, добрыя суседзі і браты», пра гэта ён пісаў ва ўступе «*Na threny…*», паўтараючы вывады з «*Upominania…*» [8, с. 72].

Каталіцкі прапаведнік, наследуючы інтэлектуальнай традыцыі свв. Пятра Даміані, Грыгорыя VII і Аквіната, сцвярджае прыярытэт духоўнай улады над свецкай. Паводле Пятра Скаргі, *religia i kapłaństwo fundamentem jest królestw u ludzi Boga prawego* [7, с. 48]. Задача дзяржавы – абараняць каталіцкую веру, нават сам кароль, хаця і павінны быць адзіным ўладцам, усё ж мае абавязкі перад Касцёлам, *bo każdy król chrześcijański koronę swoje, i miecz, i moc królewską* ***od Chrystusa przez kapłana jego*** *bierze; i nigdy doskonałym królem nie jest, póki* ***koronowany od kapłana*** *nie bywa* [7, с. 49]. Каталіцкі палеміст абазначае ролю святарства ў дзяржаве: гэтае саслоўе вучыць і захоўвае каралеўства ў веры. Усе іншыя саслоўі (Скарга выдзяляе пяць: духавенства, рыцарства, сенатарства, машчанства і сялянства) павінны выконваць свае абавязкі, тады дзяржава ўтварае адзіны арганізм, які існуе для агульнага дабра. Скарга падкрэслівае важнасць міжсаслоўнай згоды, знаходжання на сваім месцы, цытуе св. Аўгустына: iż głupi nie mogą szczęśliwiej żyć, jedno gdy mądrych słuchają a im służą.

У пэўным антаганізме да палітычнай пазіцыі Пятра Скаргі знаходзіцца Мялецій Сматрыцкі. Значная частка таго інтэлектуальнага кола, якое сфармавалася вакол астрожскіх школ, прытрымлівалася агульных для шляхты канцэпцый шляхецкай рэспублікі залатых вольнасцяў. Для валынскага шляхціча Максіма Сматрыцкага гэта таксама было натуральна. Разам з тым заўважна, што палітычныя пытанні не займаюць шмат месца ў творчасці праваслаўнага палеміста, у адрозненні ад Скаргі, няма ў яго і трактатаў, у якіх усебакова разглядаецца палітычная тэорыя. Тым не менш, у сваіх палемічных творах ён закранае ролю шляхты ў кіраўніцтве дзяржавай і яе ўплыў на духоўнае жыццё ўсёй краіны. А ў позніх творах нават прадпісвае, што неабходна зрабіць, каб дасягнуць грамадзянскага дабра. У творы «Threnas to jest lament…» Мялецій Сматрыцкі пад імем Тэафіла Арталога абвінавачвае русінаў у адпадзенні ад Маці-Царквы, адрасуючы свой «плач» шляхце, заклікаючы яе да вяртання ў праваслаўе. Менавіта шляхта з'яўляецца для Сматрыцкага дзеючай сілай гісторыі: згадваючы праваслаўных шляхецкіх продкаў грэка-каталіцкага біскупа Іпація Пацея,

ён заклікае таго быць верным іх перакананням. У гэтым творы Мялецій Сматрыцкі рэзка адмоўна ставіцца да Каталіцкага касцёла, называе яго ератычным. Аднак пазней Мялецій Сматрыцкі неаднаразова ўхвальна апісваў свабоду вызнання веры ў Рэчы Паспалітай. У «Weryfikacji niewinności» і «Obronie Weryfikacji» Мялецій Сматрыцкі апраўдвае існаванне неўніяцкай Кіеўскай мітраполіі і законнасць яе іерархіі, якую аднавіў ерусалімскі патрыярх Тэафан III. Ён адкідвае абвінавачванні ў шпіянажы на карысць Порты і сцвярджае, што Тэафан нават заклікаў казакоў ваяваць супраць туркаў за караля Рэчы Паспалітай. У гэтых творах полацкі епіскап дастаткова адназначна заяўляе, што галоўны вораг усіх хрысціян – Асманская імперыя, для барацьбы з якой неабходна грамадзянскае адзінства, супольная праца ўсіх саслоўяў, згода ў дзяржаве. Крытыка ўніі з тэалагічнай змяшчаецца на палітычную: Сматрыцкі абінавачвае прыхільнікаў уніі ў парушэнні сацыльнага супакою, паводле «Weryfikacji niewinności» для міра ў дзяржаве на землях ВКЛ павінна быць толькі адна Руская царква, якая будзе агульнай для ўсіх русінаў, у той час як Каталіцкі касцёл аб'яданае палякаў і літвінаў. Тым не менш, Мялецій Сматрыцкі адзначае, што не вера робіць «русіна русінам, літвіна літвінам, а паляка палякам», але кроў і паходжанне [4, с. 301]. У параўнанні з больш раннімі творамі, полацкі епіскап выказваецца значна больш мякка, не абвінавачвае каталіцызм у ерасі, дапускае яго існаванне разам з праваслаўем. Акрэсліваецца роля шляхты як абаронцаў міжканфесійнага міру, шляхта павінна быць мудрымі заканадаўцамі і мужнымі воінамі. Што паказальна, Сматрыцкі прытрымліваўся амаль аднолькавых поглядаў на шляхецкае саслоўе нават пасля пераходу на бок уніі. У сваім першым уніяцкім творы «Апалогія перангрынацыі…» (1627) усё так жа абараняе ідэі ўнутрыдзяржаўнай згоды і парадку, але цяпер сцвярджае, што для таго, каб дасягнуць гэтага, неабходна спачатку прывесці народы Рэчы Паспалітай да рэлігійнага адзінства. Асобна да працы на карысць гэтага адзінства Сматрыцкі заклікае шляхту, якая павінна адмовіцца ад ерасяў, каб стаць прыкладам усяму «рускаму народу» [9, с. 31]. Менавіта на шляхту ўскладваецца абавязак абараняць не толькі межы дзяржавы, але і «веру продкаў» (для Сматрыцкага-ўніята праваслаўе і каталіцызм з'яўляюцца сінонімамі, адным вызнаннем артадаксальнай веры). Шляхта для полацкага епіскапа – найлепшае і самае шаноўнае саслоўе, якое павінна мудра кіраваць праз сеймы. Менавіта на шляхце абавязак захоўваць супакой і імкнуцца да супольнага дабра.

Агульным у палітычных перакананнях Пятра Скаргі і Мялеція Сматрыцкага неабходна прызнаць імкненне да грамадзянскага парадку, саслоўнага міру і згоды ў дзяржаве. Яны абодва наследуюць традыцыйнай арыстоцелеўска-сярэднявечнай канцэпцыі дзяржавы, якая існуе для агульнага дабра як аб'яднанне людзей аднаго паходжання. Тым не менш, у межах гэтай парадыгмы яны ствараюць розны вобраз дасканалай дзяржавы. Пётр Скарга абараняе моцную каралеўскую ўладу, якая абапіраецца на Сенат і духавенства; рыцарства ці шляхта ў яго бачанні павінна ваяваць, абараняючы ўладу і ўвесь Pax Christiana ад знешніх ворагаў. У сваю чаргу, Мялецій Сматрыцкі адданы ідэалам шляхецкай дэмакратыі, шляхта, паводле яго, павінна быць не толькі мужнай на вайне, але і мудрай у палітычных справах. Адносна

іншых саслоўяў палемісты прытрымліваюцца тамісцкага пераканання, што ўсе павінны знаходзіцца на сваім месцы і выконваць сваю ролю.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Капустенскій, З. Палінодія // Русская Историческая Библиотека: в 39 т. СПб., 1872–1927. Т. 4. С. 313–1200.
2. Кароткі У. Г. «Третий Рим» и «Второй Константинополь»: проблема иерархии в церковно-полеми-ческой литературе восточных славян // Сравнительное литературоведение: теоретический и исторический аспекты: Мат-лы Междунар. научной конференции. М., 2003. С. 111.
3. Кароткі У. Творчы шлях Мялеція Сматрыцкага Мінск: Навука і тэхніка, 1987. С. 42.
4. Smotrizki M. Verificatia niewinności // Архив Юго-Западной России, издаваемый комиссиею для разбора древних актов. Киев: Типография Г. Т. Корчак-Новицкого. Т. 7. Ч. 1. С. 279–344.
5. Skarga P. O rządzie i jedności Kościoła Bożego. Kraków, 1591.
6. Skarga P. Proces konfederacyjej. Kraków, 1596.
7. Skarga P. Kazania sejmowe / oprac. J. Tazbir, M. Korolko. Wrocław etc.: Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1984.
8. Skarga P. Upominanie do ewangelików y do wszystkich społem nie katholików, iż o skażenie zborów Krakowskich gniewać się y nic nowego y burzliwego zaczynać nie maią. Poznań: B. Wolrobowa i dziedzice, 1592.
9. Smotrycki M. Apologia Peregrinatiey do kraiów wschodnich. Dermań, 1628.
10. Tazbir J. Piotr Skarga. Szermierz Kontrreformacj. Warszawa; Wiedza powszechna, 1983.

# РАЗДЗЕЛ 3
# СУСВЕТНАЯ ЛІТАРАТУРА І АСПЕКТЫ КАМПАРАТЫВІСТЫКІ

## Ф. НИЦШЕ И А. ПУШКИН: ДВА «ЗАКЛИНАНИЯ»

**И. С. Скоропанова**

*Доктор филологических наук, профессор,*
*Белорусский государственный университет,*
*пр-т Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, SkoropanovaI@bsu.by*

Статья посвящена культурному диалогу немецкого философа, филолога, поэта, композитора Ф. Ницше с гением русской литературы А. Пушкиным. Рассматривается романс Ф. Ницше-композитора «Beschwörung», созданный на слова стихотворения А. Пушкина «Заклинание», осуществляется их сопоставительная характеристика. Тема статьи является актуальной, так как в пушкинистике данный вопрос едва затронут и, скорее, в информационном, нежели аналитическом ключе. Цель исследования – раскрыть причины обращения Ф. Ницше к пушкинскому тексту, промежуточный характер его освоения через перевод на немецкий язык Т. Опицем, особенности музыкальной трактовки стихотворения, отражающие и обнаруженную Ф. Ницше близость собственным переживаниям, и его личностный подход к заинтересовавшему поэтическому произведению иностранного автора, в каковом проявляются и черты немецкой ментальности. Статья имеет междисциплинарный, компаративистский, мультимедийный характер. Ценность проделанного исследования – в заполнении имеющегося пробела в изучении творчества А. Пушкина и в расширении представления о характере взаимодействия немецкой и русской культур. Практическое значение результатов работы – в возможности использовать её материал как литературоведами, так и переводчиками и музыковедами при чтении лекций, проведении практических и семинарских занятий по родственной проблематике.

***Ключевые слова:*** поэзия; музыка; культурный диалог; стихотворение А. Пушкина «Заклинание»; романс Ф. Ницше «Beschwörung»; характер апроприации.

## Ф. НІЦШЭ І А. ПУШКІН: ДВА «ЗАКЛИНАНИЯ»

**І. С. Скарапанава**

*Доктар філалагічных навук, прафесар,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр-т Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, SkoropanovaI@bsu.by*

Артыкул прысвечаны культурнаму дыялогу нямецкага філосафа, філолага, паэта, кампазітара Ф. Ніцшэ з геніем рускай літаратуры А. Пушкіным. Разглядаецца раманс Ф. Ніцшэ-

кампазітара «Beschwörung», створаны на словы верша А. Пушкіна «Заклинание», ажыццяўляецца іх супастаўляльная характарыстыка. Тэма артыкула з'яўляецца актуальнай, так як у пушкіністыцы дадзенае пытанне ледзь закрануты і, хутчэй, у інфармацыйным, чым аналітычным ключы. Мэта даследавання – раскрыць прычыны звароту Ф. Ніцшэ да пушкінскага тэксту, прамежкавы характар яго асваення праз пераклад на нямецкую мову Т. Опіцам, асаблівасці музычнай трактоўкі верша, якія адлюстроўваюць і выяўленую Ф. Ніцшэ блізкасць да уласных перажыванняў, і яго асобасны падыход да зацікавіўшага яго паэтычнага твора замежнага аўтара, у якім выяўляюцца і рысы нямецкай ментальнасці. Артыкул мае міждысцыплінарны, кампаратывісцкі, мультымедыйны характар. Каштоўнасць праведзенага даследавання – у запаўненні наяўнага прабелу ў вывучэнні творчасці А. Пушкіна і ў пашырэнні ўяўлення аб характары ўзаемадзеяння нямецкай і рускай культур. Практычнае значэнне вынікаў працы – у магчымасці выкарыстоўваць яе матэрыял як літаратуразнаўцамі, так і перакладчыкамі і музыказнаўцамі пры чытанні лекцый, правядзенні практычных і семінарскіх заняткаў па роднаснай праблематыцы.

***Ключавыя словы:*** паэзія; музыка; культурны дыялог; верш А. Пушкіна «Заклинание»; раманс Ф. Ніцшэ «Beschwörung»; характар апрапрыяцыі.

## F. NIETZSCHE AND A. PUSHKIN: TWO «SPELLS»

**I. S. Skoropanova**

*Hab. PhD, Professor,*
*Belarusian State University,*
*4 Nezavisimosti Ave, 220030, Minsk, Belarus, SkoropanovaI@bsu.by*

The article is devoted to the cultural dialogue between the German philosopher, philologist, poet, composer F. Nietzsche and the genius of Russian literature A. Pushkin. The article considers the F. Nietzsche-composer's romance «Beschwörung» created on the words of A. Pushkin's poem «Spell», their comparative characterisation is carried out. The topic of the article is topical, as in Pushkin studies this issue is hardly touched upon and, rather, in an informative than analytical way. The aim of the research is to reveal the reasons for Nietzsche's appeal to Pushkin's text, the intermediate character of its mastering through the German translation by T. Opitz, the peculiarities of the musical interpretation of the poem, reflecting both Nietzsche's proximity to his own experiences and his personal approach to the poetic work of a foreign author, in which features of German mentality are also manifested. The article has an interdisciplinary, comparativist, multimedia character. The value of the research is in filling the existing gap in the study of A. Pushkin's work and in expanding the idea of the nature of interaction between German and Russian cultures. The practical significance of the results of the work is the possibility to use its material both by literary critics, translators and musicologists when giving lectures, conducting practical and seminar classes on related problems.

***Keywords:*** poetry; music; cultural dialogue; A. Pushkin's poem «Spell»; F. Nietzsche's romance «Beschwörung»; character of appropriation.

Особое пристрастие к музыке и повышенную музыкальную одарённость Ф. Ницше считал характерной чертой немецкой ментальности, утверждал: «Жизнь без музыки – нелепость. У немцев даже Бог на небеси поёт» [1, с. 543]. Во всяком случае к самому Ф. Ницше – философу, филологу, поэту, композитору – это суждение полностью подходит: можно сказать, что дух музыки связывает все аспекты его творческой индивидуальности.

А. Аствацатуров указывает, что музыкальное образование Фридрих начал получать с шести лет, когда мать подарила ему рояль; с десяти стал сочинять музыку сам; продолжал этим заниматься и в последующие годы, испробовав в себя в различных музыкальных жанрах, преимущество отдавая фортепианным сочинениям и вокальной лирике. Первый пик ницшевской композиторской активности приходится на 1862–1865 годы: это период обучения в школе Пфорта и Боннском университете, откуда, разочарованный в теологии, он ушел в Лейпцигский университет на филологию. Среди его многочисленных музыкальных композиций есть произведения на стихотворения А. Пушкина (см. [2, с. 23]).

Интересно разобраться, как и почему Ф. Ницше вышел на А. Пушкина, что общего с ним нашел, почему А. Пушкин зазвучал для него музыкально.

Из поэтов Фридрих любил античных авторов, Ф. Шиллера, Д. Байрона, Ф. Гёльдерлина, писал музыку на стихи А. Шамиссо, К. И. Грота, Ш. Петефи, Ф. Рюккерта. Всё это европейские величины; Россия же в Европе, в основном, воспринималась как европеизирующаяся, но все-таки варварская страна. Тем не менее совершенный ею на почве европеизации культурный прорыв, связанный прежде всего с творчеством А. Пушкина, привлек к себе внимание благодаря оценке последнего после его смерти А. Мицкевичем (осевшим к тому времени во Франции) как явления мирового значения. В Германии в 1840-е годы вышел двухтомник, в 1854–1855-е – трехтомник сочинений А. Пушкина в переводе на немецкий. Специалисты предполагают, что какое-то представление о них Ф. Ницше имел, так как интересовался славянством. Известно также, что при обучении в Боннском университете у Фридриха был русский товарищ-сокурсник. Возможно, он привлек внимание Ф. Ницше к России и личности А. Пушкина. Сказалось в этом и влияние Т. Опица, поэта-переводчика А. Пушкина на немецкий язык, ведь именно к его переводам обратился Ф. Ницше. Между ними существовали и личные отношения – Т. Опиц был одним из первых поклонников

Ф. Ницше, и его мнению Фридрих доверял. Стихи же он оценил и наиболее резонирующие по передаваемому настроению с его душевным состоянием положил на музыку.

Выскажу предположение, что выбор стихотворения А. Пушкина «Заклинание» в переводе «Beschwörung» Т. Опица определён известной близостью духа, стиля, образной системы данного произведения поэзии немецкого романтизма, и сам Ф. Ницше-поэт характеризуется как поздний романтик. По словам Т. Манна, романтизм «вывел музыку из глухомани узкой специальности и дудочников и привёл к контакту с миром высшей духовности, с общим художественно-интеллектуальным движением времени», сделал искусством, перешедшим «из сферы чисто музыкальной в сферу общеинтеллектуального» [3, с. 187]. Аналогичен подход Ф. Ницше в «Beschwörung».

Обычно датой написания А. Пушкиным «Заклинания» считается 1830 год, местом – нижегородское родовое поместье Болдино, куда А. Пушкин приехал для оформления наследственных дел, но эпидемией холеры был удержан там на три месяца. Из большого числа произведений, написанных в болдинскую осень, «Заклинание» резко выделяется именно как романтическое, тогда как все остальные пушкинские произведения – отчётливо-реалистические. В. Кунин (см. [4, с. 269]) относит его к стихотворениям-воспоминаниям, но выраженные в нём чувства говорят не о прошлом, а о свежих муках, каковые нетерпеливо ждущий брака с Н. Гончаровой поэт испытывать не мог. Более убедительно суждение М. Визеля: «17 октября / пт. Переписанные набело стихотворения «Заклинание» и «Стамбул гяуры нынче славят…» [5, с. 72]. Заточённый в Болдино А. Пушкин не только сочиняет, но и приводит в порядок свой, если так можно выразиться, литературный архив.

Стихотворение представляет собой обращение к умершей женщине, которую лирический герой любил и продолжает любить после её кончины.

Используемое имя скончавшейся – Леила – сугубо условное и имеет двойственную семантику. Оно отсылает к поэме Д. Байрона «Гяур», где Леила ассоциируется с красотой и гармонией. Однако в переводе с арабского Леила означает «сумерки», «ночь», что косвенным образом указывает, что называемая мертва. Предполагают, что здесь зашифрован автобиографический факт, и умершая возлюбленная поэта – гречанка Калипсо Полихрони либо жена одесского негоцианта Амали Ризнич, в которую влюбился поэт во время одесской ссылки, но умершая от чахотки. С одной из этих дат смерти, скорее всего, и связано появление стихотворения, по крайней мере его первого варианта.

Поэтику «Заклинания» определила романтическая условность с оттенком мистицизма. Впечатление, что А. Пушкин ориентируется на линию В. Жуковского, для баллад и сказок которого характерен мотив явления живого мертвеца, в свою очередь восходящий к немецкой романтической традиции (например, к «Леноре» Г. Бюргера). У А. Пушкина, однако, мотив, к каковому он отсылает, дан в «перевёрнутом» виде: не призрак умершего увлекает за собой возлюбленную в могилу, а потерявший любимую призывает её к себе – в жизнь, ибо для него она жива: все его мысли о ней, и любовь к ней, перемешанная со скорбью, неизменна и по-прежнему сильна. Не

тайны гроба интересуют лирического героя и не посещающие его иногда сомнения волнуют: а столь ли идеальной была возлюбленная? Нет, не это им движет, признаётся заклинающий:

тоскуя,
Хочу сказать, что всё люблю я,
Что весь я твой: сюда! сюда! [6, с. 115].

В сущности, в романтическом ключе А. Пушкин воспевает вечную любовь – и до гроба, и после гроба – всегда.

Вот этот максимализм, жажда сверхвозможного, нетускнеющая сила чувства, думается, и привлекли Ф. Ницше, ценившего жизнь на пределе.

Оценил он, надо думать, и то, что страдающий персонаж А. Пушкина – отнюдь не декадент: не сломлен выпавшем на его долю несчастьем, и его скорбь – это «скорбь глубочайшего счастья» [6, с. 397], испытанного и испытываемого им, – счастья настоящей любви. Он не хочет, чтобы всё пережитое исчезло без следа, и сохраняет его в поэтическом слове. О том, что лирический герой «Заклинания» – поэт, свидетельствуют образы, в которых ему видится явление умершей. Это «возлюбленная тень», «дальняя звезда», «легкий звук», «дуновенье», «ужасное виденье» – принято будет всё, чем она о себе заявит. Поэт даёт ей посмертную жизнь. Исповедь и акт творчества у А. Пушкина не разъединены. Отсюда – пронизывающая стихотворение искренность, деятельный (если так можно выразиться) характер призыва, что подчёркивает завершающий каждую строфу трёхкратный повтор:

сюда, сюда!
<…>
сюда! сюда!..
<…>
сюда, сюда! [6, с. 115–116].

На фоне развернутых на всю строфу-восьмистишие сложных синтаксических конструкций с их замедленной мелодичностью подобные обороты-заклинания напоминают «взрывы». Ритмическая энергетика уравновешивает тоскливые строки, так что общее уныние стихотворению не присуще – уже воображаемое общение с дорогим существом будит в герое-поэте живые силы.

Следуя за ходом пушкинской мысли и передачей воссоздаваемых чувств, Ф. Ницше в то же время даёт в романсе произведению свою трактовку, посредством музыки усиливает всё, прозвучавшее в стихотворении, и прежде всего, укрупняет образ исповедующегося и заклинающего лирического героя, наделяя его величием. Ясно, что при всей художественной условности за этим образом стоит личность А. Пушкина, но сам он проакцентировать свою принадлежность к числу великих в мире культуры постеснялся. Ф. Ницше же в числе первых посчитал нужным это продемонстрировать. Романс создан с учётом оперной традиции Венской школы, несёт

в себе дух высокой классики, не отменяющий внимание к психологическим нюансам переживаний, наделён известной патетичностью и обращён не только к скончавшейся Леиле, но и к воспринимающей публике, для которой написан, так что в нём можно уловить черты ариетты. Есть в романсе приметы «звуковой живописи».

Создан романс в тональности до-минор, и его «минорность» обоснована, хотя не однообразна, – варьируется и с мажорными руладами. Вот начало нотного варианта:

Фортепианное звучание у Ф. Ницше – намеренно приглушённое, как бы берущее на себя роль скорбного аккомпанемента и отчётливо заявляющее о себе в виде аккордов в паузах между строфами. Главная же роль отведена у Ф. Ницше сольному исполнению, по контрасту с фортепианной мелодией, напротив, звучному, завораживающему. Уникальность личности повествующего о постигшей его трагедии и своей необыкновенной любви выражается и в том, что композитор создал романс в расчёте на его исполнение тенором. В звучании этого голоса, в зависимости от того, какие ноты – низкие или высокие – он берёт, проступает и взросло-мужское и подростково-юношеское, что сигнализирует о том, что и в зрелом человеке сохранилась молодость души, прежде всего – в остроте испытываемых переживаний. Искусность выводимых рулад – намёк на его талантливость. Как и у А. Пушкина, энергия ритма, передающая силу чувства, нарастает к концу каждой строфы:

Zu mir, zu mir!
<…>
Zu mir, zu mir!
<…>
Zu mir, zu mir! [7].

Завершается же романс мощным фортепианным аккордом. В результате доминирует перевес жизнеутверждающего над скорбно-трагедийным. Герой романса предстаёт как незаурядная, талантливая, стойкая в испытаниях личность, в творчестве одолевающая душевный мрак, дарующая символический модус бессмертия настоящей любви.

А. Пушкин отчасти «германизирован» Ф. Ницше, но и сам привнёс в романс свою задушевность, передаваемую, главным образом, негромкими междусольными аккордами. Пушкинское стихотворение дало Ф. Ницше импульс для творчества, а Ф. Ницше-композитор дал произведению новую жизнь.

В Германии ницшевский романс «Beschwörung» считается одним из самых удачных музыкальных произведений Ф. Ницше и до настоящего времени входит в репертуар Берлинской академической оперы (см. [8]). Заслуживает он и более широкого распространения на родине А. Пушкина, настраивая на культурный диалог. Нужно ценить сближающее страны и нации.

## Библиографические ссылки


1. Ницше Ф. Стихотворения. Философская проза / Сост. и вступ. статья М. Кореневой; Вступ. статья и комментарии А. Аствацатурова. СПб.: Худож. лит., 1993.

2. Астравацатуров А. Три великие книги Фридриха Ницше // Фридрих Ницше. Стихотворения. Философская проза. СПб.: Худож. лит., 1993. С. 22–60.

3. Манн Т. Собр. соч.: в 10 т. Т. 5: Доктор Фаустус. М.: Госиздат. худож. лит., 1960.

4. Жизнь Пушкина: Переписка; Воспоминания. Дневники: в 2 т. Т. 2 / Сост. вступ. очерки и прим. В.В. Кунина. М.: Правда, 1988.

5. Визель М. Пушкин. Болдино. Карантин. Хроника самоизоляции 1830 года. М.: Болден, 2022.

6. Пушкин А.С. Полн. собр. соч.: в 6 т. Т. 2: Стихотворения 1826–1836. Поэмы. М.: Госиздат, 1949. С. 115–116.

7. Opitz Theodor. Beschwörung // Орфей. Книги о музыке. Кн. 1. ПБ: изд. Госакадфилармонии, 1922. С. 222–225.

8. Nietzsche: Beschwörung. Dietrich Fischer-Dieskau Aribert Reimann. [Электронный ресурс]. URL: https://www.youtube.com/watch?v=5vffxOjFiJs (дата обоащения: 19.09.2024).

# ГРАТЭСК У МАСТАЦКАЙ СІСТЭМЕ БАЛЯСЛАВА ЛЕСЬМЯНА (НА ПРЫКЛАДЗЕ БАЛАДЫ «ПІЛА»)

**Н. Я. Анапрэенка**

*Кандыдат філалагічных навук,*
*Нацыянальная бібліятэка Беларусі,*
*пр-т Незалежнасці, 116, 220114, г. Мінск, Беларусь, anapreenkanatalla@gmail.com*

Даследуюцца асаблівасці гратэску ў мастацкай сістэме польскага паэта Б. Лесьмяна. Трагікамічныя элементы глыбока ўвайшлі ў яго паэзію, аказалі істотны ўплыў на творчую свядомасць, мастацкае мысленне, гумар і сатыру. У сваёй творчасці паэт узнімае праблемы ўніверсальнага характару, імкнецца адказаць на пытанні аб сэнсе жыцця і прызначэнні чалавека ў свеце. Уласнае светаадчуванне аўтар перадае з дапамогай гратэску як сродку стварэння дзіўных персанажаў, якія трапляюць у незвычайныя сітуацыі. Праводзіцца аналіз светапоглядных і эстэтычных пошукаў гэтага майстра слова, якія абумовілі гратэскава-парадыйны аспект яго творчасці. Рысы індывідуальнага стылю пісьменніка раскрыты не толькі ў сувязі з літаратурнымі традыцыямі, але і з улікам яго творчага метаду і эвалюцыі поглядаў: вызначаны спецыфіка аўтарскага «я», сродкі аўтарскай рэфлексіі і паэтызацыі з'яў навакольнай рэчаіснасці.

***Ключавыя словы:*** балада; гумар; гратэск; парадокс; трагікамізм; фальклор; баладатворчасць.

# ГРОТЕСК В ХУДОЖЕСТВЕННОЙ СИСТЕМЕ БОЛЕСЛАВА ЛЕСЬМЯНА (НА ПРИМЕРЕ БАЛЛАДЫ «ПИЛА»)

**Н. Я. Анапреенко**

*Кандидат филологических наук,*
*Национальная библиотека Беларуси,*
*пр-т Независимости, 116, 220114, г. Минск, Беларусь, anapreenkanatalla@gmail.com*

Исследуются особенности гротеска в художественной системе польского поэта Б. Лесьмяна. Трагикомические элементы глубоко вошли в его поэзию, оказали существенное влияние на творческое сознание, художественное мышление, юмор и сатиру. В своем творчестве поэт поднимает проблемы универсального характера, стремится ответить на вопросы о смысле жизни и предназначении человека в мире. Собственное мироощущение автор передает с помощью гротеска как средства создания удивительных персонажей, попадающих в необычные ситуации. Проводится анализ мировоззренческих и эстетических изысканий этого мастера слова, обусловивших гротескно-пародийный аспект его творчества. Черты индивидуального стиля писателя раскрыты не только в связи с литературными традициями, но и с учетом его творческого метода и эволюции взглядов: определены специфика авторского «я», средства авторской рефлексии и поэтизации явлений окружающей действительности.

***Ключевые слова:*** баллада; юмор; гротеск; парадокс; трагикомизм; фольклор; балладотворчество.

# GROTESK IN THE ARTISTIC SYSTEM BOLASLAVA LESMYAN (BASED ON THE EXAMPLE OF THE BALLAD «SAW»)

**N. Y. Anapreenko**

*PhD, Ass. Professor,*
*National Library of Belarus,*
*Nezavisimosti Avenue, 116, 220114, Minsk, Belarus, anapreenkatalla@gmail.com*

The article examines the features of the grotesque in the artistic system of the Polish poet B. Lesmian. Tragicomic elements were deeply rooted in his poetry and had a significant influence on creative consciousness, artistic thinking, humor and satire. In his work, the poet raises problems of a universal nature, strives to answer questions about the meaning of life and the purpose of man in the world. The author conveys his own worldview using the grotesque as a means of creating original characters who find themselves in unusual situations. An analysis of the ideological and aesthetic searches of this master of words, which determined the grotesque-parody aspect of his work, is carried out. The features of the writer's individual style are revealed not only in connection with literary traditions, but also taking into account his creative method and the evolution of his views: the author's specificity, the means of author's reflection and poeticization of the phenomena of the surrounding reality are determined.

***Keywords:*** ballad; humor; grotesque; paradox; tragicomism; folklore.

Б. Лесьмян – стваральнік дзіўных і незвычайных персанажаў, важнейшымі рысамі якіх з'яўляецца парадыйнасць (знешні выгляд і паводзіны герояў) і сумежнае становішча (існаванне на перакрыжаванні тутэйшага быцця і тагасвету). З прычыны прамежкавага становішча, нявызначанага анталагічнага статусу, а таксама незвычайных сітуацый, у якіх знаходзяцца гэтыя незвычайныя істоты, яны з'яўляюцца адначасова і трагічнымі, і камічнымі, бо, як слушна адзначыла Э. Сідарук, «іх быццё – цень зямной экзістэнцыі, форма існавання так занадта на яе падобная і адначасова такая розная, што можна было б яго акрэсліць як "пародыю" экзістэнцыі» [1, с. 98].

Вычурна-казачныя персанажы Б. Лесьмяна, як і ўся яго мастацкая прастора, ўяўляюць сабой ўвасабленне супярэчнасцей тагачаснай эпохі, а гратэскавыя метамарфозы, якія адбываюцца з героямі твораў, – гэта, галоўным чынам, водгаласы ўласных духоўна-светапоглядных метамарфоз польскага майстра слова. Н. Багамолавай зроблена цалкам справядлівая заўвага, што «гумар становіцца выяўленнем стаічнага стаўлення паэта да непазбежнага трагізму света і чалавечага існавання» [2, с. 162].

Пры стварэнні ўласных фантастычных сюжэтаў і вобразаў безумоўным арыенцірам Б. Лесьмяна была стыхія народнай гумарыстыкі. Адным з пацверджанняў гэтага з'яўляецца выкарыстоўванне польскім пісьменнікам традыцый нацыянальнай баладатворчасці. Сярод яго камічных твораў ў жанравых адносінах пераважаюць байкі, балады, баладападобныя творы і «песні», блізкія да балады, дзе гратэскава-парадыйны аспект паэзіі Лесьмяна найбольш прыкметны. Але не толькі таму, што балада – ўлюбёны жанр паэта: у структуру самой балады закладзены функцыянальныя

магчымасці парадыйнай і гратэскавай практык. З падобнага пункту гледжання зыходзіць і Б. Стэльмашчык: «Па-першае – напісаная вершам, яна (балада – *А. Н.*) мела, з аднаго боку, моцна развіты сюжэтны бок, з іншага – яе сінкрэтычны характар дазваляў моцную лірызацыю апісання і драматызацыю сітуацыйных сцэнак, што палягчала стылізацыю і дадавала маляўнічасці наратыўным адносінам. Па-другое – народныя ўзоры балады адрозніваюцца асабліва напеўнай рытмікай і версіфікацыяй; гэта набліжае баладу да песні, што таксама добра ўпісваецца ў лесьмянаўскае паняцце функцыі рытму і песні ў мастацтве паэзіі. Па-трэцяе – як форма, якая выйшла з народнай уражлівасці і народнага бачання свету, балада была ідэальнай формулай для набліжэння да духоўнасці першаснага чалавека. Акрамя таго, залічаныя да жанравых асноў балады такія рысы, як фантастыка, дэманічнасць, таямнічасць, аб'ядноўваюць яе ля самых каранёў з казачнасцю. Спосаб супастаўлення Лесьмянам усіх гэтых аспектаў у яго баладах даказвае, што яны набываюць характар гратэску» [3, с. 289]. Літаратурная балада па сваёй сутнасці – жанр стылізаваны, які застаецца ў цеснай сувязі з народнай культурай і спалучае сур'ёзнасць са смехам. Актыўна выкарыстоўваючы гатовыя наратыўныя ўзоры гэтага жанру, Б. Лесьмян узнімае ў сваіх мастацкіх тэкстах пэўныя філасофскія пытанні.

Народны гумар, часам здзеклівы, часам проста гратэскавы, служыць зыходным матэрыялам для польскага творцы пры стварэнні ўласных вобразаў, сюжэтаў, тэм. Асаблівую ўвагу прыцягвае зварот паэта да матыву смерці: «Збліжэнне з фальклорам падкрэсліла своеасаблівую "барокавасць" уяўлення Лесьмяна: захапленне не толькі смерцю, але і раскладам, брыдотай, пачварнасцю – аднолькава, у такім пагрозлівым варыянце, як гратэскавы і поўны народнага гумару», – сцвярджае Е. Квяткоўскі [4, с. 81]. Б. Лесьмян выкарыстоўвае гэты матыў не толькі, каб паказаць часовасць жыцця, але яго адзінасць і непаўторнасць. «Смерць чакае лесьмянаўскіх герояў. Але як своеасаблівая абарона перад ёй – гумар Лесьмяна, вытокі якога – у народнай мудрасці. <…> Гэты гумар з'яўляецца састаўной часткай цэласнага, аптымістычнага ў сваёй аснове погляду мастака на свет», – разважае В. Хораў [5, с. 245]. У творах польскага паэта смерць − заўсёды момант абвостранага адчування жыцця, абсалют асалоды, вышэйшая мэта чалавечага існавання тут, на зямлі.

Нароўні з матывамі смерці і макабрычнымі вобразамі значнае месца паэтычнай спадчыне Б. Лесьмяна займае матыў пачварнасці, дэструкцыі і распаду цела, адным з этапаў якога з'яўляецца калецтва. Па словах К. Кароткіх, «ствараючы чалавека, ён канструіруе *homunculusa* (гамункула – *А. Н.*), заўсёды асуджаючы яго на калецтва, знішчэнне ці забаўкі насмешлівага лёсу» [6, с. 72]. Увогуле ў мастацтве для гратэсавага вобразу ўласціва адсутнасць адзінства і цэласнасці, ён заўсёды прымае дзіўныя ці скажоныя формы. Аднак у гратэску за знешнім непраўдападабенствам, фантастычнасцю прыхавана глыбокае мастацкае абагульненне важных з'яў жыцця. У творчасці Б. Лесьмяна «алхімія цела» ў першую чаргу звязана з пазнаваўчым працэсам, мэтай якога з'яўляецца адкрыццё чагосьці ўтоенага і неспазнага. Гаворачы словамі Б. Сянкевіча, польскі паэт ставіць герояў гэтых твораў «перад экстрэмальным «тэсціраваннем» цела» [7, с. 172]. Гратэскавая вобразнасць ствараецца аўтарам праз паказ найскладаных механізмаў чалавечай псіхікі: героі, якія спазнаюць распад цела, адначасова адчуваюць як пакуту, так і асалоду ад такога гвалту.

У гэтым кантэксце характэрным прыкладам з'яўляецца балада «Піла» («Ріла», 1920), напісаная ў стылі народнай прыпеўкі з вялікай дозай гумару. «Гэта даказвае народная "задзірлівасць" і жартаўлівасць стылю нарацыі, а таксама народны песенна-танцавальны рытм дыстыхаў. "Цябе прагну, мрою адзіны – дыны мае дыны" – спявае здань хлопцу, якога сабе нагледзела. У яе "стан пілы" (зварот да народных вераванняў), і яна вельмі хутка закахалася. Яна рэкламуе свае "вострыя" магчымасці, спакушаючы хлопца, а гэтая спакуса своеасаблівая: яна прапаноўвае яму такое каханне, якога ніколі ў яго не было, і такія сны, якіх ён яшчэ не бачыў. Спакуса становіцца эфектыўнай – і тут заканчваецца народная забава і пачынаецца драма, хоць яна не адразу прыкметная», – доказна даводзіць Б. Стэльмашчык [8, с. 297].

У паэзіі Б. Лесьмяна гратэск служыць у першую чаргу ўзнаўленню ключавой для яго метафізічна-філасофскай праблематыкі. Так і ў гэтым творы вобразы Пілы і парабка на ідэйным і функцыянальным узроўнях перадаюць спецыфіку і неадназначнасць лесьмянаўскага бачання свету:

1. Піла (дакладней, здань у яе выглядзе) сімвалізуе каханне пачуццёвае, нават агрэсіўнае і разбуральнае. Аўтар дакладна апісаў падобны від кахання: «Poznał chłopiec, czym w uścisku jest stal, gdy pokocha! // Całowała go zębami na dwoje, na troje <…> // Poszarpała go pieszczotą na nierówne części…» [9, с. 212].

Выкарыстоўваючы асаблівасці, якімі валодае піла (востры, зазубраны прадмет), паэт перадае цяжкі для апісання душэўны стан і парадаксальныя пачуцці: гэта такое каханне, якое адначасова захапленне і кашмар, шчасце і пакуты.

2. Бязлітасна-эратычны акт герояў гэтага твора мае перспектыву пазнання, якое адбываецца ў экстрэмальнай сітуацыі. Піла прагне давесці хлопца да граніцы пазнання, да разумення таго, што ён не зведаў ніколі: «Oczaruj się tym widokiem, coś go nie widywał, // Ośnijże się tymi snami, coś ich nie wyśniwał» [9, с. 211].

Пры гэтым яе мэтай застаецца і ўласнае пазнавальнае жаданне – адкрыць яшчэ невядомае і ўтоенае праз уладу над асобай, якую яна робіць сваёй ахвярай, рэччу. Ею валодае «жаданне ўлезці ў цела парубка, пашырыць магчымасці, якія надае пазнанне праз пачуццё дотыку ці позірку, перайсці граніцы "замкнёнага" цела. Адкрыццё атрымліваецца з дапамогай гвалту і кахання. Даследаванне чужога цела здзяйсняецца цаной змены яго структуры, а дакладней, яго знішчэння», – цікавыя назіранні выказвае Б. Сянкевіч [7, с. 166].

Аб'ект такой лютасці-пяшчоты – парубак – з ахвотай прымае «ласкі» пілападобнай здані: ён прагне спазнаць каханне іншае, мацнейшае, чым тое, што ён зведаў раней, атрымаць асалоду ад зачаравання, якога яшчэ не выпрабоўваў.

Вобраз парубка сімвалізуе мару аб здзяйсненні сваіх сіл і аб спазнанні перажыванняў на мяжы чалавечых магчымасцей альбо нават пераходзячы гэтую мяжу: ён, згодна Б. Сянкевічу, «спраўджвае сябе праз гранічны вопыт, які дае магчымасць выйсця па-за межы звыклых сітуацый і захапленняў» [7, с. 168]. Такога погляду на праблему прытрымліваецца і М. Савіцка-Леўчук, якая сцвярджае наступнае: «У гранічнай сітуацыі, зазнаючы небяспеку і паражэнне існавання, чалавек адкрывае быццё і небыццё, хоць адкрыццё звычайна азначае пагібель. Лесьмянаўскі вандроўца таньчыць па краі прорвы, каб спазнаць жах таго, што з'яўляецца іншым, каб зразумець здзяйсненне быцця ў яго паразе» [10, с. 241].

3. «Любоўная гульня» Пілы і хлопца заканчваецца ўпадабненнем аб'екта і суб'екта пазнання, страчваннем між імі межаў, тоеснасцю адзін аднаму. Калі гэта прачытаць у сімвалічным ключы, то можна зрабіць наступную выснову: творчая асоба ў пошуках сакральнага сэнсу стварае ўласны, недасягальны для іншых, свет, калі падчас натхнення адбываецца поўнае зліццё адкрывальніка са сваім адкрыццём.

Такім чынам, галоўныя героі – Піла і парубак – гэта не толькі мастацкія вобразы, але і носьбіты ідэі, філасофскага падтэксту твора; абсурдныя і неверагодныя сітуацыі, якія адбываюцца паміж галоўнымі героямі, адначасова прадстаўляюцца і жахлівымі, і смешнымі. Падобны эфект дасягаецца Б. Лесьмянам не толькі праз стварэнне забаўных вобразаў і сітуацый, але таксама і шляхам моўнай гульні, семантычныя наступствы якіх і дазваляюць выявіць адметнасць лесьмянаўскага гумару. Так, шляхам перайначвання паэтычных метафар і слоў з пераносным значэннем жудасная смерць хлопца напаўняецца камічным дыскурсам: «Chcę się ciałem przymiarkować do nowej pieszczoty, // Chcę się wargą wypurpurzyć dla krwawej ochoty! // Chcę dla twojej, dla zabawy tak się przeinaczyć, // Abym mógł się na twych zębach dreszczami poznaczyć!» [9, с. 211]. Таксама аўтар па-майстэрску выкарыстоўвае і двухзначнасць слова «цалаваць»: «Pocałunki dla cię, chłopcze, w ostrą stal uzbroję, // Błysk – niedobłysk na wybłysky – oto zęby moje!» [9, с. 211]. Так і «цалавала» Піла хлопца, пакуль не «зацалавала» да самай смерці.

Аднак на гэтым трагікамічная сітуацыя не заканчваецца: пакрамсанае на кавалкі цела далей працягвае дзіўнае існаванне: павекі замаргалі ў пылу; галава ходзіць па грэблі, шукаючы шыю; адно вока бразгоча ў павуцінне, а другое спіць у мурашніку; грудзі прысвоены ярам-рабаўнікам, які імі дыхае, вуха дапамагае слухаць вербе; адна нага таньчыць у лесе, другая валачэцца па лузе, а рука «знакам крыжа перахрысціла невядома каго» [9, с. 212]. Трагічны змест гэтага твора выказаны ў гратэскава-камічнай форме.

Б. Лесьмян часта звяртаўся да простых формаў вершаскладання, характэрных для фальклору і народнай паэзіі. У баладзе «Піла» польскі мастак слова таксама карыстаецца багатым рэсурсам паэтычных сродкаў, каб твор нагадваў натуральнасць і прастату народнай песні: яна напісана дыстыхам у стылі народнай прыпеўкі і на першы погляд «для забавы». Цікавыя назіранні наконт гэтага выказвае Б. Стэльмашчык: «Радасна пявучы рытм доўжыцца да самага канца, аднолькава зацягваючы і ў смяротную забаву, і ў настойлівыя ласкі дэманічнай пілы. Лёгка, танцавальна, з народным прытупам, гратэскава пачуццёва парэзаны, развальваецца чалавек “у супярэчлівыя краіны” з-за кахання дэмана, «што ведае чароўнасць магілы» [8, с. 298]. Межы спазнання пяройдзены – і вяртанне назад ужо немагчыма. Запал кахання перарастае ў пагрозлівую форму знішчэння.

Такім чынам, Б. Лесьмян у сваёй творчасці ўзнімае метафізічныя пытанні універсальнага характару (сэнс быцця, прызначэнне і месца чалавека ў сусвеце, ідэі сусветнай гармоніі і г. д.) і свой уласны светапогляд перадае пасродкам гратэскавых метамарфоз і казачных персанажаў, якія ўяўляюць сабой увасабленне супярэчнасцей тагачаснай эпохі. Імкненне спазнаць таемную сутнасць духоўна-экзістэнцыяльнага светаўладкавання стварае эмацыянальны напал, напружанасць пачуццяў і глыбокую філасафічнасць твораў, што тлумачыцца ў першую чаргу гарманічнасцю і складанасцю ўнутранага свету самаго аўтара. У сваіх вершах, фантастычных, міфічных,

казачных, ён прадставіў асабістую жыццёвую філасофію, стварыўшы ўласны паэтычны свет, багаты незвычайнай фантазіяй, фантастычны і рэальны адначасова. Створаныя Б. Лесьмянам літаратурныя трагікамічныя сюжэты і вобразы, мудрагеліста трансфармуючыся, змяшчаючы фантасмагарычныя і складаныя сімвалы, выяўляюць касмаганічныя працэсы і ўздымаюць пытанні пра месца асобы, індывідуальнай свядомасці ў складзе ўсяго сусвету.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. *Sidoruk E*. Groteska w poezji Dwudziestolecia: Leśmian – Tuwim – Gałczyński. Białystok: Wyd-wo Uniwersytetu w Białystoku, 2004.

2. *Богомолова Н. А.* Баллада Болеслава Лесьмяна «Свидрига и Мидрига» и перевод Сергея Городецкого // Н. А. Богомолова. Польские и русские поэты XX века. Творческие связи. Аналогии. Художественный перевод. М.: Наука, 1987. С. 159–171.

3. *Stelmaszczyk B.* Demony erotyki. Groteskowo-gotyckie powinowactwa w balladach Bolesława Leśmiana // B. Stelmaszczyk. Wokol gotycyzmow: wyobraznia, groza, okrucienstwo. Kraków: Universitas, 2002. S. 287–298.

4. *Kwiatkowski J*. Literatura Dwudziestolecia. Warszawa: PWN, 1999.

5. *Хорев В.А.* Литература 1918–1944 годов // В.А. Хорев. История польской литературы : в 2 т. М: Наука, 1969. Т. 2. С. 171–225.

6. *Korotkich K*. Metamorfozy Leśmianowskiego człowieka // K. Korotkich. Twórczość Bolesława Leśmiana. Studia i szkice. Kraków: Universitas, 2000. S. 63–72.

7. *Sienkiewicz, B.* Leśmianowska «alchemia ciała» (cykle Ballady i Pieśni kalekujące z tomu Łąka) // Nauka. 2010. № 4. S. 163–181.

8. *Stelmaszczyk B.* Demony erotyki. Groteskowo-gotyckie powinowactwa w balladach Bolesława Leśmiana // B. Stelmaszczyk. Wokol gotycyzmow: wyobraznia, groza, okrucienstwo. Kraków: Universitas, 2002. S. 287–298.

9. *Leśmian B.* Poezje zebrane. Toruń: Algo, 1995.

10. *Sawicka-Lewczuk B.* Mur, granica, kres w wyobraźni poetyckiej Leśmiana // B. Sawicka-Lewczuk. Twórczość Bolesława Leśmiana. Studia i szkice. Kraków: Universitas, 2000. S. 233–244.

# СВЕТАПОГЛЯДНА-МЕТАДАЛАГІЧНЫ ЗРУХ У БЕЛАРУСКАЙ І ПОЛЬСКАЙ ЛІТАРАТУРАХ XIX СТАГОДДЗЯ

**Н. Л. Бахановіч**

*Кандыдат філалагічных навук,*
*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры*
*Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі,*
*вул. Сурганава 1, к. 2, 220072, г. Мінск, Беларусь, Natali_ja@mail.ru*

Гаворыцца пра змены ў мастацкай свядомасці творчай інтэлігенцыі на тэрыторыі Беларусі і Польшчы ў другой палове XIX ст. Грамадства ажыццяўляе радыкальную пераацэнку каштоўнасцей, заручыўшыся падтрымкай запатрабаванага ў той час пазітызму як філасофіі і светапогляду, што садзейнічае кардынальнай змене і кірунку гістарычнага развіцця і характару літаратурнага працэсу. У выніку паступовага мэтаскіраванага адмаўлення эліты ад ідэалізацыці мінулага і засяроджання на рэальным чалавеку і яго патрэбах адбываецца нараджэнне новага героя. Нягледзячы на гістарычна абумоўленую меншую праяўленасць гэтых з'яў у айчынным грамадска-культурным жыцці ў другой палове XIX ст., у параўнанні з польскім, пісьменнікі адчуваюць павевы часу і прадбачваюць будучыя пераўтварэнні пачатку XX ст., здзейсненыя на хвалі Адраджэння.

***Ключавыя словы:*** светапогляд; метадалогія; пазітывізм; чалавек; беларуская літаратура; польская літаратура.

# МИРОВОЗЗРЕНЧЕСКО-МЕТОДОЛОГИЧЕСКИЙ СДВИГ В БЕЛОРУССКОЙ И ПОЛЬСКОЙ ЛИТЕРАТУРАХ XIX ВЕКА

**Н. Л. Баханович**

*Кандидат филологических наук,*
*Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы*
*Национальной академии наук Беларуси,*
*ул. Сурганова 1, к. 2, 220072, г. Минск, Беларусь, Natali_ja@mail.ru*

Говорится об изменениях в художественном сознании творческой интеллигенции на территории Беларуси и Польши во второй половине XIX в. Общество осуществляет радикальную переоценку ценностей, заручившись поддержкой востребованного в то время позитивизма как философии и мировоззрения, что содействует кардинальному изменению и направлению исторического развития и характера литературного процесса. В результате постепенного целенаправленного отрицания элиты от идеализацити прошлого и сосредоточения на реальном человеке и его потребностях происходит рождение нового героя. Несмотря на исторически обусловленную меньшую проявленность этих явлений в отечественной общественно-культурной жизни во второй половине XIX в., по сравнению с польским, писатели чувствуют веяния времени и предвещают будущие преобразования начала XX в., совершенные на волне возрождения.

***Ключевые слова:*** мировоззрение; методология; позитивизм; человек; русская литература; польская литература.

## WORLDVIEW AND METHODOLOGICAL SHIFT IN BELARUSIAN AND POLISH LITERATURE OF THE END OF THE 19TH CENTURY

**N. L. Bahanovich**

*PhD, Ass. Professor,*
*Research Center of Belarusian Culture, Language and Literature*
*of the National Academy of Sciences of Belarus,*
*Surganova av. 1 / 2, 220072, Minsk, Belarus, Natali_ja@mail.ru*

The article talks about changes in the artistic consciousness of the creative intelligentsia in Belarus and Poland in the second half of the 19th century. Society carries out a radical reassessment of values, gaining support for positivism, which was in demand at that time, as a philosophy and worldview, which contributes to a radical change in the direction of historical development and the nature of the literary process. As a result of the elite's gradual purposeful rejection of the idealism of the past and focusing on the real person and his needs, a new hero is born. Despite the historically determined lower manifestation of these phenomena in the national social and cultural life in the second half of the 19th century, compared to the Polish one, the writers feel the mood of the times and anticipate the future transformations of the beginning of the 20th century, carried out on the wave of the Renaissance.

***Keywords:*** worldview; methodology; positivism; a person; Belarusian literature; Polish literature.

XIX стагоддзе ў гісторыі называюць доўгім, і кожны даследчык укладвае ў гэтае вызначэнне сваё разуменне. Калі гаварыць пра літаратуру, то працягласць можна асацыяваць хаця б з тым, што за адносна невялікі час былі народжаны і ў многім пройдзены тры самастойныя светапоглядна-метадалагічныя сістэмы, якія фармавалі аблічча мастацтва слова. Апроч таго, і рамантызм, і рэалізм, і мадэрнізм у пэўным сэнсе былі падрыхтоўкай да грамадска-эканамічнай і культурна-палітычнай парадыгмы наступнага стагоддзя. Не адмаўляючы ў значнасці эстэтыцы кожнай з гэтых сістэм, звернем увагу на тую з іх, што прывяла да нараджэння новага героя – простага чалавека, які стане цэнтрам літаратуры і гісторыі ў XX ст. Пасля паўстанняў 1830–1831 гг., а затым 1863–1864 гг., стымуляваных рамантычным светапоглядам з яго ідэяй змагання, пасля звязанага з паразай грамадскага расчаравання вызначальным зрухам для беларускага і польскага народаў, які прадвызначыў змены ў літаратуры і паўплываў на набліжэнне новай, мадэрнай эпохі, з'яўляецца адмаўленне ад ідэалізацыі старога шляхецкага свету. Традыцыя, запачаткаваная рамантыкам А. Міцкевічам, істотная на працягу ўсяго XIX ст., а для асобных польскіх аўтараў і ў першай палове XX ст. (М. Ваньковіч, А. Юрэвіч і інш.), усё ж губляе значнасць. Становіцца відавоч-

най неактуальнасць ідэі вяртання Рэчы Паспалітай, усвядомленая са спробай аб'ектыўнага погляду на пытанні гісторыі. Па меры разгортвання сацыяльнавызваленчых і нацыятворчых рухаў паволі адбываецца адмаўленне ад жыцця ва ўладзе ілюзій і паварот да рэальных праблем свайго часу.

Нягледзячы на тое, што традыцыя апявання мінулага ў дзвюх літаратурах дэактуалізуецца па-рознаму, аднолькава ажыццяўляецца радыкальная змена курсу і грамадства, і мастацтва: погляды скіроўваюцца ў супрацьлеглым звыкламу і зразумеламу напрамку ідэалізацыі і прагі ўзнаўлення былога – у бок будучыні. Падкрэсліваючы важнасць гэтага моманту, польскі даследчык П. Херц адзначае, што «пэўныя пісьменнікі не перайшлі з засценка "пана радцы" да аднолькава шляхетнага засценка "сучаснай" багемы, але стварылі чарговую эпоху ў літаратуры і польскай думцы. Можна гэту эпоху любіць, можна яе не пераносіць, але не можна яе значэннем грэбаваць» [1, с. 288]. Ды і само высакароднае саслоўе як сацыяльная група, якая была носьбітам ідэі вяртання Рэчы Паспалітай, пакутліва перажывае этап гістарычнай ломкі, справакаваны, з аднаго боку, «разборамі» шляхты, з іншага – яе няздольнасцю арыентавацца ў рэчаіснасці – быць лідарам у новых сацыяльна-эканамічных і культурных умовах. У выніку на хвалі часу, яго магчымасцей і патрэб, жыццё пачынаюць тварыць прадстаўнікі народа (унутры яго якраз пачынаецца грашова-маёмаснае расслаенне), якія стагоддзямі лічыліся ніжэйшымі па статусе (хоць якраз былі найбольш працаздольнымі і выноснівымі). Цяпер яны пачынаюць атрымоўваць слова і набываць грамадскую, а неўзабаве і грамадзянскую вагу. Раней селянін як і выхадзец з іншых непрывілегіяваных саслоўяў, успрымаўся, паводле польскага даследчыка С. Пігоня, «без своеасаблівай унутранай квінтэсенцыі, якая б акрэслівага яго каштоўнасць – ацэньваўся толькі паводле карыснасці, паслужлівасці. Паводле гэтага таксама, у залежнасці ад той функцыі, якую выконваў, ён атрымліваў прозвішча» [2, с. 247]. У другой палове XIX ст. у грамадска-культурнай сферы заўважаецца светапоглядна-метадалагічны зрух – усведамленне неабходнасці камунікаваць з селянінам як з паўнавартаснай духоўнай асобай са сваімі жаданнямі і патрэбамі.

Ключавую ролю ў рэалізацыі гэтага зруху, у тым ліку ў літаратуры, пачынае выконваць пазітывізм: філасофскі кірунак распаўсюджваецца настолькі, што становіцца самастойным і ўсеахопным грамадска-культурным рухам. На ўзроўні праграмы развіцця менавіта ў літаратуры пазітывізму, ідэі якога ўвасабляліся пасродкам творчых метадаў рэалізму і, у меншай ступені, натуралізму, ніжэйшае саслоўе і яго герой са сваімі клопатамі ставіцца ў цэнтр твораў. У польскім мастацтве слова адным з рэалізатараў пазітывісцкіх ідэй і аўтараў грамадскай праграмы выступае творца беларуска-польскага памежжа Э. Ажэшка, якая, жывучы на працягу доўгага часу ў Гародні, увасабляе ў творах вяскоўца-беларуса. Пісьменніца акцэнтуе ўвагу на яго ўзорных маральных якасцях – індывідуалізуе паводле этычнага крытэрыю, робячы тым самым гэтак званыя польскія «крэсы» прасторай маралі. Паварот да селяніна ў канцы XIX ст., распачаты польскай літаратурай, захапіў і беларускую: яна ўсё болей афармляецца як самастойная, дзякуючы прысутнасці айчыннага кампанента, носьбітам якога якраз і быў вясковец, у польскамоўных мастацкіх тэкстах і з'яўленню беларускамоўных. Апроч спадчыны Э. Ажэшкі, Ю. Крашэўскага і іншых аўтараў, дзе шырока прадстаўлены айчынны дыскурс у выглядзе мясцовых рэалій, селянін

знаходзіцца ў цэнтры беларускамоўных твораў В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча.

Гісторыю беларускай думкі звычайна мала звязваюць з пазітывізмам, хоць, калі паразважаць, яго прысутнасць была б цалкам лагічнай. Карані пазітывісцкага светапогляду ў гісторыі нашай краіны глыбейшыя, чым традыцыйна ўяўляецца, зрэшты, як і ў суседзяў: пачынаючы з рамана «Пан Падстоліц» (1831–1833) Э. Масальскага з прапанаванымі ў ім ідэямі рэарганізацыі сістэмы гаспадарання і ладу жыцця, працягваючы апісаннямі напрыканцы рамана «Полацкая шляхта» (1885) В. Савіча-Заблоцкага, дзе гаворыцца пра пабудову фабрыкі, пашырэнне адукацыі сярод сялянства і развіццё асобы з апорай на дакладныя навукі, заўважная ідэя нясення прагрэсу народу. Гэта і ёсць не што іншае, як увасабленне так званай тэорыі «малых спраў», «арганічнай працы», «працы ў асновах». Калі ж гаварыць пра развагі ў паэме «Паляўнічыя акварэлькі з Палесся» (1898) Я. Лучыны, то гэта ўжо спроба крытычнага разумення наступстваў пазітывізму, не ва ўсім станоўчых для чалавека. Хлапаманства, хаджэнне ў народ у тагачаснай жыццёвай практыцы, рэалізаванае ў мастацтве слова, напрыклад, у матыве вяртання на радзіму адлучаных ад народа шляхецкіх сыноў, якія марнуюць грошы за мяжой («Ідылія» (1842–1844) В. Дуніна-Марцінкевіча), нясе адбітак пазітывізму. М. Гарэцкі называе аўтара п’есы паводле ідэалогіі «добрым беларускім шляхціцам-хлопаманам, узгадаваным на ўлонні беларускай прыроды» [3, с. 236], абвінавачваючы, што «глыбей закрануць сялянскае жыццё не дазваляла яму сацыяльная несвядомасць, боязнь нападаў з боку паноў і пераследаванняў з боку царскага рэжыму» [3, с. 237]. Калі гаварыць пра перыяд нацыянальнага Адраджэння пачатку ХХ ст., то ледзьве не ўся нашаніўская літаратура з вобразам мужыка ў цэнтры і імкненнем асэнсавання яго як годнай і вартай асобы, уяўляе сабой наступства папярэдніх светапоглядна-метадалагічных змен, падмацаваных новымі рэаліямі мадэрнага часу з яго навукова-тэхнічнымі дасягненнямі, сацыяльна-эканамічнымі навацыямі і грамадска-палітычнымі канцэпцыямі. Калі прыгледзецца, размовай людзей пазітывісцкага і мадэрнісцкага светапоглядаў з’яўляецца дыскусія ў нашаніўскай прэсе, асноўным пытаннем якой было, ці мае права чалавек аддавацца ва ўладу хараству і песціць яго ў душы, калі радзіма патрабуе самаадданага служэння ў выглядзе практычных дзеянняў.

Рэалізацыя згаданага светапоглядна-метадалагічнага зруху ў беларускай і польскай літаратурах, як і станаўленне новага героя ў іх, па-рознаму ўспрымаецца даследчыкамі дзвюх краін. У свой час вялікае ўражанне на беларускіх літаратуразнаўцаў зрабіла інтэрпрэтацыя польскім гісторыкам Р. Радзікам дзвюх суседніх літаратур як квінтэсенцый «сялянскай» (у беларускай) і «шляхецкай» (у польскай) этыкі [4]. Асноўнай падставай для такіх заключэнняў стала адмаўленне панства ў паэме «Новая зямля» Я. Коласам, дзе гэта саслоўе паўстае як увасабленне старога ладу і сімвал прыгнёту мацнейшым слабейшага. Р. Радзік бярэ пад увагу і паходжанне нашаніўцаў, з якім звязвае схільнасць выказвацца ад імя мужыка ды адмаўляць высакароднаму саслоўю ў годнасці і вартасці. Не адмаўляючы трагічнай разарванасці пануючага і залежнага саслоўяў у айчыннай гісторыі, беларускае мастацтва слова ўсё ж магло б мець іншае аблічча, калі б не выключанасць цэлага рэцэптыўнага пласта –

польскамоўнай прозы Беларусі XIX ст. Вернутая сёння да свайго чытача, яна паступова ліквідуе ўспрыманне радаводу культурнай спадчыны беларусаў як выключна сялянскага (хоць само па сабе апошняе зусім не лічыцца недахопам, як і ў многіх іншых народаў). Заўважны і высакародныя карані Я. Купалы – адсюль у нечым прывабны вобраз Адольфа Быкоўскага ў «Паўлінцы» і такая адухоўленая паэзія. Розніца літаратур не ў наяўнасці ці адсутнасці пэўнага героя з адпаведным светапоглядам і ідэалогіяй ці нейкай ідэі, тэндэнцыі, а хутчэй у станаўленні іх у якасці магістральных. І ў гэтым адметнасць беларускага нацыянальнага шляху ў гісторыі, у якім было, калі ахапіць папярэдняе XIX ст., усё: і высакароднасць, і сялянскасць, і прага мінулага, і паварот да мадэрнай будучыні, у вялікай ступені здзейснены чалавекам шырокага далягляду і еўрапейскага ўзроўню мыслення Ф. Багушэвічам.

Сялянская этыка і сялянская карціна свету не з'яўляюцца для літаратуры нашых суседзяў вызначальнымі ў святле яе вялікай праблемна-тэматычнай разнастайнасці. Але даследаванні паказваюць, што карані вясковай прозы XX ст., якая ўтварае самастойную плынь і ў польскай літаратуры першай паловы XX ст., варта шукаць якраз у творах канца XIX – пачатку XX ст., пачынаючы ад літаратуры пазітывізму [5]. Не бачыць у польскім мастацтве слова супрацьстаяння панскага і сялянскага светапоглядаў ці міжсаслоўных сутычак немагчыма. Для творчасці выхадцаў са збяднелай шляхты, тым больш з вяскоўцаў, не чужыя праблемы працы на зямлі, недахопу грошай і галечы, неабходнасці плаціць падаткі, залежнасці ад прыродных умоў і інш. Апавяданні «Томэк Баран» («Tomek Baran») (1897), «Сука» («Suka») (1897), «Справядліва» («Sprawiedliwie») (1899), «Орка» («Orka») (1919) У. Рэйманта паказваюць наяўнасць канфлікту паміж пануючым і бяспраўным класамі – выкрыццё шляхецкага саслоўя не чужое польскаму мастацтву. Высокі ўзровень раскрыцця падобнай тэматыкі паказваюць творы «Прыцемкі» («Zmierzch») (1892) і «Забыццё» («Zapomnienie») (1895) С. Жэромскага. Толькі прыведзеныя прыклады пазбаўляюць польскую літаратуру арэолу абсалютнай павагі да шляхецкага саслоўя, таму што само акцэнтаванне праблем залежнага класу ўказвае на тых, хто валадарыць і прымае рашэнні. Тэмай безвыходнасці жыцця селяніна прасякнута творчасць Э. Ажэшкі, А. Дыгасіньскага, Г. Запольскай.

Спачатку ў польскім грамадска-культурным жыцці крытыка панства не ўхвалялася, пра што сведчаць хаця б нападкі на Г. Сянкевіча ў прэсе за непрыгляднае аблічча выскароднага саслоўя ў цыкле апавяданняў «Эскізы вуглём» («Szkice węglem») (1876). Гэта не столькі сведчыць пра адметнасць польскай ментальнасці, у прыватнасці дамінаванне «шляхецкай» этыкі ў іх літаратуры, колькі з'яўляецца наступствам часавага несупадзення ў распаўсюджанні з'явы: у поўнай меры герой-селянін прыйшоў у літаратуру Беларусі ў пачатку XX ст. Новае – грамадская ідэалогія, светапогляд, літаратурныя метады, героі – пакутліва прабівала сабе шлях, як гэта і бывае, таму польскія суседзі ў гэтых адносінах пракладвалі дарогу і сабе, і нам. Ключавую ролю тэма вясковага жыцця іграе ў аўтараў, звязаных з Карпатамі, напрыклад ва У. Оркана. Ураджэнец і жыхар тых мясцін, селянін, ён піша пра цяжкае жыццё мясцовых ратаяў. Твор "Праклятце" («Przekleństwo») (1900) – польскі празаічны адпаведнік паэмы «Адвечная песня» (1908) Я. Купалы.

Асабліва падобныя апісанні селяніна ў творах «На абрыве (II)» («Nad urwiskiem (II)») (1900) У. Оркана і «Паўлюковы думкі» (1907) Я. Коласа. Польская мініяцюра змешчана ў аднайменным зборніку «На абрыве» («Nad urwiskiem»), дзе пануе атмасфера чалавечага болю, звязанага з гаротным жыццём, непасільнай працай і безвыходнасцю. З апавядання паўстае тыповы партрэт «скамянелага» ў сваім мусульманскім спакоі тыповага жыхара падкарпацкай вёскі: «*З вузенькага акна ў нізкай хаціне каля лесу высунулася валасатая чорная сялянская галава... Глыбока запалыя вочы, як вочы земляной палёўкі, з дзіўнай упартасцю глядзяць навокал. У гэтай душы ёсць падаўленая сіла, якая глядзіць на свет вачыма; ёсць нейкі вечны, затоены боль, што застыў на сухім маршчыністым твары, а вераб'іны нос, рэзка выгнуты, выдае непрыхаваную драпежнасць, змякчаную высокім і наморшчаным ілбом. Пазнаеш па рухомых бровах і ілбе першабытнага мысляра, якому баліць уласнае невуцтва і які, адчуваючы сваю мізэрнасць перад вялікімі сіламі, грызе сябе таемнай злосцю і бяссільным гневам*»[1] [6, с. 70]. Атмасфера трывогі і страху за будучыню, выяўляючы стан душы жыхара польскай вёскі, дамінуе ў зборніку У. Оркана.

Прыкладна праз сем гадоў беларускі пісьменнік Я. Колас стварае ў мініяцюры «Паўлюковы думкі» вобраз сялянскага героя, якія тыпалагічна суадносіцца з выяўленым У. Орканам: «*Вунь відаць мужыцкая вёска. Зліліся ў кучу хаты і гумны. Праз гнілыя саламяныя стрэхі льецца вада. Вокны забіты, заложаны лучынаю, усякім рыззём. У хаце сырасць, гразь. Па кутках павуцінне: дым, чарната, смурод. На двары – павярнуцца нельга. Ходзіць мужык расхлістаны, у лапцях, чорны, як камінар, з мазалямі. Не знае ён ніколі спакою. Мокне ў дождж на полі, на лузе, прышчыцца на сонцы. Горкі пот залівае яму вочы. Мерзне зімою ў хаце. Есць – як папала. У хлеб падсыпае мякіну, есць нішчымны квас і заціркy. Яго ўсякі гоніць, усякі ўшчувае. Забілі мужыка, скалечылі яго душу, адабралі ад яго вобраз твой, Божа!*» [7, с. 22]. Замест злосці і бяссілля, уласцівых герою У. Оркана, беларускі аўтар надзяляе Паўлюка смеласцю падумаць пра тое, чаму ўсё так несправядліва ўладкавана ў чалавечым свеце, у параўнанні з жывёльным, і нават усумніцца ў правільнасці прапанаванай рэлігіяй і духавенствам карціне свету.

Пасля расчаравання ў рамантычных ідэалах пазітывісцкія істотна спрыяюць здзяйсненню кардынальнага светапоглядна-метадалагічнага зруху, вызначальнага для далейшага развіцця і літаратуры, і грамадства. Таму вобраз селяніна і не быў цалкам адрынуты наступнай генерацыяй – мадэрністамі, нягледзячы на ўласцівы ёй індывідуалізм і імкненне да стварэння сацыяльна не абцяжаранага мастацтва.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. *Hertz P.* Ład i nieład / P. Hertz. Warszawa : Państ. Inst. Wydaw., 1964.

2. *Pigoń St.* Na drogach kultury ludowej : rozprawy i studia / wyb. i opracow. T. Judełki-Burzeckiego. Warszawa : Lud. Spółdz. Wydaw., 1974. 666 s.

[1] Пераклад з польскай мовы аўтара артыкула. – Н.Б.

3. *Гарэцкі М.* Беларускі тэатр у палове XIX веку ; прадм. Н. Гілевіча, пасл. Т. Голуб // Вобраз : літ.-крытыч. арт. ; склад. Т. Грамадчанка ; рэдкал. : Н. Пашкевіч (рэд.) і інш. Мінск : Маст. літ., 1988. С. 224 – 243.

4. *Радзік Р.* «Новая зямля»: вобраз грамадства ў паэме Якуба Коласа // Беларусь і Беларусы ў прасторы і часе : зб. да 75-годдзя праф. А. Мальдзіса ; пад рэд. С. Запрудскага [і інш.]. Мінск , 2007. С. 291–296.

5. *Цыбенко О. В.* Литературные истоки польской деревенской прозы [Электронный ресурс] // КиберЛенинка.. URL: https://cyberleninka.ru/article/n/literaturnye-istoki-polskoy-derevenskoy-prozy/viewer (дата обращения : 20.09.2024).

6. *Orkan W.* Nad urwiskiem. Szkice i obrazki . Kraków : Druk W. L. Anczyca i Spółki, 1900.

7. *Колас Я.* Збор твораў : у 20 т. Мінск : Беларус. навука, 2008. Т. 5 : Апавяданні (1906–1924) / [рэд. З. У. Драздова].

## ШАБЛОЎСКАЯ І. В. ЯК ДАСЛЕДЧЫЦА ЧЭШСКАГА РАМАНА ХХ СТАГОДДЗЯ

**А. У. Вострыкава**

*Кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр-т Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь,*
*vostrikova72@mail.ru*

Аналізуецца літаратуразнаўчая спадчына д.ф.н., праф. БДУ Шаблоўскай І. В. Прадметам асэнсавання становяцца навуковыя работы, прысвечаныя чэшскаму раману ХХ стагоддзя. Шаблоўская І. В. была пачынальніцай багемістыкі ў беларускай філалагічнай навуцы. Яна звярталася пераважна да аналізу творчасці чэшскіх празаікаў ХХ стагоддзя, выяўляючы нацыянальную адметнасць і мастацкую спецфіку іх свету. Таксама важным складнікам для беларускай даследчцы быў камапаратыўны аспект, што дазваляла больш выпукла і яскрава прадэманстраваць, з аднаго боку, арыгінальнасць абраных пісьменнікаў, з другога – паказаць знітаванасць іх пошукаў з універсаліямі іншых славянскіх літаратур, з еўрапейскай і сусветнай літаратурнай традцыяй і сучаснымі тэндэнцыямі развіцця.

***Ключавыя словы:*** Шаблоўская І. В.; чэшскі раман ХХ стагоддзя; рэцэпцыя; кампаратыўны падыход; нацыянальная адметнасць.

## ШАБЛОВСКАЯ И. В. КАК ИССЛЕДОВАТЕЛЬ ЧЕШСКОГО РОМАНА XX ВЕКА

**Е. В. Вострикова**

*Кандидат филологических наук, доцент,*
*Белорусский государственный университет,*
*пр-т Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь,*
*vostrikova72@mail.ru*

Анализируется литературоведческое наследие д.ф.н., проф. Шабловской И. В. Предметом осмысления становятся научные работы, посвященные чешскому роману XX века. Шабловская И. В. была зачинателем богемистики в белорусской филологической науке. Она обращалась преимущественно к анализу творчества чешских прозаиков XX века, учитывая национальную особенность и художественную спецфику их мира. Также важной составляющей для белорусской исследовательницы был компаративный аспект, что позволяло более выпукло и ярко продемонстрировать, с одной стороны, оригинальность избранных писателей, с другой – показать связанность их поисков с универсалиями других славянских литератур, с европейской и мировой литературной традицией и современными тенденциями развития.

***Ключевые слова:*** Шабловская И. В.; чешский роман XX века; рецепция; компаративный подход; национальная особенность.

# SHABLOVSKAYA I. V. AS A RESEARCHER OF THE CZECH NOVEL OF THE 20TH CENTURY

**A. U.Vostrykava**

*PhD, Ass. Professor,*
*Belarusian State University,*
*4 Nezavisimosti Ave, 220030, Minsk, Belarus,*
*vostrikova72@mail.ru*

The article analyzes the literary heritage of PhD, Ass. Prof. BSU Shablovska I. V. Scientific works devoted to the Czech novel of the 20th century become the subject of interpretation. Shablovskaia I. V. was a pioneering bohemian in Belarusian philological science. She turned mainly to the analysis of the work of Czech novelists of the 20th century, revealing the national distinctiveness and artistic specificity of their world. Also, an important component for the Belarusian researcher was the comparative aspect, which made it possible to more clearly and vividly demonstrate, on the one hand, the originality of the selected writers, on the other hand, to show the fusion of their searches with the universals of other Slavic literatures, with the European and world literary tradition and modern development trends.

***Keywords:*** I. V. Shablovskaia; Czech novel of the 20th century; reception; comparative approach; national distinction.

Прафесар Шаблоўская І. В. (1939–2004) была літаратуразнаўцам-замежнікам. Яна больш за дваццаць гадоў узначальвала кафедру замежнай літаратуры на філалагічным факультэце БДУ. Разам з тым яна з'яўляецца аўтарам многіх навуковых прац па славістыцы і чэшскай літаратуры, якая была для яе вельмі важным накірункам навуковых росшукаў. Шаблоўская І. В. вядомая і як перакладчыца мастацкіх твораў з чэшскай мовы на беларускую і рускую. Ёй належыць першая на Беларусі праграма «Гісторыя чэшскай літаратуры» для студэнтаў-славістаў БДУ. Яна стала лаўрэатам прэміі за лепшы крытычны артыкул «Чэшская літаратура: далёкая і блізкая», надрукаваны ў часопісе «Полымя» у 1997 г.

Літаратуразнаўчыя даследаванні Шаблоўскай І. В. у галіне чэшскай літаратуры можна асэнсоўваць, зыходзячы з храналагічнага альбо тэматычнага прынцыпу.

У першым выпадку трэба звярнуцца да яе работ па чэшскім рамане першай паловы XX стагоддзя. Сярод раманістаў гэтага перыяду беларуская багемістка вылучае асобы Яраслава Гашака, Карэла Чапека і Уладзіслава Ванчуры.

Яраславу Гашаку прысвечаны аналітычны артыкул «Вялікая кніга Яраслава Гашака» і кампаратыўныя работа «Зялёная галінка. Яраслаў Гашак і Франц Кафка: антыгероіка абсурду». У першай з названых прац Шаблоўская І. В. гаворыць пра незвычайнаць падходу чэшскага пісьменніка ў рамане «Прыгоды ўдалога ваякі Швейка» да тэмы Першай сусветнай вайны і вайны ў цэлым: «…гэта вясёлая кніга пра вайну <…>. У кнізе Яраслава Гашака не толькі няма звыклай для антываеннага эпасу "акопнай праўды", няма ў ёй і звыклага стаўлення да вайны як да гістарычнай падзеі.

Знойдзем тут зусім новы погляд на вайну, на Першую сусветную: быццам і не гістарычную падзею, а хутчэй п'яную сутычку дзе-небудзь на Жыжкаве, раёне Прагі, заселеным пераважана працоўным людам» [1, с. 53]. У такой канцэпцыі вайны слыннага чэшскага празаіка Шаблоўская І. В. бачыць глыбокія нацыянальня вытокі, якія ідуць ад творчасці стырыка XIX стагоддзя К. Г. Бароўскага, а таксама ад таго дэмакратычнага асяроддзя, у якім фарміраваўся пісьменнік. Таксама ў артыкуле праводзіцца паралель з народнай смехавой культурай, пра якую пісаў М. Бахцін у сваёй слыннай манаграфіі пра Франсуа Рабле. Шаблоўская І. В. зазначае: «Раман Гашака належыць карнавальнай культуры з непрадказальнасцю яе ігравой клаўнады і блазанства, з яе глыбіннай мудрасцю, ананімнай апазіцыйнасцю грамадскай думкі» [1, с. 55]. Вялікую ўвагу навукоўца надае перакладам гэтай кнігі на беларускую і рускую мовы. Таксама падрабязна аналізуецца жанравая прырода твора, называюцца дамінантныя рысы паэтыкі, такія, як карыткатура, пародыя, фарс, містыфікацыя і гратэск, прыём зніжэння велічнага і гераічнага. «Спалучэнне неспалучальнага, кантраснасць выказванняў, змешванне высокага і нізкага, розных стыляў стварае палітру гашакаўскага рамана, у якім мудрасць схавана за блазнаваннем» [1, с. 59]. Не абыйдзена ўвагай і вобразная сістэма слыннага твора. Многа гаворыцца пра незвычайнасць самога цэнтральнага героя, Швейка, пра складанасць і дваістасць вобраза, пра неадназначнасць успрымання яго літаратурнай крытыкай у розныя часы. Літаратуразнаўца прыходзіць да высновы, што «гумар Швейка, іронія Гашака фальклярызаваныя, успрымаюцца як сучасны варыянт эпічнасці чалавека, чалавека, якому абрыдла цывілізацыя войн» [1, с. 60]. У гэтым, на нашу думку, актуальнасць чэшскага рамана і яго літаратуразнаўчай рэцэпцыі. У другім з названых артыкулаў Шаблоўская І. В. параўноўвае мастацкія светы двух такіх «непараўнальна розных пісьменнікаў», як Кафка і Гашак, называючы іх «пражскімі Апосталамі» [1, с. 230]. Беларуская даследчыца мяркуе, што іх аб'ядноўвае тое, што абодва ў сваіх творах выступалі супраць таталітарызму, імперскаці і ўціску асобы. «Абодва пісьменніка разумелі абсурд жыцця, абодва не маглі з ім ужыцца. Адзін – апостал трагічны. Апостал страху. Другі – вясёлы. Апостал смеху. Абодва выказалі сваю эпоху, свой час як трагедыю. Адзін у форме пасіўнага яе адмаўлення. Другі – актыўна шукаючы выйсце» [1, с. 230].

Многа Шаблоўская І. В. пісала і пра творчасць К. Чапека, адкрываючы яго беларускаму чытачу і навуковай супольнасці. Нас цікавяць погляды багемісткі на раманістыку чэшскага гуманіста. На думку даследчыцы, Карэл Чапек моцна паўплываў на развіццё рамана ў еўрапейскай літаратуры XX стагоддзя, бо пашырыў яго жанравыя параметры, спалучыў навуковую фантастыку з сацыяльнай прозай, раманутопію з сацыяльнай прыпавесцю. Увогуле Шаблоўская І. В. упэўнена, што для Чапека прыпавесць была спосабам мастацкага мыслення. Чапек можа быць цалкам арганічны даследаваны ў паралелях з Г. Уэлсам, А. Франсам, А. Талстым, Р. Брэдберы, К. Ванегутам і іншымі. Ён сваімі раманамі выйшаў па значнасці за межы чэшскай літаратуры і ўяўляе сусветны мастацкі феномен. Менавіта такая пазіцыя прэзентуецца ў артыкулах літаратуразнаўцы.

Аб’ектам асэнсавання для Ірыны Вікенцьеўны стаў і творчы сусвет слыннага чэшскага пісьменніка-наватара першай паловы XX стагоддзя Уладзіслава Ванчуры. Ён паўстае ў навуковых працах даследчыцы як мысліцель і белетрыст, талент якога выявіўся ў прозе, драматургіі, публіцыстыцы, сцэнарысцка-рэжысёрскай дзейнасці. Шаблоўская І. В. аналізуе яго раманы «Пекар Ян Маргоўл», «Палі ворыва і вайны», «Вясёлае лета», «Гартанны», «Маркета Лазарава», «Канец старых часоў», «Тры ракі», якія яна ставіць у кантэкст пошукаў еўрапейскай тагачаснай літаратуры. Асоба вылучаецца манументальная эпапея Ванчуры ў рэчышчы гістарычнага жанру «Карціны з гісторыі народа чэшскага» у трох тамах, апошні з якіх выйшаў пасля смерці чэшскага пісьменніка. «Гісторыя паўстае на старонках эпапеі Ванчуры ў жывых і канкрэтных постацях князёў, палкаводцаў, простага люду. Народ, шматпакутлівы і неабаронены, паказаны як творца гісторыі», – менавіта такой канцэпцыі прытрымліваецца ў сваім рамане У. Ванчура па меркаванні беларускай багемісткі [2, с. 25]. Шаблоўская І. В адзначае камапазіцыйную мазаічнасць рамана-хронікі чэшскага раманіста, якая не перашкаджае цэласнасці ўспрымання. Таксма акцэнтуюцца моватворчыя намаганні аўтара ў тэксце сваёй незвычайнай ва ўсіх адносінах кнігі. Падкрэсліваецца і злабадзённасць гістарычнага твору пісьменніка, паколькі той ствараўся напярэдадні і ў часы Другой сусветнай вайны, заклікаў да супраціўлення ворагу, быў прасякнуты ідэямі свабоды і незалежнасці. Літаратуразнаўца лічыць важным, што другі знакавы чэшскі раманіст другой паловы XX стагоддзя Мілан Кундэра захапляўся Ванчурам і разглядаў яго раманы ў кантэксце сусветнай літаратурнай традыцыі. «Адмыслова валодаў пісьменнік рамяством раманіста, спалучаў апісальніцтва і ўмоўную паэтыку, выдатна ведаў і скарыстоўваў сусветны вопыт, застаючыся пры гэтым адным з самых чэшскіх аўтараў», – піша пра яго даследчыца [2, с. 27] .

Сярод чэшскіх раманістаў другой паловы XX стагоддзя Шаблоўская І. В. шмат увагі надавала творчасці Мілана Кундэры і Багуміла Грабала. «Раман Кундэры мае сваю акрэсленую тэарэтычную мэту, намагаецца быць адпаведным сучаснаму чалавеку, складанаму духоўнаму свету чалавека эпохі таталітарызма. Чалавека, які вымушаны жыць у прасторы хлусні і ўціску, гвалту і масавай псіхалогіі. Чалавека, інтэлект якога ўзбагачаны здабыткамі сусветнай культуры на працягу тысячагоддзяў. Чалавека, які пакутуе ад свае моцы і немачы. Паэтыка прозы Мілана Кундэры мае арганічным вытокам канцэпцыю рамана, якую пісьменнік распрацоўваў на працягу чвэрці стагоддзя», –зазначала літаратуразнаўца [1, с. 93]. Творчыя здабыткі пісьменніка Ірына Вікенцьеўна разглядала праз непарыўную сувязь тэорыі і мастацкай практыкі Кундэры. Яна анцэнтавала інтэлектуальнасць і філасафічнасць прозы гэтага чэшскага аўтара, што дазваляла ёй упісваць чэшскага творцу ў кантэкст сусветнай літаратуры XX стагоддзя і разглядаць яго ў адным шэрагу з такімі слыннымі мастакамі слова, як У. Фолкнэр, Р. Музіль, Г. Гесэ, Г. Г. Маркес і іншымі. Багемістка падкрэслівае схільнасць раманіста да асэнсавання мастацтва ў філасофскім плане, што, бясспрэчна ўплывае на яго прозу і надае ёй пэўныя ўласцівасці: аналітычнасць і эсэізм. Таксама важным яна лічыць тое, што раманіст напісаў шэраг эсэ пра творчасць паэтаў Г. Апалінэра і В. Нэзвала і раманы У. Ванчуры. Прычым, творчасць У. Ван-

чуры Мілан Кундэра аналізуе ў кантэксце мастацкіх светаў М. Сервантэса, М. Пруста, Д. Джойса, Ф. Кафкі, Г. Броха, Р. Музіля. Літаратуразнаўчыя здабыткі сучаснага чэшскага раманіста, які пайшоў з жыцця летам 2023 г., змашчаны ў двух манаграфіях «Мастацтва рамана», адна з якіх выйшла на яго радзіме, у Чэхаславакіі, а другая, з такой жа назвай, – на французскай мове ў Парыжы праз некалькі дзесяцігодзяў пасля першай. Шаблоўская І. В. упэўнена, што ў іх творца сфармуляваў сваё мастацкае крэда, прадставіў сваё разуменне рамана, «зыходзячы з асабістага вопыту і нацыянальных традыцый» [1, с. 75]. М. Кундэра меркаваў, што ў XX стагоддзі раман стаў формай пазнання рэчаіснасці, эпохі, свету, у большай ступені, чым сацыялагічныя і гісторыяграфічныя навукі, і сваімі раманамі намагаўся адкрыць новыя старонкі чалавечай экзістэнцыі. Даследчыца звяртаецца да разгляду як «чэшскіх» раманаў, напісаных у Чэхаславакіі, так і да «французскіх» раманаў, якія пабачылі свет у эміграцыі. Яна вылучае асабліва тэму памяці і бяспамятства ў раманах, тэму Бацькаўшчыны пісьменніка і яе несвабоды ў савецкія часы. Хвалявала чэшскага творцу і тэма эміграцыі, у якой вымушана апынуліся многія людзі. Выявіўшы ў сваіх навуковых штудыях ідэйна-тэматычную і мастацкую спецыфіку многіх раманаў Мілана Кундэры, Шаблоўская І. В. у рэшце рэшт сцвярджае: «Кундэра стварыў арыгінальную і адмысловую форму сучаснага рамана, падобнага і непадобнага на класічныя ўзоры. Палітра раманнай прозы Кундэры шырока ўключае фантастычнае і гратэск, філасофскі аналітызм і псіхалагічны досвед, іронію і апісальніцтва» [1, с. 91]. Асаблівасці паэтыкі Кундэры-практыка беларуская даследчыца тлумачыць яго канцэпцыяй рамана як антытаталітарнага жанру.

Аўтарам, які вабіў і прыцягваў навукоўцу, быў Багуміл Грабал, які, як ніхто іншы, змог увасобіць у сваёй прозе чэшскую ментальнасць і нацыянальны характар, спецыфічна чэшскае стаўленне да жыцця і арыгінальнае бачанне свету. Гэтага пісьменніка яна называла «чэшскім дыяментам у кароне сусветнай літаратуры» [1, с. 290]. Даследчыца сцвярджала, што «менавіта стыхія паўсядзённасці, будзённага як праява існасці зацікавіла раз і назаўсёды Грабала і прынесла яму сусветную вядомасць. Дарэчы, ён яе вывучаў не па Фрэйду… А па аўтэнтычнаму жыццю» [1, с. 294]. Шаблоўская І. В. аналізуе раманы Грабала «Пастрыжэнне», «Занадта гулкая адзінота», «Я абслугоўваў англійскага караля». На яе думку, «пісьменнік стварыў і ўдасканальваў на працягу дзесяцігоддзяў свой адмысловы тып прозы, у тым ліку рамана, які натуральна ўвабраў сюрэалізм і нацыянальную традыцыю гашакаўскай “шынкоўскай гісторыі”, постмадэрнісцкую іронію і рэфлексію Карэла Чапека, пікарэскны раман і раман выхавання, які мае вытокам літаратуру нямецкага барока. Раманы Грабала – суцэльныя маналогі, споведзі аўтара, у якіх плынь свядомасці спалучана з аналітычнай эсэістыкай, пакуты канкрэтнага героя пададзены ў кантэксце Духу чалавечага і набываюць масштабы сусвету. Сусвет месціцца ў думках героя, ён часцей за ўсё набліжаны да самога аўтара. Аўтар-апавядальнік стварае трагічны ўніверсум існасці, быцця чалавечага ў адзіноце» [1, с. 93–94].

Яшчэ адным прадметам вывучэння і даследавання слыннай беларускай літаратуразнаўцы становіцца раман «Чэшскі соннік» Людвіка Вацуліка. Раман адлюстроўвае існаванне чэшскай інтэлегенцыі, пісьменнікаў, самога аўтара пасля падаўлення Пражскай вясны, у часы так званай нармалізацыі ў Чэхаславакіі. Кніга мае дзённікавую форму. Запісваюцца снабачанні, менавіта праз іх выражаецца рэчаіснасць. Гісторыя кахання, падтэксты, паралелі з раманам Хэмінгуэя «Бывай, зброя!», матывы раздзеленасці, страты, адзіноты, прыроды, горада Прагі, вымысел і дакументальнасць, панаванне пачуцця наканаванасці многіх няшчасцяў, жанравая прырода рамана – пра ўсё гэта піша даследчыца, доказна і аргументавана. Шаблоўская І. В. сцвярджае, што Людвігу Вацуліку ўласціва дысідэнцтва формы, інашадумства паэтыкі. У якасці галоўнай яна вылучае праблему «асобы і ўлады ва ўмовах несвабоды таталітарызму» [1, с. 274].

Дагэтуль мы прытрымліваліся храналагічнага падыходу пры разглядзе літаратуразнаўчай спадчыны слыннай беларускай багемісткі і выяўлялі, якія асобы чэшскай літаратуры з першай і другой палоў XX стагоддзя сталі аб'ектам яе філалагічнай рэфлексіі. Аднак трэба назваць тэму, якая была магістральнай для Ірыны Вікенцьеўны: славянская ваенная проза. Менавіта ёй прысвечаны кандыдацкая і доктарская дысертацыі Шаблоўскай І. В. [Гл. 3, 4]. Славянская літаратура пра вайну даследуецца ў яе манаграфіі [Гл.5], дзе выяўляецца адметнасць гэтага ўнікальнага феномену, які ствараўся на працягу паловы стагоддзя. Ірына Вікенцьеўна лічыць, што ваенную прозу на дадзеным этапе развіцця наўрад ці можна назваць гістарычнай. Да ваеннай прозы беларуская даследчыца падыходзіла ў кампаратыўным аспекце, параўноўваючы беларускую і чэшскую літартуры, амерыканскую і беларускую прозу пра Другую сусветную. Яна пісала ўвогуле пра розныя славянскія літаратуры і пра тое, якія адметнасці мела ваенная проза заходніх і паўднёвых славян у параўнанні з усходнімі. «Ваенная проза вяртала чалавека, заідэалагізаванага, таталітарнага, да этычных каштоўнасцяў, да духоўнага існавання, ад класавага да агульначалавечага, – у гэтым, на маю думку, прызначэнне філасофскай функцыі ваеннай прозы, так бы мовіць, яе экзістэнцыяльнасці… Ваенная проза з'яўляецца вынікам эвалюцыі прозы пра Другую сусветную вайну і існуе ў полі гэтага больш шырокага паняцця», – зазначала багемістка [1, с. 178].

Такім чынам, можна зрабіць высновы, што менавіта прафесар Шаблоўская І. В. стала першапраходцам у асэнсаванні і вывучэнні спецыфікі зместу і формы чэшскага рамана. Яна ўвяла ў беларускі навуковы і культурны ўжытак многія слынныя імёны майстроў чэшскай прозы XX стагоддзя, напісаўшы вельмі змястоўныя даследаванні пра Я. Гашака, К. Чапека, У. Ванчуру, Б. Грабала, М. Кундэру, Л. Вацуліка, майстроў чэшскай ваеннай прозы. Важным становіцца камапаратыўны аспект у выяўленні месца і мастацкай адметнасці свету чэшскіх раманістаў ў славянскіх літаратурах, еўрапейскім і сусветных кантэкстах. Менавіта такі падыход да спадчыны чэшскіх творцаў прадэманстраваў упісанасць іх пошукаў у агульныя тэндэнцыі развіцця розных літаратур свету.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. *Шаблоўская І. В.* Сусветная літаратура ў беларускай прасторы: Рэцэпцыя. Тыпалогія. Кантакты. Мінск: Радыёла-плюс, 2007.

2. *Шаблоўская І. В.* Паэтыка чэшскага рамана XX стагоддзя. Мінск, 1995.

3. *Шабловская И. В.*Чешская литература периода второй мировой войны (1938/39 – 1945 гг.): Автореф. дисс. на соискание учен. степени канд. филол. наук / АН СССР. Ин-т славяноведения и балканистики. М., 1970.

4. *Шабловская И. В.* Проза Европейских социалистических стран 60–70-х годов о Второй мировой войне.Общее и особенное: Автореф.дис.на соиск.учен.степ.д-а филол.наук:10.01.04 / АН СССР,Ин-т славяноведения и балканистики. М., 1988.

5. *Шабловская И. В.* Самой высокой мерой: современная проза европейских социалистических стран о войне. Минск : Университетское, 1984.

## І. В. ШАБЛОЎСКАЯ ЯК ДАСЛЕДЧЫК ПОЛЬСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

**М. М. Хмяльніцкі**

*Доктар філалагічных навук, дацэнт,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр-т Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, KhmelnickiNN@bsu.by*

Разглядаюцца навуковыя публікацыі доктара філалагічных навук, прафесара Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта І. В. Шаблоўскай, прысвечаныя польскай літаратуры розных перыядаў. Вызначаны ўнёсак беларускага літаратуразнаўцы ў асэнсаванне творчасці А. Міцкевіча, пісьменнікаў Польшчы XX стагоддзя (Ю. Тувіма, Я. Івашкевіча, З. Налкоўскай, М. Дамброўскай, Т. Бароўскага і інш.), акрэслены сутнасць і наватарскі характар яе даследаванняў ваеннай прозы і драмы абсурду ў славянскіх літаратурах.

***Ключавыя словы:*** І. В. Шаблоўская; Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт; польская літаратура; ваенная проза; драма абсурду; рэалізм; мадэрнізм.

## И. В. ШАБЛОВСКАЯ КАК ИССЛЕДОВАТЕЛЬ ПОЛЬСКОЙ ЛИТЕРАТУРЫ

**Н. Н. Хмельницкий**

*Доктор филологических наук, доцент,*
*Белорусский государственный университет,*
*пр-т Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, KhmelnickiNN@bsu.by*

Рассматриваются научные публикации доктора филологических наук, профессора Белорусского государственного университета И. В. Шабловской, посвященные польской литературе разных периодов. Определен вклад белорусского литературоведа в осмысление творчества А. Мицкевича, писателей Польши XX века (Ю. Тувима, Я. Ивашкевича, З. Налковской, М. Домбровской, Т. Боровского и др.), очерчены сущность и новаторский характер ее исследований военной прозы и драмы абсурда в славянских литературах.

***Ключевые слова:*** И. В. Шабловская; Белорусский государственный университет; польская литература; военная проза; драма абсурда; реализм; модернизм.

## I. V. SHABLOVSKAYA AS A RESEARCHER OF POLISH LITERATURE

**M. M. Khmialnitski**

*Hab. PhD, Ass. Professor,*
*Belarusian State University,*
*4 Independence Avenue, 220030, Minsk, Belarus, KhmelnickiNN@bsu.by*

In the article examines scientific publications of Habilitated Doctor of Philology, professor of the Belarusian State University I. V. Shablovskaya, dedicated to Polish literature of different periods. The contribution of the Belarusian literary scholar to the understanding of the works of A. Mickiewicz, writers of 20th century Poland (J. Tuwim, J. Iwaszkiewicz, Z. Nałkowska, M. Dombrovskaya, T. Borovsky and others), is defined the essence and innovative nature of her studies of war prose and absurd drama in Slavic Literatures.

***Keywords:*** I. V. Shablovskaya; Belarusian State University; Polish Literature; war prose; absurd drama; realism; modernism.

Гісторыя філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта багата на імёны выбітных літаратуразнаўцаў, якія справамі і навуковымі здзяйсненнямі праславілі сваю альма-матэр. Сярод іх асаблівае месца належыць доктару філалагічных навук, прафесару, шматгадоваму загадчыку кафедры замежнай літаратуры **Шаблоўскай Ірыне Вікенцьеўне** (1939–2004). Глыбокі даследчык славянскіх літаратур, таленавіты выкладчык, кіраўнік, мудры дарадца для цэлай кагорты навукоўцаў, перакладчык, яна была адна з тых, хто актыўна ўводзіў прыгожае пісьменства Беларусі ў іншанацыянальны кантэкст, а творы замежных аўтараў разгдядаў праз прызму беларускай ідэйна-мастацкай адметнасці. Аб'ектам асаблівай зацікаўленасці І. В. Шаблоўскай была чэшская літаратура, аднак яна пакінула шэраг публікацый, у якіх даследавала менавіта творчасць польскіх майстроў слова, асабліва XX стагоддзя. Для славіста, кампаратывіста гэта натуральная з'ява: не столькі прадэманстраваць сваю гісторыка-літаратурную эрудыцыю, пашырыць кантэкст навуковых штудый, колькі выявіць агульныя тэндэнцыі развіцця, заканамернасці і спецыфіку літаратурнага працэсу ў славянскіх краінах, а таксама падабенства мастацка-эстэтычных законаў, якія збліжаюць літаратуры, пісьменнікаў, актуалізуюць падобную праблематыку і шляхі яе ідэйна-мастацкага ўвасаблення.

І. В. Шаблоўская ведала польскую мову, сама перакладала фрагменты многіх твораў і прац літаратуразнаўцаў суседняй з Беларуссю краіны, не тое што не давяраючы існуючым перакладам: многае, сапраўды, не было перакладзена на беларускую мову, а наяўныя пераклады на рускую мову не заўсёды перадавалі мастацкі модус, стылёвы каларыт, моўную адметнасць твора.

І. В. Шаблоўская неаднаразова падкрэслівала наступную думку: «Узаемадзеянне літаратур – аснова развіцця роднай культуры, сродак захавання нацыянальнай спецыфікі ў яе агульначалавечым значэнні» [1, с. 17]. У гэтым даследчыцкім ракурсе яна надавала асаблівае значэнне польскаму прыгожаму пісьменству. Ад часоў Яна Каханоўскага праз рамантызм Адама Міцкевіча, мастацкі індывідуалізм пісьменнікаў Маладой Польшчы, прадбачлівасць аўтараў міжваеннага дваццацігоддзя да багацця і запатрабаванасці польскай ваеннай прозы як нацыянальнага мартыралога, пэўнага спосабу асэнсаваць прычыны і наступствы гэтай драматычнай падзеі, а таксама да драмы абсурду ці феномена іншадумства – усе гэтыя аспекты і шляхі развіцця літаратуры суседняй краіны разглядаліся беларускім даследчыкам ў цеснай сувязі з іншаславянскімі і заходнееўрапейскімі.

Не можа не здзіўляць даследчыцкі дыяпазон ведання польскай літаратуры І. В. Шаблоўскай: розныя перыяды і аўтары, жанрава-тэматычныя блокі, праблематыка, кантактныя сувязі і тыпалагічныя сыходжанні. Яна звярнулася да літаратуры польскага рамантызму, у прыватнасці да спадчыны Адама Міцкевіча – сына беларускай зямлі, у творчасці якога знайшлі адлюстраванне разнастайныя мясцовыя рэаліі, традыцыі і звычаі. Яскравым пацвярджэннем гэтаму служыць артыкул І. В. Шаблоўскай «Семантыка шляхецкай сядзібы ў паэме "Пан Тадэвуш" Адама Міцкевіча» [2]. Гэта вельмі глыбокае і арыгінальнае даследаванне, здавалася б, добра вядомага матэрыялу, дэманструе менавіта беларускі погляд на сусветна вядомы твор: аўтар публікацыі знаходзіць маркеры беларускасці ў паэме Міцкевіча ў іх лакальным (рэгіянальным) і больш шырокім значэннях, разглядаючы вобраз-сімвал сядзібы праз пэўныя ракурсы: гістарычны, псіхалагічны, філасофскі, сацыякультурны, эстэтычны і г. д. [2, с. 126], што дазваляе арганічна інтэграваць яго ў больш абагулены вобраз бацькаўшчыны, роднай зямлі.

Несумненна, знакавай падзеяй ў айчынным літаратуразнаўстве стаў выхад у свет вучэбнага дапаможніка І. В. Шаблоўскай «Гісторыя замежнай літаратуры (XX стагоддзе, першая палова)» [3], які выразна адрозніваўся ад папярэдніх выданняў падобнага фармату і структурай, і праблемна-тэматычным падыходам пры асэнсаванні (разглядзе) літаратурнага матэрыялу, і згадкамі пра забароненых у савецкія часы аўтараў, і абавязковым пазначэннем беларускіх перакладаў тых ці іншых твораў замежных пісьменнікаў.

У вучэбны дапаможнік І. В. Шаблоўская, зразумела, уключыла раздзел, прысвечаны польскай літаратуры першай паловы XX стагоддзя. Падкрэслім, што ў ім асаблівы акцэнт быў зроблены на міжваенным дваццацігоддзі: аўтар выдання канцэптуальна ахарактарызавала асноўныя мастацкія тэндэнцыі развіцця польскай літаратуры ў гэты перыяд, выявіла яе сувязі з сучаснасцю і гісторыяй, прадставіла візіткі найбольш значных польскіх пісьменнікаў, акрэсліла традыцыйнае і наватарскае, вызначальныя ідэйна-мастацкія рысы ў іх творчасці. У цэнтр увагі беларускага славіста трапілі такія аўтары, як Л. Стаф, «певец природы и любви, вечных ценностей и тем», чыя паэзія «была способом защитить прекрасное и человека» [3, с. 244], Б. Лесьмян, «в богатом художественном мире которого "буйство красок и половодье чувств звучат подобно сакральному мифу"» [3, с. 244–245], Ю. Тувім, «виртуоз рифмы и композиции» [3, с. 256], аўтар напісанай у эміграцыі ліра-эпічнай паэмы "Кветкі Польшчы", радкі якой былі «окрашены пламенной любовью к страдающей родине <….>, по свидетельству Бжезинки, повторялись в отечестве как молитва» [3, с. 80], М. Паўлікоўская-Яснажэўская, «тонкий лирик, мастер интимной миниатюры» [3, с. 245], Я. Івашкевіч, які «демонстрировал отточенное мастерство глубокого психологического анализа, давал реалистический срез жизни польской провинции, разных слоев общества» [3, с. 245], У. Бранеўскі, у паэзіі якога «военные ритмы переходили в чеканный пролетарско-революционный шаг, повторяя закономерность революционизирующего влияния первой мировой на искусство первой половины века» [3, с. 245], К. І. Галчыньскі, «поэт-лирик, прибегавший к фантасмагорической образности, гротескной символике, склонный к мистификации, иронии,

поэт яркого эксцентричного дарования», для якога «поэзия – игра <…> ибо, потешая публику, поэт пытается предостеречь сограждан от надвигающейся катастрофы при их недопустимом легкомыслии» [3, с. 246], К. К. Бачыньскі, «поэт так называемого “драматического поколения”. Несмотря на то, что в его балладах и эллегиях преобладают темы войны и террора, призыв “к оружию”, главный их летмотив все же иной – прорыв к вечному, к непреходящим нравственным ценностям, которые только и могут спасти личность от распада» [3, с. 79].

У сваім дапаможніку І. В. Шаблоўская таксама звярнула ўвагу і на істотныя дасягненні польскай прозы першай паловы XX стагоддзя, на творчасць тых пісьменнікаў суседняй славянскай краіны, якія шмат у чым прадвызначылі аблічча нацыянальнай літаратуры заяўленага перыяду: гэта не толькі рэалісты (С. Жаромскі, З. Налкоўская М. Дамброўская, Л. Кручкоўскі і інш.), але і мадэрністы, авангардысты – В. Гамбровіч, Б. Шульц, С. І. Віткевіч, пра якіх і на радзіме ў канцы мінулага стагоддзя яшчэ многае не было сказана і даследавана, не кажучы пра постсавецкую прастору, дзе іх творы амаль не перакладаліся і пра гэтых аўтараў ведалі вельмі мала. І. В. Шаблоўская, разважаючы аб творчасці польскіх наватараў мастацкага слова, дае ім вельмі трапныя характарыстыкі: «С. И. Виткевич, автор экспериментальных, абстрактно-ассоциативных пьес, создатель нового театра, В. Гомбрович, поэтика которого новаторски сочетает авангардизм и морализаторство, приемы игры и самовыражение. “Фердидурка” – одно из первых произведений постмодернизма, но как предтеча – это наверняка» [3, с. 250].

Але бадай самы значны і плённы вектар даследаванняў І. В. Шаблоўскай – выяўленне агульнага і адметнага ў станаўленні і развіцці ваеннай прозы ў літаратурах славянскіх краін. Яе вывучэнню Ірына Вікенцьеўна прысвяціла не адзін год працы ў бібліятэках і архівах розных краін, навуковых росшукаў і рэфлексій, якія набылі канцэптуальна цэласны выгляд у доктарскай дысертацыі «Проза европейских социалистических стран 60–70-х гг. о Второй мировой войне: общее и особенное» [4], манаграфіі «Самой высокой мерой. Современная проза европейских социалистических стран о войне» [5] і дакладзе на XI Міжнародным з’ездзе славістаў «Паэтыка славянскай ваеннай прозы» [6]. Як слушна падкрэслівала аўтар, прадмет дадзеных даследаванняў – «галоўныя аспекты канцэпцыі чалавека ў літаратуры сацыялістычных краін Еўропы, прысвечанай антыфашысцкай барацьбе ў перыяд Другой сусветнай вайны (Вялікая Айчынная вайна савецкага народа і вызваленчы рух у краінах Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы)» [5, с. 9]. І кваліфікацыйная работа, і кніга І. В. Шаблоўскай, безумоўна, сталі падзеяй у тагачаснай літаратуразнаўчай славістыцы. І сёння яны набываюць асаблівае значэнне ў святле захавання гістарычнай памяці беларускага народа. Зразумела, што не ўсе аўтары і творы, прысвечаныя дадзенай праблематыцы, увайшлі ў іх змест, і ў першую чаргу менавіта па ідэалагічных прычынах, але пазней яны створаць эфект постпраўды ў іншых публікацыях беларускага літаратуразнаўцы.

У сваіх даследаваннях Ірына Вікенцьеўна актыўна звярталася да твораў ваеннай прозы польскіх аўтараў: З. Налкоўская (яе дзённік перыяду вайны і акупацыі пазней будзе разгледжаны ёю ў асобным артыкуле), М. Белашэўскі, Т. Бароўскі і інш. У поле

ўвагі і асэнсавання беларускага славіста трапяць такія праблемы і аспекты, як гераізм, здрада, памяць, гуманізм, духоўная ізаляцыя, жыццё і смерць, чалавек і грамадства і інш. І. В. Шаблоўская праз нацыянальнае і ўніверсальнае, тыпалагічныя перасячэнні і аспекты разглядае творы аб Другой сусветнай вайне прадстаўнікоў розных школ і напрамкаў (З. Налкоўская («Медальёны»), Е. Путрамант («Верасень»), К. Філіповіч («Дзённік антыгероя»), З. Посмыш («Пасажырка»), Т. Бароўскі («Каменны свет»), В. Біліньскі («Канец вакацый»), М. Белашэўскі («Дзённік варшаўскага паўстання»), Е. Анджаеўскі («Попел і дыямент»), Т. Новак («А як будзеш каралём, а як будзеш катам») і інш.), глыбока і шматаспектна аналізуе жанрава-стылёвую спецыфіку, эвалюцыю, праблемна-тэматычны вузел, мастацкія адметнасці, наратыўныя стратэгіі твораў аб вайне.

Яшчэ адзін цікавы накірунак літаратуразнаўчых штудый І. В. Шаблоўскай у 1990-я гг., дзе таксама прысутнічаў польскі складнік, – мастацкі і сацыякультурны феномен драмы абсурду, ці «драмы инакомыслия», як трапна назаве гэту жанравую мадыфікацыю Ірына Вікенцьеўна ў адной са сваіх першых публікацый, прысвечаных дадзенай праблематыцы. Менавіта ў гэтых даследаваннях яна выйшла на шырокія паралелі і абагульненні, выявіла генезіс і анатомію драмы абсурду, абгрунтавала падабенства і адрозненні славянскай драмы абсурду ад заходнееўрапейскай, абумоўленыя разнастайнымі фактарамі. Вынікі гэтага даследавання былі прадстаўлены ў дакладзе на XII Міжнародным з’ездзе славістаў у Кракаве [7]. Падкрэслім, што выступленне прафесара БДУ прагучала на гэтым навуковым форуме вельмі дарэчы, цікава, па-наватарску.

І. В. Шаблоўская, разглядаючы феномен драмы абсурду, асаблівую увагу звярнула на творчасць Славаміра Мрожака, многія п’есы якога сталі своеасаблівай візітоўкай славянскага тэатра абсурду. Прадметам яе ўвагі з’явіліся такія хрэстаматыйныя творы польскага драматурга, як «Караль», «Танга», «Стрыптыз» і інш. У сваёй публікацыі беларускі даследчык абгрунтавана выявіла найбольш характэрныя рысы зместу і формы драмы абсурду (экзістэнцыяльная праблематыка, чалавек і ўлада, іронія, гратэск, фарс, трагікамічныя сітуацыі, героі, канфлікт, мова, лексікон герояў, стэрэатыпы і клішэ, сон і ява, роля музыкі і інш.) праз прызму нацыянальнай непаўторнасці і тыпалагічны кантэкст.

І. В. Шаблоўская неаднаразова дэманструе бліскучы, лаканічны, але надзвычай глыбокі аналіз той ці іншай п’есы С. Мрожака. У пацвярджэнне прывядзём толькі адзін прыклад: «Драма абсурду не ўцягвае гледача ў дзеянне, ніякі тэатральны цуд не стварае. Мадэлі, канструкцыі, умоўныя схемы – усе навідавоку. Ёй больш адпавядаюць сітуацыі ўмоўна-гратэскныя, як у п’есе Мрожака “У адкрытым моры”. Тут як бы алюзія на караблекрушэнне. Персанажы – Абломкі Буйны, Сярэдні, Дробны на плыце ў элегантных касцюмах пры гальштуках, а плыт – у адкрытым моры. У гэтай экстрэмальнай сітуацыі разыгрываецца жахліва банальная дзея. Трэба вырашыць, каго з’есці. І дэмагагічныя фразы, моўная сафістыка саркастычна выяўляюць сутнасць усёй гэтай дэмакратыі: з’ядуць, вядома ж, Дробнага, бо Буйны хоча есці і мае моц. Тут іронія на адрас парламенцкай казуістыкі і некаторых экзістэнцыялісцкіх

тэзаў пра свабоду, адвольна вытлумачаемых катэгорый свабоды, выбару. Як бы тая ж гульня сказамі, словамі, гульня як самамэта і бачнасць жыцця» [1, с. 79].

І. В. Шаблоўская на высокім філалагічным узроўні прааналізавала шматаспектнасць, генезіс, жанравыя коды драмы абсурду на матэрыяле розных літаратур, у тым ліку польскай, як даследчык засведчыла гісторыка-літаратурную і культуралагічную кампетэнтнасць.

Такім чынам, здзейсніўшы сціслы агляд літаратуразнаўчай спадчыны І. В. Шаблоўскай, мы пераканаліся ў тым, што польскае прыгожае пісьменства не было на перыферыі яе прафесійнай ўвагі. Публікацыі прафесара філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, прысвечаныя славянскім літаратурам, безумоўна, актуальныя і сёння. Яны ўзбагачаюць айчынны навуковы дыскурс, дэманструюць новыя шляхі разгляду быццам добра знаёмага матэрыялу, з'яўляюцца ўзорам параўнальна-гістарычнага і тыпалагічнага падыходаў пры даследаванні розных літаратур.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Памяць і слава: Ірына Вікенцьеўна Шаблоўская. Да 80-годдзя з дня нараджэння / склад. Н. М. Шахназаран ; рэдкал.: І. С. Роўда, Г. М. Бутырчык, Н. М. Шахназаран. Мінск : БДУ, 2020.

2. *Шаблоўская І. В.* Сусветная літаратура ў беларускай прасторы: рэцэпцыя, тыпалогія, кантакты / [прадм. Г. Бутырчык]. Мінск : Радыёла-плюс, 2007.

3. *Шабловская И. В.* История зарубежной литературы : (XX век, первая половина) : учеб. пособие для студентов высших учебных заведений. Минск : Экономпресс, 1998.

4. *Шабловская И. В.* Проза европейских социалистических стран 60–70-х гг. о Второй мировой войне. Общее и особенное : автореф. дис. на соиск. учен. степ. д-ра филол. наук : 10.01.04. М., 1988.

5. *Шабловская И. В.* Самой высокой мерой : современная проза европейских социалистических стран о войне. Минск : Университетское, 1984.

6. *Шаблоўская І. В.* Паэтыка славянскай ваеннай прозы. Мінск : Навука і тэхніка, 1993.

7. *Шаблоўская І. В.* Драма абсурду ў славянскіх літаратурах і еўрапейскі вопыт. Паэтыка. Тыпалогія. Мінск : Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, 1998.

# ПРОБЛЕМАТИКА РОМАНА Е. ТУРСУНОВА «МАМЛЮК»

**М. С. Сабыржанова**

*Казахский национальный университет им. Аль-Фараби,*
*пр-т Аль-Фараби, 71, 050040, г. Алматы, Казахстан,*
*merekesabyrzhankyzy@gmail.com*

Охарактеризовать проблематику романа современного казахстанского писателя Е. Турсунова «Мамлюк». В статье использованы следующие методы исследования: мифопоэтический, поэтико-структурный анализ произведения, сравнительный.

Е. Турсунов в историческом романе «Мамлюк» использует возможности мифа для выражения своих представлений о природе власти. Писатель воссоздает яркий образ выдающегося правителя средневекового Египта султана Бейбарса. Е. Турсунов старается убедить читателей в своем видении природы власти. Тема власти прежде всего связана с образом Бейбарса. В романе «Мамлюк» предпринята попытка предложить новые мировоззренческие ориентиры для казахстанского общества.

Практическое значение статьи заключается в том, что ее материалы возможно использовать для разработки технологии анализа новых произведений казахстанской художественной литературы.

***Ключевые слова:*** казахстанская литература; Е. Турсунов; роман «Мамлюк; султан Бейбарс; миф; власть.

# ПРАБЛЕМАТЫКА РАМАНА Е. ТУРСУНАВА «МАМЛЮК»

**М. С. Сабыржанова**

*Казахскі нацыянальны ўніверсітэт імя Аль-Фарабі,*
*пр-т Аль-Фарабі, 71, 050040, г. Алматы, Казахстан,*
*merekesabyrzhankyzy@gmail.com*

Ахарактарызаваць праблематыку рамана сучаснага казахстанскага пісьменніка Е. Турсунава «Мамлюк». У артыкуле выкарыстаны наступныя метады даследавання: міфапаэтычны, паэтыка-структурны аналіз твора, параўнальны.

Е. Турсунаў у гістарычным рамане «Мамлюк» выкарыстоўвае магчымасці міфа для выражэння сваіх уяўленняў аб прыродзе ўлады. Пісьменнік узнаўляе яркі вобраз выбітнага кіраўніка сярэднявечнага Егіпта султана Бейбарса. Е. Турсунаў стараецца пераканаць чытачоў у сваім бачанні прыроды ўлады. Тэма ўлады перш за ўсё звязана з вобразам Бейбарса. У рамане «Мамлюк» зроблена спроба прапанаваць новыя светапоглядныя арыенціры для казахстанскага грамадства.

Практычнае значэнне артыкула заключаецца ў тым, што яго матэрыялы магчыма выкарыстоўваць для распрацоўкі тэхналогіі аналізу новых твораў казахстанскай мастацкай літаратуры.

***Ключавыя словы:*** казахстанская літаратура; Е. Турсунаў; раман «Мамлюк»; султан Бейбарс; міф; улада.

## THE PROBLEMS OF E. TURSUNOV'S NOVEL «MAMLUK»

**M. S. Sabyrzhanova**

*Al-Farabi Kazakh National University,*
*Al-Farabi Ave., 71, 050040, Almaty, Kazakhstan,*
*merekesabyrzhankyzy@gmail.com*

The purpose of the article is to characterize the problems of the novel «Mamluk» by the modern Kazakh writer E. Tursunov. The article uses the following research methods: mythopoetic, poetic and structural analysis of the work, comparative.

E. Tursunov in the historical novel «Mamluk» uses the possibilities of myth to express his ideas about the nature of power. The writer recreates a vivid image of the outstanding ruler of medieval Egypt, Sultan Baybars. E. Tursunov tries to convince readers of his vision of the nature of power. The theme of power is primarily connected with the image of Baybars. In the novel «Mamluk» an attempt is made to offer new ideological guidelines for the Kazakh society.

The practical significance of the article lies in the fact that its materials can be used to develop a technology for analyzing new works of Kazakh fiction.

***Keywords:*** Kazakh literature; E. Tursunov; novel «Mamluk»; Sultan Beybars; myth; power.

В Казахстане развивается художественная литература. Казахстанские писатели публикуют свои новые произведения. Роман «Мамлюк» современного казахстанского автора Ермека Турсунова сразу же обратил на себя внимание нашей читательской аудитории. Автор воссоздал в романе образ выдающегося исторического деятеля, правителя средневекового Египта султана Бейбарса. Как мы предполагаем, автор романа «Мамлюк» надеется, что образ Бейбарса может обогатить смысловое пространство современной казахстанской литературы. Бейбарс имеет отношение к нашей стране, так как его детство прошло в маленьком кипчакском ауле. Бейбарс по своему происхождению кипчак, ставший в далеком Египте верховным правителем. Художественный анализ жизни и государственной деятельности Бейбарса, мудрого правителя, поможет расширить представления о природе власти.

Роман «Мамлюк» содержит авторскую гуманитарную технологию. В романе выражены взгляды писателя на власть и сильную личность, способную успешно управлять страной. В романе содержится интеллектуальная история, которая представляет собой развитие мыслей автора с помощью художественных образов. Автор романа видит в выдающейся исторической личности (султане Бейбарсе) пример для новых поколений политиков и государственных деятелей. Прошлое может стать полезным уроком для всего общества.

Цель этой статьи – проанализировать проблематику романа Ермека Турсунова «Мамлюк». Необходимо отметить, что впервые в казахстанском литературоведении изучаются проблемы организации смыслового пространства романа «Мамлюк». Материал исследования – роман Е. Турсунова «Мамлюк», литературные герои и пробле-

матика этого произведения. В нашей статье для раскрытия темы использованы следующие методы исследования: мифопоэтический, поэтико-структурный анализ произведения, сравнительный. Применение мифопоэтического метода позволит выявить мифологическое наполнение романа. Метод поэтико-структурного анализа произведения следует использовать для определения доминант художественной формы и содержания романа «Мамлюк». Сравнительный метод необходим для выявления сходства этого романа с произведениями некоторых европейских авторов и его своеобразия.

Для раскрытия темы нашей работы следует иметь в виду направления и методы гуманитарной науки. Важна для нас теория Юнга об архетипах и бессознательном [1]. Необходимо упомянуть труд канадского исследователя мифологии Н. Фрая [2]. Необходимо назвать исследование Д. Кэмпбелла о мифе, архетипе и бессознательном [3]. В своей статье мы учитываем труды Е. М. Мелетинского о связи мифологии и художественной литературы [4].

Сюжет литературного произведения выражает мировидение автора. Автор может использовать возможности мифа как мировоззренческой конструкции. Известно, что миф несет в себе различные смыслы. Художественный мир романа Е. Турсунова «Мамлюк» построен на мифологической основе. Мифологическое мышление определяет все уровни текста романа: смысловой, стилистический, семиотический, сюжетно-композиционный, сферу культурных ассоциаций. Основные концепты: женщина, мужчина, жизнь, смерть, судьба, власть.

Роман «Мамлюк» содержит мысли его автора о личности, о природе власти, о преодолении комплекса раба, об обретении свободы в условиях тотальной несвободы. Этот роман является не только литературным произведением, но также интеллектуальной историей, которая в свою очередь отражает мировоззрение автора. Роман «Мамлюк» – это система авторских комментариев истории и деятельности исторической личности. Формы создания смыслов в романе – авторские размышления о личности главного героя. Категория личности получает в литературе форму паттерна. В художественном мире литературного произведения большую роль играют образы-паттерны. Перечислим основные паттерны в романе «Мамлюк»: правитель, воин, раб, мудрец, предатель, купец, наставник. Эти паттерны – конструкции поведения людей в социуме. В романе паттерны выполняют определенную функцию. Главный герой произведения Махутбек побывал в роли раба, затем стал воином, а потом занял трон султана и вошел в историю под именем султана Бейбарса. Ключевыми паттернами в романе являются паттерн воина и правителя. Оба паттерна тесно связаны друг с другом. По мысли автора романа, только закаленный испытаниями воин подготовлен к осуществлению обязанностей правителя. Но стать гуманным и успешным правителем может только мудрый воин.

Автор специально вводит в повествование образ Вэя, который выступает в роли мудрого наставника главного героя. Он неспешно развивает у Махутбека новые навыки мышления и поведения, которые помогали ему выживать и побеждать. Махутбек усваивает наставления Вэя. Но воля к власти у Махутбека сильнее, чем его

другие качества. В представлении автора романа, Махутбек стремится к власти, осознавая свое физическое и духовное превосходство над остальными людьми.

В романе наблюдается внимание автора к теме власти. Е. Турсунов, раскрывая проблему власти, обращается к образу исторической личности султана Бейбарса. Сюжет романа основан на развития личности главного героя Махутбека, который обретает верховную власть в средневековом Египте. Основной вектор этого развития – движение к власти. Конечно, сначала у мальчика, похищенного из родного кипчакского аула, не было мыслей о власти. Но под влиянием обстоятельств он стал правителем страны. В целом история главного героя является дорогой к вершине власти. Тема власти получила свое осмысление еще в мифологии. Например, древнегреческая мифология содержит сюжеты борьбы богов за власть. Общеизвестно, что мифология оказывает влияние на художественную литературу. Мифологические темы проникают в литературные произведения.

Тема власти – одна из самых древних в мировой художественной литературе. В рамках нашей статьи нет необходимости уходить далеко, к истокам мировой литературы. Остановимся на близком к нашему времени литературном контексте. Нас интересует западная литература XX в. Для раскрытия темы власти использовались различные художественные формы и приемы. Так, австрийский писатель Франц Кафка поднимал проблему власти в романах «Замок» и «Процесс», используя приемы абсурда и гротеска. Кафка показал разрушительное влияние бюрократии на рядового человека. Его романы оказались актуальными для Европы накануне второй мировой войны. Е. М. Мелетинский отмечает авторскую мифологическую направленность творчества Кафки: «Так же как Джойс, Кафка осуществляет переход от реалистического социального романа к синтетической конструкции символической модели мира» [4, с. 137]. Произведениям Кафки присущ «мифологизм чисто творческий, спонтанный, личный» [4, с. 137].

Немецкий писатель Томас Манн поднимает проблему власти, непосредственно используя для этого мифологические сюжеты и образы. Нас особенно интересует роман «Иосиф и его братья». Сопоставление этого произведения и романа «Мамлюк» обнаруживает определенное сходство. Оба произведения написаны в жанре исторического романа. Главный герой романа Т. Манна – библейский персонаж Иосиф. Главный герой романа Е. Турсунова – выдающийся средневековый государственный деятель и полководец Бейбарс. Наблюдается сюжетное сходство этих романов. Юный Иосиф был продан в рабство своими братьями. Юный Бейбарс был похищен соплеменниками и продан китайскому купцу. Затем он становится рабом-мамлюком. Судьбы Иосифа и Бейбарса связаны с Египтом (соответственно эпохи фараонов и средневековым). Иосиф и Бейбарс совершают восхождение на вершину власти благодаря своим исключительным талантам. Иосиф становится главным министром и другом фараона, Бейбарс – султаном средневекового Египта. В этих романах утверждается идея деятельного гуманизма. В обоих произведениях выражается надежда авторов на мудрого и волевого мужчину, способного облагородить власть и использовать ее для облегчения жизни многих людей.

Е. Турсунов вслед за Т. Манном ориентируется на Библию в поисках вечных духовных ценностей. В начале романа он напоминает читателям историю Юсуфа (Иосифа). «И однажды выманили братья в поле юного Юсуфа, схватили, сорвали с него яркие одежды и продали измаильтянам» [5, с. 11]. «С той поры и повелось: обманывает брат брата, идет на него войной...» [5, с. 12]. Но Е. Турсунов верит в победу человечности. Смысл жизни человека состоит в пути «от слепоты – к прозрению» [5, с. 13]. Характерно, что в финале романа автор вставляет эпизод, повествующий о смерти отца Иосифа Якуба (Иакова) и примирении Иосифа с братьями. В романах «Иосиф и его братья» и «Мамлюк» выражается одна и та же идея. Человек должен быть гуманным, власть должна быть человечной. Иосиф и Бейбарс учатся быть человечными, воспитывают себя, чтобы на вершине власти служить людям, помогать им, облегчать им жизнь.

Таким образом, в романе «Мамлюк» нашло отражение мировосприятие автора. В произведении выражена надежда автора на дальнейшую гармонизацию общественных отношений. Автор романа, используя возможности мифа как мировоззренческой конструкции, рассмотрел ключевые философские проблемы. Это вопросы духовного становления личности, природы власти, бесконфликтного взаимоотношения власти и общества.

## Библиографические ссылки

1. Юнг К. Г. Архетипы и коллективное бессознательное. Москва: Издательство АСТ, 2019.

2. Фрай Н. Анатомия критики// Зарубежная эстетика и теория литературы XIX–XX вв. Трактаты, статьи, эссе / Под редакцией Г. К. Косикова. Москва: Издательство Московского государственного университета, 1987. С. 232–264.

3. Кэмпбелл Д. Герой с тысячью лицами: Миф. Архетип. Бессознательное. Москва: София, 1997.

4. Мелетинский Е. М. От мифа к литературе. Москва: Российский государственный гуманитарный университет, 2001.

5. Турсунов Е. Мамлюк. Роман. Алматы: Издательство MELOMAN Publishing, 2021.

# СПЕЦИФИКА РЕПРЕЗЕНТАЦИИ КАТЕГОРИИ «СВОЙ – ЧУЖОЙ» В ПОВЕСТИ В. П. АВЕНАРИУСА «ПЕРВЫЙ ВЫЛЕТ. ПУТЕВОЙ ДНЕВНИК ИНСТИТУТКИ»

**В. А. Филатова**

*Кандидат филологических наук, доцент,*
*Федеральное государственное бюджетное научное учреждение высшего образования*
*«Донецкий государственный педагогический университет им. В. Шаталова»,*
*ул. Рудакова, 25, 284626, г. Горловка, ДНР, Россия, vafilatova@mail.ru*

На материале повести «Певрый вылет. Путевой дневник институтки» В. П. Авенариуса, написанной в форме дневника в самом начале XX века, от лица пятнадцатилетней девушки, которая впервые отправляется в путешествие с семьей за границу, рассматривается ее восприятие мира, взросление, переосмысление понятий «свой – чужой». В статье доказывается, что если в начале повествования «чужое» вызывает у нее интерес и восторг, то к окончанию путешествия она утверждается в мысли, что «свое» – это самое главное и дорогое в жизни. Дихотомия «свой – чужой» рассматривается на примере ее отношения к природе, достопримечательностям, людям и человеческим ценностям.

***Ключевые слова:*** детская литература; путевой дневник; «свой – чужой»; путешествие; противопоставление.

# СПЕЦЫФІКА РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ КАТЭГОРЫІ «СВОЙ – ЧУЖЫ» Ў АПОВЕСЦІ В. П. АВЕНАРЫЎСА «ПЕРВЫЙ ВЫЛЕТ. ПУТЕВОЙ ДНЕВНИК ИНСТИТУТКИ»

**В. А. Філатава**

*Кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*Федэральная дзяржаўная бюджэтнае навуковая ўстанова вышэйшай адукацыі*
*«Данецкі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт ім. В. Шаталава»,*
*вул. Рудакова, 25, 284626, г. Горлаўка, ДНР, Расія, vafilatova@mail.ru*

вествование сосредоточено на агонизирующем безумце, попавшем в психиатрическую больницу (писатель имел опыт принудительного лечения) и сражающегося с цветами мака, которые в его сознании становятся материальным выражением «мирового зла», нуждающегося в искоренении («Цветок в его глазах осуществлял собою все зло; он впитал в себя всю невинно пролитую кровь (оттого он и был так красен), все слезы, всю желчь человечества» [2, с. 201]).

Личность главного героя освобождена от всяческих социальных определений: в тексте нет ни имени, ни возраста, ни статуса. Безумец представляет собой концентрат обостренных до предела мессианских идей, сочетая в себе наивность Дон Кихота и самоотверженность Христа.

Сумасшедший наделен высшей мудростью, которая недоступна остальным: «Что вы так пристально смотрите на меня? Вы не прочтете того, что у меня в душе, – продолжал больной, – а я ясно читаю в вашей! Зачем вы делаете зло? Зачем вы собрали эту толпу несчастных и держите ее здесь? Мне все равно: я все понимаю и спокоен; но они? К чему эти мученья? Человеку, который достиг того, что в душе его есть великая мысль, общая мысль, ему все равно, где жить, что чувствовать. Даже жить и не жить... Ведь так?» [2, с. 195].

Сфера его бытования разомкнута, не ограничена локусом лечебницы и календарным временем: «Я переживаю самим собою великие идеи о том, что пространство и время – суть фикции. Я живу во всех веках. Я живу без пространства, везде или нигде, как хотите» [2, с. 195]).

Система мироздания его духа сугубо аксиологическая, предопределенная понятиями добра, которому надо служить, и зла, которое надо искоренить. Будничный бред приобретает характер епифании, сверхъестественного откровения, прозрения, выхода в мир абсолюта, скрытого за ширмой реальности «непросветленных». В каждом больном главный герой видит «тайно скрывающееся или скрытое лицо, которое он знал прежде или о котором читал или слыхал» [2, с. 197], причем среди них были люди всех стран, живые и мертвые. Больной сочувствует им, грезит о том, что «весь мир содрогнется, сбросит с себя ветхую оболочку и явится в новой, чудной красоте» [2, с. 199]. Эта эсхатологическая концепция созвучна многим мистическим проектам философии Нового времени. Миссия безумца – сорвать три цветка мака, однако за безобидностью ритуала с рациональной точки зрения стоит самое настоящее самопожертвование, которое рассматривается как необходимость, а не опция. Финал – гибель пациента после устранения третьего, последнего цветка – не должен казаться безусловно и однозначно трагичным, ведь это означало бы не столько торжество зла, сколько торжество прагматизма, пронизывающего весь текст как альтернативная дуалистическая оптика: реальность-истина и реальность-маскарад, меняющиеся местами. Герой исполняет свой долг безропотно и освобождается от страданий, пусть и ценой собственной жизни.

Галлюцинации героя новеллы «Сердце-обличитель» (1843) не столь далеки от бытовой действительности. Впрочем, свое безумие он яро отрицает: «Ну, да! Я нервен, нервен ужасно – дальше уж некуда; всегда был и остаюсь таким; но откуда вы

взяли, что я – сумасшедший?» [5, с. 421]. Вновь сталкиваемся с мономанией – навязчивой и чрезмерной увлеченностью какой-либо идеей, сопровождающейся бредом и галлюцинациями. Механизм ее беспочвенного появления описан физиологически детально: «Затрудняюсь определить, как этот замысел пришел мне на ум; но, как только возник, мне не стало от него покоя ни днем, ни ночью. Сам старик тут был ни при чем. Никакого взрыва ненависти не было и в помине. Я любил старика. Он мне ничем не досадил. Не обидел меня ни разу. На деньги его я не зарился. По-моему, все дело в этом глазище... – ну да! именно в нем. Один глаз у него был точь-в-точь, как у грифа, – водянисто-голубой, подернутый блестящей пленкой. Когда он смотрел на меня, у меня каждый раз кровь стыла в жилах, и вот, как-то незаметно, не сразу, я и додумался прикончить старика, чтоб не видать больше этого глаза вовеки» [4, с. 421].

Глаз старика вызывает у безумца иррациональное раздражение, которому он не способен противостоять: «Оно [око] смотрело, широко-широко открытое, и, лишь взглянув на него, я пришел в ярость. Я видел его с предельной ясностью – водянисто-голубоватое, подернутое пленкой, от гнусного вида которой меня мороз пробирал до мозга костей; но ни лица, ни самого старика мне не было видно; потому что, словно по наитию, я направил луч прямо на эту проклятую точку» [4, с. 423]. Стоит обратить внимание на символику цвета в сопоставлении: красные, угрожающие маки, ядовито-опасные, затмевающие крест на колпаке больного, и мертвенно-безразличный, будто застывший голубой глаз, вызывают будто бы противоречащие логике обратные реакции: оцепенение и неистовство соответственно.

Герой осознает, что его намерение аморально, безуспешно пытаясь отрефлексировать собственное поведение и найти ему логическое объяснение. Дисгармония мира в данном случае осознанно субъективна и не представляет собой материальное выражение вселенского зла. Мировоззренческая монументальность этому конфликту не свойственна. Однако и преступление, и наказание для человека начинаются с осознания виновности и без него не существуют, безотносительно к происходящему в объективной реальности и закрепленному в рамках закона. Когда разум, затуманенный болезнью, начинает вести его обладателя по ложному следу, это становится действительно пугающим.

Безумец слышит под половицами стук сердца умерщвленного соседа, но настоящим обличителем становится его собственная совесть – проблеск светлого разума или пик мании: «Я видеть больше не мог этих притворных улыбочек! Я понял, что если не закричу, то вот она, смерть моя! а оно: еще – чу!.. громче! громче! громче! громче!..» [4, с. 425]. Иммерсивность в тексте достигается также благодаря повествованию от первого лица.

Формальные критерии, обеспечивающие и «единство эффекта», и оправданное соотнесение с жанровой дефиницией более скрупулезно соблюдены в «Сердце-обличителе» (острота и парадоксальность сюжета, концентрированная событийность). «Красный цветок» содержит некоторые описания характера отступления; произведение также разделено на шесть условных частей, различных по объему. Впрочем, эти

обстоятельства не оказали негативного влияния на динамичность и некоторую вакуумную самообращенность сюжета, что видится магистральным в вопросе определения жанра.

Новелла Э. А. По – классический хоррор, окутанный саспенсом, шокирующий читателя по привычной и устоявшейся для современного человека модели. Новелла В. М. Гаршина – патогенез на грани трансценденции, полифонически совмещающее натуралистические детали и символику. Произведения объединяет пронзительность, экспрессивность, глубокий психологизм и пристальное внимание к «аномалиям души», вырождающимся в сумасшествие. Мотив безумия в «Сердце-обличителе» становится инструментом развенчания «перевернутой» детективной интриги, причиной преступления, отождествляется с деструктивным, разрушительным началом, порождаемым воспаленным сознанием; в «Красном цветке» он приравнивается к инаковости, предначертанной судьбой наделенности исключительными душевными свойствами, голгофе избранного на пути к спасению человечества. Героев объединяет стремление к преодолению дисгармонии, воплощенной в ярких образах глаза с бельмом и трех цветков мака. В первом случае побуждения эгоистичны, во втором же, напротив, альтруистичны, продиктованы внутренней потребностью усовершенствовать мир для всеобщего блага. Реципиент вынужден принимать «правила игры» в обоих случаях, ведь безумие становится лейтмотивом, движущей силой, причиной и следствием, замкнутыми в цикле страждущего сознания, где забвение разума становится освобождением.

## Библиографические ссылки


1. *Бологов П. В.* Эдгар По и Всеволод Гаршин: одна болезнь, одна судьба. [Электронный ресурс]. Режим доступа: http://www.psychiatry.ru/stat/13. Дата доступа: 05.09.2024.

2. *Гаршин В. М.* Сочинения: Рассказы. Очерки. Статьи. Письма. Сост. В. И. Порудоминский. М.: Сов. Россия, 1984.

3. Литературный энциклопедический словарь. [подгот. Е. И. Бонч-Бруевич и др.]; под общ. ред. В. М. Кожевникова, П. А. Николаева. М.: Советская энциклопедия, 1987.

4. *По Э. А.* Новеллистика Натаниела Готорна / Пер. с англ. З. Е. Александровой // Эстетика американского романтизма. М.: Искусство, 1977.

5. *По Э. А.* Полное собрание рассказов / Ред. А. А. Елистратова. М.: Издательство «Наука», 1970.

6. *По Э. А.* Философия творчества / Пер. с англ. В. В. Рогова // Эстетика американского романтизма. М.: Искусство, 1977.

# РЭАЛІЗАЦЫЯ НЯЎЛАСНА-ПРОСТАЙ МОВЫ Ў АЎТАФІКЦЫЯНАЛЬНАЙ ПРОЗЕ К. ІШЭРВУДА

**У. В. Салодкі**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр-т Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь,*
*ulad.salodki@gmail.com*

Даследуецца выкарыстанне наратыўных інструментаў, ужытых у рамане К. Ішэрвуда «Фіялка Пратэра». На прыкладзе твора разгледжаны асобныя тыпы аповеду і спосабы перадачы чужой мовы ў камунікатыўнай сітуацыі мастацкага тэксту. У межах прадстаўленых звышфразавых адзінстваў выяўлены сінтаксічныя адзінкі, што вызначаюць наратыўнамаўленчую сетку твора. Пры дапамозе аналізу ўнутрытэкставых сродкаў прысутнасці аўтара, героя і апавядальніка прадэманстравана сувязь моўнай рэалізацыі наратыўнага дыскурсу і жанравай спецыфікі аўтафікцыянальнага рамана.

***Ключавы словы:*** наратыўны дыскурс; раман «Фіялка пратэра»; наратыўныя сказы; свабодны ўскосны дыскурс; няўласна-простая мова.

# РЕАЛИЗАЦИЯ НЕСОБСТВЕННО-ПРЯМОЙ РЕЧИ В АВТОФИКЦИОНАЛЬНОЙ ПРОЗЕ К. ИШЕРВУДА

**В. В. Солодкий**

*Белорусский государственный университет,*
*пр-т Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь,*
*ulad.salodki@gmail.com*

Исследуется использование нарративных инструментов, примененных в романе К. Ишервуда «Фиалка Пратера». На примере произведения рассмотрены отдельные типы рассказа и способы передачи чужого языка в коммуникативной ситуации художественного текста. В пределах представленных сверхфразовых единств выявлены синтаксические единицы, определяющие нарративно-речевую сеть произведения. При помощи анализа внутритекстовых средств присутствия автора, героя и рассказчика продемонстрирована связь языковой реализации нарративного дискурса и жанровой специфики автофикционального романа.

***Ключевые слова:*** нарративный дискурс; роман «Фиалка Пратера»; нарративные предложения; свободный косвенный дискурс; несобственно-простой язык.

# REALIZATION OF FREE INDIRECT SPEECH IN THE AUTOFICTIONAL PROSE OF CH. ISHERWOOD

**U. V. Salodki**

*Belarusian State University,*
*4 Independence Avenue, 220030, Minsk, Belarus,*
*ulad.salodki@gmail.com*

The article investigates the use of narrative tools applied in the novel «Prater Violet» by Ch. Isherwood. On the example of the work the separate types of narration and ways of transferring foreign language in the communicative situation of the artistic text are considered. Within the presented supraphrasal units the syntactic units defining the narrative and speech network of the text are revealed. The link between the linguistic realization of narrative discourse and the genre specificity of the autofictional novel is demonstrated by the analysis of the intratextual means of the presence of the author, hero and narrator.

***Keywords:*** narrative discourse; the novel «Prater Violet»; narrative sentences; free indirect discourse; free indirect speech.

Проза англа-амерыканскага пісьменніка Крыстафера Ішэрвуда ў значнай ступені характарызуецца блізкім перапляценнем біяграфічнага і мастацкага. Трансфармацыя аўтабіяграфічных жанраў, што пачалася разам з эпохай мадэрнізму, працягваецца і сёння. Такое становішча рэчаў выклікае цікавасць да нараталагічнага аспекту прозы, у якой аўтар, герой і наратар часта становяцца адной фігурай у прасторы мастацкага тэксту. Дадатковае пытанне паўстае ў кантэксце «смерці аўтара»: узнікае неабходнасць перагляду ролі біяграфічнага і ўнутрытэкставага вобраза аўтара, яго магчымасцяў і функцый у арганізацыі аповеду. З аднаго боку, узнікае месца для філасофскага асэнсавання паняццяў праўды, шчырасці, фактуальнасці ўнутры камунікатыўнай сітуацыі. З другога боку, аналіз асаблівасцяў становішча пункта гледжання і дэйксісу, які звязвае прастору аповеду, дае глебу для літаратуразнаўчага падыходу да праблемы аўтабіярафічнасці і аўтафікцыянальнасці.

Мастацкі тэкст адначасова аб'яднаны наяўнасцю па-за сабой свядомасці аўтара і раздроблены разнастайнасцю пунктаў гледжання, выражаных у адным ці некалькіх апавядальніках. Даследчыца нараталагічнага падыходу Л. В. Татару ў манаграфіі «Наратыў і культурны кантэкст» зазначае: «Суб'ектна-маўленчы план пункта гледжання ахоплівае сетку маўленчых і разумовых актаў аўтара як "кіроўнай свядомасці", апавядальніка, персанажаў і чытача» [1, с. 132].

Маўленчыя і разумовыя акты аўтара адлюстроўваюцца шматлікімі лексічнымі, сінтаксічнымі і кампазіцыйнымі сродкамі. Аб'ектам аналізу функцыянальна-кагнітыўнага дыскурсу прозы з'яўляюцца звышфразавыя адзінствы, у межах якіх рэалізуецца пункт гледжання. Рэалізацыя пункта гледжання ў аўтафікцыянальных тэкстах з дыегетычным наратарам адбываецца пры дапамозе няўласна-простай мовы.

Няўласна-простая мова – гэта прыём аповеду, форма перадачы чужой мовы, які спалучае ў сабе элементы простай і ўскоснай мовы. Дадзены прыём пабудовы наратыву займае асаблівае месца падчас аналізу аўтабіяграфічных мастацкіх твораў, бо

суб'ектам свядомасці, успрыняцця і маўлення, што генералізуе хранатоп тэксту, з'яўляецца не проста апавядальнік ці аўтар, а яны абодва адначасова. У такім выпадку цяжка выдзеліць аб'ектыўную мову аўтара, якая ў класічным выглядзе рэалізуецца ў «аўтарскіх развагах», «лірычных адступленнях», дзе праяўляецца абасобленасць ад хранатапічнай прасторы. «Калі аўтарскае "Я" выражана экспліцытна, твар аўтара хаваецца за тварам кагосьці іншага, але не проста хаваецца, але і маскіруецца ў ім. У выніку мова наратара з'яўляецца няўласна-сваёй мовай аўтара» [1, с. 150].

Выявіць межы, дзе заканчваецца пазіцыя аднаго наратара і пачынаецца прастора другога, дапамагае з'яўленнне элементаў чужой мовы. Натуральна, што дзеля вызначэння чужой мовы неабходна паздзяліць аповед на свой (што належыць да прасторы аднаго пункта гледжання) і чужы. Найбольш поўнай праявай першага будзе простая мова, што выражаецца экспліцытна ў яе афармленні. Чым у большай ступені адбываецца інфільтрацыя элементамі чужой мовай, тым менш выражаецца гэты працэс экспліцытна. Выкарыстоўваецца няўласна-простая мова, мадальныя словы, метатэкставыя элементы.

Няўласна-простая мова можа быць рэалізавана рознымі кампазіцыйна-маўленчымі сродкамі, адным з якіх з'яўляецца свабодны ўскосны дыскурс, распрацаваны доктарам філалагічных навук, прафесарам А. В. Падучавай: «Свабодны ўскосны дыскурс, у адрозненне ад традыцыйнага наратыву, не патрабуе рэдукцыі натуральнай мовы. Дэйктычныя і экпрэсіўна-дыялагічныя элементы застаюцца ў руках аўтара, што абраў дадзеную форму аповеду, паколькі ў свабодным ускосным дыскурсе яны змяняюць інтэрпрэтацыю – гаспадаром эгацэнтрыкаў у азначаным дыскурсе з'яўляецца не апавядальнік, а персанаж: ён "узурпіруе" эгацэнтрычны пласт мовы – як дэйктычную, так і экспрэсіўна-дыялагічную вобласці» [2, с. 337].

Такім чынам, свабодны ўскосны дыскурс уяўляе сабой рэалізацыю натуральнай камунікатыўнай сітуацыі ва ўмовах мастацкага тэксту з захаваннем патрэбы ў наяўнасці сінхроннага адрасата. Элементы свабоднага ўскоснага дыскурсу змяшчаюць базавыя катэгорыя наратыўных сказаў, якія даюць магчымасць удакладніць экспліцытную рэпрэзентацыю думкі і маўлення ў тэксце. Выдзяляюць асобныя катэгорыі «наратыўных сказаў», якія дапамагаюць размежаваць як прамоўленае, так і непрамоўленае ў розных тыпах дыскурсу (таблица).

Абапіраючыся на дадзеную шкалу, разгледзім структуру фрагментаў з рамана К. Ішэрвуда «Фіялка Пратэра». Лічбамі пазначаны сказы ці асобныя клаўзы:

«Without answering, I sat down in my chair at the table (1). The morning paper still lay where I had let it fall an hour ago, crumpled and limp, as if bled of its news (2). Germany's withdrawal from the League was still the favourite topic (3). An expert predicted a preventive war against Hitler some time next year, when the Maginot Line would be impregnable (4). Goebbels told the German people that their vote on November the twelfth would be either yes or yes (5)»[1] [3, с. 11].

[1] Не адказаўшы, я апусціўся на сваё крэсла за сталом. Скамечаная і млявая – быццам з яе выцеклі навіны – ранішняя газета ўсё яшчэ ляжала там, дзе гадзіну таму я яе пакінуў. Выхад Германіі з Лігі Нацый па-ранейшаму быў найпапулярнейшай тэмай. Адзін з экспертаў прадказаў прэвентыўную вайну супраць Гітлера ў наступным годзе, калі лінія Мажыно стане

| Базавыя катэгорыі «наратыўных сказаў» | Рэпрэзентацыя маўлення | Рэпрэзентацыя думкі |
|---|---|---|
| Просты дыскурс | Простая мова: *“Hey, I love you!”; He said: “Hey, I love you!”* | Простая думка (ўнутраны маналог): *Hey, I love her!* |
| Ускосны дыскурс | Ускосная мова: *He said, he loved her.* | Ускосная думка: *He thought he loved her.* |
| Свабодны ўскосны дыскурс | Свабодная ўскосная мова: *Hey, he loved her.* | Свабодная ўскосная думка: *Hey, he loved her.* |
| Адноўлены стан (абагульнена-наратыўная перадача зместу дыскурса) | Перадача маўленчых актаў: *He finally took courage and proposed to her.* | Псіханарацыя (перадача разумовых актаў і станаў): *His heart beat pit a pat. He suddenly realized he was in love with her.* |
| Адноўленае ўспрыняцце (свабоднае ўскоснае ўспрыняцце і ўражанне) | *He looked out into the garden. The butterflies were hovering over hedges, and the little brook was snuggling warmly in the sunshine.* | |

Крыніца: [1, с. 153].

Дадзены абзац змяшчае ў сабе адну сцэну. Дэйктычны цэнтр сцэны прымацаваны да свядомасці галоўнага героя – Крыстафера Ішэрвуда. На ўзроўні дыскурсу ўрывак складаецца з розных тыпаў наратыўных сказаў: Сказы 1 і 2 можна аднесці да персанальнага аповеду. Таксама гэтыя ж сказы нясуць у сабе элементы рэальнасці (прасторы і часу). Сказ 4 перадае змест газеты. Сказ 5 – замена простай мовы на ўскосную, пра што кажа захаванне стылістыкі фразы.

У невялікім працытаваным урыўку заўважаем успрыняцце рэальнага локуса, невялікую рэтраспекцыю, пераказ зместа чужых думак, замена простай мовы на ўскосную.

Розніца паміж міметычным апісаннем і разумовым актам наратара заўважана ў наступным урыўку: «I was off (1). My mother poured fresh cups of tea for Richard and herself (2). They exchanged milk and sugar with smiling pantomime and settled back comfortably in their chairs (3), like people in a restaurant when the orchestra strikes up a tune which everybody knows by heart (4)»[2] [3, с. 11].

У дадзеным урыўку сказы 1–3 адлюстроўваюць успрыняцце рэальнасці наратарам, клаўза 4 – рэалізацыю разумовага акта.

Адным з найбольш распаўсюджаных тыпаў рэалізацыі свабоднага ўскоснага дыскурсу з’яўляецца ўнутраны маналог, прыкладам якога служыць дадзены ўрывак:

---

непрыступнай. Гебельс паведаміў нямецкаму народу, што дванаццатага лістапада ён прагаласуе толькі «за» або «за» [Тут і далей пераклад мой – У. С.].

[2] Я ўстаў з-за стала. Маці наліла ў кубкі сабе і Рычарду свежай гарбаты. Усміхнуўшыся, яны перадалі адно адному малако і цукар і зручна ўладкаваліся ў крэслах, бы наведвальнікі рэстарана ў момант, калі аркестр грае усім вядомую мелодыю.

Death, the desired, the feared. The longed-for sleep. The terror of the coming sleep. Death. War. The vast sleeping city, doomed for the bombs. The roar of oncoming engines. The gunfire. The screams. The house shattered. Death universal. My own death. Death of the seen and known and tasted and tangible world. Death with its army of fears. Not the acknowledged fears, the fears that are advertised. More dreadful than those: the private fears of childhood. Fear of the height of the high-dive, fear of the farmer's dog and the vicar's pony, fear of cupboards, fear of the dark passage, fear of splitting your finger-nail with chisel. And behind them, most unspeakably terrible of all, the arch-fear: the fear of being afraid[3] [3, с. 124].

Прыведзеная цытата з'яўляецца ўвасабленнем псіханарацыі, рэалізаванай ва ўнутраным маналогу

Усе прыклады звязаны адным наратарам, які экспліцытна выражаны ў аповедзе ад першай асобы. Асаблівасцю аповеду з'яўляецца яго паліфанічнасць: фрагменты маўлення могуць адначасова належаць аўтару, герою і чытачу. Унутраны маналог, рэалізаваны ад першай асобы, знаходзіцца на перыферыі полюса чужой мовы. У такіх умовах унутрытэкставыя пазіцыі аўтара і наратара часта не маюць вызначаных межаў.

Такім чынам, аўтабіяграфічнасць творчасці К. Ішэрвуда і трыадзінства катэгорый аўтар – галоўны герой – наратар дае магчымасць казаць пра аўтафікцыянальнасць як пра тэматыка-стылістычную характарыстыку творчасці пісьменніка. Дадзеная характарыстыка азначае не толькі ўзаемадзеянне фактуальнага і фікцыянальнага, праўдзівага і мастацкага, але і рэалізацыю самааб'ектывацыі аўтара ў нараталагічнай сістэме твора.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Татару Л. В.* Нарратив и культурный контекст. Москва: Ленанд, 2011.

2. *Падучева Е. В.* Семантические исследования: Семантика времени и вида в русском языке; Семантика нарратива. 2-е изд., испр. и доп.. Москва: Языки славянской культуры, 2010.

3. *Isherwood Ch.* Prater Violet. London: Penguin Books, 1961.

[3] Смерць – жаданая, жахлівая. Доўгачаканы сон. Страх перад блізкім сном. Смерць. Вайна. Велізарны начны горад, вырачаны на бамбардзіроўкі. Рокат рухавікоў. Страляніна. Крык. Дом разбураны. Усеагульная смерць. Мая ўласная смерць. Смерць бачнага, вядомага, вартага даверу, адчувальнага свету. Смерць з яе арміяй страхаў. Невядомыя страхі, знаёмыя страхі. Больш страшныя за асабістыя страхі дзяцінства. Боязь вышыні пры скоках з парашутам, боязь сабакі фермера і поні святара, боязь шафаў, боязь цёмнага калідора, боязь раскалоць пазногаць зубілам. За імі ўсімі хаваецца галоўны страх: страх спалохацца.

# РАСШИРЕНИЕ ХУДОЖЕСТВЕННОГО ПРОСТРАНСТВА В ЭЛЕГИИ Г. КОНИССКОГО «СЕРПА ОЖИДАЮТ СОЗРЕЛЫЕ КЛАССЫ…»

**С. Э. Сомов**

*Кандидат филологических наук, доцент,*
*Белорусский государственный университет,*
*пр-т Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, somov72@mail.ru*

Анализируется духовно-философская элегия белорусского просветителя Георгия Конисского, посвященная теме смерти и судьбе человеческой души в загробном мире. В соответствии с религиозными убеждениями автора, смерть – это окончательный исход души из тела и последующее движение к Богу на частный справедливый суд, после которого душа отправляется либо в Царство небесное, либо в преисподнюю, в зависимости от того, какой нравственный «багаж» сумел собрать человек в земной жизни: плохой или хороший. Г. Конисский описывает «смертный путь», неизбежно предстоящий лирическому герою. Это движение по последней «дальней дороге» расширяет художественное пространство в произведении от точки у зеркала, в которое смотрится поседевший человек, до непостижимо далекого места пребывания небесного Праведного Судии, т. е. Бога в его трансцендентном существовании.

***Ключевые слова:*** Георгий Конисский; элегия; духовно-философский; художественное пространство; смерть; бессмертие; путь.

# ПАШЫРЭННЕ МАСТАЦКАЙ ПРАСТОРЫ Ў ЭЛЕГІІ Г. КАНІСКАГА «СЕРПА ОЖИДАЮТ СОЗРЕЛЫЕ КЛАССЫ…»

**С. Э. Самоў**

*Кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр-т Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, somov72@mail.ru*

Аналізуецца духоўна-філасофская элегія беларускага асветніка Георгія Каніскага, прысвечаная тэме смерці і лёсу чалавечай душы ў замагільным свеце. У адпаведнасці з рэлігійнымі перакананнямі аўтара, смерць – гэта канчатковы зыход душы з цела і наступны рух да Бога на прыватны справядлівы суд, пасля якога душа адпраўляецца альбо ў Царства Нябеснае, альбо ў апраметную, у залежнасці ад таго, які маральны «багаж» здолеў сабраць чалавек у зямным жыцці: дрэнны ці добры. Г. Каніскі апісвае «смяротны шлях», непазбежна маючы адбыцца лірычнаму герою. Гэты рух па апошняй «далёкай дарозе» пашырае мастацкую прастору ў творы ад кропкі ля люстэрка, у якое глядзіцца пасівелы чалавек, да неспасціжна далёкага месца знаходжання нябеснага Праведнага Суддзі, г. зн. Бога ў яго трансцэндэнтным існаванні.

***Ключавыя словы:*** Георгій Каніскі; элегія; духоўна-філасофскі; мастацкая прастора; смерць; неўміручасць; шлях.

# EXPANSION OF ARTISTIC SPACE IN THE ELEGY OF G. KONISSKY «THE MATURE CLASSES ARE WAITING FOR THE SICKLE... »

**S. E. Somov**

*PhD, Ass. Professor,*
*Belarusian State University,*
*4 Nezavisimosti Ave., 220030, Minsk, Belarus, somov72@mail.ru*

The article analyzes the spiritual and philosophical elegy of the Belarusian educator Georgy Konissky, dedicated to the theme of death and the fate of the human soul in the afterlife. According to the author's religious beliefs, death is the final exodus of the soul from the body and the subsequent movement to God for a private just judgment, after which the soul goes either to the Kingdom of Heaven or to the underworld, depending on what kind of moral "baggage" a person managed to collect in earthly life: bad or good. G. Konissky describes the "mortal path" that inevitably lies ahead for the lyrical hero. This movement along the last "long road" expands the artistic space in the work from the point at the mirror in which the gray-haired man looks himself, to the incomprehensibly distant place of residence of the heavenly Righteous Judge, so God in his transcendental existence.

***Keywords:*** Georgy Konissky; elegy; spiritual and philosophical; artistic space; death; immortality; path.

Могилевский и Белорусский архиепископ Георгий Конисский, один из выдающихся просветителей XVIII века, реализовал свои гуманитарные таланты в разных жанрах литературно-художественного творчества, в том числе и в жанре элегии. Сохранилось только одно стихотворение, близкое к элегии, которое самим автором было озаглавлено как «Песнь» [1, Т. 2, с. 261–262]. После появлении в печати данное произведение высоко оценил А. С. Пушкин. Именно А. Пушкин в критическом отзыве на первое собрание сочинений Конисского определил жанр стихотворения как элегический и назвал произведение «достопримечательным» [2, с. 99]. В последующие годы эта главная поэтическая удача Георгия практически нигде не публиковалась, а потому осталась незамеченной литературоведами. Произведение, построенное в рамках канонов классицистической поэзии, исполнено не только мысли, но и вкуса, насыщено метафорами, аллюзиями на Античность и Библейские сюжеты. Несмотря на сравнительно небольшой объем, в стихотворении Конисский сумел создать широкую пространственно-временную картину, проецируемую за грань физического бытия.

Элегия не имеет точной датировки написания, однако ее содержание свидетельствует о том, что произведение было написано уже немолодым человеком, которому перевалило за пятьдесят и который всерьез задумывается о смерти, разглядывая в зеркале свои полностью поседевшие волосы. Поэтому, предположительно, элегия «Серпа ожидают созрелые классы…» могла быть написана в период с 1768 (год завершения «Варшавской миссии» архиепископа Георгия, в период которой он был чрезвычайно занят подготовкой и участием в бурных заседаниях Полкого сейма) по 1793 год, когда он был уже так болен и слаб, что сочинил для себя самого эпитафию

и составил большое завещание, касающееся всего его имущества, вплоть до личных вещей.

Тема элегии – духовно-философская: Конисский размышляет о смысле человеческой жизни в проекции на приближающуюся неминуемую и скорую смерть, а также о той загробной участи, которая уготована человеку в зависимости от его духовного состояния в момент перехода в вечность. Святитель Георгий как глубоко верующий человек, прославленный уже в наше время в лике святых сначала Белорусской (1993), а затем и Русской православной церковью (2017), был убежден в том, что люди с чистым сердцем и душой, не отягощенной грехами, по милости Божией попадают в Царство Небесное, а нераскаявшиеся грешники неминуемо отправляются в ад на вечные муки; и что человек, пока он жив и не лишен свободы выбора между добром и злом, может повлиять на судьбу своей бессмертной души в вечности. Важно, чтобы он успел подумать об этом и переменить свою жизнь на земле к лучшему.

Серпа ожидают созрелые классы;
А нам вестники смерти – седые власы.
О! смертный, безпечный, посмотри в зерцало:
Ты сед, как пятьдесят лет тебе миновало [1, с. 261].

Автор призывает смертного и беспечного человека посмотреть в зеркало и, глядя на свои седые волосы, задуматься о скоротечности жизни и приближении смерти. В духе древней русской литературы приход смерти изображается им как время наступления жатвы (ср. описание гибели воинов на реке Немиге в «Слове о полку Игореве»). Так в начале стихотворения внимание читателя «приземляется» к вещам вполне осязаемым и понятным: это созревшие колосья, которые на поле ожидают жнивного серпа, и вскоре будут им срезаны, поскольку рост и, соответственно, жизнь в них уже заканчивается. Подобным образом ожидают устрашающего «серпа смерти» и стареющие люди, в которых рост, развитие и жизнь тоже постепенно прекращается. Даже на фоне бодрости тела, которое еще подвижно и полно сил, проявляются первые «вестники смерти» – седые волосы, которые похожи на засыхающие выспевшие колосья, некогда зеленые, потом золотисто-желтые, а потом блеклые и безжизненные, как солома или койстра.

В пространственном отношении начало повествования – это фактически точка: мы представляем себе некие конкретные колосья, а затем оказываемся вместе с поседевшим лирическим героем у зеркала, в котором видим его побелевшие волосы. Эта точка, как момент представляющейся герою смерти, становится началом пути, а вернее, двух разновеликих путей, один из которых – по земле, а второй – по небу. Образ зеркала, показывающего герою признаки приближающегося конца, удачно вписывается автором в контекст перехода от одной формы существования в другую, запредельную, неизвестную, а потому пугающую и, может быть, опасную (ср. в народно-мифологической культуре зазеркалье как мир духов, противопоставленный миру живых, и соответствующие устойчивые традиции завешивания зеркал в помещении, где находится уже умерший, душа которого покинула тело и готовится к переходу в этот загадочный мир духов).

Говоря о движении в пространстве, Конисский, опять-таки вслед за фольклорной традицией проводов покойника, называет его путь «смертной дорогой», в которую он отправляется один и навсегда. Путь его тела короткий – до «гроба», т. е. до могилы на кладбище. Этот путь скорбный, но не одинокий, поскольку покойного провожают друзья. Однако этот путь не имеет для человека и, по большому счету, для окружающих важного значения, поскольку прах отправляется к праху, чтобы окончательно рассыпаться и исчезнуть с поверхности земли, по крайней мере до таинственного всеобщего воскресения на Страшный суд. Конисский подчеркивает, что друг, проводивший друга до гроба, возвращается в свой дом, то есть в место живых людей, забот, печалей, радостей, словом, в место живой жизни. Туда умершей душе путь уже заказан, ее уделом становится вынужденное движение по другой по-настоящему длинной дороге к Богу, перед которым она должна предстать на свой частный суд.

Как же ты собрался в смертную дорогу?
С чем ты предстанешь Правосудному Богу?
Путь смертный безвестен, и полон разбоя:
Искусснаго, храбраго требует конвоя.
Кто ж тебя поведет, и за тебя сразится?
Друг, проводив тебя к гробу, в дом возвратится [1, с. 261–262].

Здесь автор эмоционально заостряет перспективу предстоящего суда и называет Бога «Правосудным», а не милостивым, как это чаще всего описывается в христианских произведениях о Боге-Любви. С одной стороны, творчеству архиепископа Георгия в разных жанрах (трагекомедия «Воскресение мертвых», поэтические переложения псалмов царя Давида, многочисленные храмовые проповеди и др.) свойственны библейские мотивы и образы грозного и нелицеприятного Божьего суда, на котором каждого грешника постигает неминуемая заслуженная кара. С другой стороны, он сравнивает трепет души и ее страх перед Небесным судом с трепетом земного преступника, ведомого на суд и знающего, что этот суд будет суровым, а не снисходительным.

Этот путь, по словам Конисского, сам по себе опасен и «полон разбоя», а потому заключенному, ведомому на суд, как путешественнику, отправляющемуся в дальнюю дорогу, на которой могут встретиться разбойники, необходима вооруженная охрана – «добрый конвой». Эти образы пути, конвоя и разбоя вполне понятны только верующему христианину или читателю, знакомому с православными представлениями о судьбе души умершего человека после смерти. Эти представления носят во-многом легендарный и даже фольклорно-мифологический характер, они не выражены в полном объеме в трудах святых Отцов церкви и не оформлены в виде законченного учения, поскольку признаются тайной, в значительной степени недоступной пониманию предметно мыслящего человеческого разума ввиду своей трансцендентности. Вместе с тем, в религиозных кругах принято считать, что после смерти до сорока дней душа человека находится в некоем движении, позволяющем ей троекратно приближаться к Богу и познавать духовный мир, ранее сокрытый от нее: созерцать как райские пределы, так и глубины ада.

На этом пути к Небесному престолу, к раю и к аду душа испытывает потрясающий ее ужас и трепет: и потому, что ее несут ангелы смерти – тот самый «конвой»; и потому, что несут не прямо в рай, а на суд с еще неизвестным финалом; и потому, что по пути ее пытаются перехватить темные силы – бесы, которые уверены, что имеют на нее полные права ввиду множества грехов, совершенным человеком в его жизни. Они предъявляют доказательства в виде списка этих грехов, демонстрируют душе и ангелам смерти своего рода ретроспекцию всего злого, что было в жизни человека, всего того, что он и сам давно забыл, но что продолжает лежать грузом на его душе, поскольку не исповедано и не очищено. Вот почему в религиозной среде этот длинный путь и это сорокадневное движение души традиционно называют «воздушными мытарствами», то есть путем страданий.

Изнеможешь, пеший, таща грехов ношу!
Ах! тут-то нужно иметь подмогу хорошу,
Подмогу, какая дана Сикеоту:
Но – та дана слезам, кровавому поту [1, с. 262].

«Хорошая подмога», о которой пишет Конисский, заключается в действиях ангелов во время воздушных мытарств. Они, по преданию, защищают душу, чтобы донести ее до престола Божьего и не отдать демонам. Каждый раз, когда те предъявляют свои права, ангелы достают из некоего ковчежца (ящик или шкатулка) ценность и откупаются от бесов. Этот ковчежец (ср. ковчег завета, дарохранительница на престоле храма, шкатулка с мощами святых и частицами святынь и др.) в данном контексте выступает символом того нетленного богатства, которое человек сумел скопить себе на небе: это те добрые дела, которые он совершал бескорыстно и безвозмездно, те добрые мысли и движения души, которые его посещали, те молитвы о нем, которые творили родные и знакомые люди. Соответственно, если этот ковчег большой, то несмотря на множество грехов, которые есть у каждого человека, небесному «конвою» будет что предъявить преисподним разбойникам, и путь мытарств душа пройдет безвредно.

Вот почему, говоря о подмоге на этом пути, Конисский в качестве примера приводит образ Сикеота, имевшего по смерти такую подмогу, поскольку много потрудился для того, чтобы собрать большое сокровище. Сикеот – это прозвание христианского святого Феодора, жившего в Малой Азии в конце VI – начале VII в. и прославившегося своим подвижничеством: трудолюбием и особенным монашеским аскетизмом. В стихотворении его труды выражаются амбивалентным символом «кровавого пота». С одной стороны, это аллюзия на евангельское изображение последней уединенной молитвы Иисуса Христа в Гефсиманском саду перед арестом и жертвенной смертью, когда капли его пота были похожи на кровь. С другой стороны, это символика неустанного духовного труда, открывающего путь в Царство небесное, которое «нудится», т. е. зарабатывается серьезными и длительными усилиями.

Но лирический герой стихотворения совсем не похож на святого человека, напротив, его жизнь автор называет «цепью грехов» и, соответственно, душу оголенной, беззащитной:

А ты много ли плакал за грехи? Считайся.

Не весь ли век твой есть цепь грехов? Признайся.
Ах! вижу, ты нагиш, как родила мать:
Ни лоскутка на душе твоей не сыскать! [1, с. 262].

Такой душе не войти «в небесны чертоги», ее путь иной – в преисподнюю: «в ад тебя низринут, связав руки, ноги», – категорично и сурово утверждает автор, вразумляя своего героя, а с ним и читателя. Конисский напоминает им о десяти глупых девах из притчи Христа, в которой на брачный пир к жениху (суть Царство небесное и Господь) попали только те девы, которые запаслись маслом (добрыми делами) и сохранили свои светильники (души) горящими. Здесь автор использует метафору о масле и светильнике, углубляя понимание того, что в основе и добрых дел, и покаяния лежит твердая вера в Бога: «Без масла дел благих гаснет свеча Веры» [1, с. 8]; а также использует символ дерева и топора как аллюзию на еще одну притчу Христа о бесплодной смоковнице, которую срубают и сжигают в огне (душа в адском пламени).

В итоге, проследив «смертный путь» с земли на Небо и в преисподнюю, расширяющий художественное пространство произведения до общемировых масштабов, Конисский делает категорический вывод о необходимости совершения добрых дел:

Итак, доколе древа топор не коснется,
Плод добрых дел тебе принесть остается [1, с. 8].

Этот вывод становится логическим завершением предпринятого анализа пути достижения вечного счастья в Царствии небесном. Поскольку этот путь проходит не по земле, а в духовном пространстве, он предполагает и соответствующие усилия человеческого духа: наличие веры и надежды на Всевышнего, убежденность в истинности добра, стремление к нему, совершение как можно большего количества добрых дел, а в случае неизбежных ошибок (грех как «промах мимо цели») – скорейшее искреннее раскаяние в них.

**Библиографические ссылки**

1. Собрание сочинений Георгия Конискаго, Архиепископа Белорусскаго. Санкт-Петербург: Тип. Императорской Российской Академии. Ч. 1–2. 1835.

2. *Пушкин А. С.* Собрание сочинений Георгия Конисского, архиепископа Белорусского, изд. протоиереем Иоанном Григоровичем. СПб. 1835 // Пушкин А.С. Собрание сочинений: в 10 т. Т. 6. Критика и публицистика. М.: Гос. изд-во «Художественная литература», 1962. С. 94–106.

# АСЭНСАВАННЕ ЛІТАРАТУРНАГА ПРАЦЭСУ ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ ХХ СТАГОДДЗЯ Ў ПРАЦАХ К. ХРОМЧАНКІ

**П. І. Навойчык**

*Кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр-т Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь,*
*navoich@bsu.by*

Разглядаюцца асноўныя напрамкі навуковай і педагагічнай дзейнасці вядомага беларускага вучонага, даследчыка беларускай літаратуры Кузьмы Хромчанкі. Адзначаецца яго ўклад у асэнсаванне беларускай літаратуры пачатку ХХ ст., а таксама літаратуры Заходняй Беларусі 1930-х гадоў. У сваёй выкладчыцкай дзейнасці Хромчанка быў звязаны з распрацоўкай курсаў лекцый, прысвечаных нацыянальным літаратурам Савецкага Саюза, а пазней – літаратурам бліжняга замежжа. Вучоны зрабіў значны ўклад у вывучэнне беларуска-ўкраінскіх літаратурных узаемасувязей і творчай спадчыны Тараса Шаўчэнкі.

***Ключавыя словы:*** літаратуразнаўства; беларуская літаратура; даследчык літаратуры; літаратурныя ўзаемасувязі; манаграфія; выкладчык; філалагічны факультэт.

# ОСМЫСЛЕНИЕ ЛИТЕРАТУРНОГО ПРОЦЕССА ПЕРВОЙ ПОЛОВИНЫ XX ВЕКА В РАБОТАХ К. ХРОМЧЕНКО

**П. И. Навойчик**

*Кандидат филологических наук, доцент,*
*Белорусский государственный университет,*
*пр-т Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь,*
*navoich@bsu.by*

Рассматриваются основные направления научной и педагогической деятельности известного белорусского ученого, исследователя белорусской литературы Кузьмы Хромченко. Отмечается его вклад в осмысление белорусской литературы начала XX в., а также литературы Западной Беларуси 1930-х годов. В своей преподавательской деятельности Хромченко был связан с разработкой курсов лекций, посвященных национальным литературам Советского Союза, а позже – литературам ближнего зарубежья. Ученый сделал значительный вклад в изучение белорусско-украинских литературных взаимосвязей и творческого наследия Тараса Шевченко.

***Ключевые слова:*** литературоведение; русская литература; исследователь литературы; литературные взаимосвязи; монография; преподаватель; филологический факультет.

# UNDERSTANDING THE LITERARY PROCESS OF THE FIRST HALF OF THE 20TH CENTURY IN THE WORKS OF K. KHROMCHANKA

**P. Navoichyk**

*PhD, Ass. Professor,*
*Belarusian State University,*
*Karl Makrs Street 31, 220030, Minsk, Belarus,*
*navoich@bsu.by*

The article examines the main areas of scientific and pedagogical activity of the famous Belarusian scientist, researcher of Belarusian literature Kuzma Khromchenko. His contribution to the understanding of Belarusian literature of the early 20th century, as well as the literature of Western Belarus of the 1930s is noted. In his pedagogical activity, Khromchenko was associated with the development of lecture courses devoted to the national literature of the Soviet Union, and later – the literature of the near abroad. The scientist made a significant contribution to the study of Belarusian-Ukrainian literary ties and the creative heritage of Taras Shevchenko.

***Keywords:*** literary studies; Belarusian literature; literature researcher; literary relations; monograph; lecturer; Faculty of Philology.

У канцы 1950-х гадоў, пасля выкрыцця культу асобы Сталіна, паўстала вострая неабходнасць адраджэння гуманістычных вытокаў нацыянальнага мастацтва. Склаліся параўнальна спрыяльныя ўмовы для вяртання ў навуковае і літаратурнае жыццё імёнаў пісьменнікаў і іх твораў, аб'ектыўных ацэнак гістарычных падзей, незаслужана забытых у гады сталінскага таталітарызму, выкрасленых з гісторыі як варожых савецкаму грамадству і камуністычнай ідэалогіі. У гэты час у літаратуру прыйшло пакаленне маладых, энергічных людзей з ярка выражанай актыўнай грамадзянскай пазіцыяй, якіх пазней назавуць «шасцідзясятнікамі», узяўшых на сябе смеласць і адказнасць вярнуць у літаратуру «малога чалавека» як цэнтральны аб'ект мастацкага адлюстравання. Сваёй творчасцю яны пераканаўча сцвярджалі неабвержную праўду слоў класіка: «чалавек – гэта цэлы свет».

За апошнія дзесяцігоддзі творчасць пісьменнікаў-шасцідзясятнікаў дастаткова грунтоўна даследавана і належна ацэнена, у тым ліку іх сучаснікамі літаратурнымі крытыкамі. Думаецца, прыйшла пара пакінуць для нашчадкаў і яшчэ адну старонку нашага мінулага – сістэматызаваць і асэнсаваць уклад у беларускую навуку і тых сціплых працаўнікоў ад літаратуразнаўства, не ўвянчаных лаўрамі і дзяржаўнымі прэміямі, але зрабіўшых свой важкі ўклад у вялікую справу вяртання слаўных імён, адраджэння аб'ектыўных ацэнак мінулага. Адным з іх і быў выпускнік літаратурнага факультэта Магілёўскага педагагічнага інстытута (1951) і аспірантуры Акадэміі навук БССР (1956), навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры Акадэміі навук (1956-1966) і выкладчык філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1966–2000) Кузьма Рыгоравіч Хромчанка. Выдатны даследчык беларускай літаратуры і беларуска-ўкраінскіх літаратурных сувязей, таленавіты педагог ён

быў чалавекам надзвычай сціплым, у поўным сэнсе інтэлігентным і вельмі далікатным у зносінах з людзьмі. Лёс распарадзіўся так, што ён пайшоў з жыцця роўна ў 80-ты дзень свайго нараджэння – 25 кастрычніка 2009 года, а значыць сёлета яму споўнілася б 95.

У сваім хрэстаматыйным вершы «Троянди й виноград» («Ружы і вінаград») класік украінскай паэзіі М. Рыльскі пісаў: «у щастя людського два рівних є крила». Такімі «крыламі» ў жыцці К. Р. Хромчанкі сталі два асноўныя напрамкі прафесійнай дзейнасці, якія ў роўнай меры былі важнымі для яго, якім ён аддаваўся на поўніцу, якімі жыў штодня – літаратуразнаўчыя даследаванні і выкладчыцкая дзейнасць. Тры гады аспірантуры і дзесяць год працы ў Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук БССР у якасці навуковага супрацоўніка і вучонага сакратара сталі важкімі старонкамі біяграфіі, калі малады навуковец сфарміраваўся як прафесійны даследчык літаратуры, вызначыўся з напрамкамі далейшых літаратурных даследаванняў. А педагагічнага «хлеба» ён паспытаў яшчэ ў першыя два гады пасля заканчэння Магілёўскага педінстытута, калі працаваў настаўнікам беларускай мовы і літаратуры ў Дзятлаўскай сярэдняй школе (Гродзенская вобласць, 1951–1953). Школьны вопыт стаў добрым падмуркам на чарговым павароце лёсу, калі ў 1966 годзе К. Хромчанка прыйшоў працаваць выкладчыкам літаратуры на філалагічны факультэт БДУ.

Кола навуковых зацікаўленняў К. Хромчанкі было надзвычай шырокім: літаратурны працэс канца XIX – пачатку XX стст., творчасць пісьменнікаў Заходняй Беларусі ў 20–30-я гады XX ст., беларуска-ўкраінскія літаратурныя ўзаемасувязі і інш. У перыяд працы ў Акадэміі навук і пазней К. Хромчанка шмат працаваў у архівах, дзе карпатліва збіраў звесткі аб жыцці і творчасці пісьменнікаў, вывучаў перапіску рэдакцый газет і часопісаў з аўтарамі, высвятляў акалічнасці пэўных гістарычных падзей, збіраючы і аналізуючы факты з самых розных крыніц. Менавіта фактаграфічная дакладнасць і ўвага да дэталяў вызначала выступленні К. Хромчанкі ў друку і на навуковых сімпозіумах, сцвярджала яго аўтарытэт як аб'ектыўнага даследчыка. Безумоўна, у сваіх працах ён вымушаны быў прытрымлівацца пэўных ідэалагічных патрабаванняў і не мог выказацца з поўнай адкрытасцю, але ў любым выпадку імкнуўся да максімальна магчымай праўдзівасці.

Узрастанне К. Хромчанкі як даследчыка літаратуры было даволі дынамічным і плённым: у 1957 годзе ён выступіў у друку з першымі літаратурна-крытычнымі артыкуламі і рэцэнзіямі, а ў 1960 годзе ўжо выдаў першую грунтоўную манаграфію «Піліп Пестрак: Жыццё і творчасць», у аснову якой былі пакладзены матэрыялы кандыдацкай дысертацыі, прысвечанай творчасці пісьменніка. У першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі стаўленне савецкіх ідэолагаў да палітычных і нацыянальна-культурных дзеячаў колішняй Заходняй Беларусі было даволі стрыманае, да творчасці пісьменнікаў-«заходнікаў» прыглядаліся з асаблівай уважлівасцю. І хаця Піліп Пестрак як пісьменнік і дзяржаўны дзеяч падазронасці не выклікаў, больш за тое, займаў вельмі адказныя пасады, выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, пісалася пра яго няшмат. Манаграфія К. Хромчанкі ўпершыню раскрывала перад чытачом асобу творцы ў самых розных сферах яго жыцця і творчай дзейнасці, змяшчала даволі пад-

рабязныя старонкі біяграфіі і дастаткова грунтоўны аналіз лірыкі і прозы, які дазваляў прасачыць, як з гадамі развіваўся талент пісьменніка, і ацаніць яго месца і ролю ў кантэксце нацыянальнай літаратуры [4].

У згаданай манаграфіі яскрава выявіўся і яшчэ адзін талент К. Хромчанкі – як бліскучага стыліста. Вельмі тонкае адчуванне сэнсавага і гукавога напаўнення слова з'яўляецца вызначальнай рысай ужо першай кнігі даследчыка. У гэтай сувязі прыгадваецца, як ён працаваў з намі, студэнтамі-філфакаўцамі, што пісалі курсавыя і дыпломныя працы пад яго кіраўніцтвам. Нашы опусы ён перачытваў, не шкадуючы ўласнага часу, па некалькі разоў, кожны раз надаючы ім стылёвай гладкасці і вызваляючы ад моўных недакладнасцей і «ляпаў», а тым самым даваў нам запамінальны ўрок ашчаднай працы са словам.

Наколькі бездакорнай была вышэйназваная манаграфія маладога даследчыка сведчыць той факт, што пры выданні зборніка абавяданняў у 1970 годзе і 5-томнага збору твораў П. Пестрака ў 1984 годзе напісаць да іх прадмовы прапанавалі менавіта К. Хромчанку [2, с. 3–14; 3, 6–22,]. Ён жа быў і рэдактарам 1-га і 5-га тамоў згаданага 5-томніка.

Яшчэ ў перыяд сваёй працы ў Акадэміі навук К. Хромчанка пачаў цікавіцца літаратурай мяжы XIX–XX стст. У яго асабістым архіве захавалася нямала выпісак з газет, часопісаў таго перыяду, перапіска рэдакцый з пісьменнікамі, іншыя запісы. Даследчык вывучаў літаратурны працэс у вельмі шырокім кантэксце, не абмяжоўваючыся толькі мастацкімі тэкстамі і ўважліва прыглядаючыся да ўсіх аўтараў, не зважаючы на ідэалагічныя штампы, якія змяшчаліся ў падручніках і энцыклапедчных даведніках. Таму, калі ў 1979 годзе з друку выйшла яго чарговая манаграфія «Беларуская мастацкая проза (канец XIX – пачатак XX ст.)», цікавасць да яе была непадробнай [1]. К. Хромчанка ўключыў у пералік разглядаемых аўтараў практычна ўсіх, чые апавяданні на беларускай мове пабачылі свет у азначаны перыяд. У выніку чытач атрымаў магчымасць убачыць даволі шырокую панараму развіцця беларускай мастацкай прозы, даведацца, да прыкладу, пра што пісалі «рэакцыйныя» пісьменнікі, той жа А. Пшчолка, творчасць якога была малавядомай нават студэнтам-філолагам, ацаніць значэнне малой прозы Ядвігіна Ш., Максіма Гарэцкага і інш.

Даследчык прасачыў, як развівалася беларуская мастацкая проза колькасна і якасна, вылучаючы найбольш знакавыя постаці і даючы іх укладу ў нацыянальную літаратуру грунтоўную ацэнку. К. Хромчанка разглядаў нашаніўскія публікацыі, асобныя кніжныя выданні, не зважаючы на тое, што паводле ацэнак савецкіх ідэолагаў ад літаратуры яны лічыліся нацыяналістычнымі альбо контррэвалюцыйнымі.

Адметна, што праз два гады ў Львове выйшла кніга вядомага ўкраінскага даследчыка літаратуры І. Дэнысюка з падобнай назвай: «Розвиток української малої прози XIX – поч. XX ст.». Зразумела, што К. Хромчанка не мог абыйсці яе маўчаннем. У рэцэнзіі, змешчанай у навуковым часопісе «Веснік БДУ», ён даючы высокую ацэнку працы свайго замежнага калегі, адзначыў: «Сінтэтычна-абагульняючы аспект спалучаецца з дэталёвым аналізам паэтыкі аднаго твора, а ўкраінская навелістыка ў

цэлым разглядаецца ў яе кантактах з рускай, беларускай і зарубежнай» [5, с. 74]. Увогуле ж трэба адзначыць, што беларуска-ўкраінскія літаратурныя ўзаемасувязі займалі асобную старонку навукова-педагагічных зацікаўленняў К. Хромчанкі.

На філалагічным факультэце БДУ яму давялося распрацаваць, па сутнасці, аўтарскі курс – «Літаратура народаў СССР». У канцы 1960-х па гэтай дысцыпліне ніякіх вучэбных дапаможнікаў яшчэ не было выдадзена. Малады выкладчык сабраў і сістэматызаваў матэрыял па літаратурах былога Савецкага Саюза. Слухачы гэтага ўнікальнага курса атрымлівалі магчымасць прасачыць развіццё нацыянальных літаратур народаў Прыбалтыкі, Закаўказзя і Сярэдняй Азіі ад старажытнасці да сучаснасці.

Пасля распаду Савецкага Саюза згаданы курс стаў неактуальным. Паўстала пытанне аб яго замене. У выніку пэўных роздумаў, абмеркаванняў было прынята рашэнне ўвесці ў вучэбныя планы філолагаў-беларусістаў і русістаў новую дысцыпліну – «Літаратура бліжняга замежжа». Паводле канцэпцыі, яна павінна была асвятляць гісторыю развіцця польскай і ўкраінскай літаратур, якія былі тыпалагічна блізкія беларускай, і ў аглядным плане – літаратуру народаў Прыбалтыкі. Зразумела, што займацца распрацоўкай новага курса было даручана К. Хромчанку. Трэба сказаць, што ў сілу аб'ектыўных і суб'ектыўных прычын і ў ранейшыя часы добрую палову курса «Літаратура народаў СССР» займалі лекцыі па гісторыі ўкраінскай літаратуры, таму вялікіх складанасцей пастаўленая задача не выклікала.

Апрача згаданых дысцыплін К. Хромчанка вёў спецсемінар па беларуска-ўкраінскіх літаратурных узаемасувязях і чытаў спецкурс, прысвечаны Тарасу Шаўчэнку. Трэба адзначыць, што даследчык збіраў матэрыялы аб жыцці і творчасці ўкраінскага класіка на працягу ўсяго жыцця. Ён меў унікальныя выданні, якія набываў сам альбо дасылалі сябры з Украіны. Да прыкладу, у яго кніжных зборах было факсімільнае выданне легендарнага рукапіснага альбома Кабзара «Тры леты». Гэты альбом пісаўся не для друку і змяшчаў крамольныя па тым часе вершы і паэмы, у якіх крытыкаваўся царскі рэжым. Менавіта гэты дакумент быў канфіскаваны пры арышце пісьменніка ў 1847 годзе і стаўся найбольш важкім «злачынствам», за якое паэт атрымаў самае строгае пакаранне з усіх кірыла-мяфодзеўцаў (да ліку якіх ён, дарэчы, фармальна не належаў) – безтэрміновую высылку ў салдаты «без права пісаць і маляваць» (уласнаручнае дапаўненне імператара Мікалая I да прысуду паэта).

Дасканалае веданне творчасці Шаўчэнкі, а таксама шматлікіх падрабязнасцей асабістага жыцця ўкраінскага паэта надалі К. Хромчанку аўтарытэт аднаго з вядучых шаўчэнказнаўцаў нашай краіны. Нядзіўна, што менавіта ён стаў аўтарам разгорнутай прадмовы да першай кнігі, якая распачынала выбітную серыю «Скарбы сусветнай літаратуры» – Тарас Шаўчэнка «Вершы. Паэмы» [6, с. 5–20]. Яна ўбачыла свет у 1989 годзе і змяшчала беларускія пераклады вершаў і паэм украінскага Кабзара. К. Хромчанка даволі грунтоўна прасачыў асноўныя вехі творчага шляху ўкраінскага класіка, зрабіўшы акцэнт на яго кантактах з лепшымі сынамі беларускай зямлі – паэтамі, скульптарамі, мастакамі.

Шмат часу і сіл прысвяціў К. Хромчанка даследаванню беларуска-ўкраінскіх літаратурных, культурных узаемасувязей 20-х гадоў XX ст. Сабраны матэрыял змяшчаў інфармацыю пра пераклады твораў мастацкай літаратуры на беларускую і ўкраінскую мовы, іх выданні, творчыя сустрэчы і асабістыя кантакты беларускіх і ўкраінскіх пісьменнікаў – у гэты перыяд яны сапраўды былі надзвычай актыўнымі і плённымі.

На пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя даследчык сістэматызаваў багатую фактуру і атрымаўся даволі ёмісты рукапіс, які несумненна заслугоўваў асобнага выдання. Перамовы з выдавецтвамі былі няпростымі – гэта быў час вострага фінансавага крызісу, таму выдавалася ў асноўным забаўляльная літаратура, якая прыносіла прыбытак, а навуковая адкладвалася на «потым». Так сталася і з рукапісам Хромчанкі. Працу ўзялі да выдання, паставілі ў план на бліжэйшы год, аднак з-за недахопу грошай былі вымушаны перанесці на год наступны, потым зноў на наступны, а ў выніку і ўвогуле забыць на яе.

Тым не менш, сабраны матэрыял ўсё ж пабачыў свет на самым канцы жыццёвай дарогі даследчыка. І хаця К. Хромчанка з 2000 г. не працаваў на філалагічным факультэце БДУ, напярэдадні яго 80-годдзя кіраўніцтва факультэта, ведаючы пра нявыдадзеную кнігу, рашыла зрабіць падарунак свайму заслужанаму ветэрану. Манаграфія была пастаўлена ў план выданняў філалагічнага факультэта на 2009 г.

Аднак прайшло амаль дваццаць год з таго часу, як рыхтаваўся рукапіс. Неабходна было перагледзець сабраны матэрыял, што кольвечы перапрацаваць і, па магчымасці, дапоўніць. На вялікі жаль, здароўе даследчыка пачало імкліва пагаршацца. Ён ужо не мог сам сядзець за сталом, вычытваць і правіць рукапіс. На дапамогу бацьку прыйшла дачка Галіна, якая працавала на той час выкладчыкам беларускай мовы на тым жа філалагічным факультэце. Яна прыгадвала пазней, што праца над кнігай надавала сіл і чароўным чынам перамяняла бацьку. Ён уважліва слухаў, як дачка чытае тэкст і на слых правіў стыль, удакладняў факты, якія памятаў, альбо загадваў паглядзець іх у сваіх запісах ці даведніках.

Манаграфія «Скрыжаванні шляхоў адраджэння: беларуска-ўкраінскія літаратурныя ўзаемасувязі 20–30-х гадоў XX стагоддзя» выйшла з друку літаральна за некалькі тыдняў да смерці аўтара [7]. Кузьма Рыгоравіч ужо амаль увесь час ляжаў непрытомны, але ў адну з рэдкіх хвілін ледзь прыкметнага абуджэння Галіна на хвілінку ўлажыла яму ў рукі яго апошнюю кнігу. Так, завяршаючы сваю жыццёвую дарогу, ён здолеў перадаць нашчадкам плён сваёй руплівай шматгадовай працы. Яго старанні не прапалі марна. Кнігі К. Хромчанкі многія і многія гады будуць служыць наступным пакаленням даследчыкаў роднай літаратуры.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Хромчанка К. Р.* Беларуская мастацкая проза (канец XIX – пачатак XX ст.). Мінск: БДУ, 1979.

2. *Хромчанка К. Р.* Вернасць жыццёвай праўдзе // Пестрак П. Апавяданні. Мінск : Народная асвета, 1970. С. 3–14.

3. *Хромчанка К. Р.* Водгалас зведанага і перажытага // Пестрак П. Збор твораў. У 5-ці т. Т. 1. Вершы, апавяданні, аповесці. Мінск : Мастацкая літаратура, 1984. С. 6–22.

4. *Хромчанка К. Р.* Піліп Пестрак: Жыццё і творчасць. Мінск: выд. Акадэміі навук, 1960.

5. *Хромчанка К. Р.* Рэц. на кн.: Розвиток українськоі малоі прози XIX – поч. XX ст. / І. О. Денисюк. Київ : Вища школа, 1981. // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Серыя 4. Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. Псіхалогія. 1983. № 2. С. 73–74.

6. *Хромчанка К. Р.* Свабоды і дружбы народаў пясняр // Вершы. Паэмы: пераклад з украінскай Тарас Шаўчэнка. Мінск : Мастацкая літаратура, 1989. С. 5–20.

7. *Хромчанка К. Р.* Скрыжаванні шляхоў адраджэння: беларуска-ўкраінскія літаратурныя ўзаемасувязі 20–30-х гадоў XX стагоддзя. Мінск: Выд. БДУ, 1987.

# РАЗДЗЕЛ 4

# СЛАВЯНСКІ ФАЛЬКЛОР, МІФАЛОГІЯ І ІХ АСЭНСАВАННЕ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

## ТАПАНІМІЧНАЯ НАРОДНАЯ ПРОЗА ЯК АБ'ЕКТ ДАСЛЕДАВАННЯ Ў КАНТЭКСЦЕ ФАЛЬКЛАРЫСТЫКІ І ТАПАНІМІКІ[1]

**Т. М. Аліферчык**

*Кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі,*
*вул. Сурганава, 1, корп. 2, 220072, г. Мінск, Беларусь,*
*tan1olif@gmail.com*

Даследуюцца тапанімічныя тэксты як аб'ект вывучэння ў межах фальклярыстыкі і ў межах тапанімікі. Для фальклярыстыкі тапанімічная народная проза актуальная як прыклад трансфармацыі гісторыі ў народнай свядомасці. У межах тапанімікі тапанімічныя тэксты з'яўляюцца важнай крыніцай інфармацыі аб матывацыі і этымалогіі (у тым ліку народнай этымалогіі) онімаў.

***Ключавыя словы:*** фальклярыстыка; анамастыка; тапаніміка; тапанімічная народная проза; тапанімічныя тэксты.

## ТОПОНИМИЧЕСКАЯ НАРОДНАЯ ПРОЗА КАК ОБЪЕКТ ИССЛЕДОВАНИЯ В КОНТЕКСТЕ ФОЛЬКЛОРИСТИКИ И ТОПОНИМИКИ

**Т. М. Олиферчик**

*Кандидат филологических наук, доцент,*
*Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы НАН Беларуси,*
*ул. Сурганова, 1, корп. 2, 220072, г. Минск, Беларусь,*
*tan1olif@gmail.com*

Исследуются топонимические тексты как объект изучения в пределах фольклористики и в пределах топонимики. Для фольклористики топонимическая народная проза актуальна как пример трансформации истории в народном сознании. В пределах топонимики топонимические тексты являются важным источником информации о мотивации и этимологии (в том числе народной этимологии) онимов.

***Ключевые слова:*** фольклористика; ономастика; топонимика; топонимическая народная проза; топонимические тексты.

---

[1] Артыкул падрыхтаваны ў межах праекта БРФФД Г23ИП-031 "Тапанімічная народная проза ў сістэме этнакультурнай спадчыны беларусаў: гістарычная памяць, жанравы склад, сюжэты і вобразы".

# TOPONYMIC FOLK PROSE AS AN OBJECT OF RESEARCH IN THE CONTEXT OF FOLKLORISTICS AND TOPONYMY

**T. M. Aliferchyk**

*PhD, Ass. Professor,*
*Center for Belarusian Culture, Language and Literature researches*
*of the National Academy of Sciences of Belarus,*
*1/2 , Surganava str., 220072, Minsk, Belarus,*
*tan1olif@gmail.com*

In the article, the author examines toponymic texts as an object of research in the context of folkloristics and toponymy. Toponymic folk prose is relevant for folkloristics as an example of the transformation of history in people's consciousness. Within toponymy, toponymic texts are an important source of the motivation and etymology (including folk etymology) of onyms.

***Keywords:*** folkloristics; onomastics; toponymy; toponymic folk prose; toponymic texts.

Тапанімічная народная проза – гэта фальклорныя творы, якія тлумачаць паходжанне назваў населеных пунктаў, урочышчаў, іншых геаграфічных аб'ектаў. Да такіх тэкстаў адносяцца тапанімічныя паданні (легенды) і тапанімічныя/намінатыўныя паведамленні (кароткія звесткі інфармантаў, якія тлумачаць паходжанне назвы альбо апісваюць дэнатат). Як адзначае Н. Шкляева, «дэталёвы разгляд тэкстаў народных апавяданняў на тапанімічную тэматыку, акрэсленых паняццем народная тапанімічная проза, пераконвае ў тым, што сярод іх трапляюцца як сюжэтныя (фабулаты), так і бессюжэтныя (хранікаты) паведамленні» [1, с. 15].

Для тапанімічных паданняў як паўнацэнных фальклорных твораў актуальнымі з'яўляюцца паэтыка, сістэма вобразаў, спецыфіка іх адлюстравання, адпаведнасць гістарычным падзеям, светапоглядная сістэма ў цэлым. Некаторыя адзначаныя аспекты ўжо былі даследаваны беларускімі навукоўцамі, напр., К. П. Кабашнікавым [2], А. В. Цітаўцом [3] і інш. Асабліва важны аспект тапанімічнай народнай прозы – «народная гісторыя», г. зн. трансфармацыя ў народнай свядомасці гісторыі і яе новае «прачытанне»/канструяванне ў фальклорных тэкстах з адсылкай да канкрэтнага геаграфічнага аб'екта. Пры гэтым тапанімічныя паведамленні застаюцца па-за ўвагай даследчыкаў-фалькларыстаў, але з'яўляюцца надзвычай важнай крыніцай матывацыі і этымалогіі онімаў для тапанімістаў. Таму, відавочна, даследаванне тапанімічных тэкстаў патрабуе міждыцыплінарнага падыходу.

У артыкуле ў большай ступені ўвага скіравана на тапанімічныя паведамленні, паколькі менавіта яны не даследаваліся ні ў кантэксце фалькларыстыкі, ні ў кантэксце тапанімікі. Для фалькларыстыкі такія тэксты не ўяўляюць каштоўнасці, паколькі не з'яўляюцца паўнацэннымі фальклорнымі творамі. У межах анамастыкі зварот да тапанімічных паведамленняў з'яўляецца спарадычным, паколькі прадстаўленая ў іх версія этымалогіі можа быць інтэрпрэтавана як народная і звычайна патрабуе верыфікацыі. Пры гэтым тапанімічныя паведамленні з'яўляюцца надзвычай важнай крыніцай для выяўлення матывацыі онімаў і іх матывавальнай асновы.

Па-першае, у радзе выпадкаў тапанімічныя паведамленні ўтрымліваюць дыялектны матэрыял, што дазваляе рэканструяваць семантыку старажытных лексем,

якія для тапонімаў з'яўляюцца матывавальнымі асновамі. У беларускай мікратапаніміі адзначаны наступныя адзінкі:

*Галя* – балота. *Галя* – вялікае балото (Дзяніскавічы Ганц. Бр.), *Галяй* называюць вялікае балота (Гічыцы Івац. Бр.), *Галь* – балота. Чыстае, бязлеснае (Глінная Івац. Бр.; Заполле Івац. Бр.).

Звесткі інфармантаў, у якіх адзначана дакладная характарыстыка геаграфічнага аб'екта, даюць неабходны кірунак для этымалагізацыі:

*Га́ліва* – палянка ў лесе. *Паміж лесу прастор вялікі* (Бакшты Іўеўск. Гр.), *Галы́* – поле. *Кагда-та лес быў, вада стаяла, мох рос і куп'ё было, цяпер поле* (Рудня Астравітая Чэрв. Мн.), *Галы́* – поле, дзе раней было балота (Белавічы Бярэз. Мн.), *Га́лэ* – поле, дзе раней было балота (Ушкавіца Кобр. Бр.).

Пры такой характарыстыцы ў якасці матывавальнай асновы можна меркаваць дыялектную лексему *галь/гала/гало/галы*: *галь* 'голае, даступнае вятрам месца' [4, с. 49], *галя*/*галь* 'свабодная прастора, месца без высокай расліннасці', *гало* 'гала, адкрытая бязлесная прастора' [5, т. 1, с. 192], *галь* 'гала, чыстая бязлесная прастора' [5, т. 1, с. 193], *га́ла, га́ло, га́ля* 'паляна сярод лесу', 'рэдкалессе', 'балота', 'пагорак сярод поля, агарода' [6, т. 1, с. 406], *гал* 'палянка ці з рэдкай расліннасцю прастора ў лесе, на балоце' [7, с. 44], *га́ла* 'паляна, вялікае адкрытае месца сярод лесу' (тое ж *га́ло́*), *га́ла* 'шырокая балотная сенажаць без зарасніку ці з асобнымі кустамі, дрэвамі', 'куп'істая балотная сенажаць сярод лесу', 'чыстае, адкрытае месца; свабодная прастора' [7, с. 44] і інш.

Прычым нават на ўзроўні дыялектнай лексемы, якая выступае таксама ў якасці народнай геаграфічнай тэрміналогіі, назіраюцца змены ў семантыкі: *галь*/*гала* – у першую чаргу 'свабодная прастора (без расліннасці)', семантычная прыкмета 'балота/балоцістая мясцовасць' неабавязковая, але нават у выпадку яе наяўнасці семантыка 'свабодная, адкрытая мясцовасць' таксама адзначаецца.

Каментары інфармантаў адносна дэнататаў вызначаюць кірунак этымалагізацыі ніжэй адзначаных мікратапонімаў і дазваляюць узнавіць старажытную лексему **гвозд'*, якая на сучасным этапе зрэдку сустракаецца ў дыялектах:

*Гвоздзе́ц* – востраў сярод балота, ніўкі на ім, цяпер лес (Вяда Івац. Бр.), *Гваздо́к* – лес, балота (Козікі Івац. Бр.), *Гваздо́к* – лес (Уласаўцы Івац. Бр.), *Гвозніца* – лес, поле, сенажаць (Дзераўная Стаўбц. Мн.), *Гвозцы* – урочышча (Вець Бых. Маг.), *Гваздзе́ц* – груд сярод балота (Жытлін Івац. Бр.), *Гвосца* – сенажаць і лес (Чудзін Ганц. Бр.), *Гваздовы лес* – лес (Кавалі Слон. Гр.), *Гвоздзева* – лес (Дакудава Лід. Гр.).

У адзначаных тэкстах асноўнай семантычнай прыкметай з'яўляецца 'лес', часткова 'балота', а выпадкі іменавання *Гвоздзь*/*Гвозніца* ў адносінах да сенажаці/поля тлумачыцца хутчэй трансанімізацыяй (пераходам назвы геаграфічнага аб'екта на суседні). Семантыку 'лес' для старажытнага апелятыва *гвоздзь* адзначае таксама М. І. Талстой, гл. падрабязна [8, с. 61–64].

У некаторых выпадках даследаванне менавіта тапанімічных паведамленняў дазваляе ўстанавіць матывацыю онімаў, для якіх яна не відавочная. Разгледзім для прыкладу онімы, матываваныя апелятывам *двор*:

*Двор* – поле (Альхоўка Навагр. Гр.), *Двір* – поле (Сухоўчыцы Кобр. Бр.), *Дворнае* – поле (Жыгалкі Стаўбц. Мн.), *Дворны лес* – лес (Літва Стаўбц. Мн.), *Дворны*

*сад* – урочышча (Матырына Леп. В.), *Дворны сад* – урочышча (Цотава Чашн. В.), *Дворыска* – урочышча (Сувіды Камар. Гом.), *Дворышча* – поле (Старына Стаўбц. Мн.), *Дворышча* – урочышча (Чудзяны Крыч. Маг.).

Тапанімічныя паведамленні для мікратапонімаў тыпу *Двор, Двір, Двыр, Двірська* (з улікам дыялектных фанетычных асаблівасцяў) дазваляюць дакладна ўстанавіць этымалогію такіх адзінак:

*Двірьска* – поле. У мінулым панская зямля (Субаты Драг. Бр.), *Двірські ліс* – лес, які калісьці належыў пану (Субаты Драг. Бр.), *Двыр* – урочышча, дзе быў маёнтак (Гошава Драг. Бр.), *Двор* – месца былога маёнтка (Скідзель Гр.), *Дворышча* – поле, дзе быў маёнтак (Жоўніна Пін. Бр.), *Дваровы лес* – частка лесу (тут быў панскі маёнтак) (Гербелевічы Дзятл. Гр.), *Дварцы́* – урочышча, хутар (Верцялішкі Гродз. Гр.), *Двор* – хутар (тут жыў пан) (Павіланцы Воран. Гр.), *Дворна дарога* – дарога да былога панскага двара (Сурвілішкі Іўеўск. Гр.), *Дворна* – паша (былы панскі двор) (Чэхайцы Іўеўск. Гр.), *Дворна кудра* – кудра (былы панскі двор (Тэлькаўшчына Іўеўск. Гр.), *Дворна поле* – поле (належала да панскага двара) (Вялікая Нявіша Шчуч. Гр.), *Дворнае* – поле (былы панскі двор) (Каргаўды Воран. Гр.), *Дворнае* – частка вуліцы (Азёры Гродз. Гр.), *Дворная паша* – паша (каля былога панскага двара) (Чаплічы Лід. Гр.), *Дворная сажалка* – сажалка (на былым панскім двары) (Мілашэвічы Слон. Гр.), *Дворня* – крыніца (на лузе каля былога панскага двара) (Вішнеўка Зэльв. Гр.), *Дворня* – частка поля (былы панскі двор) (Амбілеўцы Шчуч. Гр.), *Дворыска* – агароды (былы панскі двор) (Востава Смаст. Гр.), *Дворышча* – сенажаць (былы панскі двор) (Сухінічы Маст. Гр.).

З тапанімічных паведамленняў відавочна, што матывацыя онімаў з асновай *двор* мяркуе прыналежнасць (у мінулым) зямлі альбо сядзібы пану, параўн., напр, *двор* ‘дом (у тым ліку і з рознымі гаспадарчымі пабудовамі). палац, харомы’, ‘асобная сельская гаспадарка’, ‘панскі, скарбовы, шляхецкі маёнтак’,‘ніжэйшая адміністрацыйная адзінка’, ‘двор, участак зямлі пры доме, абгароджаны плотам ці сценамі будынкаў’ і інш. [9, с. 293]. Гэтыя ж паняцці для *двара* адзначаны і ў «Этнаграфіі Беларусі»: ‘комплекс жылых і гаспадарчых пабудоў; тое, што і сядзіба’, ‘участак зямлі пры хаце, доме, абгароджаны плотам ці сценамі будынкаў’, ‘у феадальны перыяд двор, або дым, – асобная гаспадарка, якая абкладалася падаткамі і павіннасцямі’, ‘памесце, маёнтак (пашыраны са старажытнасці, належалі вялікаму князю, магнатам, шляхце, зямянам, баярам)’ [10, с. 168]. У апошнім выпадку на тэрыторыі двара стаялі вялікакняжацкі (панскі) дом, флігелі, стайні, вазоўні, свірны, аборы, лазня, скарбніца і інш. Каля большасці двароў існавалі асобныя фальваркі [10, с. 168].

З улікам тапанімічных паведамленняў, для онімаў тыпу *Двор, Дварэц, Дворышча, Дворня* і пад. найбольш верагоднай падаецца этымалогія ад *двор* ‘панскі, скарбовы, шляхецкі маёнтак’.

Тапанімічныя паведамленні з’яўляюцца адзінай крыніцай вызначэння відаў матывацыі мікратапонімаў, матывавальная аснова якіх не адносіцца да антрапонімаў або ландшафтных апелятываў (якія адлюстроўваюць найбольш пашыраныя ў тапаніміі адантрапанімічную і ланшафтную мадэлі намінацыі). Фактычна толькі на падставе тапанімічных тэкстаў можна вызначыць спецыфіку падзейнай і вобразнай матывацыі, якая ляжыць у аснове вобразных/прэцэдэнтных мікратапонімаў.

*Нага* – поле, якое нагадвае нагу (Бабровічы Івац. Бр.), *П’ята* – сенажаць, якая мае форму пяты (Галоўчыцы Драг. Бр.), *П’ята* – пасвыско (пуд граніцэю, далёко)

(Залядынне Іван. Бр.), *Шэя* – нізіна вузкая ў лесе (Субаты Драг. Бр.), *Шыі* – протяжное місце (Махро Іван. Бр.), *Талерка* – гара з гладкім кругам, як талерка, кажуць, што там цэркаў была і патанула (Беразіно Докш. Віц.), *Вылы* – лес, які мае форму віл (Юнішча Стол. Бр.), *Топорэц* – поле, якое па форме нагадвае сякеру (Бабровічы Івац. Бр.), *Ілынскэ* – поле, на якім усё вымакае (ад Ілья – у народзе бог дажджу – інфарм.; Галоўчыцы Драг. Бр.), *Пытрывкы* – сенажаць, якую звычайна касілі пасля Пятра – 12 ліпеня (Галоўчыцы Драг. Бр.), *Сібір* – поле вельмі далёкае і неўрадлівае (Градкі Стаўбц. Мін.), *Сібір* – поле на поўнач ад вёскі (Саланое Віл. Мін.), *Сівастóпіл* – балота маленькае (Паяці Мёр. В.), *Гéто* – сенажаць. *З аднаго боку рака, з двух другіх старон канавы і толькі адзін уезд. Пастаў вартавога – вось табе і гето* (Халоркі Івац. Бр.), *Гета* – поле (Бакшты Шчуч. Гр.), *Гета* – паша (абгароджаная) (Мілашэвічы Слон. Гр.), *Гета* – частка вёскі (Накрышкі Дзятл. Гр.), *Гібá* – забалочаны лес. *Там ёсьць глыбокая ўпадзіна, якая ўбірала ў сябе сьцёкі дзьвюх рачулак, утвараючы глыбокія, гіблыя вадзяныя стублы* (Турная Івац. Бр.; Жытлін Івац. Бр.), *Золотэ дно* – бухта р. Гарынь, дзе зімуе вялікая колькасць рыбы (Столін Бр.).

Адзначаныя тапанімічныя паведамленні дазваляюць рэканструяваць вобразную мадэль тапанімічнай намінацыі, якая адлюстроўвае архаічнае светаўспрыняцце і мадэль намінацыі па падабенстве (да цела чалавека, да побытавых прадметаў, прадметаў адзення і г. д.). Уласна, выключна на падставе тапанімічных тэкстаў у гэтым выпадку можна даследаваць вобразы і сферы атаясамлення, якія адлюстраваны ў мікратапаніміі.

Такім чынам, тэксты тапанімічнай народнай прозы з'яўляюцца важнай крыніцай інфармацыі і аб'ектам міждысцыплінарнага даследавання і ў галіне фальклярыстыкі, і ў галіне анамастыкі.

Асноўная ўвага фальклярыстаў надаецца даследаванням жанравай спецыфікі такіх твораў, уключанасці ў гістарычную прозу, сюжэтам і вобразам, "народнай гісторыі", адлюстраванай у іх. Тапанімічныя паданні адрозніваюцца рысамі міфалагічнага і канкрэтна-гістарычнага асэнсавання існасці. Гістарычная рэальнасць і яе міфалагізацыя ў тапанімічных паданнях з'яўляюцца надзвычай важнымі ў навуковых даследаваннях. Верыфікацыя часта адбываецца на падставе супастаўлення сістэмы вобразаў і спецыфікі адлюстравання гісторыі ў тапанімічных (і не толькі) паданнях з гістарычнымі, археалагічнымі і ўласна моўнымі данымі.

Для тапанімікі як раздзела анамастыкі тэксты тапанімічнай прозы ўяўляюць каштоўнасць перш за ўсё як крыніца матывацыі і этымалогіі тапонімаў. Аднак асцярожнасць да тапанімічных паведамленняў як крыніцы інфармацыі аб паходжанні онімаў, відавочна, тлумачыцца наяўнасцю народнай этымалогіі ў іх, якая развіваецца па розных прычынах. Як слушна адзначае М. Антропаў, «народная этымалогія звычайна разумеецца як моўная з'ява, сутнасць якой у тым, што этымалагічна ізаляваныя, непразрыстыя, г.зн. без т.зв. "унутранай" формы словы, часцей за ўсё запазычаныя (радзей родныя) рэматывуюцца – атрымліваюць семантычную матывіроўку, набываючы, такім чынам, унутраную форму на падставе знешняга гукавога супадзення з сугучнымі іншымі словамі; іх сапраўднае паходжанне пры гэтым не ўлічваецца…» [10]. Асновай народнай этымалогіі для мікратапонімаў і айконімаў можна лічыць фанетычнае збліжэнне оніма (нават з празрыстай унутранай формай) з іншым (звычайна фанетычна сугучным) словам. Пры гэтым фальклорная рэматывацыя ўзнікае на этапе разгортвання тэкста/паведамлення да наратыва, якім і з'яўляецца

тапанімічнае паданне. Тэксты з разгорнутым сюжэтам, як правіла, функцыянуюць у адносінах да назваў населеных пунктаў – аб'ектаў большай значнасці ў арганізацыі прасторавых адносін, чым невялікія, часцей за ўсё гаспадарчыя ўчасткі.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Шкляєва Н. В. Народна топонімічна проза Західного Полісся: синхронічний аспект : автореферат дисертації на здобуття наукового ступеня кандидата філологічних наук : 10.01.07 / Шкляєва Наталія Володимирівна ; Львівський національний університет ім. І.Франка Львів, 2005.
2. Кабашнікаў К. П. Жанравы склад беларускай народнай прозы // Народная проза / К. П. Кабашнікаў, А. С. Фядосік, А. В. Цітавец ; нав. рэд. А. С. Ліс. Мінск : Беларуская навука, 2002. С. 72–88.
3. Цітавец А. В. Тапанімічныя паданні ў кантэксце няказкавай фальклорнай традыцыі // Народная проза / К. П. Кабашнікаў, А. С. Фядосік, А. В. Цітавец ; нав. рэд. А. С. Ліс. Мінск : Беларуская навука, 2002. С. 491–503.
4. Народная лексіка / Рэд. А. А. Крывіцкі, Ю. Ф. Мацкевіч. Мінск : Навука і тэхніка, 1977.
5. Тураўскі слоўнік. У 5-ці т. / А. А. Крывіцкі, Г. А. Цыхун, І. Я. Яшкін, П. А. Міхайлаў, Т. П. Трухан. Мінск : Навука і тэхніка, 1982–1987.
6. Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча: у 5 т. / Акадэмія навук Беларускай ССР, Інстытут мовазнаўства імя Я. Коласа. Мінск : Навука і тэхніка, 1979–1986.
7. Яшкін І. Я. Беларускія геаграфічныя назвы. Тапаграфія. Гідралогія / І. Я. Яшкін ; рэд. М. В. Бірыла. Мінск : Навука і тэхніка, 1971.
8. Толстой Н. И. Славянская географическая терминология. Семасиологические этюды. М. : Наука, 1969.
9. Гістарычны слоўнік беларускай мовы. Вып. 7 / Склад. Т. І. Блізнюк і інш., рэд. А. М. Булыка. Мінск : Навука і тэхніка, 1986.
10. Этнаграфія Беларусі: энцыкл. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.). [і інш.]. Мінск : БелСЭ, 1989.
11. Антропаў М. Народная этымалогія // Міфалогія беларусаў : энцыкл. Слоўнік / Склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка; нав. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. Мінск : Беларусь, 2011. С. 567.

# ПЕРАКЛАД КІТАЙСКАЙ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ НА БЕЛАРУСКУЮ МОВУ: НАБЫТКІ І ПЕРСПЕКТЫВЫ

**Гао Жуй**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр-т Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь,*
*gaor70702@gmail.com;*
*Навуковы кіраўнік – кандыдат філалагічных навук, дацэнт Л. В. Алейнік*

Разглядаецца гісторыя перакладаў кітайскай мастацкай літаратуры на беларускую мову. Адзначаецца, што ў мінулым стагоддзі пэўная актывізацыя ўвагі да кітайскай літаратуры ў Беларусі назіралася ў 1950–1960 гады, калі ўзмацніліся сяброўскія сувязі паміж СССР і КНР. У першыя дзесяцігоддзі XXI стагоддзя колькасць перакладаў з кітайскай мовы на беларускую беспрэцэдэнтна павялічылася. Выяўляецца, што галоўным аб'ектам увагі перакладчыкаў зрабіліся паэтычныя творы кітайскіх мастакоў слова. Сцвярджаецца, што ўзоры прозы сучасных кітайскіх пісьменнікаў, сярод якіх лаўрэаты прэстыжных нацыянальных і міжнародных прэмій, у тым ліку Нобелеўскай прэміі, таксама з'яўляюцца падставовымі тэкстамі для перакладу на беларускую мову. Магчымасць прачытаць кітайскую мастацкую літаратуру на роднай мове – гэта каштоўны вопыт для беларусаў, які пашырае веды, дазваляе асэнсаваць менталь-насць кітайскага народа і ўмацоўвае міжкультурныя сувязі.

***Ключавыя словы:*** кітайская мастацкая літаратура; нацыянальная традыцыя; пераклад; міжкультурныя сувязі; менталітэт.

# ПЕРЕВОД КИТАЙСКОЙ ХУДОЖЕСТВЕННОЙ ЛИТЕРАТУРЫ НА БЕЛОРУССКИЙ ЯЗЫК: ПРИОБРЕТЕНИЯ И ПЕРСПЕКТИВЫ

**Гао Жуй**

*Белорусский государственный университет,*
*пр-т Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь,*
*gaor70702@gmail.com;*
*Научный руководитель – кандидат филологических наук, доцент Л. В. Олейник*

Рассматривается история переводов китайской художественной литературы на белорусский язык. Отмечается, что в прошлом веке определенная активизация внимания к китайской литературе в Беларуси наблюдалась в 1950–1960 годы, когда усилились дружеские связи между СССР и КНР. В первые десятилетия XXI века количество переводов с китайского языка на белорусский беспрецедентно увеличилось. Оказывается, что главным объектом внимания переводчиков стали поэтические произведения китайских художников слова. Утверждается, что образцы прозы современных китайских писателей, среди которых лауреаты престижных национальных и международных премий, в том числе Нобелевской премии, также являются основательными текстами для перевода на белорусский язык. Возможность прочитать китай-

скую художественную литературу на родном языке – это ценный опыт для белорусов, который расширяет знания, позволяет осмыслить ментальность китайского народа и укрепляет межкультурные связи.

***Ключевые слова:*** китайская художественная литература; национальная традиция; перевод; межкультурные связи; менталитет.

## TRANSLATION OF CHINESE FICTION LITERATURE INTO BELARUSIAN LANGUAGE: ACQUISITIONS AND PROSPECTS

**Gao Zui**

*Belarusian State University,*
*4 Independence Avenue, 220030, Minsk, Belarus,*
*gaor70702@gmail.com;*
*Supervisor – PhD, Ass. Professor L. V. Aleinik*

The article examines the history of translations of Chinese fiction into Belarusian. It is noted that in the last century, a certain activation of attention to Chinese literature in Belarus was observed in the 1950s and 1960s, when friendly ties between the USSR and the People's Republic of China strengthened. In the first decades of the 21st century, the number of translations from Chinese into Belarusian increased unprecedentedly. It turns out that the main object of translators' attention was the poetic works of Chinese word artists. It is claimed that samples of prose by modern Chinese writers, among whom are laureates of prestigious national and international prizes, including the Nobel Prize, are also basic texts for translation into Belarusian. The opportunity to read Chinese fiction in the native language is a valuable experience for Belarusians, which expands knowledge, allows one to understand the mentality of the Chinese people and strengthens intercultural ties.

***Keywords:*** Chinese fiction; national tradition; translation; intercultural relations; mentality.

Вывучэнне гісторыі перакладаў і выданняў кітайскіх літаратурных твораў у Беларусі выяўляе, што ў XX стагоддзі сярод вялікай разнастайнасці кніг, якія выдаваліся ў краіне, сфера літаратурнага перакладу была прадстаўлена дастаткова сціпла. Пэўная актывізацыя ўвагі да кітайскай літаратуры назіралася толькі ў 1950–1960 гады, калі ўзмацніліся сяброўскія сувязі паміж СССР і КНР. На гэты час прыходзяцца публікацыі некаторых паэтычных зборнікаў і асобных празаічных твораў кітайскіх пісьменнікаў. «Пераклады рабіліся зазвычай з ужо зробленых раней рускіх перастварэнняў, рэдка з падрадкоўнікаў. Паасобныя творы кітайскіх пісьменнікаў перакладалі М. Танк, М. Аўрамчык, У. Дубоўка, В. Вітка, А. Русецкі, С. Дзяргай, А. Бачыла, К. Кірэенка, С. Міхальчук і шэраг іншых пісьменнікаў. Нізку вершаў кітайскага паэта Ду Фу пераклаў Янка Сіпакоў. Перакладаліся нават раманы: "Сонца над ракой Сангань" Дзін Ліна, "Перад світаннем" Мао Дуня, "Ураган" Чжоу Лі Бо"» [1, с. 57].

У першыя дзесяцігоддзі XXI стагоддзя колькасць перакладаў з кітайскай мовы на беларускую значна павялічылася – сярод іх ёсць працы эканамічнага, культуралагічнага, гістарычнага і сацыяльна-палітычнага зместу (напрыклад, вядомая праца лідэра кітайскай дзяржавы «Сі Цзіньпін аб дзяржаўным кіраванні» [2]), і непасрэдна літаратурныя творы.

У 2014 г. Выдавецкім домам «Звязда» і выдавецтвам «Мастацкая літаратура» па ініцыятыве Міністэрства інфармацыі Беларусі быў заснаваны праект «Светлыя знакі: паэты Кітая», у межах якога выйшлі зборнікі паэзіі выбітных кітайскіх мастакоў слова ў перакладах знакамітых беларускіх паэтаў. Лі Бо, Ду Фу, Су Шы, Ай Цін, Ван Вэй, Лі Хэ, Мэн Хаажань, Лі Цінчжаа, Ван Гачжэнь і шматлікія іншыя творцы загаварылі па-беларуску. Выключна складаную творчую працу зрабілі сучасныя беларускія паэты Мікола Мятліцкі, Навум Гальпяровіч, Алесь Бадак, Леанід Дранько-Майсюк, Рагнед Малахоўскі, Таццяна Сівец і іншыя майстры паэтычнага слова.

З перакладамі на беларускую мову кітайскай прозы справа іншая. Перакладаюцца пераважна асобныя невялікія творы, якія друкуюцца ў бягучай літаратурнай перыёдыцы і ў разнастайных літаратурна-мастацкіх альманахах. Прадстаўнічых узораў прозы, перакладзеных з кітайскай мовы на беларускую ў першыя дзесяцігоддзі XXI ст., фактычна не сустракаецца.

Між тым, сярод сучасных кітайскіх празаікаў – лаўрэаты прэстыжных нацыянальных і міжнародных прэмій, іх творы перакладаюцца на шматлікія замежныя мовы. Сусветную вядомасць атрымалі Хань Шаагун, Янь Лянькэ, Дэн Игуан, Лю Хэн, Шань Са і іншыя аўтары, іх кнігі карыстаюцца вялікай увагай чытачоў розных нацыянальнасцей.

У 2012 г. лаўрэатам Нобелеўскай прэміі па літаратуры стаў кітайскі пісьменнік Мо Янь. Шведская акадэмія абгрунтавала ўзнагароду наступным чынам: за «галюцынаторны рэалізм, які аб'ядноўвае народныя казкі з гісторыяй і сучаснасцю» [3]. Гэтая высокая ўзнагарода, якую ўпершыню атрымаў пісьменнік кітайскага паходжання, ва ўсім свеце павялічыла цікавасць не толькі да творчасці самога аўтара, але і да ўсёй кітайскай літаратуры. Папулярнасць твораў пісьменніка ўзрасла нават непасрэдна ў Кітаі: многія чытачы адкрылі для сябе гэтага выбітнага мастака слова, які валодае сапраўдным талентам апавядальніка; кнігі Мо Яня пачалі вывучаць і даследаваць кітайскія літаратуразнаўцы, культуролагі. На бягучы момант творы Мо Яня перакладзены і выдадзены ў розных краінах свету больш чым на чатырох дзясятках замежных моў.

Для старэйшага пакалення кітайцаў, якія жылі ў эпоху ўсталявання і развіцця дыпламатычных сувязяў паміж КНР і СССР, увага да творчасці іх суайчынніка з боку сучасных расійскіх масмедыя мае асабліва вялікае значэнне. Магчымасць выдаваць свае творы на рускай мове і распаўсюджваць іх у краінах былога СССР не менш важнай з'яўляецца для самога Мо Яня, бо мастацкая літаратура ўмацоўвае і пашырае міжкультурны дыялог, садзейнічае ўзаемаразуменню людзей, што ў эпоху глабалізацыі з'яўляецца надзвычай актуальным.

Упершыню рускамоўная версія рамана Мо Яня «Краіна віна» [4] была выдадзена ў Расіі ў 2012 годзе. За дванаццаць год, якія мінулі з таго часу, выйшла з друку яшчэ

пяць кніг Мо Яня на рускай мове: «Жабы» [5], «Смерць пахне сандалам» [6], «Вялікія грудзі, шырокі зад» [7], «Сорак адна хлапушка» [8]. Беларусы, на жаль, могуць прачытаць творы Мо Яня толькі на рускай мове.

Унікальны стыль Мо Яня, у якім ён спалучае гісторыю і сучаснасць, казачную рэальнасць і рэалістычную карціну свету, выяўляе лад жыцця, звычаі і характары яго народа. Кнігі пісьменніка здольны даць чытачам даволі грунтоўнае ўяўленне пра культуру Кітая, пра менталітэт народа. Сёння, калі стратэгічнае партнёрства паміж Кітаем і Беларуссю развіваецца паспяхова і дынамічна, супрацоўніцтва ў галіне адукацыі і культуры паміж дзвюма краінамі з'яўляецца вельмі важнай часткай партнёрства, а літаратуры дзвюх краін маюць патрэбу ва ўзаемаабмене і вывучэнні. Адпаведна ўзрастаюць патрабаванні да якасці перакладаў мастацкіх узораў Мо Яня, якая вымагае пільнасці і дакладнасці.

Зборнік эсэ Мо Яня «Спеўная сцяна» [9] яшчэ не перакладзены на рускую мову. Гэтая кніга вельмі паказальная для прозы мастака, творчай манеры якога ўласцівы зварот да магічнага рэалізму. Для выяўлення сувязі вуснай народнай творчасці і гісторыі з сучаснасцю пісьменнік арганічна спалучае ў сваіх творах уласны вопыт, творчую фантазію і па-мастацку перапрацаваныя народныя легенды. Пісьменнік, які нарадзіўся ў сям'і заможных сялян у воласці Далань уезду Гаомі правінцыі Шандунь, дзеянні ўсіх сваіх кніг разгортвае менавіта ў гэтай мясцовасці, дзе прайшло яго дзяцінства і станаўленне. Паводле меркавання літаратуразнаўцы М. В. Заўялавай, кожны твор Мо Яня заслугоўвае пільнай увагі: не толькі раманы, але і апавяданні, «бо кожнае з іх уяўляе сабой кароткі этнаграфічны і этнапсіхалагічны экскурс у жыццё кітайскага народа» [10, с. 640].

Кніга «Спеўная сцяна» стварае адчуванне, што аўтар гутарыць з намі сам-насам і распавядае гісторыю, якая развіваецца няспешна і спакойна, як павольна цячэ свежая крыніца, але пакідае след у свядомасці чытача і схіляе яго да філасофскіх рэфлексій. Дзеля выяўлення асаблівасцей мастацкага перакладу з кітайскай мовы на беларускую, звернемся да цэнтральнага эсэ кнігі, якое мае трагедыйны пафас, і ў перакладзе ён павінен быць захаваны. Аўтабіяграфічны характар мастацкага тэксту абавязвае гэтаксама да захавання логікі мыслення пісьменніка.

Найперш варта звярнуць увагу на будову сказаў, лексічнае значэнне слоў і іх парадак. Для прыкладу разгледзім наступную фразу:

不说话使人处在一种相互理解的和谐气氛中，避免了过分的亲昵也避免了争斗，人与人之间的关系拉上了一层透明的帷幕，由于有了这层帷幕，彼此反倒更深刻地记住了对方的容貌。

Даслоўны пераклад гэтага сказа на беларускую мову:

«Маўчанне дазваляе людзям знаходзіцца ў гарманічнай атмасферы ўзаемаразумення і пазбягаць празмернай блізкасці або варожасці і прымушае зацягваць адносіны паміж людзьмі празрыстай заслонай, дзякуючы якой знешні выгляд іншага застаецца няпэўным».

Відавочна, што сказ атрымліваецца доўгім, нязвыклым для беларускай моўнай традыцыі. Яго варта падзяліць на некалькі асобных сказаў, каб сэнс зрабіўся больш

выразным. Апроч таго, некаторыя словы і словазлучэнні патрабуюць адаптацыі, своеасаблівага вытлумачэння. Як падкрэсліваюць сучасныя даследчыкі перакладной літаратуры, каб захаваць сэнс арыгінала, перакладчык часам змушаны «адну лексічную адзінку ў мове-крыніцы ператвараць у цэлы канцэпт у мэтавай мове» [11, с. 113]. Таму пераклад прыведзенага сказа будзе больш адпаведны і зразумелы беларускамоўнаму чытачу ў наступным выглядзе: «Маўчанне дазваляе людзям знаходзіцца ў гарманічнай атмасферы ўзаемаразумення. Маўчанне дазваляе людзям пазбягаць празмернай блізкасці і адкрытай варожасці. Маўчанне нівелюе эмоцыі, нібы накрывае іх вэлюмам. Прыхаваныя вэлюмам, адносіны і намеры людзей робяцца няпэўнымі». Калі складаны сказ падзяляецца на чатыры простыя, дзейнік з'яўляецца ў кожным сказе, што палягчае чытачам разуменне агульнага сэнсу.

Або яшчэ адзін прыклад.

**一个不**说话的女人，**笑起来更**赏心悦目。**你不用**说就能明白她的意思。

译文: Жанчына, якая не размаўляе, больш радуе вока, калі яна ўсміхаецца. Вы можаце зразумець яе сэрца і думкі, не кажучы.

Літаральны пераклад не дазваляе зразумець сэнс фразы. Адаптацыя для беларускамоўнага чытача патрабуе перабудовы ўсёй канструкцыі: «Ціхая ўсмешка жанчыны больш радуе вока і больш зразумелая».

Класічная кітайская мова з'яўляецца дастаткова лаканічнай – іерогліф выконвае ролю самастойнай моўнай адзінкі, у ім можа ўтрымлівацца даволі шырокі змест, нават цэлая фраза. Але якраз у гэтым існуе складанасць інтэрпрэтацыі сэнсу, пошуку дакладнага для перакладу адпаведніка.

Нягледзячы на культурныя адрознасці паміж дзвюма краінамі, цікавасць беларусаў да перакладаў кітайскай літаратуры з кожным годам усё больш узрастае. Сёння, у перыяд развіцця міжкультурнай камунікацыі, даследаванне праблем мастацкага перакладу з'яўляецца вельмі актуальным. Пытаннямі перакладу займаецца шэраг дысцыплін: традыцыйная лінгвістыка, этналінгвістыка, псіхалінгвістыка, тэорыя міжкультурнай камунікацыі і іншыя. Пераклад мастацкага твора патрабуе адзінства формы і зместу арыгінальнага і перакладнога тэксту. Узнаўленне ў перакладзе зместу і формы арыгінала павінны быць максімальна дакладнымі, але ў працы з мастацкай літаратурай сапраўдная адэкватнасць перакладу нярэдка дасягаецца з дапамогай адступленняў ад арыгінала і пэўных замен слоў, фраз, нават вобразаў. Паводле сцвярджэння А. В. Фёдарава, «уменне звяртацца да адэкватных замен, ахвяраваць менш істотным патрабуе ад перакладчыка такту, знаходлівасці і вынаходлівасці. Толькі пры наяўнасці гэтых якасцей перакладчык можа дасягнуць адэкватнасці ў перакладзе» [12, с. 25].

У ходзе перакладу мастацкага твора перакладчык выступае ў ролі пісьменніка і паэта, сааўтара твора. Мастацкі пераклад патрабуе ад перакладчыка пэўных ведаў, уменняў і навыкаў, глыбокага разумення зместу твора, творчага пошуку, пры гэтым трэба захаваць творчую індывідуальнасць аўтара літаратурнага твора.

У апошнія гады міжнародныя сувязі паміж Кітаем і Беларуссю выйшлі на высокі ўзровень усебаковага супрацоўніцтва, пашырыліся ўзаемныя абмены у сферы адукацыі, усё больш беларусаў вывучаюць кітайскую культуру і кітайцаў – беларускую. Пераклад літаратурных тэкстаў мае вялікае значэнне для гэтага ўзаемавыгаднага культурнага супрацоўніцтва. Для беларусаў, якія вывучаюць кітайскую мову, магчымасць чытаць кітайскую мастацкую літаратуру на роднай беларускай мове – гэта каштоўны вопыт, які не толькі пашырае веды, але дазваляе асэнсаваць ментальнасць кітайскага народа.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Кенька М. П. Асаблівасці перакладу з кітайскай мовы на беларускую // Белорусско-китайский культурный диалог: история, современное состояние, перспективы: сборник научных статей. Минск: РИВШ, 2014. С. 57–64.

2. *Сі Цзіньпін*. Аб дзяржаўным кіраванні. Мінск: Мастацкая літаратура, 2023.

3. The Nobel Prize in Literature 2012. Prize Announcement. 11 Oct 2012.

4. Мо Янь. Страна вина. Москва: Эскмо, 2021.

5. Мо Янь. Лягушки. Москва: Эскмо, 2020.

6. Мо Янь. Смерть пахнет сандалом. Москва: Эскмо, Inspiria, 2024.

7. Мо Янь. Большая грудь, широкая задница. Москва: Эскмо, 2023.

8. Мо Янь. Сорок одна хлопушка. Москва: Эскмо, Inspiria, 2021.

9. 莫言。《会唱歌的墙》。中国杭州：**浙江文**艺出版社，2021年。282页。

10. Завьялова М. В. Мо Янь – лауреат Нобелевской пермии по литературе // Общество и государство в Китае. 2013. № 1. С. 633–641.

11. Ничипорук Д. Б. Особенности перевода китайской классической поэзии на белорусский язык (на примере книги переводов поэзии Мэн Хаожаня “Мудрасць гор маўклівых” из поэтической серии «Светлыя знакі. Паэты Кітая») // Літаратура ў культурнай прасторы Беларусі і Кітая: зборнік навуковых артыкулаў па матэрыялах Міжнар. канф., прысвечанай народнаму паэту Беларусі Я. Коласу, г. Цяньцзінь, Кітайская Народная Рэспубліка, 17–18 мая 2019 г. Мінск: БДТУ, 2019. С. 109–113.

12. Федоров А. В. Основы общей теории перевода (лингвистические проблемы /. Учеб. пособие. СПб.: Филологический факультет СПбГУ, 2002.

# СОДЕРЖАНИЕ И ФУНКЦИОНАЛЬНОСТЬ ПОНЯТИЯ «ЛИТЕРАТУРОВЕДЧЕСКАЯ КОМПЕТЕНТНОСТЬ»: КРОСС-КУЛЬТУРНОЕ ИЗМЕРЕНИЕ

**И. Л. Шевлякова-Борзенко**

*Кандидат филологических наук, доцент,*
*Университет Хучжоу,*
*Вторая кольцевая восточная дорога, 759, 313000, г. Хучжоу, Китай,*
*shauliakova@yandex.by*

Литературоведческая компетентность рассматривается в статье как системная совокупность теоретико- и историко-литературных знаний, умений, навыков, опыта аналитической деятельности, которые могут быть использованы в типовых и новых контекстах восприятия и оценки литературных текстов, явлений, процессов. Актуализированная в кросс-культурном измерении литературоведческая компетентность является эффективным инструментом анализа специфики и результатов взаимодействия культур в усложняющейся ситуации глобализирующегося мира. Указанное измерение литературоведческой компетентности обеспечивается поливалентностью ее когнитивной составляющей, контекстуальной сензитивностью, личностной готовностью субъекта к восприятию и принятию инаковости как ресурса художественности, а также многоцелевым характером результатов. Функционально кросс-культурное измерение литературоведческой компетенции предполагает анализ, интерпретацию и оценку особенностей коммуникации читателя с инокультурным текстом, ориентированной на восприятие и принятие инаковости как нового ресурса (само)развития (художественного, эстетического, аксиологического).

***Ключевые слова:*** литература; культура; кросс-культурность; литературоведческая компетентность; межкультурная компетентность; межкультурная сензитивность; кросс-культурный интеллект.

# ЗМЕСТ І ФУНКЦЫЯНАЛЬНАСЦЬ ПАНЯЦЦЯ «ЛІТАРАТУРАЗНАЎЧАЯ КАМПЕТЭНТНАСЦЬ»: КРОС-КУЛЬТУРНАЕ ВЫМЯРЭННЕ

**І. Л. Шаўлякова-Барзенка**

*Кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*Універсітэт Хучжоу,*
*Другая кальцавая Усходняя дарога, 759, 313000, г. Хучжоу, Кітай,*
*shauliakova@yandex.by*

Літаратуразнаўчая кампетэнтнасць разглядаецца ў артыкуле як сістэмная сукупнасць тэарэтыка- і гісторыка-літаратурных ведаў, уменняў, навыкаў, вопыту аналітычнай дзейнасці, якія могуць быць выкарыстаны ў тыпавых і новых кантэкстах ўспрымання і ацэнкі літаратурных тэкстаў, з’яў, працэсаў. Актуалізаваная ў крос-культурным вымярэнні літаратуразнаўчая

кампетэнтнасць з’яўляецца эфектыўным інструментам аналізу спецыфікі і вынікаў ўзаемадзеяння культур у складанай сітуацыі глабалізаванага свету. Адзначанае вымярэнне літаратуразнаўчай кампетэнтнасці забяспечваецца полівалентнасцю яе кагнітыўнага складніка, кантэкстуальнай сензітыўнасцю, асобаснай гатоўнасцю суб’екта да ўспрымання і прыняцця іншасці як рэсурсу мастацкасці, а таксама шматмэтавым характарам вынікаў. Функцыянальна крос-культурнае вымярэнне літаратуразнаўчай кампетэнцыі прадугледжвае аналіз, інтэрпрэтацыю і ацэнку асаблівасцяў камунікацыі чытача з іншакультурным тэкстам, арыентаванай на ўспрыманне і прыняцце іншасці як новага рэсурсу (сама)развіцця (мастацкага, эстэтычнага, аксіялагічнага).

***Ключавыя словы:*** літаратура; культура; крос-культурнасць; літаратуразнаўчая кампетэнтнасць; міжкультурная кампетэнтнасць; міжкультурная сензітыўнасць; крос-культурны інтэлект.

## LITERARY COMPETENCE: THE CONTENT AND FUNCTIONALITY OF THE CONCEPT IN CROSS-CULTURAL DIMENSION

**I. L. Shauliakova-Barzenka**

*PhD, Ass. Professor,*
*Huzhou University,*
*No. 759, East 2nd Road, Huzhou, China (313000),*
*shauliakova@yandex.by*

Literary competence is considered in the article as a systematic set of theoretical and historical literary knowledge, skills, and analytical experience, which can be used in typical and new contexts of perception and evaluation of literary texts, phenomena, and processes. Actualized in a cross-cultural dimension, literary competence is an effective tool for analyzing the specifics and results of cultural interaction in the increasingly complex situation of a glocalizing world. This dimension of literary competence is provided by the polyvalence of its cognitive component, contextual sensitivity, personal readiness of the subject to perceive and accept otherness as a resource of artistry, and the multi-purpose nature of the results. Functionally, the cross-cultural dimension of literary competence involves analyzing, interpreting, and assessing the features of the reader’s communication with a foreign cultural text, focused on the perception and acceptance of otherness as a new resource (self)development (artistic, aesthetic, axiological).

***Keywords:*** literature; culture; cross-culturality; literary competence; cross-cultural competence; cross-cultural sensitivity; cross-cultural intelligence.

В последние десятилетия в поиске новых методологических возможностей литературоведение всё чаще обращается как к дискурсам отдельных дисциплин, так и к наработкам междисциплинарного характера, самой логикой развития научного знания включаясь в масштабные процессы конвергенции. Речь идет об общей устремленности научного знания к реконструкции целостной картины мира, что предполагает, в числе прочего, усиление интереса к методологическим и инструментальным

возможностям меж- / трансдисциплинарности. Понимание логики конвергенции позволяет многое понять о специфике взаимодействия культур в *глокальном мире*, где процессы глобализации «уточняются» процессами культурно-этнической локализации. По отношению к гуманитарному знанию интенсификация конвергентных процессов приводит, в числе прочего, к становлению методологической культуры *рационально-синкретичного* типа, основанной на особом качестве схождения, диффузионного взаимодействия методов и инструментов, изначально принадлежащих к самым разным сферам научного, технического знания, общественным, культурным, художественным практикам и т. п.

Наиболее продуктивным методологическим концептом, который отражает суть эффективного, практически результативного взаимодействия культур в условиях глокализации, нам представляется *концепт кросс-культурности* [2], такой модели взаимодействия культур, в основе которой – осознание и принятие культурных особенностей (различий) всеми субъектами этого взаимодействия. Вопрос о содержательных границах кросс-культурности связан с анализом взаимодействующих культур как «пересекающихся совокупностей», прежде всего – с осмыслением последствий этих пересечений. Одним из наиболее действенных инструментов обнаружения и использования смыслов и ценностей кросс-культурности в конкретной культурной практике оказывается *литературоведческая компетентность*, актуализированная в особом, кросс-культурном измерении.

В плане терминологическом с литературоведческой компетентностью происходит то же, что и со многими другими: содержание и компонентный состав довольно сильно варьируются от исследования к исследованию; функциональность зачастую рассматривается как простая сумма функций отдельных составляющих. В педагогическом дискурсе обнаруживается интерес к «формированию литературоведческой компетентности учащихся начальной школы» [3], а в самом термине «литературоведческая компетентность» последняя довольно легко заменяется на «компетенцию». Во избежание терминологических коллизий, под *литературоведческой компетентностью* мы будем понимать *совокупность теоретико- и историко-литературных знаний, умений, навыков, опыта аналитической деятельности, которые могут быть использованы в типовых и новых контекстах восприятия и оценки литературных текстов, явлений, процессов*. Стоит подчеркнуть: само определение «литературоведческая» указывает на свойство профессионализации, специальный характер знаний, навыков, опыта осмысления литературных явлений, фактов, событий и т. д.

В системе координат кросс-культурного типа литературоведческая компетентность подвергается своего рода «аккультурации», понимаемой как процесс «взаимодействия культур, в ходе которого происходит их изменение, усвоение ими новых элементов, образование в результате смешения разных культурных традиций принципиально нового культурного синтеза» [4, с. 130]. Кросс-культурный компонент литературоведческой компетентности сосредоточен, в числе прочего, на *феноменологии конвергенций*, сущность которой не укладывается в формулировки «культурного влияния одной нации на другую и упрощенной бинарности этого влияния» [5]**.** Про-

стое выявление, описание, каталогизация и интерпретация этих конвергенций в системе координат кросс-культурности не достигают практической исследовательской цели. Они должны обязательно содержать некий применимый вывод-рекомендацию: например, как отличия становятся ресурсом художественности, которая, в свою очередь, становится образно-эстетическим воплощением аксиологии. То есть в кросс-культурном измерении литературоведческая компетентность должна имманентно включать способность к восприятию (рецепции), анализу и оценке литературных явлений и событий, порожденных культурными и литературно-художественными дискурсами, «инаковость» которых для носителя литературоведческой компетенции является свойством онтологическим. Это очевидным образом означает особое свойство литературоведческой компетентности, которое обеспечивается дополнительными составляющими. Чтобы определить эти специальные компоненты, развертывающие кросс-культурное измерение литературоведческой компетентности, мы будем вынуждены обратиться к понятиям *межкультурной компетентности*, *кросс-культурного интеллекта* и *межкультурной сензитивности*.

Сюжетообразующий компонент, находящийся в центре действия быличек, на первый взгляд, носит характер происшествия. Действительно, герои подавляющего большинства произведений оказываются в ситуации столкновения с чем-то необычным и страшным впервые и единоразово. Результаты происшествия обычно касаются жизни только этих героев. Например, героиня одной из быличек нашла в лесу голого ребенка. Пожалев его, женщина прикрыла ребенка своей одеждой. Оказалось, что тот принадлежал русалке, которая в благодарность за человеческую доброту наделила женщину ловкостью в работе: «З тае пары яна пачала так працаваць, што ўсе дзівіліся, адкуль у яе бярупца сілы» [2, с. 174]. Однако если рассматривать это происшествие в контексте других произведений данного жанра, становится очевидным, что схожие происшествия происходили с героями многих других быличек. Они повторяются, а это значит, что слушатели и персонажи художественного мира произведений имеют дело с типичными случаями. Более того, осознание этого проявляется и на уровне рассказчика.

Сознание носителей устнопоэтической традиции содержит в себе набор прецедентных ситуаций (например, нечисть заманивает на гибель, ведьма вредит и др.), в соответствии с которыми создаются и воспринимаются былички. Рассказчик знает, что случаи столкновения человека со сверхъестественным бывали и раньше, и то, о чем он рассказывает, – один из таких случаев. Подтверждением могут служить итоговые замечания типа: «Дак от як нячыстая сіла здзекуецца да дурыць людзей» [2, с. 156]; «Во якія кепікі з людзей строіў тут калісьці нячысцік» [2, с. 158]; «Дак во як баба паддзелала» [2, с. 227].

Конечно, встречаются произведения, в которых ключевой компонент сюжетного действия не выходит за пределы происшествия, как, например, в быличке «Заліто», где героиня однажды нашла стену своего дома залитой сметаной. Не зная наверняка, что стало причиной такого необычного происшествия, она может только предполагать, что, скорее всего, здесь не обошлось без колдовства и «гэта, мабыць, уздзеяно» [2, с. 232]. Однако таких произведений немного. Как правило, и у рассказчика, и у героев быличек нет никакого сомнения в том, что в данном случае имело место вмешательство сверхъестественных сил.

Рассказчик – наиболее характерная для быличек субъектная форма организации речи. Он рассказывает о неожиданном, необычном и страшном происшествии, которое произошло с ним или хорошо знакомыми ему людьми, свидетельства которых заслуживают доверия: «Некалі на Яна прыходжу я ранкам у сцепку да судзіны браць муку. Калі пагляджу я туды, ажно там сядзіць, вылупіўшы вочы, неякая велькая чорная рапуха. Яна чыста ўкачалася ў муку і паглядае на мяне, спяршэў я спалохалася, але потым, апамятаваўшысь, што цяпер Яна, я дагадалася, што гэта не рапуха, а ведзьма...» [2, с. 227]; «Сядзімо мы раз у карчме, пакурваем люлькі да гамонім аб том, аб сём. Толькі ось улазіць Купрэй і пачынае жаліцца, што яго коні ноччу хтось заезджвае ў хляве...» [2, с. 169].

Использование субъектной формы рассказчика создает эффект получения слушателем сведений «из первых рук», что дает дополнительные основания для восприятия их как вероятных, особенно если в текст включены убедительные заверения: «Я сама бачыла от гэстымі самымі вачыма, што на вас пазіраюць. Далібо, што праўда, каб я так свет божы аглядала...» [2, с. 231]. Кроме того, она позволяет слушателю пережить вместе с рассказчиком всю неожиданность и жуть происшествия, о котором рассказывается в быличке: «На другую ноч пайшоў я з сябрам разам пілнаваць коней. Запалілі мы грамнічную свечку, накрылі яе горшчыкам, узялі з сабой свянцонае вады да сядзім, чакаем, покуль з'явіцца ён сам. Толькі ось каля поўначы й пачалі коні біцца да тупаць. Адкрыў гэта сябер свечку, зірном мы, аж на конях сядзіць сівы дзед з доўгаю барадою да толькі іх паганяе. От я як крапануў яго свянцонаю вадою, дык ён і знік. Назаўтра павесілі мы ў хляве сароку, а больш нічога. От з тых часоў не чапае коней» [2, с. 170].

Реже встречается в быличках форма повествователя. Обычно она используется для сообщения о том, какие бывали случаи столкновения со сверхъестественным. В таких рассказах, как правило, нет ссылок на личную известность участника происшествия, не называется имен. Герой представлен как «некий человек», «один человек», «одна баба» и др.: «Некалі панскі хурман рана на Яна вёў на выган коні і забачыўшы, што ведзьма рушнічком збівала росу, ён давай яе дражніць і абаганяць росу абруцею. Прыйшоўшы да двара, ён павесіў обруць ў стайні на калочкі. Калі зойдзе ён сюды зноў чэраз паўгадзінкі, ажна ж там нацекла із обруці цэлая каложына малака...» [2, с. 225]; «Адзін чалавек, ідучы познім вечарам, убачыў на полі нейкую істоту. Падобная да чалавека, але не мела на сабе шкуры і былі відаць усе ўнутранасці. Гэты чалавек так перапалохаўся, што захварэў на сухоты і неўзабаве памёр» [2, с. 180].

Быличка воссоздает картину мира, в центре которой находятся взаимоотношения человека со сверхъестественными существами и явлениями. Их опасность для человека, естественно, внушает героям быличек страх: «...Спалохалася мая кабета. Валасы на ѐй дыбам сталі – страх...» [2, с. 145]; «...Ён у страх, яму аж валасы дыбам сталі, – думае, што гэта нячысты...» [2, с. 221]. Передается это чувство и слушателю, причем не только из-за жути описываемого происшествия, но и благодаря напряженности самого повествования. В некоторых произведениях, прежде чем перейти к происшествию, рассказчик предупреждает, что будет рассказывать о страшных вещах. Такое начало сразу создает соответствующее настроение у слушателя: «Ці вы ведаеце, – не пры нас гаворачы, – што гэта за ліхо – мара? Калі самі не ведаеце, та мо хоць

чулі ад людзей. А от мне так трапілася самому бачыць на вочы гэстую пачверу. Ну й пачвера ж, мае браткі! Але ось я раскажу па парадку, як тое было...» [2, с. 180].

Встреча героя былички со сверхъестественным существом почти всегда неожиданная, внезапная. В тексте эффект неожиданности создается за счет использования наречия «вдруг», а также частиц «аж», «ажно» и др.: «Быў раз у чацвер Святы Мікола. Усхапілася яна назаўтра, у пятніцу, з першымі пеўнямі, села за прасніцу, схапіла верацяно да давай круціць так, што аж гудзе. Але ось чуе яна, што хтось бразнуў у вакно. Зірнула яна туды, аж пад вакном стаіць старэнькая баба, да такая старэнькая, што чуць на нагах трымаецца. І пытае яна тую маладзіцу, чаму яна так рана прадзе да яшчэ ў святую пятніцу...» [2, с. 141].

Наиболее обостренные моменты действия акцентируются в рассказе благодаря использованию глаголов в форме настоящего времени: «...Прала яна, прала раз, аж да паўночы. Удруг *чуе*, што нехта *стукае* ў вакно. Так яна *пытае*: «Хто там?» Ён і *кажа*: «Я прынёс табе, кабета, работу». Спалохалася мая кабета... » [2, с. 145]. «...Вяртаўся ён аднойчы ў сваю вёску, і прыйшлося яму праязджаць праз могілкі. І вось *едзе* ён на кані, аж *бача*, што па могілках *ходзіць* нейкі чалавек у чорным...» [3, с. 37].

Важную роль в быличках играют диалоги, истинный смысл которых для героя раскрывается позже, когда он догадывается, что собеседник – необычный человек.

Таким образом, эстетическое отношение фольклорного «автора» к героям быличек, переживающим мистический случай, выражается в произведениях с помощью образной и речевой детализации, которая вызывает соответствующие сильные эмоции и у слушателя – неожиданное столкновение со сверхъестественным представляется пугающим, опасным, нежелательным.

**Библиографические ссылки**

1. *Конан У. М.* Гісторыя эстэтычнай думкі Беларусі. У 3 т. Т. 1. X ст. – 1905 г. Мінск: Беларуская навука, 2010.

2. Легенды і паданні / склад. М. Я. Грынблат і А. І. Гурскі; рэд. тома А. С. Фядосік. Мінск: Беларуская навука, 2005.

*3. Новак В. С.* Міфалогія беларусаў: вуч. дап. для студ. філал. спец. вну. Гомель: Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт, 2005.

4. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. Т. 3. Гродзенскае Панямонне / пад рэд. Т. Б. Варфаламеевай. Мінск: Вышэйшая школа, 2006.

# ОБРАЗ СЕМЬИ В БЕЛОРУССКОМ ФОЛЬКЛОРЕ (НА МАТЕРИАЛЕ ТРАДИЦИОННЫХ СЕМЕЙНО-ОБРЯДОВЫХ ПЕСЕН)

**А. В. Морозов[1)], Т. А. Морозова[2)]**

*[1)] доктор филологических наук, профессор,*
*Академия управления при Президенте Республики Беларусь,*
*ул. Московская, 17, 220030, г. Минск, Беларусь, morozoff.bel@mail.ru;*
*[2)] кандидат филологических наук, доцент,*
*Белорусский годарственный университет,*
*пр-т Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, morota2012@yandex.ru*

Впервые проанализирован фольклорный образ семьи с точки зрения воплощения в традиционном песенном творчестве трех групп семейных ценностей, связанных с замужеством, родительством и родством. Проведенный анализ показал, что образ счастливой семьи в белорусском фольклоре базируется на ценностях взаимной любви, созидания добра, верности, взаимопонимания и уважения. Тексты многих семейно-бытовых песен белорусского народа являются свидетельством того, что отсутствие подлинных семейных ценностей пагубно влияет на взаимоотношения в семье, счастье и благополучие ее членов.

***Ключевые слова:*** белорусский фольклор; семейно-бытовые песни; образ семьи; семейные ценности; традиции.

# ВОБРАЗ СЯМ'І Ў БЕЛАРУСКІМ ФАЛЬКЛОРЫ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ТРАДЫЦЫЙНЫХ СЯМЕЙНА-БЫТАВЫХ ПЕСЕН)

**А. В. Марозаў[1)], Т. А. Марозава[2)]**

*[1)] доктар філалагічных навук, прафесар,*
*Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь,*
*вул. Маскоўская, 17, 220030, г. Мінск, Беларусь, morozoff.bel@mail.ru;*
*[2)] кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*Беларускі гадавы ўніверсітэт,*
*пр-т Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, morota2012@yandex.ru*

Упершыню прааналізаваны фальклорны вобраз сям'і з пункту гледжання ўвасаблення ў традыцыйнай песеннай творчасці трох груп сямейных каштоўнасцей, звязаных з замужжам, бацькоўствам і сваяцтвам. Праведзены аналіз паказаў, што вобраз шчаслівай сям'і ў беларускім фальклоры грунтуецца на каштоўнасцях узаемнага кахання, стварэння дабра, вернасці, узаемаразумення і павагі. Тэксты многіх сямейна-бытавых песень беларускага народа з'яўляюцца сведчаннем таго, што адсутнасць сапраўдных сямейных каштоўнасцей згубна ўплывае на ўзаемаадносіны ў сям'і, шчасце і дабрабыт яе членаў.

***Ключавыя словы:*** беларускі фальклор; сямейна-бытавыя песні; вобраз сям'і; сямейныя каштоўнасці; традыцыі.

# THE IMAGE OF THE FAMILY IN BELARUSIAN FOLKLORE (BASED ON THE MATERIAL OF TRADITIONAL FAMILY AND HOUSEHOLD SONGS)

**A. V. Morozov[1)], T. A. Morozova[2)]**

*[1)] Hab. PhD, Professor,*
*Academy of Public Administration under the Aegis of the President of the Republic of Belarus,*
*Moskovskaya st., 17, 220030, Minsk, Belarus, morozoff.bel@mail.ru;*
*[2)] PhD, Ass. Professor,*
*Belarusian State University,*
*4 Independence Ave., 220030, Minsk, Belarus, morota2012@yandex.ru*

The article analyzes for the first time the folklore image of the family from the point of view of embodiment in traditional songs of three groups of family values related to marriage, parenthood and kinship. The analysis showed that the image of a happy family in Belarusian folklore is based on the values of mutual love, creation of good, fidelity, mutual understanding and respect. The texts of many family and household songs of the Belarusian people are evidence that the lack of genuine family values has a detrimental effect on relationships in the family, the happiness and well-being of its members.

***Keywords:*** Belarusian folklore; family and household songs; family image; family values; traditions.

Актуальность темы исследования заключается в том, что функционально различные виды культуры (в том числе художественная культура и ее феномен - искусство) могут способствовать консолидации общества посредством выработки необходимого набора ценностей, этических норм и поведенческих стратегий. В каждом обществе существует комплекс коллективных представлений и ценностей, которые обеспечивают его устойчивость и жизнеспособность. Как нами было показано ранее, в фольклоре «осуществляется деятельная ориентация личности на культурные ценности» [4, с. 9], которая находит выражение в семейных ценностях, воплощенных в традиционном творчестве белорусского народа.

Центральным институтом функционирования и развития любого общества является семья. Сюда стекаются материальные ценности и духовные богатства; именно в семье находится источник счастья и подлинных ценностей.

Семейно-бытовые песни как один видов внеобрядовой лирики белорусского народа охватывают различные сферы семейной жизни – взаимоотношения супругов, взрослых детей и родителей, братьев и сестер, свекрови и невестки, вдовью и сиротскую судьбу.

Семья – это живой барометр социального климата: по характеру взаимоотношений в семье, каждодневных забот и действительному положению ее членов можно достоверно судить о состоянии общества в целом, его устоях, моральных принципах

и имеющихся противоречиях. При анализе содержания огромного массива белорусских семейно-бытовых песен нами были выделены три основных группы семейных ценностей:

1. Ценности, связанные с супружеством;
2. Ценности, связанные с родительством;
3. Ценности, связанные с родством.

Счастье человека в традиционной культуре белорусского народа не представляется без создания крепкой и жизнеспособной семьи: трепетным и радостным чувством ожидания встречи, поиском любимого и верного спутника охвачена значительная часть этого устно-поэтического народного творчества. Важность доброго взаимопонимания и крепких семейных уз подчеркивают многие белорусские пословицы: «Нашто клад, калі ў сям'і лад», «Каторага пальца не ўреж, то ўсё баліць», «Чужая хата не грэе», «Баба без мужыка, як калёсы без каня», «Добрая жонка дом сберажэ, а ліхая рукавом растрасе».

В народной поэзии прославляются ценности счастливой семьи – взаимная любовь, согласие и уважение, общность целей и интересов, верность и взаимонимание. В справедливом разделении хозяйственных забот по дому, совместном труде на благо своих детей заключается сила многодетной крестьянской семьи. Тогда и дело спорится, и на душе праздник:

А звіўся хмель
З бярозаю зялёнаю.
Нажыўся Лявон
З жаной маладою.
Нанасіўся сарочак беленькіх,
Штаноў алененькіх.
Бог яму даў
Жану маладую,
Сям'ю вясялую:
У поле ідуць,
Як пчолкі гудуць,
Да ўсё баравыя.
Сы поля ідуць –
Песенькі пяюць,
Да ўсё жніўныя [3, с. 24].

Проникновенный лиризм семейно-бытовых песен поднимается с прозы нелегкого быта белорусского крестьянства до высот осознания ценностей семейной жизни – любви, доверия, доброты, верности, взаимопонимания и уважения. От песен об удачном браке исходят светлые побуждения сохранения тепла домашнего очага, счастья и радости семейной жизни в атмосфере верности и поддержки. Так, в песне «Вячэрняя зара ясна…» готовность оставаться с любимым человеком проявляется в незамысловатом отказе крестьянина поменяться женами с дворянином:

Вячэрняя зара ясна,
Ранняя яснейша,
Двараніна жана красна,
У селяніна краснейша…
Селянінава жана ўлетку пажынае,
Зімой пажывае.
– Селянін, змяняй жану,
Дам каня варанога, вала палявога.
– Я прідатку не хачу, сваей жонкі не мяняю [2, с. 390, 391].

Группа семейных ценностей, связанных с родительством, наиболее ярко выражена в крестильных песнях (их названия на белорусском языке – песні хрэсьбінныя, радзінныя). А. С. Федосик среди крестильных песен белорусского, русского и украинского народов выделял следующие разновидности: «Величальные песни, в которых восславляются роженица, отец ребенка, бабка, кума, кум, высказываются пожелания счастья новорожденному; юмористические песни с легкой насмешкой над участниками крестин – кумом и кумой, бабкой, отцом ребенка; беседные песни, исполняввшиеся во время застольного торжества по случаю крестин, тематически связанная с угощением участников торжества…» [7]. Следует особо подеркнуть, что в традиционном представлении белорусского крестьянства образ счастливой семьи немыслим без детей; рождение ребенка воспринимается как главное семейное событие, благотворно влияющее на участников христианского обряда Крещения. Уважительные и радостные величальные песни, добрые и искристые шуточные песни, лиричные и ироничные беседные песни, в целом, подчинены ключевой мысли крестинных песен – пожеланию счастливой судьбы новорожденным.

Вместе с тем, тексты многих фольклорных песен белорусского народа являются свидетельством того, что отсутствие подлинных семейных ценностей пагубно влияет на взаимоотношения в семье, счастье и благополучие ее членов. Соединение прочувственного лиризма и эпического начала придает самобытным белорусским семейно-бытовым песням особо примечательный эмоциональный фон неблагополучия и неудовлетворенности жизнью при игнорировании группы семейных ценностей, связанных с родством персонажей художественных произведений.

Многие песни семейно-бытовой тематики несут в себе ярко выраженный заряд критической направленности, связанный с традиционными представлениями о важности добрых взаимотношений в семье. Так, песни о неродной семье рождаются вскоре после свадьбы и содержат первое эмоционально-критическое впечатление молодой женщины. Уже само прощание с родительским домом преисполнено ощущением утраты относительной девичьей вольнушки:

Бывайце здаровы, да бацькавы парогі,
Кудою хадзілі мае белыя ногі.
А кудою хадзілі, хадзіці не будуць,
Ой, каго й любіла, любіці не буду [6, с. 31].

Выданная замуж молодая жена идеализирует обстановку в доме родителей, домашние заботы и светлые чувства, прибегая к условным поэтическим формулам, развитой символике и метафоричности, свойственным любовным и свадебным песням. Прочувствованное описание начинающейся жизни в замужестве не содержат еще подробной картины быта и труда; бытовые зарисовки предельно обобщены, но окончательно возобладавшие трагические чувства сопровождают постижение происшедшей жизненной драмы. Поэтическая одухотворенность течения жизни в родном доме представлена в психологическом контрасте с горькой метафоричностью описания обстановки в семье мужа («гульня дзевоча – журба жаноча»), нагнетанием горестных переживаний с помощью многократного повтора-констатации женской «няшчаснай долі»:

Як сабе абачу,
Горанька заплачу,
Доля ж мая няшчасная!

Як я падрастала,
Горачка не знала,
Доля ж мая няшчасная!

Падрасці не далі,
Замуж аддавалі,
Доля ж мая няшчасная!

Вяселле зрабілі,
Мяне загубілі,
Доля ж мая няшчасная! [1, с. 52].

Появившиеся в результате создания семьи новые родственники часто оказываются неспособными проникнуться переживаниями и заботами молодой женщины. Так, помимо распространенной психологической причины – ревностной опеки свекровью своего сына – проскальзывает существенный социально-бытовой мотив: проблематично нахождение двух хозяек в одном доме. В данной ситуации свекровь нередко стремится подчеркнуть свое главенство:

А ў полі вярба каласістая,
Мая свякруха наравістая:
Ой, не раз, не два не абедала.
Пакуль свякроўку пераведала.
Зарання ўстала, спаці не дае,
Работку кажа, сама спаці ляжа [1, с. 146].

Отличительной чертой семейно-бытовых песен является отход от обрядовой заданности в поступках персонажей фольклорных произведений. Так, в песнях о лихой свекрови сын по-разному относится к своенравию матери: иногда он поддерживает её или отмалчивается («Мужык жонку катуе…», «У цёмным лузе каліна стаяла…», «Горушка мая крутая…»), но все же чаще молодая женщина видит в муже защиту и поддержку. Весьма своеобразно показано поведение мужа в бытовой сценке из песни «А шумела, гудзела…», где ему удается «угодить» матери, приказавшей наказать невестку:

Як узяў сын плётку
А павеў жонку ў клеці,
Як стаў жану біці,
Як стаў навучаці.
Але біў жа па плечыках,
А па голых сценачках,
А не біў жа па жонушцы,
А па белай падушцы.
– А крычы, жана, душа,
Кабы маці пачула,
А хвала табе, божа,
Што жаны не калечыў,
Сваю мамку ўцешыў [6, с. 115].

Бесконечные от тревог и печали, поэтические откровения замужней женщины передают невыносимость жизни с нелюбимым человеком. В сравнении с вдохновенным, эмоционально возвышенным стилем многих любовных песен семейно-бытовые песни о неудачном браке с развернутой поэтической строфой воспринимаются монотонно-протяжными, переходят на повествование, но в них также присутствуют метафоры несчастья:

Лепей было ў мамачкі тры гары капаць,
Як з нялюбым міленькім ночку начаваць.
Тры гары капаючы – сяду аддыхну,
Як з нялюбым таварышам жыць я не магу.
Лепей было ў мамачкі горкі палын есці,
Як з нялюбым таварышам за стол сесці [5, с. 402].

Как и в русском фольклоре, подавляющее большинство песен семейно-бытовой тематики создавалось женщинами – количество песен, воплощающих мысли и чувства мужчин, их неудовлетворенность заведенным укладом семейной жизни, гораздо меньше. Энергия фольклорного слова, вдохновляемая присущей женщине от природы более яркой эмоциональностью, значительна. Эмоционально насыщенные пе-

реживания в поэтической исповеди женщины контрастируют с речью мужчины – более сдержанной, менее метафоричной, в которой основной акцент делается на событийное изложение. Этот контраст существенен, например, в песнях с похожим мотивом жалобы одного из супругов на неудачный брак:

Ні на каго так не жаль
Як на атца сваего
Як на атца сваего
На радзіцеля.
Што ажаніў ён мяне,
Малалетняга,
Малалетняга,
І малавумнага,
Што ўзяў я жану
Не па любові,
Што не бела ліцо,
Не чорныя бровы…[6, с. 260, 261].

Аддаў мяне мой татачка -
У наўколіны жыці,
У вясёлую сямеечку –
Не буду тужыці.
Я ж, здаецца, татка родны,
Не тужу, не плачу,
За дробнымі я слёзкамі
Дый свету не бачу.
Я ж, здаецца, татка родны,
У тугу не ўдаюся,
А як выйду на уліцу –
Ад ветра валюся [5, с. 446].

Сравнительный анализ идейно-художественных особенностей песенных текстов указывает на несоразмерность глубины переживаний мужчины и женщины. Мужчина ограничивается констатацией того, что женат по воли отца и жена его нелюбима и некрасива. Поэтический дар женщины вобрал и неоднократные ласковые обращения («мой татачка», дважды «татка родны»), и рассказ о питавшейся отцом надежде на свадьбу («аддаў… у вясёлую сямеечку – не буду тужыці»), и глубокие метафорические переживания («за дробнымі я слёзкамі дый света не бачу», «ад ветру валюся») наряду с горькой иронией по поводу несбывшихся надежд. Наличие в лирическом повествовании элементов психологического показа семейной жизни способствует постижению важнейшего правила: недопустимо «переламывание» одного супруга под интересы и потребности другого, грубое вмешательство в дела молодых со стороны родителей.

Таким образом, проведенный анализ позволил сформулировать следующие выводы:

1. Сущностная характеристика образа семьи в традиционном фольклоре должна быть основана на идентификации в текстах народных произведений трех групп семейных ценностей: связанных с замужеством, родительством и родством.

2. Образ счастливой семьи в белорусском фольклоре базируется на ценностях взаимной любви, созидания добра, верности, взаимопонимания и уважения.

3. Тексты многих семейно-бытовых песен белорусского народа являются свидетельством того, что отсутствие подлинных семейных ценностей пагубно влияет на взаимоотношения в семье, счастье и благополучие ее членов.

**Библиографические ссылки**

1. Беларускія народныя песні: У 4-х т. / Запіс Р. Шырмы. Т. 2. Мінск: Дзярж. выд-ва БССР, 1960.

2. Жніўныя песні / Склад.: А. С. Ліс, В. І. Ялатаў; пад рэд. А. С. Фядосіка. Мінск: Навука і тэхніка, 1974.

3. Косич М. Н. Литвины-белорусы Черниговской губернии, их быт и песни // Живая старина. 1901. Вып. III–IV. С. 1–88.

4. Морозов А. В. Фольклор в духовной культуре восточных славян. Вильнюс: Ксения, 2005.

5. Песні сямі вёсак: Традыцыйная народная лірыка Міншчыны / Уклад. і рэд. Н. С. Гілевіча. Мінск: Вышэйшая школа, 1973.

6. Сямейна-бытавыя песні / Склад.: І. К. Цішчанка, Г. В. Таўлай; пад рэд. А. С. Фядосіка. Мінск: Навука і тэхніка, 1984.

7. Федосик А. С. Песня крестильная // Восточнославянский фольклор: Словарь научной и народной терминологии. Минск: Навука і тэхніка, 1993. С. 214.

# РАЗДЗЕЛ 5

# ЛІТАРАТУРНЫЯ СУВЯЗІ. ІНТЭРМЕДЫЯЛЬНАСЦЬ. ДЫДАКТЫКА

## ВОБРАЗЫ ПАЭМЫ «НЕЎТАЙМАВАНЫ РАЛАНД» Л. АРЫЁСТА ВА «УСПАМІНАХ» І. КЛЮКОЎСКАГА

**У. І. Чарота**

*Кандыдат філалагічных навук,*
*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі,*
*вул. Сурганава, 1/2, 220072, г. Мінск, Беларусь, charotav@yahoo.com*

Прадметам даследавання з'яўляюцца «Успаміны аб паўстанні 1830 г.» выпускніка Віленскага ўніверсітэта, мастака і мастацтвазнаўца Ігнація Клюкоўскага (1804–1862). Праведзены аналіз дазваляе сцвярджаць, што іх аўтар быў знаёмы з паэмай «Неўтаймаваны Раланд» Л. Арыёста і па-асабліваму ставіўся да гэтага твора: для стварэння як мага больш маляўнічых карцін і яскравых гераічных вобразаў, а таксама дзеля надання рамантычнага арэолу таму, што адбывалася, ён выкарыстоўвае вобразы з паэмы італьянскага паэта.

***Ключавыя словы:*** І. Клюкоўскі; успаміны; італьянская літаратура; вобраз; Л. Арыёста.

## ОБРАЗЫ ПОЭМЫ «НЕИСТОВЫЙ РОЛАНД» Л. АРИОСТО В «ВОСПОМИНАНИЯХ» И. КЛЮКОВСКОГО

**В. И. Черота**

*Кандидат филологических наук,*
*Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы НАН Беларуси,*
*ул. Сурганова, 1/2, 220072, г. Минск, Беларусь, charotav@yahoo.com*

Предметом исследования являются «Воспоминания о восстании 1830 г.» выпускника Виленского университета, художника и искусствоведа Игнатия Клюковского (1804–1862). Проведенный анализ позволяет утверждать, что их автор был знаком с поэмой «Неистовый Роланд» Л. Ариосто и по-особенному относился к этому произведению: для создания как можно больше красочных картин и ярких героических образов, а также для придания романтического ореола происходившему, он использует образы из поэмы итальянского поэта.

***Ключевые слова:*** И. Клюковский; воспоминания; итальянская литература; образ; Л. Ариосто.

# THE IMAGES OF THE POEM «ORLANDO FURIOSO» BY L. ARIOSTO IN «MEMORIES» BY I. KLUKOWSKI

**U. I. Charota**

*PhD, Ass. Professor,*
*The Center for Belarusian culture, language and literature researches of the NAS of Belarus,*
*1/2 Surganova str., 220072, Minsk, Belarus, charotav@yahoo.com*

In the article, the subject of the study is «Memories of the uprising of 1830» by Ignacy Klukowski (1804–1862), a graduate of Vilnius University, an artist and an arts critic. The analysis carried out allows us to state that their author was familiar with the poem «Orlando furioso» by Ludovico Ariosto and had a special attitude towards this work: to create the most colorful pictures and vivid heroic images, as well as to give a romantic aura to what was happening, he uses images from the poem by Italian poet.

***Keywords:*** I. Klukowski; memories; Italian literature; image; L. Ariosto.

На падставе звестак, сабраных гісторыкамі, складаецца такая вось кароткая даведка пра выпускніка Віленскага ўніверсітэта, ашмянскага шляхціца, мастака і мастацтвазнаўца Ігнація Клюкоўскага (1804–1862) [1, с. 3, 5]: з 1819 года ён вучыўся ў Школе прыгожых мастацтваў, якая была структурнай адзінкай універсітэта ў Вільні, а з 1822 вывучаў права на факультэце маральна-палітычных навук той жа навучальнай установы [2, с. 222]. Па звестках В. В. Гарбачовай, пасля заканчэння ўніверсітэта ён збіраўся працягваць вучобу ў Італіі, але здзейсніць гэты намер яму не ўдалося [1, с. 6]. Малады чалавек, мяркуючы па некаторых яго публікацыях у часопісе «Віленскі дзённік», цікавіўся італьянскім мастацтвам і культурай наогул. А друкаваў Клюкоўскі ў ім свае пераклады з ананімных «Успамінаў пра Італію» («Салоны і мастакі» [3], «Рымскія вілы» [4]), апублікаваных «Revue Britannique» у чэрвені 1829 года, а таксама інфармацыю пра працу “Notizie di medici, maestri di musica e cantori, pittori, architetti, scultori ed altri artisti italiani in Polonia e polacchi in Italia” Себасцьяна Чампі (Ciampi Sebastiano; 1769–1847), прысвечаную італьянска-польскім сувязям [5]. Ёсць падставы дапусціць, што выпускнік Віленскага ўніверсітэта валодаў італьянскай мовай: па-першае, павінен быў вывучыць яе ўжо таму, што намерваўся вучыцца ў Італіі; па-другое, у названых яго публікацыях прысутнічаюць цытаты, перакладзеныя на польскую мову з італьянскай; па-трэцяе, мы проста не ўяўляем, як ён, не ведаючы мовы, змог перадаць змест напісанай па-італьянску працы Себасцьяна Чампі і даць ёй ацэнку.

Усе папярэднія даследчыкі асобы Клюкоўскага засяроджвалі ўвагу толькі на тым, што ён актыўна ўдзельнічаў у польскім паўстанні 1830–1831 гг., потым падаўся ў эміграцыю, у Парыж, дзе напісаў успаміны пра падзеі, да якіх сам меў дачыненне. Між тым, для нас у прыгаданых «Успамінах аб паўстанні 1830 г.» не меншую цікавасць уяўляюць звесткі філалагічныя і канкрэтна італьяністычныя, у прыватнасці тое, што І. Клюкоўскі чытаў паэму «Неўтаймаваны Раланд» Лудавіка Арыёста (Ariosto Ludovico; 1474–1533) і па-асабліваму ставіўся да гэтага твора. Справа ў тым, што аўтар успамінаў для стварэння як мага больш маляўнічых карцін і яскравых

гераічных вобразаў, а таксама дзеля надання рамантычнагна арэолу таму, што адбывалася, згадвае гераінь паэмы італьянца; прычым іншых літаратурных персанажаў у яго тэксце няма.

І. Клюкоўскі, асоба з уяўленнем, якое відавочна падсілкоўвалася літаратурнымі крыніцамі, час, праведзены ў мястэчку Трашкуны, апісвае вось як: «Гэта было пасапраўднаму маляўнічае відовішча, якое нагадвала сярэднявечча ці нашу Барскую канфедэрацыю. Свабодна сабраная моладзь са сваімі бацькамі ці крэўнымі старэйшага ўзросту абедала і вячэрала за прадаўгаватымі ў тры рады сталамі, пастаўленымі каля трапезнай. Усе яны, узброеныя пісталетамі, шаблямі ці старажытнымі карабелямі з залатымі рукаяцямі, жалезнымі старадаўнімі рапірамі ці загнутымі турэцкімі палашамі, у дзіўным і ў кожнага іншым аддзенні, весела і з ахвотай сядалі за сталы. Шэрага колеру настольнікі, алавяны посуд і алавяныя куфлі з півам, пастаўленыя перад кожным, сціплыя, без лішку (бо ў нашым становішчы гэтага немажліва было ўжываць) стравы, але шчодра настаўленыя; укрыжаваны Хрыстос, выразаны з дрэва і закопчаныя па баках кляштарныя абразы, вокны, якія выходзілі на касцёльныя муры і законніцкі сад; старанны, гасцінны, ветлівы, шчыры бернардынскі гвардыян з цяжкасцю з-за сваёй паўнаты прыслужваў у сваім кляштары ўзброеным гасцям пад час іх гутаркі. Як жа рамантычна выглядала сцэна! Патрэбна была толькі Альцына, каб наша сапраўдная рэчаіснасць перанеслася ў чароўныя краіны з фантазіі Арыёста!..» (*Падкрэслена намі – У. Ч.*) [1, с. 59–60]. На першы погляд, намалявавную аўтарам успамінаў карціну цяжка суаднесці з нейкім фрагментам твора Л. Арыёста. Аднак у наступным абзацы ёсць наступнае: «У спакойным вясковым зацішшы пасля цяжкасцяў і спёкі прыемна правялі мы сярод прыгожых жанчын некалькі дзён з забавамі, музыкай, танцамі і патрыятычнымі спевамі. Праходзілі дні ў вясёлай бяздзейнасці…» [1, с. 60]. І гэта ўжо больш канкрэтна адсылае чытача да Песень VI і VII «Неўтаймаванага Раланда» з аповедам пра знаходжанне Рудж’ера ў царстве феі Альцыны. Прыгадаем: стомлены гіпагрыф, на якім ляцеў герой, сядае на прыгожы і прывабны востраў [6, с. 100–102], дзе Рудж’ера знаходзіць сабе прытулак у царстве чараўніцы Альцыны; а там – атмасфера свята, бесклапотнасці і весялосці:

*73*

che si può ben così nomar quel loco,
ove mi credo che nascesse Amore.
Non vi si sta se non in danza e in giuoco,
e tutte in festa vi si spendon l’ore:
pensier canuto né molto né poco
si può quivi albergare in alcun core:
non entra quivi disagio né inopia,
ma vi sta ognor col corno pien la Copia.

*74*

Qui, dove con serena e lieta fronte
par ch’ognor rida il grazioso aprile,
gioveni e donne son: qual presso a fonte

canta con dolce e dilettoso stile;
qual d'un arbore all'ombra e qual d'un monte
o giuoca o danza o fa cosa non vile;
e qual, lungi dagli altri a un suo fedele
discuopre l'amorose sue querele [7, p. 123].

У перакладзе вольным вершам М. Л. Гаспарава гэтыя дзве актавы на рускай мове гучаць наступным чынам:

73 Истинно мнилось, это рай,
Где сама рождена Любовь:
Здесь только игры, здесь только пляски,
И каждый час здесь праздничный час.
Ни надолго, ни на недолго
Здесь седая забота не живет в душе,
Здесь нет места бедности и скудости,
Здесь царит Изобилие с полным рогом.

74 Здесь, где ясно и весело,
Словно вечно смеется милый апрель,
Юные цветут кавалеры и дамы.
Иные у фонтана ласкательно и сладко
Поют; иные в тени холмов и рощ
Пляшут, играют и красиво резвятся;
А иные в стороне верному наперснику
Изливают любовную свою тоску.
[6, с. 110].

Як ужо адзначалася, без асаблівых нацяжак можна дапусціць, што І. Клюкоўскі ведаў італьянскую мову. І наўрад ці выпадковым супадзеннем з'яўляецца тое, што ўкладзеная Л. Капэлі (Cappelli Luigi; 1776–1838) анталогія «Scelta di poesie italiane per uso di coloro, che si dedicano allo studio della lingua italiana nell'Università Imperiale di Vilna Scelta» («Выбраная італьянская паэзія для карыстання тым, хто вывучае італьянскую мову ў Імператарскім Віленскім універсітэце»; Вільня, 1809), змяшчала якраз шостую і сёмую песні з паэмы Л. Арыёста [8, p. 171–194]. Не выключаецца, адпаведна, што Ігнацій Клюкоўскі, будучы студэнтам Віленскага ўніверсітэта, наведваў заняткі Л. Капэлі па італьянскай мове і літаратуры. Але паколькі звестак пра яго вучобу дайшло зусім мала, катэгарычна адстойваць гэтую версію нельга.

Іншая справа – той тэкставы матэрыял, які ўяўляюць успаміны. А ў іх І. Клюкоўскі піша, што жанчын-удзельніц паўстання ўяўляў сабе як «…літоўскіх Брадамант і Бабелін» (*Падкрэслена намі – У. Ч.*). Асабліва цікавы працяг: «Мае разгарачаныя мыслі малявалі чароўны вобраз ахвяры і адвагі з боку асобаў прыгожага полу. Быў блізкім да экстазу. Аднак, пасля таго як убачыў пані Плятэр і яе сяброўку, прозвішча якой запамятаў, уся чароўнасць растаяла, як сон ці міраж» [1, с. 65].

Удакладнім, што пад абагуленым імем «Бабелін» тут маецца на ўвазе, найверагодней, гераіня грэчаскай нацыянальна-вызваленчай рэвалюцыі 1821–1829 гадоў Ласкарына Бубуліна (1771–1825). Што ж датычыцца «Брадамант», то гэта ж імя дзяўчыны-ваяўніцы, гераіні як паэмы «Закаханы Раланд» Матэа Марыя Баярда (Boiardo Matteo Maria; 1441–1494), так і яе працягу – г. зн. паэмы «Неўтаймаваны Раланд» Л. Арыёста. Прычым калі апошні ў сваім творы акцэнтуе больш увагу на каханні да Рудж'ера і перыпетыях яе жыцця, то ў Песні VI другой кнігі паэмы «Закаханы Раланд» Брадаманта паўстае як адважная начальніца аднаго з атрадаў хрысціянскага войска, якое змагалася супраць сарацынаў [6, с. 16]. Прымаючы пад увагу кантэкст, у якім І. Клюкоўскі згадвае гераіню абедзвюх італьянскіх паэм, на нашу думку, ён меў на ўвазе Брадаманту пераважна ў трактоўцы М. М. Баярда. Зноў жа, каб сцвярджаць, што аўтар успамінаў быў добра знаёмы з паэмай «Закаханы Раланд», недастаткова падстаў. Але ў той жа час і цалкам выключаць гэтую магчымасць нельга. Хутчэй за ўсё, пра тое, як была прадстаўлена Брадаманта ў «Закаханым Раландзе», аўтар успамінаў даведаўся не непасрэдна з мастацкага твора, а з нейкіх іншых крыніц – напрыклад, з прац па гісторыі італьянскай літаратуры. Ну а калі падчас вучобы ў Віленскім універсітэце ён наведваў заняткі Л. Капэлі, то выкладчык мог распавядаць пра гісторыю гэта жаночага вобраза пры аналізе сёмай песні «Неўтаймаванага Раланда», бо якраз у ёй Л. Арыёста піша пра пошукі Брадамантай свайго каханага.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. За вольнасць і веру : Ігнацій Клюкоўскі і яго ўспаміны аб падзеях паўстання 1830–1831 гадоў / [уклад., пер. на беларус. мову, уступ. арт., камент., паказ. В. В. Гарбачовай ; навук. рэдагаванне: А. А. Кожынава]. Мінск: Лімарыус, 2007.

2. Гарбачова В. В. Ігнацій Клюкоўскі і Іаахім Лялевель (1822–1830 гг.) // Беларускі археаграфічны штогоднік = The Belarusian archeographical year-book / [рэдкал.: Э. М. Савіцкі (гал. рэд.) [і інш.]]. Мінск, 2011. Вып. 12. С. 222–233.

3. Wspomnienia o Włoszech (Salony i Artyści) / przekł. I. Klukowskiego // Dziennik Wileński. Historya i Lit. 1830. T. 10, Lip. S. 3–31.

4. Wspomnienia o Włoszech (Wille Rzymskie) / przekł. I. Klukowskiego // Dziennik Wileński. Historya i Lit. 1830. T. 10, Paźdz. S. 217–235.

5. Klukowski, I. Notizie di medici, maestri di musica e cantori, pittori, architetti, scultori ed altri artisti italiani in Polonia e polacchi in Italia, raccolte da Sebastiano Ciampi R. corrispondente attivo di scienze e lettere in Italia pel Regno di Polonia, con appendice degli artisti italiani in Russia ecc. Lucca. 1830 w 8ce str. 165 // Dziennik Wileński. Historya i Lit. 1830. T. 10, List. S. 313–316.

6. Ариосто, Л. Неистовый Роланд : [поэма : в 2 т.] / Л. Ариосто; пер. свобод. стихом М. Л. Гаспарова. М.: Наука, 1993. Т. 1 : Песни I – XXV.

7. Ariosto L. Orlando furioso: in 3 vol. / a cura S. Debenedetti. Bari: Gius. Laterza & Figli, 1928. Vol. 1.

8. Scelta di poesie italiane per uso di coloro, che si dedicano allo studio della lingua italiana nell'Università Imperiale di Vilna. Vilna: A spese di Giuseppe Zawadzki stampatore dell'univ., 1809.

# АПАЗІЦЫЯ АСАБІСТАГА І КАЛЕКТЫЎНАГА Ў РАМАНЕ БА ДЗІНЯ «ХАЛОДНАЯ НОЧ» І АПОВЕСЦІ В. БЫКАВА «ЗНАК БЯДЫ»

**М. В. Яромка**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр-т Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь,*
*maryna.yaromka@gmail.com*

Прысвечаны мастацкім сродкам раскрыцця апазіцыі асабістага і калектыўнага ў рамане Ба Дзіня «Халодная ноч» і аповесці В. Быкава «Знак бяды». Узаемная сувязь двух тыпаў досведу перадаецца праз тыпізацыю герояў, развіццё індывідуальнай гісторыі на фоне глабальных падзей, раскрыццё тэмы асабістай і гістарычнай памяці. Стратэгіі паводзін персанажаў (адаптацыя, супраціў) выяўляюць спосабы рэагавання на глабальныя выклікі. Розніца паміж творамі палягае ў пазіцыі, з якой адбываецца асэнсаванне ўласнага досведу: калі ў «Халоднай ночы» героі знаходзяцца ў плыні падзей (акцэнт на эмацыйнасці, здольнасць уплываць на свой лёс), то ў «Знаку бяды» рэфлексія адбываецца на прасторавай і часавай дыстанцыі (рацыяналізацыя, адсутнасць кантролю над сітуацыяй).

***Ключавыя словы:*** апазіцыя асабістага і калектыўнага; Ба Дзінь; В. Быкаў; «Знак бяды»; тыпізацыя; «Халодная ноч».

# ОППОЗИЦИЯ ЛИЧНОГО И КОЛЛЕКТИВНОГО В РОМАНЕ БО ДЗИНЯ «ХОЛОДНАЯ НОЧЬ» И ПОВЕСТИ В. БЫКОВА «ЗНАК БЕДЫ»

**М. В. Яромко**

*Белорусский государственный университет,*
*пр-т Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь,*
*maryna.yaromka@gmail.com*

Посвящена художественным средствам раскрытия оппозиции личного и коллективного в романе Бо Дзиня «Холодная ночь» и повести В. Быкова «Знак беды». Взаимная связь двух типов опыта передается через типизацию героев, развитие индивидуальной истории на фоне глобальных событий, раскрытие темы личной и исторической памяти. Стратегии поведения персонажей (адаптация, сопротивление) выявляют способы реагирования на глобальные вызовы. Разница между произведениями заключается в позиции, с которой происходит осмысление собственного опыта: если в «Холодной ночи» герои находятся в течении событий (акцент на эмоциональности, способность влиять на свою судьбу), то в «Знаку бяды» рефлексия происходит на пространственной и временной дистанции (рационализация, отсутствие контроля над ситуацией).

***Ключевые слова:*** оппозиция личного и коллективного; Бо Дзинь; В. Быков; «Знак бяды»; типизация; «Холодная ночь».

# PERSONAL AND COLLECTIVE OPPOSITION IN BA JIN'S NOVEL «COLD NIGHTS» AND V. BUKAŬ'S NOVELLA «SIGN OF MISFORTUNE»

**M. V. Yaromka**

*Belarusian State University,*
*4 Niezaliežnasci avenue, 220030, Minsk, Belarus,*
*maryna.yaromka@gmail.com*

The article focuses on the artistic means for the development of the personal and collective opposition in Ba Jin's novel «Cold nights» and V. Bukaŭ's novella «Sign of misfortune». The interconnection between the two types of experience in reflected by means of characters typification, unfolding of the personal story with global events as the background, development of the topic of personal and historical memory. Characters' behavioral strategies (adaptation, rebellion) depict different ways to react to global challenges. The difference between the works is the position from which the personal experience is being reflected upon: whilst in «Cold nights» the characters are in the middle of unfolding events (emphasis on emotional experience, ability to impact one's fate), in «Sign of misfortune» reflection happens from the spatial and temporal distance (ratioanalisation, losing control of the situation).

***Keywords:*** Ba Jin; «Cold nights»; personal and collective opposition; «Sign of misfortune»; typification; V. Bukaŭ.

Погляд на падзеі з пазіцыі гісторыі прадугледжвае пэўную ступень абагульнення, аднак у рамках літаратурнага твора гістарычны кантэкст выяўляецца скрозь прызму індывідуальнага досведу. Апазіцыя асабістага і калектыўнага дазваляе акрэсліць уплыў гістарычных падзей на асобнага чалавека, выяўлены ў тэксце.

Творчасць Ба Дзіня (巴金Bā Jīn, 1904–2005) грунтоўна даследаваная ў кітайскім літаратуразнаўстве [1, 2, 3, 4, 5, 6, 7]. Творы пісьменніка нярэдка вывучаюцца ў кантэксце гісторыі Кітая XX стагоддзя і разглядаюцца як адлюстраванне і асэнсаванне змен у кітайскім грамадстве новай эпохі. Раман Ба Дзіня «Халодная ноч» («寒夜» Hányè, 1947) з'яўляецца спробай асэнсавання кітайскай гісторыі 1920–1940-х гадоў, рэфлексіі з нагоды сацыяльнага і светапогляднага крызісу. Аповесць В. Быкава (1924–2003) «Знак бяды» выводзіць падзеі 1920–1930-х гадоў як крыніцу маральнай катастрофы ваеннага часу, паглыбляючы разуменне нацыянальнай трагедыі. Рэфлексія над мінулым займае важнае месца ў творчасці абодвух аўтараў: у пазнейшы перыяд Ба Дзінь працягвае асэнсаванне мінулага ў эсэістыцы, уключанай у кантэкст «літаратуры шнараў» (伤痕文学shānghén wénxué); В. Быкаў прыходзіць у літаратуру і набывае вядомасць дзякуючы ваенным аповесцям, асэнсаванне досведу чалавека ў крытычнай сітуацыі шырока прысутнічае ў творах пісьменніка. Раскрыццё гісторыі праз лёс асобнага чалавека дазваляе перадаць агульнанацыянальны досвед, які грунтуецца на асабістых праблемах, і ў той жа час выяўляе значнасць гістарычнага

кантэксту для чалавека, выводзіць спосабы рэагавання на вонкавую сітуацыю ў залежнасці ад асаблівасцей індывідуальнага досведу.

Рэакцыя чалавека на навакольныя падзеі з'яўляецца рэалізацыяй сфарміраваных перакананняў і ўстановак. Найбольш выразна гэта выяўляецца ў перыяды змен, якія патрабуюць ад чалавека адаптацыі. У рамане «Халодная ноч» змены адбываюцца на двух узроўнях: з аднаго боку, гэта руйнаванне старой культурнай парадыгмы і пошук новай; з іншага боку – рэзкая змена жыццёвых умоў падчас вайны. Адаптацыя герояў адбываецца паводле двух сцэнараў: Вэньсюань трымаецца за ўласныя перакананні, пазбягае канфлікту; Шушэн імкнецца да зменаў, бачыць вырашэнне канфлікту ў яго абвастрэнні. Паказальна, што рэакцыя на цяжкасці ваеннага часу карэлюе са стаўленнем да глабальных культурных змен. Выбар на карысць захавання дасягнутага вядзе да ўпартасці ва ўласных перакананнях, што пазбаўляе Вэньсюаня магчымасці адаптавацца. Шушэн, аддаючы перавагу руху, пошуку выйсця, глядзіць на канфлікт традыцый з пазіцыі канкрэтных праблем і можа адмовіцца, прынамсі часткова, ад прагрэсіўных поглядаў [8, с. 36]. Змены ў асяродку рухаюць герояў наперад, але толькі ў тым выпадку, калі яны змяняюцца ўнутрана; калі ж рэакцыя на знешнія трансфармацыі палягае ў жаданні адасобіцца, дачакацца лепшага часу, то герой апынаецца няздатным да адаптацыі.

У «Знаку бяды» рэакцыя Петрака і Сцепаніды на падзеі адрозніваецца, як і ў «Халоднай ночы», паводле пасіўнасці або актыўнасці, трывання або супраціву адпаведна. У В. Быкава, аднак, ніводзін са шляхоў не дае выратавання, што акцэнтуе разуменне ваенных і даваенных падзей як катастрофы, перад якой выбар асобнага чалавека страчвае значэнне. У аповесці выводзяцца альтэрнатыўныя спосабы рэагавання на навакольны крызіс – гэта вобразы другарадных герояў, якія абіраюць жорсткасць і бесчалавечнасць або ў выніку крыўды (Гуж, Каландзёнак), або з прычыны недахопу рэфлексіі з нагоды таго, як іх дзеянні ўплываюць на іншых (Недасека). Ацэнка Сцепанідай і Петраком учынкаў гэтых персанажаў выяўляе тупіковасць дадзенага шляху: «Лепей бы ты [Недасека] памёр для іх. <…> Ты ж губіш усё жыццё іхняе. І сябе таксама» [9, с. 220–221]. Рэакцыя, якая грунтуецца выключна на знешніх умовах, выяўляецца недастатковай, што падкрэслівае важнасць унутранага свету, глыбокага асэнсавання вонкавых падзей.

У абодвух творах асаблівасці рэакцыі на падзеі выяўляюцца ў дынаміцы ўнутранага і знешняга. У раскрыцці дадзенай апазіцыі значную ролю адыгрывае рамка: выбар межаў гісторыі наўпрост вызначае падзел на ўнутранае і знешняе ў плане досведу. Маладосць Вэньсюаня і Шушэн выносіцца за рамку гісторыі, ператвараючыся ў адарваны ад сучаснасці, вонкавы досвед; мінулае Петрака і Сцепаніды, наадварот, займае ў аповедзе значнае месца, выступаючы крыніцай цяперашняга становішча. У кантэксце дадзенай праблемы назва аповесці набывае адпаведнае прачытанне: знак складаецца са знешне выражанай формы і схаванага ўнутры зместу.

Ба Дзінь ставіць акцэнт на знешнім як на сацыяльным: унутраныя перажыванні герояў залежаць ад знешняга досведу, вайна становіцца цэнтральнай прычынай разладу ў сям'і, а паводзіны герояў выяўляюць іх перажыванні. В. Быкаў засяроджвае ўвагу на ўнутраных перажываннях як дэтэрмінанце паводзін і чарговага этапу

рэфлексіі. Кожнае рашэнне ператвараецца ў нагоду для далейшага паглыблення роздуму (унутранае) над прычынамі ўласных пакут (знешняе і ўнутранае). Калі Ба Дзінь паказвае сувязь знешняга і ўнутранага як дынаміку ўзаемнага ўплыву двух кшталтаў досведу, то В. Быкаў робіць акцэнт на шматслойнасці ўнутранага: рэфлексія як рэакцыя на вонкавае і ў той жа час на ранейшую рэфлексію.

Сродкам уключэння асабістага досведу ў агульны кантэкст выступае тыпізацыя герояў. Вэньсюань і Шушэн – тыповыя прадстаўнікі кітайскай інтэлігенцыі 1920–1930-х гадоў, якія сутыкаюцца з характэрнымі для часу праблемамі (маральны канфлікт, сацыяльнае разбурэнне). Акрамя таго, Вэньсюань хворы на сухоты, якія былі шырока распаўсюджанай хваробай у тагачасным Кітаі. Пятрок і Сцепаніда – беззямельныя сяляне, вымушаныя працаваць на пана; з атрыманнем зямлі яны цяжка працуюць, але застаюцца ні з чым на фоне калектывізацыі і ўсеагульнай беднасці; вайна прыносіць героям разбурэнне і смерць. Кожны жыццёвы этап герояў наўпрост карэлюе з падзеямі беларускай гісторыі 1920–1940-х гадоў і выступае яркім прыкладам тыпізацыі. Лёс другарадных герояў дапаўняе карціну часу: смерць Яхімоўскага ў выніку страты маёмасці і статусу, ідэалагічна матываваныя пакаранні, помслівасць у выніку крыўды, якая выяўляецца ў цкаванні сваіх, бесчалавечнасць немцаў і паліцаяў, прыстасаванне праз адмову ад чалавечнасці.

Канфлікт асабістага і калектыўнага ляжыць у аснове светапогляднага крызісу, выяўленага ў «Халоднай ночы». Акцэнт на знешнім, супольным, рэалізаваным у дзеянні закладзены ў канфуцыянскай філасофіі. З аднаго боку, героі выступаюць супраць старых поглядаў, з іншага – шукаюць новую сістэму, якая б адпавядала іх асабістым перакананням. Ключавы момант – неабходнасць суаднесці агульнае і асабістае, згладзіць канфлікт ці то праз уціск асабістага (традыцыйнасць), ці то праз выбудоўванне новай сістэмы (прагрэсіўнасць).

У аповесці сутыкненне асабістага і калектыўнага адбываецца вакол праблемы выжывання: сяляне не прымаюць калектывізацыі не таму, што не пагаджаюцца з палітыкай, а таму што гэтая палітыка нясе прамую пагрозу іх існаванню; Сцепаніда вырашае пайсці ў калгас, бо бачыць у гэтым адзіную надзею забяспечыць сям'ю: «Ды і ягоная Сцепаніда, хоць і агітавала за калгас па ўсёй вёсцы, калі разабрацца, болей старалася за сябе, ну, і за яго, вядома, бо ўжо стала відаць, што з дзвюх дзесяцін пражыць неяк, а здароўе пакладзеш, гэта пэўна» [9, с. 224]. Героі не маюць глабальных памкненняў, як інтэлігенты Вэньсюань і Шушэн, для іх непрынятне новага грунтуецца не на ідэйнай супярэчнасці, а на немагчымасці выжыць у выпадку яго прыняцця; для герояў В. Быкава на месцы традыцыйнага светапогляду, з якім змагаюцца Вэньсюань і Шушэн, знаходзіцца неабходнасць цяжкай працы як адзіны спосаб жыцця селяніна.

Дынаміка ўнутранага і знешняга па-рознаму рэалізуецца ў двух творах. Ба Дзінь паказвае пошук і выбудоўванне сістэмы поглядаў, з якімі чалавек можа суаднесці ўласныя перакананні, выяўляе глыбокі ўнутраны канфлікт у выпадку, калі такой сістэмы няма. В. Быкаў стварае канцэпцыю чалавека, дзе досвед паступова становіцца менш знешнім і больш унутраным, сістэма поглядаў выбудоўваецца знутры і таму апынаецца індывідуальнай. У «Халоднай ночы» героі не могуць адшукаць сабе месца, намагаюцца адаптавацца тым ці іншым чынам (не быць памяркоўным,

адмовіцца ад свабоды); героі «Знака бяды» аддаляюцца ад супольнасці, бо для маіх мае значэнне толькі асабістае, адзіная адаптацыя – ізаляванасць.

Апазіцыя асабістага і калектыўнага закранае тэму памяці. У рамане памяць пераважна выводзіцца з пазіцыі супольнасці (традыцыйная мараль), тады як асабістая памяць не мае асаблівай вагі: увага ў асноўным засяроджваецца на актуальных падзеях, героі толькі мімаходзь згадваюць мінулае і больш думаюць пра будучыню, перажытае выконвае функцыю кантрасту з сучасным становішчам [8, с. 22–23].

У аповесці памяці надаецца надзвычай важная сэнсавая роля: «Напэўна, усё астатняе належала тут мінуламу, скаронаму тленам і небыццём. Усё, апроч непадуладнай часу, цярплівай і негаваркой чалавечай памяці, надзеленай спрадвечнаю здольнасцю ператвараць мінулае ў цяперашняе, звязваць сучаснае з будучым» [9, с. 6]. Мінулае не толькі паказвае альтэрнатыўную сітуацыю, але і разглядаецца як крыніца цяперашніх пакут, фактар фармавання сучаснага досведу. Успрыманне мінулага абапіраецца на ўспаміны, разрыў паміж якімі прыводзіць да канфлікту: Сцепаніда памятае 1930-я як цяжкі час, дзе адзіным выйсцем бачыўся калгас; Гуж глядзіць на тыя самыя падзеі з пазіцыі рэпрэсаванага чалавека, што дае яму падставы помсціць галоўнай гераіні [9, с. 214]. Розніца ў досведзе выяўляецца ў адрозным стаўленні да перажытага і ўплывае на далейшае жыццё герояў.

